Мікола Калядны

# Касьмічныя праекцыі



МІКОЛА КАЛЯДНЫ

# Касьмічныя праекцыі

**Раманы, п’есы**

Мінск
«Галіяфы»
2020

УДК 821.161.3-31/-2
ББК 84(4Беи)
К17

**Калядны, М.**

К17 Касьмічныя праекцыі : раманы, п'есы / Мікола Калядны. — Мінск : Галіяфы, 2020. — 424 с.

ISBN 978-985-7209-59-0.

Нашае жыцьцё — касьмічныя праекцыі. Бесьперастанныя, адмысловыя, вызначальныя. Створаныя ўверсе, на Нябёсах, яны ільюцца ўніз, у чалавечую сьвядомасьць і абумоўліваюць усе думкі, пачуцьці, учынкі. Героі кнігі, ідучы цераз нетры і церні рэальнасьці, выпрабоўваюць свой дух і ўзгадоўваюць у сабе разуменьне паўсюднай касьмічнай прычыннасьці. Глыбокія веды пра Космас пашыраюць іхнае сьветаўспрыманьне, адчыняюць праўду і сэнс жыцьця, дапамагаюць шукаць правільныя адказы на пытаньні — увогуле многія праблемы для іх проста адыходзяць. Характэрна: праясьненьне адчуваюць усе, хто знаёміцца зь лёсам персанажаў.

**УДК 821.161.3-31/-2**
**ББК 84(4Беи)**

**ISBN 978-985-7209-59-0**

© Калядны М., 2020
© Афармленне. ПВУП «Галіяфы», 2020

# ГОЛСКАСЬЦЬ

**рэсткая праекцыя**

# 1

— Янка-а-а!

— Чаго ты крычыш? Тут жа можна інакай.

— Ты яшчэ ўзбураны, пракуда, і не адрозьніваеш. Па-першае, я не крычу, а клічу цябе і эмоцыямі, і думкамі разам, а па-другое, досыць табе зьнікаць, а то прападзеш няўрокам. Дый хвалююся я.

— Нічога страшнага, Мар'я, я ня дурань і сабе не нашкоджу.

— А калі іншыя?

— Няўжо яны адразу кінуцца на мяне, я ж новенькі, абаронены і пад тваёй апекай. А ты — абазнаная.

— Гэта так. Дасьведчаная. А ты толькі прыйшоў, цалкам адкрыты, уразлівы, у подступах яшчэ не разьбіраесься…

— І што?

— Засвой, што поле бітвы — ужо не Энроф зь яго таямнічасьцю, а шырока адкрытая і неабмежаваная Алірна, і твае супрацўнікі ведаюць галоўнае: ты — тут.

— Ты так гаворыш, як быццам я апынуўся на тым — не, цяпер ужо трэба казаць:

на гэтым — сьвеце толькі для вайны і мяркую зь кімсьці люта разьбірацца...

— Прабач за рэзкія назовы... Патлумачу. Неабходна шпарчэй адыходзіць ад зямных успрыманьняў і разумець, што тут словы, найменьні такія ж важкія, як і ўчынкі, рэакцыі, намеры, адтаго варта ўсё называць і азначаць адразу. Сутнасна, правільна й ясна. Гэта тычыцца як добрага, так і благога — увогуле ўсяго, што адцяпер будзе цябе атачаць.

— Дзякуй, Марыля. Не адразу кумекаю, але... нешта такое ўзгадваю.

— Канешне, ты ж ня першы раз паміраеш, парадкі ранейшыя, толькі, можа, крышачку зьмяніліся, адтаго, спадзяюся, агоўтаесься хутка.

— Я стараюся. Тое-сёе ўжо агледзеў — і зьявіліся асацыяцыі...

— Пахвальна. І дзе ты пабываў ужо?

— Дзе спынялася жаданьне. Цікава ўсё! Ад няўвычкі аж дух захапляе. І ніякіх перашкодаў. Так будзе заўсёды?

— Пакуль у цябе зьбянтэжаны перыяд. А потым — і так, і не.

— Давядзі, каб я быў напагатове.

— Карта Алірны, як і ўсяго іншага, знаходзіцца ў галаве кожнага, і рух па ёй залежыць ад навігатара — асабістай сьвядомасьці, дакладней — ад узроўню яе разьвіцьця: чым глыбей пазнаньні, тым дасяжней акольнасьць; якія адчуваньні, успрыманьні — такія і малюнкі мясцовасьці, выявы, сумер. Адразу даступна ўсё, каб паказаць умовы сьвету, а пасьля, і даволі хутка, застаецца толькі індывідуальнае, назапашанае за многія жыцьці ў Энрофе.

— Як строга! А калі наступіць *мой* момант?

— Ён надыдзе так, што й не заўважыш: сьведам'е будзе працаваць па-ранейшаму, бяз збоеў, але сьвет хутка паўста-

не такім, якім ты яго ведаеш і ўяўляеш. Абастоўка сфармуецца па *тваіх* думках, уваабражэньнях, марах.

— А па *іншых*?

— Калі ты пажадаеш, каб яны былі з табой.

— Дык гэта ж дыктатура!

— Пачакай. Мяне клічуць.

Марыя трохі хіснулася, на імгненьне засяродзілася — і мігам паляцела.

# 2

Янук застаўся адзін. Так яму здавалася.

Як толькі ён кінуў позірк навокал і ўбачыў шчымліва блізкія краявіды, перад ім выявілася бясформавая павабная здань. Яна ня мела звыклых для чалавека альбо астральца канчакоў, але ўсім сваім выглядам і ўспрыманьнем пераконвала ў здольнасьцях да зносінаў.

— Падабаецца? — пачулася ад яе, і Янка зразумеў, пра што пытаньне.

— Так, — адказаў ён і зноў павярнуў галаву да пейзажу. — Нагадвае дзяцінства. Апошняе, — дадаў і пранікліва ўзерыўся ў прывід.

— Адаптуесься ўдумліва. Кемны, — прагучала хвала і яшчэ нешта, падобнае на шумценьне.

Лёгкі ветрык казытнуў фібры — і стала прыемна.

Зьнекуль узьнікла ціхая пяшчотная музыка.

Навакольле пераістачылася і запрыгажэла.

Нутро Янкі адчула нешта роднаснае.

— Вяртаесься да сваёй ролі, — адгадала ягоны стан выява, якая таксама зьмянілася і набыла залаціста-празрысты спазор.

— Хто ты?

— Мара, стыхіяля.

— ?

— Прырода. Адна зь яе творцаў і служкаў.

— Гэта ўсё тваё? — Янук шырока распасьцёр рукі.

— І маё такжа. У тым ліку й ты.

— А я адчаго?

— Ты ж таксама — прырода.

— І якая?

— Творчая, у асноўным — музычная.

— Складаю, граю, сьпяваю, танчу?

— У Вердзе быў кампазытарам.

Янка не зьдзівіўся, а задумаўся. Нешта ад культуры ён дапушчаў, бо заўсёды адчуваў у сабе дух творчасьці, багатага ўроеньня, але з выдумшчыкам музыкі атаясамляў тое ў апошнюю чаргу.

Дый Алесь нічога такога не даводзіў… Хоць ужо даўно і стала назірае Янку і ў Алірне, і ў Энрофе...

— Не было нагоды, — зноў крыху перафарбавалася Мара. — Тым больш што ў яго школа.

— Як і ў цябе?

— У мяне сістэма. А прысутнасьць такіх, як Алесь, часьцей адчуваецца невідзебна, духам. Ён *умушчае назьне*. Уважай. У цябе ж выдатны слых.

— Значыць, большасьцю трэба разьлічваць на сябе.

— Выснова ашуклівая. Самастойнасьць — асаблівы дар, які трэба заслужыць. Але яна ніколі не адмяняе настаўніцтва, а толькі ўзьвялічвае яго. *Ніхто не існуе без кіроўцы*. У кожнага ёсьць *вукар*.

— Адзін?

— Не, ты ўжо ў гэтым пераканаўся: некалькі, у залежнасьці ад стадыі падрыхтоўкі вучня. Асноўныя веды дае навука. У *гэтым* навучаньні своеасаблівы падыход: галоўнае ня тэрмін, а ўзровень; адсюль — патрабаваньні як да вучня, так і да настаўніка. Чым вышэй разьвіцьцё, тым меней апекуноў, але ўсё больш мацнейшых.

— Магчымае вяртаньне?

— Так, пакуль не дасьпее сьвядомасьць.

— А на якой стадыі я і колькі ў мяне павадыроў?

— Хутка даведаесься.

Мара стала жухнуць, разрэджвацца, аж пакуль ня зьнікла саўсім, але пасьпела сказаць:

— Не хвалюйся, усё ў цябе нармальна, толькі ўключай ды адчыняй.

— Як? — крыкнуў быў Януш, але асекся, бо ўжо не было каму.

# 3

Колькі імгненьняў паланіла думка: што далей?

Побач зыкнула і мільганула.

Янук адчуў нязвыкла, нейкім невядомым чуцьцём, як нешта ад яго аддзялілася, пераламілася разам з варыянтам ваколіцы, якая перадусім раздвоілася і кудысьці накіравалася. Пры гэтым ён ясна заўважыў, што нічога ня страціў.

Пасьля такой цікавай мітусяніны існасьці яму дакладна закарцела рушыць. Балазе ціханька загучала музыка, і пяшчота ня толькі абалачыла, але і радасна ўзьняла, спанадзіла ўсё нутро.

Мелодыя вабіла — і ляцець было прыемна, зручна. Куды — Янка ня ведаў, бо адбывалася ўсё па чыёйсьці волі, настойліва, але ласкава. Яму толькі заставалася любавацца прыгоствам, што разгортвалася вакол. Краявідаў, такіх слаўных і захватлівых, ён яшчэ не назіраў. Прырода паўставала ў сваёй лепшай кудзебнай выяве. Мабыць, Творца гэткім хараством атачыў нейкае асаблівае асяродзьдзе і для адметнае мэты.

Так меркаваў лятун і, падказвала нутро, набліжаўся да супыну.

А гэты адбыўся адразу, як толькі Януш убачыў гурт дзівосных стварэньняў, якіх аб'ядноўвала сьветлата і прамяністасьць, духовая луч. Усё настолькі зіяла, зачароўвала і сьляпіла, што засяродзіцца і ўзецiць штосьці істотнае, падрабязнае зусім не выпадала.

Тым больш нечакана шаснуў пошуг — і карціна зьмянілася.

Цяпер яна нагадвала вердаўскую. Тут ужо ўсё праглядвалася яскрава і да дэталяў, не патрабуючы ніякай дадатковай унутранай натугі, можа, толькі выклікаючы крыху зьдзіўленьня, бо стыль быў мадэрнавы, некалькі вычварны.

Наогул у Алірне, хоць і існавала шмат падабенстваў з Энрофам, усякае мейсца, зьява, падзея, аб'ект абавязкова мелі настрой — і досыць прыкметны! — таго, хто альбо стварыў іх, альбо валодаў-карыстаўся імі, альбо нейкім чынам прычыніўся да працэсу. Адтаго знаёмая абастоўка кожны раз была неспадзяванай з-за свайго характару і каларыту.

Менавіта такой паўстала і гэтая сустрэча. Калі б ня грань іншага сьвету і жыцьця, дык Янка вырашыў бы, што трапіў на чарговае фізычнае паседжаньне музыкаў: настолькі многа знаёмых прысутнічала ў гурме.

Усе заўважылі яго — і адбыўся эмацыйны воплеск, зьмястоўны, шматтанальны, калярысты, ад чаго ніхто не разгубіўся й не ўстрывожыўся, бо ўжо звыкся з праўдай і адкрытасьцю астралу.

— Ян зьявіўся!

— Нарэшце дачакаліся!

— Ну, цяпер зажывём!

— Уважайце і трапячыце!

— Тут безь цябе ўжо дакладна не абыдземся.

— А *там* маглі.

— Працягнеш вярэдзіць-тарнаваць.
— Пакволі ня будзе.
— Умец знушчэньняў.
— Зазнайма!
— Гэта — наш кон.
— Не, усё адно пыхацець мы табе не дамо.
— Дастанеш шчырасьцю і справядлівасьцю.
— Дый нахабствам таксама.
— Ачамярэў многім.
— Затое ахвярным казлом ніколі ня быў.
— Сьмелы, рашучы, дамоўны.
— А тут ты таксама знаны й славуты?
— Талент нідзе не зьнікае.
— Такіх тут процьма.
— Аковаў паўсюль стае.
— Пры жаданьні аброць можна заўсёды накінуць.
— А гракнуцца можна дзе заўгодна.
— Тым больш што на памаркі ў цябе праблемы былі.
— Здурнеў ад эзатэрыкі.
— Зь нячысьцікамі хадзіў.
— Са сьценямі размаўляў.
— Хтосьці нарадзіў.
— Карацей, на галаву дзіўнаваты.
— Як ні кажы, *пракудны*.
— Вось, зараза, і тутака сьлічны.
— Ох, і юрлівец жа!
— А распуста — натура калі ня вечная, то доўгая.
— Мабыць, за табой і іншыя панадкі захаваліся.
— Так, на што ўжо, а на заганы ды павіннасьці мы ўсе багатыя.
— Завідушчых ды імсьлівых, як і ўсякага друзу, таксама ўдосталь паўсюдна. Вунь як ашчэрыліся!

— Нічога: ты — спраўны, змагацца ўмееш.

— Вось толькі добрасьць твая падводзіць.

— Затое ты працавіты, настойлівы, праўдзівы.

— Дый зычліўцаў у цябе нямала. Як, дарэчы, і нянавіднікаў.

— Хавай цябе Бог!

Меркаваньні ліліся так моцна і выразна, што Януш спачатку ня ўцяміў, вымаўляюцца яны ці мысьлююцца.

# 4

— Няма чаго зьбіраць тлумныя таратоdatabry, а то заблытаесься, — дапамог прыяцель Гаўрусь, які адлучыўся ад агульнае групы і наблізіўся да яго. — Тут трэба прасьцей: неабавязкова кагосьці выслухваць, дастаткова толькі добра прыглядзецца — і нутро кожнага як на далоні, — ён асягнуў усіх поглядам.

Яны павіталіся і абняліся.

— Я рад цябе бачыць зноў, — усьміхнуўся Гаўра. — Нарэшце. Запомні: ад душы нічога не схаваеш, яна ўсё прымае і сартуе адразу: гэта — маё, а гэта — чужое. І ніколі не памыляецца. Ёй трэба *давяраць*. Ужо потым, калі надабе, яна штосьці-кагосьці разьбярэ па костачках, драбніцах і ўзважыць як мае быць, то бок правядзе навуковы аналіз і выдасьць вынік. Іншая справа: ці патрэбны ён табе?

Даўнія таварышы, аднадумцы, Янка і Гаўрык пасьля доўгага растаньня шчыра радаваліся новым узаемінам і бажалі нагаманіцца, але іх адцягнулі варункі.

— Ведаеш, што ўсёды шкодзіць індывіду? — па-хвацку спытаў Гаўрусь.

— Грамада?

— Узорна кеміш. Іншыя індывіды! Асабліва калі яны — гідкія здані і ў хэўры.

— Так ты іх абзываеш?

— Цябе ў астрале ўразіла толькі адна сутыка з нашым брацьцем, а пабудзеш больш — і не на такое наважысься.

— Так, пасьля *гэтага*, — Януш паказаў галавой і думкамі на ўсю кампанію, — я ня ведаю, як і паводзіць сябе.

— Натуральна, — выгукнуў Барук, які ў Вердзе ўзначальваў зьвяз музыкаў, заўсёды прытрымліваўся афіцыйнай пазіцыі, якая б яна ні была, і лічыўся паскудным чалавекам. — Тут сакрэтаў няма, усё навідавоку: нічога не схаваеш, мы ўсё прымецім.

— Гэта ён, шэльма, у аблуд гуляе, хоць пэўна ведае, што да чаго, — перапыніў яго Гаўрыла і асьцярог кунпана: — Слухай усіх, але не сьпяшайся дзейнічаць.

Гурт усхваляваўся — і запылаў рознымі настроямі. Неабавязкова было высільвацца і лавіць іх сэнс — ён быў відочны: сподумкі, паняцьці, погляды, спрэчкі зьяўляліся-паказваліся над галовамі флюідамі-аблачынкамі, сьветлымі, цёмнымі, адны тут жа прападалі, другія зьбіраліся ў шэрыя болкі і кудысьці адляталі. Прыяцелі і каму было ў навінку зь цікавасьцю назіралі.

— Да каго трэба — дабяруцца, — Гаўрыла неакрэсьлена махнуў рукой і зноў зьвярнуўся да Януша: — Сапраўды, у астрале, эмацыйным сьвеце, усё ачавістае, і таемнічаць, як робяць людзі ў фізыцы, ці бо ў матэрыяльнасьці, немагчыма — так лічаць прастакі і даверлівыя неафіты. Адукаваныя ж ведаюць: пакуль існуе нароўні з супольнай *індывідуальная сьвядомасьць*, ёсьць мажлівасьць *скрытасьці*.

— І як яна дзейнічае? — загарэўся Янук.

У паветры закудзеліліся чыесьці хіхоты-жартачкі, якія мігам прылучыліся да агульнае хмарнасьці.

— Дасьціпных — на канцэрты, — сярдзіта гыркнуў Гаўрусь і ўжо спакойна патлумачыў сябруку: — Вядома, што ўсё пачынаецца ў галаве. Думка, каб рэалізавацца, амаль заўсёды праходзіць праз пачуцьці, гэта значыць, выяўляецца на астральным узроўні — адсюль немагчымасьць усялякіх сховаў: таемнае — увесь час яўнае.

— Я зразумеў! — усклікнуў Ян.

Слухаючы Гаўра, ён агаломшана спацікаў, як ад натоўпу імпэтна па чарзе аддзяляліся нявветлівыя падшыванцы-гарэзы і лётам несьліся рэальна на канцэрты.

— Што іменна? — раздражнёна кінуў Гаўрыла, бачачы ягонае захапленьне.

— Першае: каб некага кудысьці накіраваць, трэ вельмі моцна пажадаць гэтага, — узбуджана адказаў Янка. — Другое: тайба застанецца такой, калі думкі не злучаць з эмоцыямі, напрыклад мысьляваць надзвычай прагматычна.

— Малайчына! — задаволена выгукнуў таварыш. — А цяпер яшчэ адзін урок.

— Што, і ты — мой настаўнік?

— Так. Узрадуемся!

— Дзіўна: ты ж маладзейшы!

— З чаго ты ўзяў?

— Быў маім вучнем у школе...

— А-а! Цябе ўсё яшчэ трымае мінулае. Тады тлумачу: школа існавала ў Вердзе, фізычным пласьце Зямлі. Там кожны з нас выконваў свае задачы: ты ў шматплыннасьці жыцьця шукаў арыгінальныя творчыя ручаі, я ж спасьцігаў працэс узьдзеяньня розных формаў грамадзтва на індывіда, а ўкупе мы дапамагалі адзін аднаму зносіцца.

— Так, потым ты зрабіўся апазыцыянерам.

— А ты — неблагім кампазытарам.

— Але мы працягвалі стасавацца, сталі таварышаваць. І менавіта пад тваім уплывам я стварыў свабодную сімфонію.

— Дзякую. Я ніколі не забуду, як ты мяне ратаваў ад рэпрэсантаў.

— І я ўсё памятаю... Усё адно пайшлі з таго сьвету ня ў свой час.

— Спрэчнае пытаньне. Тут прадметнае жыцьцё ацэньваецца інакш — у гэтым ты яшчэ пераканаесься. У якасьці прыкладу вернемся да нашае купы і засвоім чарговы ўрок.

Дагэтуль астралавекі безуважна назіралі за сябрамі, але пасьля апошніх словаў заварушыліся. Некаторыя нават выдаляліся і працягвалі тое рабіць на працягу ўсяе гутаркі.

# 5

— Якія ж мэтамарфозы адбываюцца з істотамі на перавалах часу? — з наўмысным выразам прамовіў Гаўра, гледзячы ў натоўп і нібы кагосьці шукаючы. — І як трансфармуецца сьвядомасьць?

— Мы сабраліся, каб парадзіцца і вызначыць новыя акцэнты, — узбуджана і катэгарычна нагадаў Астах, якога Януш ведаў як таленавітага, але бутаражнага музыканта. — А паддосьледныя пацукі знаходзяцца ў іншым мейсцы.

— Так, тут не абы-які сумніўны зграй, а сход паважаных інтэлектуалаў, — рашуча падтрымаў Макар, за якім быў аўтарытэт мудрага, разважлівага і прынцыповага крытыка, лепшага дарадцы.

— Яшчэ колькі такіх пасяджэньняў, — высунуўся Лаўрык, сумна вядомы няўдатнік і ў творчасьці, і ў быцьці. Нязнайлівыя дзівавалі, як ён трапіў на такі ўзровень, а даведаўшыся, пранікаліся да яго піетэтам, — і наш зьвяз прыме ўсеастральная супольнасьць.

Пазьней, блукаючы ў паселішчах лёсаў, Януш заўважыў колькі няўцешлівых

драматычных эпізодаў: дзяўчына хварэе і цяжка пакутуе, каля яе на каленах стаіць Лаўрык; ён у хаце ведзьмака просіць для «ясачкі» лепшага жыцьця, ахвяруючы сабой, а той маніпулюе са словамі «чалавек так, а Бог інак»; прывабная вясёлая прыгажуня побач з гаротным Лаўрыкам.

— Вярхоўнікаў вельмі зацікавяць многія нашыя якасьці, якімі мы валодаем, асабліва некаторыя, — панадліва варухнулася Данута, паказаўшы ўсім ня толькі свае пекныя і зграбныя манеры, але і чароўнасьць інтымнага характару. Многія лічылі, што менавіта апошняе, а ня талент, пасунулі дзіву бліжэй да Алімпу, хоць і сёньня да канца не разумелі сапраўднага значэньня ў сусьветнай культуры і яе, і ўсяе жаноцкасьці. Дарэчы, і сама яна таксама.

— Вам, такім знакамітым і геніяльным, наогул няма чаго рабіць з намі, — іранічна і трохі ўпіклівa падкалупнуў Хрол, былы непрыязьлівы двурушнік і злыдзень, а цяпер, пасьля некаторага азмысьленага трэнаваньня, дробны і няшкодны задзірака.

Ягоныя выпарэньні былі сапраўды спрыяльныя, зычлівыя, хоць і крыху мутнаватыя.

— А я не праганяю вас, а, насупраць, запрашаю да шчырае размовы, — прыязна ўсьміхнуўся Юльян, некалі добры і незласьлівы чалавек, але пасрэдны складчык папулярных шлягерных рытмаў для такіх жа гральцаў. — Мяркую, усім будзе карысна і павучальна дазнацца вашых думак, настрою, творчых пошукаў. Усё-ткі вы калісьці знатна ўскалыхвалі арыстакратыю, багемную публіку, выклікалі, што й казаць, зайздрасьць такіх, як я.

Гэтая адкрытасьць спароміла прыемную зьяву: ад шчырака пырхнуў сьветлы і гульлівы камячок і круга панёсься над усімі, зьбіраючы такія ж настроі, пачуцьці, выпрамяненьні ня толькі ад прысутных, але і ад усяго эфіру, і павялічва-

ючыся ў памерах. Затым ён вялікім воблакам лынуў увысь і адтуль праліўся прасьвядным дажджом.

Радасьць азарыла твары.

— Дзякуй, — не замарудзіў Гаўрыла і з прыхільнасьцю адзначыў: — Гэта добры знак, і нам ёсьць аб чым пагаварыць.

У вышыні праляцела нешта велізарнае, неабсяжнае — яго ня ўбачылі, а адчулі і захваляваліся.

Грамада выразіла згоду — і навокал зрабілася неяк цяплей, утульней. А Янушу і такім жа навакам, як ён, заставалася толькі кіўнуць галовамі, бо яны яшчэ многага ня цямілі. Так, ім было нязвычна ўспрымаць разам вялікую адкрытасьць і стрыманасьць-крывічэсьлівасьць душаў, лагодную-пашанотную лучнасьць і неверагодную рознасьць поглядаў, разгалосіцу меркаваньняў. Энэргетычныя выдзяленьні над гурмой зьбіраліся вельмаякія — і ў гэтым таксама разабрацца было нялёгка.

Характэрна, што вялі рэй далёка ня тыя, хто меў пяршомства ў Энрофе. Тут царавалі не матэрыя і пасада, а чуцьцё, розум, інтэлект — імі літаральна праменіліся сама выбітныя, і ні ў каго тое не выклікала ніякіх нараканьняў. Павагаю і спагадлівасьцю была насычаная ўся атмасфэра: гэта існавала натуральна, як дадзенасьць, аднолькавая для ўсіх. Іншая справа — у кожнага былі свае ўспрыманьне, досьвед, карма. Але ўладарылі адзіныя падыходы ў вызначэньні істасьці і сапраўднасьці астральца. Асноўным крытэрам лічылася *сьвятло*, у абалонцы якога заўсёды прабывала тонкае цела. Па яго стану і насычанасьці пазнавалі і адрозьнівалі.

Любое асяродзьдзе, мерапрыемства шанавалі ў першую чаргу за колькасьць сталых, дасьведчаных жыхароў, а ўжо потым — за яго масавасьць. Так што новапрыбылыя інтуітыўна ўзіраліся і шукалі тых, хто добра сьвяціўся, ясна выглядаў, вылучаў гармонію і ідэальна ўзаемнічаў.

— Кожны гурт каштоўны ўжо тым, што ён ёсьць, бо злучае, — натхнёна вымавіў Казімір, геній музыкі і прыгажосьці, знаўца найдалікатнейшага касьмічнага гучаньня. — І адзінка інакшая, калі яна ў аркестры ці ў хоры. Добра, што вось такая традыцыя — *інтэлектуальная талака* — не пакідае і зьбірае нас, і мы горнемся адно да аднаго. Я пабачыў нямала, але пераканаўся, што праўду лепш выражаюць дружба і згода. Цераз наш хаўрус прайшлі многія слынныя асобы. А колькі іх яшчэ будзе! Сёньняшняя сустрэча пасабліваму адлюструецца ў нашай сьвядомасьці, бо ад яе пачнецца адлік носьбітаў *новага касьмічнага прызначэньня*, якія моцна пераўтвораць і ўздымуць Зямлю. Жадаю ўсім высокага ўзьлёту і лепшых здабыткаў.

У Вердзе Янук ніколі не сустракаўся з Казімірам, але добра ведаў і абагаўляў яго як класіка і выдатнага кампазытара. Ён з захапленьнем глядзеў на свайго куміра і ня мог веры няць, што бачыць яго. Хвалі незвычайнага ўзбуджэньня каціліся навокал і тарнавалі многіх так, што яны азіраліся. Казімір таксама адчуў валваваньне Янкі, павярнуўся да яго — і яны спаткаліся і позіркамі, і душамі. Нешта блiснула паміж імі ды кранула іхныя сэрцы. Пошуг адбыўся і ў Вечнасьці.

Гаўрыла заўважыў цікаўнасьць і патлумачыў сябру:

— Фізычна ён увасабляўся неаднойчы з мэтаю прасьвятленьня людзей гукавымі сродкамі. Апошні раз ён жыў некалькі стагодзьдзяў таму ў вобразе надзвычай таленавітага творцы, які складаў цудоўную музыку. Шырока і глыбока ўплываючы на грамадзтва, ён павінен быў распачаць новы музычны напрамак, значна пашырыць межы культуры і гуманізму. Але нечаканая і загадкавая ягоная сьмерць зьнішчыла пэрспэктыву. Тады ўсе зямныя слаі скалануліся і пакрыліся смуткам, бо ведалі, што гэта — яшчэ адна параза празарнацыйных сілаў.

— Адчаго ніхто не падхапіў ягоны зьніч альбо ён сам не ўцелаісьціўся нанава? — нерваваўся Януш, спараджаючы лёгкі шэры туман, што слаўся наўзблізь.

— Ты б не пытаўся, калі б тваё сьведам'е адкрылася дастатку. Сьпяшацца тут нельга, але май наўвеце: ня ўсё так проста. Калі фармуецца вялікая задача, тады рыхтуюцца адпаведныя ўмовы і значная армія выканаўцаў на многія гады, нават стагодзьдзі; страта аднаго колца псуе ўвесь механізм, патрэбныяневерагодныя высілкі і ў Прасторы, і ў Часе, каб паўтарыць. Але часьцей назад не вяртаюцца, а рыхтуюць новыя, больш дасканалыя варыянты, — адначасова Гаўра назіраў за невялікай зыркай апукай, што выявілася ў момант псыхічнага кантакту Казіміра і Яна ды цяпер калыхалася ў вышыні. — Дык вось. Казімір пасьля трагедыі і як найбольш прасунуты індывід мог бы спакойна крочыць далей па ўзыходнай лесьвіцы інкарнацыі, але ён прыняў ахвярнае рашэньне: калі няма іншых магчымасьцяў выконваць *сваю ролю* ў фізычным целе, тады ён, не рухаючыся наперад, будзе граць *яе* да канца ў астральным выглядзе і выхоўваць годных нашчадкаў.

— Ад гэтага і зьмянілася ягоная вонкавасьць? Казімір не такі, як мы.

— Іменна. Ён паступова набывае рысы будучых жыхароў Зямлі — шасціканцовых істотаў. Зараз такіх вельмі мала, але зь цягам часу іх будзе ўсё больш. Звычайна гэта паклікання, надзвычай адораныя індывіды, якія ў новай іпастасі ўзначаляць наступную эру жыцьця.

— У яго больш верхніх канцовасьцяў і шматтварная галава — яны так цікава рухаюцца.

— Па-першае, з-за свайго ўзроўню мы пакуль ня можам дагнаць зьменаў, якія зь ім адбываюцца. Так, імклівасьць асобных частак ягонага цела, напрыклад галавы, стварае

ў нас ілюзію многалічэбнасьці. Па-другое, ён сам толькі прызвычайваецца да новага выгляду.

— Нешта мне падказвае, што гэта вельмі карплівая задача, — меркаваў Янка. — Наогул лепш на кароткі міг сысьці ў матэрыю і там хіжа ўзрасьці, чымся доўга, а тут — і няпроста назапашваць досьвед у астрале.

— Правільна і з нашага пункту гледжаньня, і зь ягонага — такі парадокс разьвіцьця. Першым парадкам ідзе большасьць, — падтрымаў яго Гаўрыла. — Дарэчы, мы з табой менавіта гэтак і зрабілі.

— Борздыя! Жадаеце ўсіх апярэдзіць, — іранічна заўважыў хтосьці.

Прыяцелі здрыгануліся, скемілі, што навідавоку, і крыху адцягнуліся-абмежаваліся ды таропка перайшлі на агульны лад.

# 6

Тады яны ўгледзелі прамяністага Марка, многасьцівага і ўсюдыіснага ў залежнасьці ад варункаў, які знаходзіўся побач і зеціў дзейства ды помыслы ўдзельнікаў.

— Усё цікава, бо ідзе на карысьць, — вымавіў ён, не адрываючыся ад дружыны і ператварыўшыся ў Марыю. — Нават вашая адвалока жывіць вучэньне.

Таварышы асалапелі, асабліва Ян.

— Дык можна і… ня ўдзельнічаць? — паспрабаваў рашучасьці Янка і зіркам паказаў на калектыў.

— Нельга. Увогуле, — не сьпяшалася Марыя-Марк, перыядычна зьмяняючы аблічча. — А сумясьціць — нават карысна: не марнуецца час.

— Якім чынам, каб нічога ня страціць? — дазнаваўся адзін Ян, адчуваючы, што Гаўрыла альбо ведае і дае спрабаваць яму, альбо ўважае Марка-Марыю за вышэйшага і ўступае.

Раптоўна абастоўка пераламілася — і замест таварыства паўстаў урбаністычны пейзаж, дзе мітусіліся людзі,

жывёлы, машыны — ніхто нікому не перашкаджаў. З вышыні гэта нагадвала велізарны мурашнік. Сітуацыя зноў зьмянілася і напераменку стала выхопліваць-узбуйняць тую ці іншую постаць, твар, аб'ект, дэталі, рухі, паказваючы, што асноўны малюнак захаваўся. У нейкую хвіліну вярнулася першасная карціна, і перад спаглядам зьмясьціліся адразу дзьве выявы, якія спачатку павольна, а затым імкліва завярцеліся, дэманструючы суцэльнасьць натуры і пакідаючы ўражаньне паўсюднай прысутнасьці.

— Толькі адны набыткі! — Марк узьняў палец і пакруціў ім. — Круг нябесны таму гарант. Нічога ў ім не губляецца, не зьнікае. Асобна, цугам, побач, супольна, накрыж, прама, скрыва, плазам, старчма, пікай, вінтом, камяком — як заўгодна. Стварэньні, рэчы, працэсы, зьявы, ідэі, думкі, эмоцыі — усё. І на гэта *вам* патрэбна толькі *адно*! — і ён запытальна зірнуў на сяброў.

— Што? — разам выгукнулі яны.

— **Веды**!

Адказ ня ўразіў. Спакойна ўспрыняты, ён здаваўся простым, дакладным і разумным. І толькі затым паўстала яго недасягальная значнасьць і маштабнасьць.

Нечакана захаморылася, загулялі ўзбуджальныя настроі і зьверху, верцячы-ўсмоктваючы прастору і ўшрубоўваючыся ўніз, паімчаў віхар, які пікам увайшоў у гурт і дзіўна расшырыўся долам, як туман. Абалачыўшы ўсіх, той адразу пачаў зьбірацца-ўскручвацца ад цэнтру, аж пакуль не ўтварыў новы і ўзбагачаны ветраварот, што ўзьняўся ўжо вяршыняй угору і хутка прапаў увышы. Паўсюль разьлілася ціхая радасьць.

Нутро ўстрапянулася і паспрабавала неяк асэнсаваць ды зьмясьціць і гэтыя ашаламляльныя праісначаньні, і ўсё тое, што неабходна для пазнаньня Вышэйшага Кругавароту.

— Задачы трэба ставіць па сілах — яшчэ адно абавязковае патрабаваньне, — вярнула да рэальнасьці Марыя. — А моц — сьвядомасьць. Трэба яе настроіць так, каб — дастасоўна да вашых умоваў — можна было ўбачыць-адчуць адначасна і грамаду, і побытавы відарыс. Адсюль прыйдзе і адпаведнае ўспрыманьне. Вось тады не абавязкова прысутнічаць на якой-небудзь падзеі. Можна яе стоўпіць з чымсьці іншым.

З інтрыгавальнай усьмешкай яна зьвярнулася да Янкі:

— І відазьмяняцца можна гэткім жа кшталтам. Дастаткова падключыць розум, уваабражэньне — і ўсё працадзіць церазь сьведам'е. Атрымаецца не адразу, але спрабаваць трэба. І не бянтэжся. Для цябе я застаюся Марыляй. Ці — як пажадаеш.

Калі Марыя зьнікла, Гаўр сказаў:

— Так цудадзейнічаць могуць толькі архаты. Пакуль яны ня выявяцца, іх не пазнаеш. Калі ж каму яны адкрыліся — значыць, таму пашанцавала, бо ён ступіў на прыступку вышэй і яго ўзяў больш дасканалы кіроўца.

— То бок настаўнікаў паменела?

— Так, і гэтаму трэба толькі радавацца.

— А яны, — і Януш павярнуўся да грамады, якая працягвала абмяркацыю як ніколі нічога, — заўважылі?

— Не. Нашыя стасункі з Маркам-Марыяй працякалі ў іншай праекцыі, непрыкметнай для іх. Той варыянт, дзе мы працягваем разам зь імі актыўнічаць і шмат радзіцца, таксама існуе — сістэма шматмернасьці! Звычайна, агульны сэнс-клопат ня дзеліць карціну і мала каго адпускае насаўсім, а тут справай распараджаўся адэпт, таму насамрэч і атрымаліся вось такія вілкі-грабкі. Можаш паспрабаваць і азірнуць варыянты, толькі перадусім пашукай у галаве адпаведную хвалю.

Ян думкай скокнуў у астральны прастор, пагартаў падзеі, выбраў неабходныя па іх зьместу, значнасьці, часавапрасторавых каардынатах, вылучыў адну, знайшоў у ёй сваё мейсца, паадсейваў непатрэбныя ўражаньні ўдзельнікаў і — укульміўся.

Цікавасьць да ўсяго гэтага, як да любой мройнасьці і прадказальнасьці, выпарылася, і ён зноўку сілай мысьлі вярнуўся назад.

— Спадзяюся, мая вандроўка па адменьніках, як па аднолькавых шэрагах, не раскалытала сутнасьць рэчаў, — заключыў Янук і для пацьвярджэньня глянуў на сябрука.

— Хутчэй за ўсё, калі ёй не спадарожнічала ўдумлівасьць.

— Ат, бяры яго трасца! — махнуў рукой Янка. — Так можна і зглузьдзіць.

— Не кажы. Я таксама ад напругі губляюся, — падтрымаў яго Гаўрык.

— Няўжо *ўсё гэта* мае істотнае значэньне для мяне як для разумнага жыхара Космасу? Здаецца, мая памяць аднавілася цалкам, і я ўзгадваю, што раней такое… *кружэньне дэталяў, мізару* неяк абыходзілі. Што адбылося?

— Ты пасталеў на адно жыцьцё і розумам выйшаў на новы ўзровень. Многія — гэтаксама.

— *Працэс мяне навучыў, і я засвоіў*. **Я ведаю!** Цяпер *механізм* павінен выдаваць запатрабаваны вынік адразу, без этапаў. Навошта мне лішняя мітусяніна? Я ў ёй як сьвядома правільная істота магу заблытацца. Ці не?

— Янка! Памятаеш, што мы рабілі на зямлі, калі заняткі былі нуднымі і надакучлівымі?

— Ха! Безумоўна! Мы, лайдакі, проста зьбягалі!

— Давай і зараз так!

— Гуляйма!

— Сьвет адчуваньняў, трымайся! Да цябе йдуць сама прагныя й ненасытныя істоты!

# 7

Такой абвесткі было дастаткова, каб усе рэсурсы астралу шырока расчыніліся і запрасілі да сябе.

Адусюль, і зьверху, і зьнізу, ад усіх бакоў шчодра палілася невычэрпная энэргія, якую адчувалі хто па-сапраўднаму зажаднуў і ўсхацеў.

Летунцы не намагаліся шукаць і не пыталіся шляхоў — ім падказвалі й іх несьлі шчырыя сэрцы ды памкненьні.

З вышыні вольнага палёту, ад лёгкасьці душы бачылася ўсё багацьце наваколля, тое, чаго раней не заўважалі з-за адвалочнасьці, устурбаванасьці іншым. Атрымлівалася, што, каб паглыбеў і паясьнеў зрок, патанчэў слых і узмацнеў голас, трэба ўсяго толькі расслабіцца і аслабаніцца.

Адразу дзіўнай, уражальнай паўстала неверагодная запоўненасьць, шматлікая, разнастайная і густая населенасьць сьвету, такая, якой не выяўляла і не дэманстравала матэрыяльнае земеньне.

— Колькі рэальных доказаў, што ў Космасе няма пустэчы! — знаходзіў Янук, зыр-

каючы і направа, і налева. — Клацнуць бы па мазгах тых, хто так бязглузда і ўпарта пераконваў чалавецтва ў нейкім вакууме і ў адсутнасьці дзесьці жыцьця. Вось жа яно — паўсюль, аж дух сьпірае!

— І *такое* выступае, што любая фантазія гасьне! — падтрымліваў Гаўрусь. — Між іншым, гэтыя дзеячы недзе тут соўкаюцца. Зірнуць бы ў іх няўдольныя вочы!

— На жаль, падыход «не ўспрымаю — значыць, няма» вельмі жывучы. Шкоды ад яго — не зьлічыць! Заўваж, ён па нораву недарэкам.

— Я б змоўчыў, бо й сам грэшны, — патлумачыў Гаўрыла. — Але падштурхоўвае. Не дурасьць. *Жаданьне ладу*. Наогул і, — ён распасьцёр рукі як можна аб'ёмней, — вось тут канкрэтна. Астральны дом — невымоўны! Не ведаеш, як ён абярнецца і ўва што перакінецца наступным разам, асабліва калі эмоцыі цераз край, — заўсёды новае будаўніцтва. Ніяк не магу звыкнуцца. Намуштравалі калісьці на шыхтах, уладкаванасьці, парадку — дасюль уяўляю ўсё адно за другім, а тут — як знутры пацягнула, так і адбываецца…

— Мабыць, адтаго мы й тутака: каб не адпачываць, а працаваць далей.

— Які ты разумны! — узрадаваўся Гаўра. — Амаль што мысьляр. Мо й павадыр табе ўжо непатрэбны? І вучыць будзеш, як у Вердзе, га?

— Ня сьмейся! Я спрабую разабрацца. Праблемы заўсёды ёсьцека.

— Правільна, тым больш што настаўнік і вучань — паняткі адносныя. Жывём — вучымся, а хто ў каго — усё роўна.

Абодва былі ўпэўненыя, што назіралі адну карціну, бо паміж індывідамі ў аднолькавых умовах рэальна адбывалася злучэньне, факусаваньне поглядаў на фізычна-эмацыйна-разумовым узроўні, але насамрэч бачаньні былі рознымі, як

і іхныя ўнутраныя сьветы — усялякімі. Ім, дый усім астатнім насельнікам Космасу, гэта не перашкаджала стасавацца, дамаўляцца, яднацца і пры тым заўсёды мець нешта асабовае, інтымнае, таёмае. У матэрыяльных пластах тое выглядала зазвычай нармальна, а вось у тонкіх — праблемна з-за сваёй яўнасьці і ўсеагульнае празрыстасьці. Бясконца падарожнічаючы па Быцьці, пераходзячы ад аднаго стану да другога, чалавек, як сусьветная разумная істота, неаднойчы перажываў спалох зьменаў, трывалы арыгінал якога захоўвала толькі наўмянальная памяць, а шматлікія копіі — зыбістая помнасьць выяўленых ракурсаў (матэрыяльнага, астральнага, мэнтальнага). Так, у астрале памятаньне прыкметна ўплывала на эмоцыі, характар, паводзіны асобы, часта выклікала разгалосіцы і міжсобіцы. А яшчэ — прыводзіла да ўсё большага азмысьленьня і ўсьведамленьня былога, кантролю над сабой.

Адтаго зусім нядзіўнымі выглядалі некаторыя неўразуменьні паміж Янкам і Гаўруком, іхныя недамоўкі, намёкі. Хутка кожны адчуў няёмкасьць і няўтульнасьць становішча, неабходнасьць адасобіцца й інакш, нават самастойна, спасьцігаць сэнс існага. Янук памкнуўся звыкла апраўдацца, нешта растлумачыць, але зноў разьвесяліў сябра:

— Я ўжо ўсё зразумеў, — усьміхнуўся ён, паказваючы на ягоную аўру, якая гуляла пераменлівымі колерамі. І вакол цела самога таксама мігацела калярыстая аблямоўка.

Янка сумеўся і вінавата ўздыхнуў.

# 8

Здалёк данеслася кранальная мелодыя, якая выкананьнем нагадвала фізычныя зямныя ўмовы. Здавалася, нехта захапіў з сабой у Алірну сентыментальны музычны фрагмент Верду, настолькі ён быў непадобным на тутэйшае гучаньне. Настальгія варухнула фібры, чамусьці ўспомніўся Алесь — і Ян пацягнуўся да крыніцы.

Чым бліжэла да яе, тым усё больш унісавала душа — і на сама высокім уздыме ён нарэшце пазнаў гэтую існасьць, яе значэньне і ўдзельнікаў.

Вынікла штосьці падобнае да зямной (менавіта так увесь час карцела называць фізычныя ўмовы існаваньня), бязь сьценаў залі, што месьцілася пасярод глухмені, заваленай ламаччам і сьмецьцем і крыху аздобленай жывым шматколер'ем. Людзі сядзелі і слухалі аркестр, які пад кіравецтвам апантанага дырыжора з захапленьнем выконваў санату Яна. Абастоўка шчымліва напомніла мінулае і ўзьняла ўнутры прыемную хвалю.

Наўкола, усё ахутваючы і ўзбуджаючы, гуляла-дрыжала лёгкая павалока. Да яе цягнуліся трапяткія фантомы слухачоў, і ў зьліве гэтае радульнае марыва пакрысе накрывала краявід, пераўтварала яго, разрэджваючы ды расьцячаючы цьмяныя і брыдкія міязмы. Янук увачавідкі ўбачыў рэальную хаду музыкі і ўразіўся, як яна заўважна пераістачае сьвет.

Паступова мэтамарфозы зачаравалі, асабліва тыя, што адбываліся вонутры. Усе прысутныя нагадвалі плазьменныя сфэры, якія прыгожа зьмяняліся ад характару мелодыі. Неаднастайныя, бліскучыя, пераліўныя, зіготкія, яны разам з разумовымі выбліскамі ўтваралі незвычайную жывую сістэму, падобную да зорнай.

Але раптоўна карціна здрыганулася — і ўзьніклі іншыя матывы й успрыманьні, мінорныя, змрочныя, агідныя. Яны рашуча і нахрапна наступілі на ранейшую выяву, дзе адсунулі, дзе зьнішчылі яе, а дзе зьмяшаліся зь ёю да бяссэнсіцы. Чарговае страсяненьне — і новая, ужо лагодная камбінацыя адпрэчыла-сквітавала папярэднікаў і заваявала тую ж самую тэрыторыю. І так некалькі разоў. Істоты ад такіх спантаннасьцяў на пачатку кожнае фазы перажывалі некаторае замяшаньне-пужаньне, а затым супакойваліся і згодна прымалі ўвесь вэрхал-сызбор.

Атрымлівалася, што бальшынёю на адным мейсцы адразу былі два і больш аб'ектаў.

Ян назіраў і дзіваваў. Што гэта? І адкуль?

Наколькі ён ведаў, кожнае, нат нязначнае, дзеяньне — фізычнае, астральнае, мэнтальнае і іншае — заўсёды займала толькі для яго вызначаную пазіцыю і ў часе, і ў прасторы, у якім бы вымярэньні яно ні было, а тут — парадак парушаны.

— Адкрыцьці ідуць ад загадкі і подзіву, — прагучала за сьпінай, і Янка абярнуўся.

# 9

Перад ім была Натальля, у мінулым знакамітая паэтка, таварышка, натхняльніца і дарадчыца не адных творцаў. На зямлі яна пражыла доўгі век, і зь ёю атаясамляўся цэлы пласт культуры.

Янка ўзрадаваўся, аж ускрыкнуў і ўсім іствам памкнуўся да яе.

Яна заўважыла ягонае парываньне і спыніла:

— Не адхіляйся, а то адляціць момант, — іківам паказала на карціну. — Упэўненая, табе добра вядомая цана натхненьня.

— Ат, — Янук махнуў рукой, — тут іншае насланьнё, нанесла абы-чаго — ніяк не дапетру.

— Не, даражэнькі. Гэта і ёсьць сама высокае натханьне, толькі прыстасаванае да гэтага сьвету і да цябе.

— А адчаго столькі блытаніны і — што жудасна раздражняе — усё ў адной кучы?

— Ты зазірні ў сваю галаву. Што там робіцца? Перад тым як нешта стварыць, колькі варыянтаў выдумляе, узважвае,

адкідвае, прымае твой глузд? Куды яны дзяваюцца? Вось тут і ў такім выглядзе адкладваюцца.

— Тое зразумела. А як наконт таго, што грувасьцяцца на адным месцы?

— Тут заступае *іншы ўзровень.*

— ?

Наталья павярнула Янку да сябе, уважліва паглядзела яму ў вочы і на міг злучылася зь ім розумам. У таго нешта пстрыкнула ў мозгу, зіхатнула перад вачыма, і ён па-новаму ўбачыў сьвет: як быццам з таго, што было, спала пялёнка, і усё зрабілася намнога выразьней і празорней. Ад нечаканасьці Ян усьміхнуўся.

— Ну вось, ты празерыў яшчэ на адзін слой, — завяршыла Наталья.

Ён накіраваў погляд на былое: там замест гармідару знаходзіўся незвычайна прыгожы гмах, паверхі якога запаўнялі ранейшыя выявы, — усё бытавала-прабывала ў сіняватай засмужы, ласцы і мілагучнасьці, вылучала дагоднасьць і дабраветлівасьць.

Януш перавёў вочы на іншыя аб'екты і такжа заўважыў зьмены. Адны пабольшалі, другія паменшалі, трэція ўзьвялічыліся, чацьвёртыя зьмізарнелі, пятыя пасьвятлелі, шостыя пацямнелі, сёмыя толькі паўсталі, восьмыя зусім зьніклі; паветра расчынілася найдробнымі сваімі насельнікамі і затрымцела-загучала так, што ўсе органы, часткі цела моцна адчулі яго і канкрэтна праявіліся — і іх Ян пачаў успрымаць як самастойных істотаў, сужыўцоў, сугасподнікаў, кутнікаў.

— Я знаходжу такое, пра што зусім не здагадваўся, — губляўся ён, разглядваючы ўсялякіх стварэньняў, якія кішма кішэлі вакол, забаўляліся і бальшынёю наравілі зрабіць якое-небудзь паскудзтва. Толькі некаторыя паводзілі сябе

прыстойна, але ўсё адно ўважліва разглядвалі Яна і пільна ўзіраліся ў акружэнь. Ён заўважыў, што яны раз-пораз чымсьці маніпулявалі, і тады зьяўляліся іншыя вызьведчыкі, якія абстаўлялі выбраную істоту нейкімі рознакаляровымі энэргетычнымі прыладамі, ахутвалі імглістым воблакам, жвава і густа мітусіліся і хуценька кудысьці яе прыбіралі.

— Ну і абклалі: ніводная думка й эмоцыя не праточыцца!

— Цудоўна! Расьцеш на вачох, глыбей бачыш, — пацяшалася Натальля, таксама асочваючы паганую араву. — Такі выгляд мае нашае акружэньне, калі рухацца да аб'ектыўнасьці. А насамрэч яна запоўненая шчыльней — я ў гэтым пераканалася, ты асэнсуеш пазьней. Чужая прысутнасьць мабілізуе, не дае расслабіцца, прывучае да абачлівасьці, асьцярожнасьці.

— Ага, памнажае шпегства і даносьніцтва. Агідна ўсё гэта.

— Як быццам раней за табой ніхто і ніколі не цікаваў. Мы ўвесь час пад дазорам і зьверху, і зьнізу.

— Цяпер я разумею, адкуль бяруць пачатак спэцслужбы дый наогул усялякая набрыдзь і таемная дзейнасьць.

— Правільна мысьлюеш, але павярхоўна і злосна, — тлумачыла Натальля, прыкмеціўшы занепакоенасьць таварыша. — У матэрыяльным сьвеце гэта, можа, ганебна і подла, але ўкупе, беручы ўвесь неабдымны Космас, — не лузай вочы, абсяг ня меншы! — адлюстроўвае ўвесь стан нашага быцьця: няма аніводнае сфэры, дзе б не існавала тайба і, адпаведна, *хлусьня*! Проста на кожным узроўні — свая прывабная абгортка.

Пра падман яна сказала з асаблівым націскам і груба, каб падкрэсьліць адсутнасьць у Сусьвеце *на выяўленым узроўні* належнай праўды ды шчырасьці і наяўнасьць розных падменьнікаў, выдумак, уваабражальнасьцяў, мітаў, казак, ілюзіяў і г.д.

— Май наўвеце: я гавару ў прынцыпе, а не за ўсіх і кожнага. Часам ілжа ступае бясшкодна для таго, каб за ёю прыйшла *вялікая праўда*.

— Дык чаму верыць і наогул хто я? — устурбавана спытаў Януш.

— Толькі сваім адчуваньням, а *ты — форма*, — спакойна адказала Натальля. — Калі б гэта зразумеў кожны, усё на сьвеце было б інакш.

— І што з таго? Як бы кола ні павярнулася, кон адзін: век жыві — век вучыся.

— Добры парадак. Гуманны! Мне ён падабаецца. Дзякуючы яму любы адыёзны гад за некалькі ўвасабленьняў можа ўдасканаліцца да крывічэсьлівае асобы.

— Якой цаной? І навошта? Сэнс не праглядваецца. Калі ён вынікне? Усё гэта і ўцешна, і брыдка — вось дзе хаос! Часам розум трапляе ў такія нетры — лепш нікому не расказваць!

— Ха-ха! Не сьмяшы: усё відавочна, і наперадзе — суд, яго не мінеш.

# 10

Ян задумаўся — і вакол загулялі энэргетычныя віхары. Натальля паназірала за імі — і панадна ўсьміхнулася.

— Яньцік! У цябе сімптомы каханка.

Ягоная аўра запярэсьцілася яшчэ больш.

— Гавары! А то зазірну ў твой эмацыйны арсенал глыбей — і ўсё знайду.

— Ад цябе нічога не схаваеш — і на Зямлі такой была.

— Я заўсёды цікаўная і ўніклівая — натура такая: па-э-тыч-на-я. Да таго ж я не да канца трансфармавалася і пакуль што жанчына. Так што, Янулька, сьпяшайся, — жартаўліва падміргнула Наталка і засьмяялася.

Ён успыхнуў, і па фібрах пранеслася зачысная хваля.

— Няўрымсьлівая дзівачка! Жарсьцю ад цябе так і шугае — стрымацца б. Заўсёды ты мяне натхняла, як і многіх! Колькі нас, ачмурэлых, пабывала ля тваіх ног!

— Ведаю. На тое і нараджалася. Ну і яшчэ каб сьлічным словам, меранай мовай чараваць.

— Малайчына! Табе дадзена ўдосталь багата чаго. Але і адпрацавала ты слаўна. Адны перамогі! Шанцуе?

— Заслужыла. Янка! — пасур'ёзьнела Натальля. — А ты хоць калі думаў, адчаго ў адных многа, а ў другіх мала?

— Безумоўна. Доўга распавядаць. Лепш давай пра сябе.

— Мы будзем удваіх разважаць, бо і цябе Бог пацалаваў.

— Справа няпростая. Я ніколі не сьпяшаўся і ўсё здабываў сваімі высілкамі. Калісьці быў нягеглым, поўзаў, набіваў гузакі, але намогся, устаў і — пайшоў.

— Я і пра сябе сказала б такое, але тольма з адной розьніцай: заўсёды прагла хутчэй і лепш, адтаго, дарэчы, і пакутавала. Чаму? Тыя-сія мысьлі ёсьць. Паслухай. Як ні круці — *сусьветны парадак быў ад чагосьці адназа*, якое потым множылася, разрасталася, разьбягалася. Адляталі першыя, другія, трэція… Улоўліваеш?

— Так, то бок яны быццам бы аднолькавыя, а насамрэч — розныя, з-за ўмоваў, хай нязначных, нараджэньня: *час у кожнага свой*.

— Менавіта. З-за гэтага ў Космасе нічога няма аднакага. Атрымліваецца, што стартава, ад кону мы, першасныя манады, ужо рожныя і да кону шляхам-бегам наблізімся паасобку, у свой час, значыць — рознымі. Я лічу, што гэта — *аснова разуменьня Боскага Промыслу*.

— Згодны. Адсюль — тлумачэньне ўсяго існага, у тым ліку розных сілаў, сьветлых і цёмных. *А ты — пяршанка.* Заўсёды!

Ян прасякнуў адкрыцьцём, узьняў галаву — і ўдалячынь лынулі яго сьмелыя намыслы-надзеі. Ён нават вонкава пераўтварыўся. Натальля радасна глядзела, і адчувалася, што яна больш захапілася ім, чымся тэмай размовы.

— Якая ты, Натка, загадкавая! — заўважыў Янка. — Аж папрыгажэла!

— І ты зноўку як на далоні. Ах, памятаю твае похапы, імпэт, захопліваcьць, творы-прысьвячэньні. Шкада, што слухала іх толькі па радыё і глядзела па тэлевізіі.

— Так, апошняе жыцьцё мы правялі на розных кантынентах. І не адны злыдні вінаватыя.

— Чаму ў нас нічога не атрымлівалася?

— Мы заўсёды сустракаліся ў розным веку: ці ты — маладая, а я — стары, ці — наадварот. Памятаеш, адным разам ты нават гушкала мяне немаўлём?

— Такое не забываецца, Януль… Фатум быў заўсёды супраць нашае паважнае сутокі, злучы.

— Не, толькі на Зямлі, у фізычнай выяве. А ў тонкім сьвеце інакш: мы падыходзілі. Успомні.

— Так, сапраўды: астрал заўсёды неяк збліжае, яднае, дазваляе карыстацца ўсім назапашаным аж да новых народзінаў дый не адбірае радасьці ад гэтага, а як толькі праходзім Нулявую Сфэру, праіснячваемся — трапляем у іншы стан, зьмяняемся, губляем памяць.

— Камусьці тое трэба, і ён добра грэецца на такіх загадках. А мы — гаруем. Няўжо нельга інакш?

— Можна, але з другімі мазгамі… Янка, ды ў балота ўсе гэтыя думкі-мукі. Яны толькі абцяжарваюць нас. Давай гуляць у іншае.

# 11

І яна ўзьнялася, стала лунаць-ныраць у розныя бакі, узьнёсла-прыгожа дэклямуючы вершы. Ён глядзеў на яе зь любаценьнем — і ўзьніклі-пацяклі ад сэрца цудоўныя матывы.

Праз колькі імгненьняў у прасторы разыгралася вялікае неабдымнае прадстаўленьне. Удзельнікаў было мноства і розных на выгляд, характар, гульню, імправізацыю. Галоўныя ролі ляглі да Натальлі і Яна, якія нават не чакалі, што іхнае бажавольле выклікае такі рэзананс і зьбярэ гэткую грамаду. Адусюль відзебна і гучна сталі прыбываць, выяўляццa адразу з атмасфэры героі: акторы, музыкі, танцоры, цыркачы, машкарнікі, казачныя і фантастычныя істоты, здані і проста рухавыя абстракцыі. Кожны зь іх гуляў-граў-танчыў-дураваў адмыслова, арыгінальна, па-свойму і, здавалася, недарэчна, абсурдна, бяссэнсава, дзеля пацехі.

Ян адчуваў насычанасьць музычнымі рытмамі, творчы ўздым і прагнуў выражэньня. Як ніколі, вабіў палёт і ўзбуджала натхнень-

не, якое, разумеў, прыляцела ад вышыні, ад багатай і невычэрпнай касьмічнай сфэры ды праказалася блакітным марывам, вельмі падобным да Натальлі. Гэтае мякка кружыла вакол, зьбірала ўвадно асобныя неакрэсьленыя і сталыя згукі атачэньня, паднятыя настроі, адметныя розгаласы, багата абдавала іх лагоднай энэргіяй, апранала ў гармонію, утаймоўвала ўсялякія недарэчнасьці ды нахабную гідоту і беражліва, каб нічога не парушыць, ткала агульную мелодыю. У гэтым прыгожым танцы Янка неаднойчы бачыў радасны твар Алеся і ўздымаўся вышэй.

Амаль такі ж стан, толькі паэтычнага зьместу, апаноўваў і Натальлю. Ёй было прыемна лятаць у абсягу музыкі і гуляньня, успрымаць існасьць вострымі пачуцьцямі і ўва ўнісон вэрсіфікаваць. Вершы атрымліваліся выдатныя і разам зь мелодыяй Яна супольным бойкім ліхарствам дагодна ўзьдзейнічалі на ўсю акольнасьць.

Прыкметна зьмяніліся і ўчасьнікі відовішча: іх творчыя выразы-вытвары ад разнаякіх і трохі паасобных рабіліся ўсё больш узаемалучнымі.

У гэтым колазвароце Ян спаймаў сябе на думцы аб умоўнасьці і падманнасьці станьня. Нешта падказвала яму: усё, што адбываецца, па сутнасьці залежыць ад ягонае пазіцыі і ад думак. Ён усьміхнуўся, засяродзіўся нутром і іначай пакеміў. У выніку сапраўды атрымалася іншае, і ня толькі з-за таго, што агульны рух карэктаваў карціну. Паспрабаваў яшчэ раз — адбылося тое ж самае.

— Трэнуесься? — з паветра вынікнуў Марк-Марыя і зьвярнуўся адразу да яго. — Правільна. А то яны, — ён весела паказаў на гурму, — без нагляду могуць дурэць колькі заўгодна і так насваволяць-напракудзяць, што доўга будзеш разграбаць іхны хлуд. Га? — і паслаў жарт прыціхлай на момант кампаніі.

— Канешне, так, абавязкова, безумоўна, няма сумневу! — загалакалі-загаманілі памагатыя-спрыяльнікі. — Мы на ўсё здатныя, толькі дай нам волю!

— І я — вольная пташка, — з гонарам нагадала пра сябе Натальля. — Таксама маю свой сьвет і свае ўражаньні, ня горшыя за гэтыя. Толькі цяпер успрыманьнямі належу да цябе, Янка, адтаго падтрымліваю тваю гульню. А калі ўлічваць нашую працяглую, хоць і дзіўную, лучнасьць, дык падобных астральных відарысаў, пры жаданьні, можна напаткаць колькі заўгодна. Вельмі ўплывовы і моцны ты таварыш! — захоплена падагуліла яна.

— Ён такі! — таксама пахваліў Марк-Марыя.

— У мяне заўсёды ў галаве бедлам, — Ян акінуў позіркам акольнасьць. — І ад мінулых увасабленьняў асацыяцыі пра яго. Няёмка й прызнавацца.

— У свой час адзін вялікі мудрэц[1] вывеў універсальную аксіёму бясконцай глыбіні: *няма такога зла, якога нельга было б ужыць замест анархіі,* — пайшоў да высокага абагульненьня Марк-Марыя.

— Можа, для абсалюту яно і так, але ў нашых шэрагах бязладзіца — усяго толькі процілегласьць парадку і зусім ня зло, а характар, — разважыў Янук і запытаў войска: — Так?

— Сапраўды, анягож, акурат, іменна, якраз, — гучна падтрымалі героі.

— А мо ўсё-такі *тое*, да чаго вы пакуль не дайшлі? — хітравата кальнуў Марк-Марыя.

Усе абурыліся, зашумелі.

— На гэта магу пакрыўдзіцца і я, — прысьцерагла Натальля.

Ян, адчуваючы больш віны за сабой, патлумачыў:

---

[1] Піфагор Самоскі (570–490 гг. да н.э.) — філосаф, матэматык, містык, аўтар ідэі музыкі сфэраў.

— Ува ўсім верх бярэ нашая прырода, натура дый момант таксама. Нікога няма стоадсоткава прыстойнага альбо нягодніка, даладнага альбо баламута. І таго, і другога — сумесь. А чаго больш, заўсёды вырашае жыцьцё.

— Але, як бы ні йшло, усе мараць быць і выглядаць самавітымі, — падкрэсьліла Натальля і самадавольна адцеміла: — Які ў мяне багаты на гэта досьвед!

— То бок ацэнка *думкай* — найгалоўная? — абагуліў Марк-Марыя і прадоўжыў бытта ад сябе: — Як мысьлюю, так і існую. А ў думках пра сябе я — сама лепшы і выбітны. І ў галаве ў мяне — ніякай блытаніны, хаосу, парадак і лад. Ці ня так, Янка?

— Не зусім, але да мяне нешта не даходзіць...

Астатнія і вачавіста, і эмацыйнымі вылучэньнямі таксама паслалі неўразуменьне.

— Добра, што хоць гневу і крыўды нямашака, — заўважыў Марк-Марыя, і над ім узьняўся флюід у выглядзе прыгожай калярыстай апукі. — Значыць, успрыманьне — найспрыяльнае і вучэбную грамату можна даваць далей. *Наш розум — сама дасканалая сістэма*. Яна заўсёды працуе безупынна і бездакорна. Ніякіх збояў, хібаў, непаладкаў яна не дапускае, а ўсялякай мешаніны, сумятні, безладу — тым больш. Калі б гэтае адбывалася — навошта яна гэткая патрэбная і каму? *У Творцы браку няма*. Толькі людзі ад недасьведчанасьці і невуцтва могуць сьцьвярджаць і даказваць благое пра глузды. Усё тое, што вы так упарта прычыняеце да мазгавых парушэньняў і беспарадку, насамрэч *ілюзія*, якая вынікае ад розных умоваў знаходжаньня вашае сьвядомасьці, ад вашага акружэньня — а гэтае можа быць якім заўгодна і формаю, і зьместам на любым узроўні: матэрыяльным, астральным, мэнтальным. Для прыкладу й лепшага ўспрыманьня прыгадайце вашыя сьненьні, начныя крозы. Большасьцю яны

здаюцца блытанымі, бяссэнсавымі — і тольма з-за таго, што вы знаходзіцеся ў палоне вялікага масавага аблуду. Ніколі не дазваляйце ні сабе, ні іншым тлумачыць іх як трызьненьне, маячню, бо гэта ня так. Адказ заўсёды адзін: у сне ваш розум трапіў у адпаведнае відовішчу вымярэньне, існуе па ягоных правілах, і вы — нармальная здаровая істота.

— Колькі мы наслухаліся казак і там, і тут! — выйшаў з гурбы Данук, у мінулым — вельмі добры сьпявак, які заўсёды пакутаваў ад таго, што быў яшчэ і выдатным чалавекам. — Чарговай байкай ты, Марк-Марыя, тлуміш нашыя галовы. Па-за гэтай камедыяй, — і ён зрабіў эфектны тэатральны спокіў, — на яе пасьмяюцца і прылічаць да звар'яцелых кожнага, хто такое скажа.

— Не сьпяшайцеся з высновамі, — зноўку ўтыкнулася Натальля. — Усё-ткі мы розныя і ня ведаем, на што здатныя. А раптам мазгі спэцыяльна блытаюць нас?

— Як гэта? Яны ж свае, уласныя! — рагатнуў і нарокам схапіўся за галаву Саўка, здольны блазан і гумарыст, але з-за вострага языка часьцяком біты. — Ці яны на ўвесь сьвет?

— Вось іменна! — узрадавана запэўніў Марк-Марыя, нібыта пачуў, чаго чакаў. — Розум — адзінае, што злучае нас разам ува ўсіх часах і прасторах. Іншае — нашыя фізыка, хімія, біялёгія, псыхіка — мінучае, этапнае, уласьцівае нейкаму канкрэтнаму стану таго ж розуму. У гэтым выпадку ўсе мы — прывіднасьць, чыясьці мысьль. Памятайма: адзінае, што нас заўсёды засьцерагае ад чыіхсьці думак, капрызаў і жадобы, — гэта *незалежны квант думкі*, які кожны мае ад Бога.

— Брацьце! — ускрыкнуў Аўлас, мастак зайздроснага лёсу: яго ўвасаблялі заўсёды, калі недзе сьпялелі ўмовы для чарговага культурнага ўздыму. — Дык навошта тады высільвацца і нешта ўзрушваць! І наогул няма чаго бадзяц-

ца на той зацухмолены рэчыўны сьвет і штосьці там удасканальваць! Лепш тут дачакацца прасьвяды.

Ці тое было ўпадробку, ці насур'ёз — ніхто ня сьцяміў, бо ніякіх асаблівых выдзяленьняў ад яго ня выйшла.

— Правільна! А як з квантам? Ты здурнеў? А прынцыпы? Штойта будзе? Досыць зьдзекаў! Ня ганьбі мэту! Надакучыла лахва? — пачулася разгалосіца.

Янка ўбачыў, што некаторыя выявы і ўдзельнікі, дзякуючы супольна-індывідуальнаму энэргетычнаму ўзбуджэньню, пакідалі ягонае поле, разьбягаліся, выходзілі на самастойны ўзровень, пачыналі ствараць свае так званыя кішэнныя, бурбальныя сьветы — і ён вырашыў не замінаць ім, адпусьціць іх, даць неабходную волю кожнаму, перш-наперш у сваіх уяўленьнях.

# 12

І гэта атрымалася, бо ўсё ягонае ўвабражэньне захапіла Натальля, панадлівая ўрода якой распаляла і спакушала. Абодвух захліснула ўзаемная радасьць, а бажаньне быць разам адразу адасобіла іх ад навакольля і кудысьці выдаліла ўвесь ранейшы краявід.

Толькі Марк-Марыя знаходзіўся ў полі ўспрыманьня даўжэй. Ён зацікаўлена і ласкава назіраў за імі, пазьменна набываючы кунежлівыя вобразы то Марыі, то Марка і юрэючы. Урэшце такі ж стан пяшчоты, зачыснага тропату і хізі стаў абалачываць Натальлю і Янку.

Млеючы ад жадасьці і наталяючыся чаканьнем, яны спавольна паплылі насустрач. Калі ж апынуліся поблізь, то ня кінуліся ў абдымкі, а сталі лятаць колам, прагна і жадліва гледзячы адно на аднаго. Кружэньне і пагоня за гульнёю шалёна завіравалі ў полымі ахоцьця. Жарсьць распалілася і шугнула вялізным аднаістым агнём.

— Красачка! — апошняе, што мелася за слова ў гэтым бязьмежжы юрнась-

ці й насалоды. Усё астатняе бязмоўна залунала ў касьмічных высях, расьцячаючыся сярод усеўладнае пяшчоты, міласьці і любові.

Сусьветныя аналы па-сапраўднаму багата і маляўніча занатоўвалі здавальненьне і радасьць абодвух. Асабліва там, дзе час і прастора зьлітыя-сплеценыя ў адзіную кветку шчасьця.

Надзіва, амяга не сьпяшалася, па-ранейшаму даючы волю й сіламоц пахацімству.

Янка з Наталкай пасьля лагоднае сунегі і кволі нанава захапіліся-захацелі, але пачулі прыемны і ўладны голас:

— Досыць любадзейнічаць і множыць распусту!

Крыху пачакаўшы ў няёмкасьці, здагадаліся, што іх турбуе Марыя-Марк, і прыслухаліся.

— Зашмат браць ня варта, — яна працягвала раіць, — пашкодзіць.

— Адчаго? Няўжо? Хіба ад такой уцехі блага? — наўзахваткі дзівавалі абое і горача абдымаліся.

— Яшчэ як! Толькі людзі, аднойчы паспытаўшы грубога інтыму, аблудна бачаць у ім вяршыню і затым ачмурэла дамагаюцца яго ўсё астатняе жыцьцё. А некаторыя не спыняюцца і тут бязглузда граюць на валасянцы.

— Ну і добра: радасьць пасярод журбы!

— Устойлівая прывіднасьць.

— Як і ўсё.

— Не сьпяшайцеся, даражэнькія! — Марыя-Марк мякка і ўмільчыва перапыніла гарачых мілосьнікаў. — Не даяце распавесьці. Лепей паслухайце. Сэксуальнасьць — вялікі Божы дар. Ужо адная ейная наяўнасьць сьведчыць аб асаблівасьці носьбіта.

— Якая тут адметнасьць: усё чалавецтва трымаецца на ёй.

— І на *такой*, якую толькі што адчулі вы?

— *Такую* мы зазналі ўпершыню, — за дваіх адказаў Янук, перазірнуўшыся з Натальляй. — Але і на Зямлі адчуваньні ніколі не бываюць аднолькавымі.

— Тут прычына інакшая.

Марыя-Марк сьцішылася і ласкава-спагадліва паглядзела на каханкаў.

Шпарка, з зыкам, выклікаючы ўнутраны рэзанас і пяшчоту, прамчаў Алесь.

За гэтае імгненьне навакольле зьлёгку здрыганулася, і ад іхнага ўспрыманьня-почаву нібыта спала нейкая апаволка. Кожны тож адчуў і ўнутраныя зьмены, нязвыкла закруціўся, пацепваючыся і аглядаючы сябе, а потым жахліва схамянуўся.

Неўразумелыя погляды настаромілся на Марыю-Марка.

— Так, вы пераўтварыліся, — растлумачыла яна, — у параўнаньні зь мінулымі трансфармацыямі гэтая — значная і многага вымагае.

— Ды ведаем мы пра тое! — узбурыўся Януш, зноў выказваючыся многасьціва. — Неаднойчы праходзілі. І зараз як звычайна: плоць адсутнічае. Але няма нічога й замест, а раней было.

— Нам што, падаравалі ашаламляльны сэкс умысна, — таксама незадаволена адцеміла Натальля, — маўляў, пакарыстайцеся напоўніцу і ў апошні раз?

— Зусім не, — супакоіла Марыя-Марк. — Па-першае, уражлівае спарваньне вам далі, каб вы зьведалі яго сапраўднасьць яшчэ маючы чалавечыя магчымасьці і параўналі з тым, якім падменьнікам карыстаюцца людзі. Па-другое, вы дасягнулі больш высокага ўзроўню сэксуальнасьці і толькі крышку прыадкрылі яе блізкасьць да духоўнасьці. Дарэчы, ужо не валодаючы распазнавальнай плоцьцю.

— Хіба яна ня ўдзельнічала?

— Спачатку была, а затым пад наплывам жарсьці зьнікла. Вы гэтага не заўважылі, калі ўсмакаваліся.

— А чаму ты нам не дазволіла працягваць? — пацікавіўся Янка.

— Памятайма: калі нешта даецца звыш, яно — чыстае і высокае. Ніколі нельга яго пэцкаць, брудзіць, апаскуджваць альбо кранаць непадрыхтаваным.

— А мы такія? — няўпэўнена спытала Натальля.

Марыя-Марк адарвалася і, было відаць, сутнасна памкнулася ў іншыя сфэры, стала выклікаць спачатку цьмяныя, а потым усё больш яскравыя вобразы.

# 13

У прасторы замільгацелі карціны жыцьця Янкі і Натальлі. Яны, безумоўна, самі пра іх ведалі, але за сумятлівасьцю ня часта зьвярталіся да мінуўшчыны. Тэматыка і накіраванасьць падбору відарысаў яўна праглядвалася, але пакуль была незразумелай.

— Мы з вамі існуем у такім разрэзе Сусьвету, што карысна калі-некалі аналізаваць прошлае, каб бачыць будучае, — павучала Марыя-Марк і чакала меркаваньняў падапечных.

— Трэба жыць як набяжыць, — банальна і для адчапнога разважыў Янук, узіраючыся ў сюжэты. — Усё наканавана і вызначана, а нашая роля — толькі ісьці.

— І выбіраць: куды, дзе вальней, — быццам між іншым удакладніла Натальля, тож захопленая відовішчам.

— А навошта? — паддражнівала Марыя-Марк. — Усё адно ж.

— Не, адчуваньні розныя, — аўтаматычна пярэчыў Янка, — а для сьвядомасьці гэта ох як важна.

— І толькі? — яшчэ больш пад'юджвала Марыя-Марк.

— Ня хочацца быць апошнім, — Натальля адвяла пагляд і ўдумліва дакончыла: — Характар у мяне такі: заўсёды жадаю быць першай і лепшай. Часам гузакі набіваю з-за гэтага, пакутую, але ад свайго не адмаўляюся. Я зразумела гэтае кіно, — і яна зноў вярнулася да відовішча. — Так, мой выбар даўні і вызначальны. Ну і апантаная ж я! Дзеля першасьці ў прыгажосьці адмовілася ад многага, што зь ёю злучана, і атрымала чаго й не чакала.

— Так, замест хады ты пабегла па этапах, парушаючы пасьлядоўнасьць, заканамернасьць і момантамі гвалтуючы сьведам'е, хоць досьведу брала шмат, — больш абагуліла Марыя-Марк.

— Божухна! — скрушна ўзмаліўся Януш і перажагнаўся. — Ухавай нас! Вось дзе адгадка! Цяпер да мяне дайшло, адчаго так недарэчна перакрыжоўваліся нашыя зямныя ўвасабленьні, — але праз момант нанава запытаў: — Тады чаму ў астрале нам так ручыць і шчасьціць?

І разам з Натальляй ён зьвярнуўся да Марыі-Марка.

— Адтаго што гэта іншы сьвет, і тут іншыя парадкі, — растлумачыла тая. — Абавязкі тычыліся толькі фізычнага ўцелаішчаньня.

— Дык, можа, нам наагул больш не нараджацца *там*? — жартоўна выдала Натальля і засьмяялася. — Будзем гуляць і піць асалоду *тут*. І нішто нам не перашкодзіць! Мы — такая добрая пара для песьняў і каханьня!

І яны весела закружлялі ў прасторы.

— Марныя спадзевы, — асадзіла і засмуціла іх Марыя-Марк. — Рана. Вам яшчэ трэба схадзіць на Зямлю некалькі разоў, каб адпрацаваць сваю карму — можа, ад гэтага што-небудзь абнадзейлівае і выйдзе.

— А хіба бывае іначай? — устрывожылася Натальля.

— Па-рознаму. Матэрыяльны сьвет трымаецца на фізычных справах, а пачуцьці і думкі — дадатак да яго, хоць і істотны. Вось і мяркуйце, як усё гэта ўжыць з карысьцю. Удасканальваньне — нялёгкі шлях. Менш падманвайце — і толк будзе. Між іншым, пакуль мы з вамі *тут* балакалі, *там* прайшло ўжо некалькі гадоў, і абставіны зьмяніліся. Час няўмольны і любіць, каб яго шанавалі. Паўтараю: такі зрэз Сусьвету.

— Нам сьпяшацца і ляцець да Нулявога Цыклу? — заклапочана мовіў Янка.

— Зусім не, — заспакоіла Марыя-Марк. — Пагойсайце яшчэ колькі тутака. Ад астралу таксама трэба нешта ж браць.

Яна разрэдзілася і прапала.

# 14

Навокал павісла неакрэсьленасьць.

— Янка! А табе карціць зноў ісьці *туды*?

— Вялікай цягі няма, але ж дарабіць нешта трэба.

— Што менавіта?

— Мяне яшчэ на Зямлі пачала даймаць мысьль: а ці льга стварыць такі твор, каб узрушыць усё чалавецтва і перайначыць яго на іншы, лепшы лад? І зараз яна не пакідае.

— Апошнім часам я таксама нешта падобнае думаю, але не злучаю гэта з чарговым і абавязковым паходам да людзей. Шчыра: абрыдзеў мне гэты род.

— Тут можна тож тварыць, і пэўна нават плёньней, чымся там, але я прагну пачуць тое, што вось тут трапеча, — і Янук прыклаў далонь да сэрца, — на зямных музычных інструментах і паказаць усім, што нябёсныя мелодыі можна здабываць і на іх. І для людзей.

— Крывічэсьліва. Я ж адчуваю, што прайшла гэты этап.

— Дык навошта тады Марыя-Марк казала пра неабходнасьць новых трансфармацыяў?

— Увасабленьні адбываюцца і зь іншымі мэтамі. Ты ж бачыў, што я нагарэзавала.

— Дык мы можам і не сустрэцца?

— На дадзены момант адказу няма: мы ж не гаспадары свайго лёсу. Давай трохі пашнарым — ану заўважаць нас ды паклапацяцца.

Выразна, на ўвесь прасьцяг, з лагодаю выніклі блакітныя вочы Алеся і цераз міг растварыліся.

Унутраны штуршок кінуў каханкаў у розныя бакі. Яны не супраціўляліся, бо ўсё больш пераконваліся, што лепей слухацца, чым артачыцца.

# 15

Дагэтуль Яна тарнавалі і ўзбуджалі звонку. Ён толькі адгукаўся і незалежна амаль нічога не пачынаў. Цяпер у ім разгаралася самаістасьць, воля.

Распусьціцца-разьліцца да акіяну эмоцыяў было прасьцей — што і адбывалася заўсёды на пачатку чарговага вяртаньня ў тонкі сьвет, калі адчуваньні цалкам выслабаняліся. Але разьліў паступова менеў у адпаведнасьці з ростам разумовай практыкі істоты — гэты працэс вызначаў узровень яе сталеньня, мудрасьці і гатоўнасьці да новых інкарнацыяў. Пабуджэньне да канкрэтных дзеяньняў звычайна ішло сызнутры і, як правіла, было глыбока ўсьвядомленым.

Януш адчуваў сігналы да руху, да свабоднага, самаведнага пошуку і неабходнасьць удумленьня.

Ён ведаў шматзначнасьць і неабдымнасьць астралу. Бяз добрай *спокмеўкі* ў ім лёгка заблудзіцца. У Янкі *такая* была — *гукавая* — і заўсёды вяла па сама неабходных мясьцінах. Калісьці ён меркаваў, што *яна* — усіхная асаблівасьць, але рэальнась-

ць пераканала ў выбранасьці: ня кожны мае Божы дар, і геніі агулам не нараджаюцца. Таму на нейкім этапе галоўнае — адчуць сваё прызначэньне. А калі злавіў імгненьне, пазнаў свой час — ідзі па максімальнай рэалізацыі, не саступай і не спакушайся. Засядлай характар вольніка і змагара!

Мала хто валодаў абсалютнай здатнасьцю чуць, як адметна гучыць, **голсчыць**, зычыць усё ў Сусьвеце, якія непаўторныя мелодыі ліюцца ад касьмічнае творчасьці і будаўніцтва. Янук быў у іх ліку — канчаткова ён зразумеў гэта ў астрале, калі Тварэньне паўстала як Шчытны Велічны Гук.

І было тое даўно: само яго ўспрыманьне спачатку напалохала, але пасьля тлумачэньняў Марыі заспакоіла. І ўсё адно ўстрывожанасьць засталася: пакуль за чалавека вырашаюць, датуль ён у запалоне.

— Не турбуйся: з табою ўсё нармальна, — гукала тады настаўніца. — У цябе шыбкая і адэкватная рэакцыя, адтаго тваё пазнаньне сьвету ідзе шыбчэй, чымся ў іншых. А гэта значыць: ты здольны да больш тонкіх энэргіяў, асабліва гукавога кшталту. Усё ў Космасе, акрамя іншых якасьцяў, выражае зычную істасьць Стваральніка, мае свой вызгук, **голск**, зьвяк і танальнасьць — разнастайнае, непаўторнае. А існуе ня сьцісла, мігам, момантна, а бясконца розгаласам, водгульлем, рэзанасам, якія працінаюць усе слаі прасторы і часу, узбагачаючы чутнасьць і **голскасьць**. Гукавое, рэсткае ўзьдзеяньне на твае пачуцьці, думкі будзе ўзрастаць — і ўрэшце ты адчуеш гучаньне сама высокага сэнсу.

Так і адбылося: да яго прыйшла музыка, і ён стаў кампазытарам.

Спатрэбілася шмат энэргіі, каб разабрацца ў мностве зычных ініцыяцыяў, вылучыць свае і набыць непаўторны гарманічны выгляд. У выніку, адсейваючы любое насланьнё какафоніі, ён аддаў перавагу мэлядычнасьці і нотам. Але

настырная брыдасьць, як неўміручая касьмічная зьява, не пакідала яго і не-не ды ўмешвалася ў творчы працэс, скарыстоўваючы любыя пралазы. Ведаючы, што зьнішчыць яе зусім нельга, Ян, тым ня менш, бараніўся, чысьціўся і рабіў усё, каб бязладзьдзе не кранала ягоныя творы.

Знаходзячыся ў пошуку, ён зьвярнуў увагу на мноства пакутніцкіх галасоў аднае прычыны. Засяродзіцца і сканцэнтравацца на іх было няцяжка, бо гуд распаўсюджваўся лакальна, густа і безупынна.

# 16

Як толькі край паўстаў зусім блізка і выразьней намаляваўся ягоны выгляд, Януш распасьцёрся ўсім сваім духам і адразу адчуў родныя матывы, тое, што адклалася ў душы за многія фізычныя ўвасабленьні, і ўбачыў канкрэтныя постаці.

Яны таксама заўважылі яго. Але агульнай радасьці ад іх ня йшло. Упераменку пульсавалі незадаволенасьць, гнеў, злосьць. Устойліва калыхаліся шматлікія перагуды, разнастайная зайдрасьць. І дзе-нідзе ўспырхвалі шчырыя подзіў ды захапленьне. То бок усё казала аб звычайнай бытавой нядолі, неўладкаванасьці, духоўнай галечы.

Янук ведаў гэты цяжкі жыцьцёвы настрой ад старых часоў і заўсёды перажываў за яго, а, імкнучыся дапамагчы яму, калі-кольвечы нават неўпрыкметку мімікраваў і ўнісаваў зь ім.

Вобраз Алеся зрабіў у вышыні колькі скокаў туды-назад і трохі паскавытаў.

— Прыцягнуўся наш блудны сын.

— Які самавіты! Хто ты зараз?

— Брацейка!

— Сёстрынька!

— Дзе ты ўсё бадзяесься? Ці знайшоў што? Скрыпачка паспрыяла?

— Бацькава доба.

— Ага, такі ж валацуга і распусьнік.

— Бусайла і галуза.

— Ах, які файны спакусьнік! Хадзі зноў да мяне.

— Любка мой, даражэнькі! Успомні сваю Еўку. Ад полацкага часу мы з табой не ўвасабляліся разам. Калі ж тое надарыцца? Богу малюся штохвілінна.

— Чаго піхаесься, настырная! Тваё прайшло. Мы зь ім у Сапегаў працавалі. Ох, і любіліся!

— Не трасіце старызнай. Так, як мы зь ім па-шляхецку сьпявалі і танчылі, ніхто ня можа. Дай буську сваёй каханцы!

— Прэч, бязулі! Шмат тут вас такіх, пустых і прагных, назьбіралася. Усіх і ня ўпомніш. Ня слухай іх, Януль, а то назад у багну завалакуць.

— Няма чаго з намі гора цягаць. Мы самі ўжо даўно пазіраем па баках.

— Правільна тады зрабіў, што пайшоў адсюль. Хоць адзін чагосьці дамогся. Праславіў нас. Сьвет і зараз пра цябе гаворыць.

— Ну і што з таго? Нам карысьць якая? Ад музыкі тольма галаўны боль. На зямельцы трэба сядзець. Араць, сеяць.

— Ён так засявае, што і сябе, і іншых добра корміць.

— Больш чужых. Жук і жаба ўсё хапаюць. А мы што маем? Трасцу!

— А слава ягоная? Адна ты колькі спажыла ўвагі, пашаны і гонару, я ўжо не кажу пра матэрыяльныя выгоды. Дый галава твая дурная крыху паднялася. Здабыла б ты тут пры-

стойнае аблічча, калі б ня ён? Глядзіш: лепшую долю атрымаеш у наступнае нараджэньне.

— Усё тое — казала-мазала. Я дык пэўна зноў буду падбіраць.

— Гэта адчаго ж?

— А як бытта ня відна!? Усё сьцялюся нізам ды падскокваю, а ён вунь як спрытна лятае. Дый ты таксама не па-хвацку пырхаеш.

— Адтаго што мы хворыя. Мазгі лячыць належыцца. Не пляткарыць, не абмаўляць, цяміць спраўна.

— Безумоўна, гэта важна. Але я, братка, вось што табе гукну: брахаць трэба менш, а калі можна — дык і наогул ня хлусіць.

— Не сьмяшы: дзе гэта ты такое бачыў, каб хтосьці ды не зманіў? Махлююць ды гаўкаюць усе — на гэтым сьвет трымаецца. Нават тут. Колькі да нас прылятала розных апекуноў ды спавесьнікаў? І што? Хто-небудзь зь іх пэўна адказаў нам, чаго адбываецца так, а ня гэтак? Маўляў, тое ня вашага клёку справа, паразумнееце — вам адчыніцца. А пакуль — тайба. Вось дзе вытанчаны ўніверсальны зман: дурням — дурное, разумным — разумнае, а хто канкрэтна які — таксама сакрэт!

— Зноў ты за сваю таёмасьць узяўся. Сапраўды, калі ўзьнікаюць такія пытаньні, значыць, чалавек, дый астралец тож, недасканалы і павінен вучыцца, то бок разумнець — і ніякай тайны тут нямашака. Адно — невуцтва.

— А мне здаецца, што лжа бывае сьвятой і грэшнай. Дзеля вялікай справы часам трэба і схітрыць, падмануць.

— Вось гэта — найвелізарны аблуд. Брахлівасьці наогул не павінна быць **а-ні-дзе**! Інакш нічога нармальнага ніколі не атрымаецца. Мы — таго прыклад.

— Наш дамарослы філосаф-лапатнік зноў блукае ў нетрах і нас туды цягне. Досыць! Разважаць — грашыць.

Трэба проста добра выконваць тое, што прызначана, — і ўсё. Так, Янка?

Упершыню да яго зьвярнуліся, і ад такое нечаканасьці госьць зьбянтэжыўся, вылучыўшы цэлы шлей разгубленасьці і няёмкасьці: ад стасункаў зь імі ён адвык.

— Каб жа ведаць сваю задачу! — хтосьці адказаў за яго і вызначыў: — Калі актор ня знае ролі, яму ня мейсца на сцэне. Значыць, мы не артысты.

— Не хвалюйце кампазытара сваімі прымітывамі. Яму з намі няўтульна. Бачыце, як сумеўся.

— Дык чаго ён тады тут?

— Сапраўды, распавядзі, Януль.

# 17

— Можа, я вас залішне ўстурбаваў. Прабачце, — перадужваючы хваляваньне, пачаў Ян. — Я пачуў роднасныя галасы і паляцеў да іх. Прызнацца, не разьлічваў на такую сустрэчу, асабліва на размову пра сэнс жыцьця.

— Ты думаеш, мы ня здатныя гэтак разважаць?

— Не, я пераканаўся: хоць мала чаго зьмянілася, але вы вырасьлі. Там, у маёй сфэры, мяркуюць інакш.

— Часьцей бы адтуль спускаліся.

— Ага, трапілі ў эмпірэі і лічаць, што наніз ужо ня варта: хай самі караскаюцца.

— Банальна, але ўсе мы — браты.

— Адсюль гэта бачыцца іначай, і рэчы, транты ўсялякія ўжо ня маюць аніякага значэньня. Душа сьвеціцца выразьней.

— Адразу відаць, хто ёсьць хто.

— Адтаго і разьдзяліліся па інтарэсах, схільнасьцях. Зірні, колькі тут розных групаў. Такіх, што на зямлі і ўявіць немагчыма. Істоты, якія там і не страчаліся, тут пацягнуліся-зблізіліся і пакрысе

прыстасаваліся да нязвыклых адносінаў. Нават ворагі знайшлі нешта агульнае і з дабром пайшлі насустрач.

— Ат, не перабольшвай, ня ўсе. Некаторыя жылі як сабака з кошкаю, так і працягваюць сварыцца. А вунь суседзі: на зямлі былі бытта бы адной сям'ёй, а тут адразу разьбегліся, ненавідзяць і нат не глядзяць адно на аднаго.

— У астрале разумееш, чаго так адбываецца. Многае расхінаецца.

— А як дзіўна перакручваюцца асабістыя ўспрыманьні. Там нешта рабіў, думаў: каштоўнае, годнае, а тут яно атрымалася пустэчай. Альбо асаблівую вагу раптам набыло дзеяньне, якое раней здавалася ніякім. Колькі такіх, хто сам за сабой не прыкмячаў якіхсьці асаблівасьцяў, а тут знайшоў іх, і яны яму не спадабаліся. Часьцяком крыўдна, як усе ўбачылі, хто ты насамрэч. І наадварот, прыемна паўстаць у нечаканай ролі дабрака й набытчыка.

— А ўсё ад таго, што меркі розныя. Абдурваюць нас.

— Жудасна, што, калі нанава нараджаесься, то многае ад тут атрыманага і ўсьвядомленага забываецца і губляецца. Камусьці ж гэта патрэбна.

— А ўвогуле, у гэтых падарожжах ёсьць свой цымус, і я задаволены, што так адбываецца.

— Мне не падабаецца. Я б жадаў увесь час быць чалавекам — так хоць галава ўвішней працуе і вопыту больш.

— А мне абрыдла шнарыць туды-сюды. Карціць новае.

# 18

Спачатку Ян, а потым астатнія адчулі ў навакольлі нязвычны спогалас, а затым — напружаньне.

Усе завалваваліся і, як па камандзе, кінуліся ўрассыпную.

— А ты чаго не бяжыш? Ня можаш? — рэхам прагучаў грамавіты бас.

— Нагоды няма, — са спакойнай цікавасьцю адказаў Янук.

— Зараз будзе.

Ураз усё зьмянілася. На зямлі гэта звалі бураю і казалі «сьвету белага не відаць». Тут было тое ж самае, толькі замест прадметаў круціліся-вярцеліся фантомы і віхурылі эмоцыі. Калі там націск стыхіі яшчэ стрымлівалі розныя перапоны-перашкоды, то тут абыклых замінак не існавала. Ураган праціnaў усіх да атамаў, а мо і драбней. Гаротныя згіналіся ніцма і ў розныя бакі, выцягваліся-сьціскаліся, дэфармаваліся да вычварных формаў, несьліся кулём, а калі і чапляліся за нешта, дык толькі адно за аднаго. Некаторыя, ужо маючы досьвед, абдымаліся,

зьбіраліся ў купкі — і такім чынам крыху процістаялі негавілі, але ўсё адно зазнавалі прамое балючае ўзьдзеяньне на пачуцьцёвыя цэнтры. Гукавое суправаджэньне гэтай ліхатні было какафанічным і адлюстроўвала неверагодную ўсіхную немарасьць ды гора. «Сапраўды, бяда ніколі не нараджае гармоніі», — падумаў Янук.

Ён заўважыў усяго некалькі астральцаў-стоікаў, якія годна супраціўляліся і змагаліся. А яго навала не кранула зусім.

— Не паддаесься, значыць, ты зь іншага легіёну, — вынайшаў той жа ўладны голас. — І які ў цябе інтарэс да гэтых недалугаў?

— Бачу, табе падабаецца нявечыць безабаронных, — гнеўна адказаў Ян і павярнуўся наўкол, шукаючы злыдня.

— Дарма намагаесься.

— Хто ты?

— Дух мейсца.

— Чаму ты такі злы?

— Ня толькі. Я — усялякі і справядлівы.

— Да болю трэсьці — справядлівасьць?

— Болю і скалынаньня няма. Ёсьць навучаньне і мэтады.

— А ўспрыманьне?

— Ілюзія, якая ад галавы. Цябе ж не шкуматала.

— Я ня туташні.

— Розумам і навыкамі, а паходжаньнем адсюль.

— Але, мы калісьці пачыналі разам. Сэрцам я зь імі і шкадую іх.

— І я люблю. Усіх. Цябе таксама. Вы ўсе — мае.

— Карацей, ты маці і бацька ў адной асобе.

— Лічыце так. Хоць насамрэч па-іншаму. Бліжэй за мяне ў кожнага з вас нікога няма.

— Значыць, трэба слухацца і — **ведаць**?

— Так.

— Яны гэта разумеюць!

— Безумоўна. Але кожны па-свойму. Вось толькі не сьпяшаюцца.

— Ім трэба дапамагчы.

— А я што раблю? Толькі дагодней, калі працуеш **сам**. І бальшынёю там — на зямлі, у матэрыі.

— Дык яны ж кажуць, што, як толькі ўвасабляюцца, у іх адбіраецца ранейшая памяць. Дый са мною заўсёды так было.

— Увогуле гэта зроблена з мэтаю, каб не памнажаць бруд і анархію. Табе знаёма, што можа наварочаць недасканасьць, калі ёй даць бязь меры. Сьвежы розум, то бок немаўляці, пры новым нараджэньні атрымлівае магчымасьць пачаць быццам бы ад нуля і шляхам выхаваньня, навукі атрымаць дастатковыя веды і правільныя арыентыры. Ты пераканаўся, што на зямлі іх удосталь. Набіраючыся досьведу, чалавек удасканальваецца і паляпшае сваю карму. Побач заўсёды настаўнікі, бачныя і таёмыя. Яны дапамагаюць рабіць выбар. А галоўнае — кожны нясе ўнутры голас Божы. Яго трэба чуць і слухацца.

— Ідэальна так, а на практыцы інак.

— Ня будзьма паглыбляцца. Жыцьцё шматплянавае, але, што б ні адбывалася, заўсёды трэба **вучыцца**.

— А як мне цяпер ім тлумачыць хоць што-небудзь?

— Я ніколі гэтага не раблю, а дзейнічаю. І жорстка, і лагодна. Яны адчуваюць, мысьлююць-мяркуюць і прымаюць. Бо ўпэўненыя: *я ведаю і навучаю*.

— Мабыць, з вышыні прасьцей. А я — такое ж стварэньне, як і яны.

— Ты пайшоў далей іх. Яны да цябе прыслухоўваюцца, вераць. А *вера — сама лепшы будаўнічы матэрыял Сусьвету*. Толькі не падманвай і не бяры больш за тое, на што здатны.

# 19

Народ агоўтаўся і зь цікавасьцю назіраў за дачыненьнямі Януша і Духа. Выглядала ўсё дзіўна: кампазытар відзебна знаходзіўся пасярод і, высока падняўшы галаву, выразна ўважаў таго ўплыву, які ліўся на яго цераз голас, пачуцьці, думкі. У залежнасьці ад сутнасьці ўмусту астральнае цела прынятчыка зьмяняла формы, пярэсьцілася і тонка зычэла.

Зьнекуль насунулася агромністая здань і накрыла ўсіх панурасьцю. Па абрысах Ян пазнаў Алеся і напружыўся. Крыху павагаўшыся, прывід зьнік.

Нехта ўкленчыў першым, і за ім пачалі клякаць ды паўзьці да Яна астатнія, ускрыкваючы на ўсе лады:

— Настаўнік, прарок, архат!!! Зьлітуйся! Духоўніцы!

— Досыць! Апамятайцеся! — надзвычай гучна заклікаў Ян, ухіляючыся запальчывых гарапякаў і забыўшыся на палёт.

— Па нораву шыхтуйся! — прагрымеў Дух, бліснуўшы маланьняй, і бедакі замітусіліся-зазьбіраліся ў чароды. — Калі масава чмурэюць, толькі так зь імі.

Гэтая пертурбацыя прайшла досыць хутка і беспраблемна — мабыць, адбывалася ня першы раз. За відочным мітусеньнем праглядваліся парадак і зладжанасьць. Адчувалася, што кожны ведаў сваё месца. І ўсё адно ў агульным зборы Ян заўважыў асобныя зычныя індывідуальныя матывы-настроі, якія маглі сьведчыць пра няпросты характар душаў.

— Так, яны зусім ня быдла, за якое іх лічаць некаторыя на зямлі, — агучыў ягоныя думкі Дух. — Патэнцыяльна моцныя. Але любяць спаць, цяжка абуджаюцца і палохаюцца навізны, часам вымагаюць непапулярных мераў.

— Дзе-дзе, а *тут* становішча і лёс вельмі выразныя, відавочныя — назірай і кіруйся! — адзначыў Ян. — Каб займець, ня трэба шмат і высільвацца. Па сабе ведаю, як прагна ўсочваў усё неабходнае.

— Калі падрыхтаваны, а калі не?

— Мы ж нешта кажам-паказваем-радзім, увогуле — навучаем. Значыць, *даём*.

— А яны не бяруць, дакладней — ня могуць узяць. Глеба неўзараная, хоць і ўрадлівая, — гэта ня столькі вобраз, колькі рэальнасьць ад зямлі. Каб штосьці вырасла, трэба *фізычна* папрацаваць. Для таго ўсе вы і выпраўляецеся туды. Калі пласт ускопаны-ўспушаны, угноены, паліты — кідай любое зерне, і адсюль, з астралу, таксама, — і ўсё прарасьце: бульба, яблыкі, ружы, думкі, ідэі.

— Ці бо: датуль, пакуль матэрыя не пераўтворыцца ад рукі чалавечае, не прасьвятлее, не патанчэе, няма чаго і думаць пра іншыя ўзыходныя шляхі. Тым больш пакуль яны закрытыя і недасяжныя.

— Прыкметна, ты ладна ўзяў, разумееш працэс. Так, звыродзьдзя, то бок скрыўленьня-скажэньня-ігнараваньня этапаў разьвіцьця, прырода не прымае ні ў якім выпадку, а калі хтосьці усё-такі намерваецца-намагаецца — жорстка помсьціць.

— У гэтым я добра пераканаўся, да гаркаты.

— Ты зразумеў, вынес урок — і пайшоў далей. А бальшыня так і засталася часаць патыліцу альбо проста лыпаць вачыма. Жудка, калі так паводзяць сябе кіроўцы.

Тубыльцы напачатку сачылі за размовай, прыслухоўваліся, ніяк не рэагавалі, а потым сталі губляць да яе цікавасьць, адварочвацца і спакваля чымсьці займацца. Вышэйшае і ўсё не датычнае да асабістага іх не хвалявала.

— Яны пераключыліся на свае справы, і даймаць я іх пакуль ня буду, — абагуліў Дух і параіў: — Затое даю волю табе. Ты можаш паназіраць за імі ў адмысловым ракурсе — гука-музычным. Астатнія сфэры чапаць ня варта: зоймуцца іншыя, а табе бліжэй іменна такая задача. Якраз узбагаціш творчыя набыткі і свае, і агульныя. Абяцаю садзейнічаць. Бачу, ёсьць пытаньні.

— Так, ты валадарыш толькі ў астрале ці яшчэ дзе?

— Я дзею як Боскі пасланец ува ўсёй мэтагістарычнай пэрспэктыве касьмічнай краіны пад назовам **Ліцьвінія** — фізычнай, астральнай, мэнтальнай, духоўнай, празарнацыйнай, чалавечай, дэманічнай і г.д. Зараз ты мяне ўспрымаеш на астральным узроўні. Я не паўсюль прысутнічаю выглядам, успрынятна, а толькі там, дзе ёсьць неабходнасьць. Але мяне адчуваюць усе, яўна альбо спадумна, і мая ўлада бесьпярэчная, няпрыкасная.

Апошняе прамаўлялася толькі Яну. Астатнія ўспрымалі адно ягоную вонкавую ўзбуджанасьць і, захопленыя сваім, зрэдзь абменьваліся выразнымі глядамі як рэакцыяй на бачанае.

Усё гучала, сьпявала, мела сваю артаэпію. Сьвядома ўключыўшы абсалютны слых і кіруючыся натханьнем, Ян стаў адчуваць гукавую палітру навакольля да драбніцаў. Але, на зьдзіўленьне, многага спачатку не разумеў, асабліва прыналежнасьць некаторых згукаў.

«Мала практыкі», — вырашыў ён і паляцеў, гойсаючы ўздоўж і ўпоперак. Сапраўды, зычэньне пакрысе стала маляваць больш канкрэтных вобразаў.

# 20

Ліцьвінія тонкага сьвету, як падказвала зрокавая памяць, многім нагадвала фізычную, зямную, але, дзякуючы паіначаным уяўленьням Януша, абастоўка ад звыкла відоўнай паступенна пераходзіла на гукавую, большасьцю невядомую. У выніку знаёмыя астральныя карціны набывалі выключна зычную форму, ад чаго праісначваліся да непазнавальнасьці. Хоць і багаты на фантазію, Ян толькі апасьля прывыкнуў да ўразьлівых галасавых мэтамарфозаў, у ліку якіх ледзь пазнаў Алеся, дый то калі той сумысна вылучыўся з касьмічнага хору цудоўным напевам.

Звычайная відовішчная асаблівасьць зьявы, працэсу, прадмету заставалася нязьменнай доўга, а вось гукавая — вагалася штохвілінна і так нечакана, выкрутасіста, загадкава, што сьведам'е гублялася ў вызначэньнях. Побач з гэтым было мноства аб'ектаў, якія мелі пастаянны характэрны гуд.

Ян нават прыпыніўся, калі стаў асэнсоўваць, усякаць маштабы несуцішнага хору,

які ўтварала ў Космасе толькі адна краіна. На нейкі момант ён зьніякавеў і не паверыў у свае магчымасьці: ніякага таленту ў яго няма, адно дамаробства. Галава трашчала і мусіла раскалоцца.

— Не сьпяшайся і не траўмуй сябе, — папярэджваў знаёмы голас. — Чуваць — ужо дар. Іншыя і гэтага не атрымліваюць. А табе дадзена яшчэ і зразумець пачутае. Не расплюхай! Цям! Спачатку ўздыхні.

Падказаць проста! А зрабіць? Лёгкіх жа няма, як і паветра. І раптам яго таўхнула: ён ніколі раней не задумваўся, чым жыве тут і наогул якога сэнсу органы новага аблічча. Цяпер Ян уважліва зірнуў на сябе.

Цела эфірнае, празрыстае, зьменьлівае ў залежнасьці ад настрою і думак.

Вянчае яго не чалавечая галава, а вялікая рухавая апука з пазнакамі роту, носу, вачэй, вушэй больш дзеля эстэтычнага кшталту, чымся для практычнай неабходнасьці. Паступова з аблічча яны сыходзілі ўвогуле і нейк незаўважна, мабыць, у выніку туташняга пачуцьцёвага дасьведчаньня. На твары заставаліся рысачкі, якія адзначалі ўнутраны сьвет, характар, эмоцыі, думкі, намеры і дазвалялі прыцягвацца адно да аднаго, мець дачыненьні. Прыгожага ці брыдкага астральца бачылі іменна па такіх рысках і своеасаблівых метках на постаці.

Канечнасьці прывідныя й аморфныя. Трансфармуюццаперарабляюцца-прыстасоўваюцца да акружэні і выконваюць ролю дапаможніка пры ўзаемадзеяньні цела з вонкавасьцю. Яны павялічваюцца, зьмяншаюцца, зьнікаюць, зьяўляюцца, злучаюцца, камбінуюцца і выконваюць іншыя фізічныя, эмацыйныя і разумовыя дзеяньні адпаведна таго, чаго пажадае істота. Рэакцыя як імгненная, так і павольная зноўтакі па натхненьні.

На скронях зьзяюць быццам бы пяшчотна-блакітныя цьяткі — прыкметы духоўнага слыху.

Лоб здаецца ўпрыгожаным зіхацелым каменем — адзнакай духоўнага зроку. У кожнага ён свайго колеру і памеру.

Унутраныя зьмены нябачныя, але адчувальныя. Ян ведаў, што мозг захоўвае надзвычай важнае — орган глыбіннай памяці.

Усё, раней прыстасаванае да харчаваньня і размнажэньня, скасаванае альбо карэнным чынам адаптаванае да новых мэтаў.

Замест натуральна-матэрыяльнага паяданьня вобразнаўяўнае энэргетычнае паглынаньне, нагадваючае акт дыханьня і папаўненьня жыцьцёвых сілаў вылучэньнямі стыхіяляў.

Досьвед спараваньня, сэксу пакінуў у Яна асалоду. Але знацьцё ўсяго працэсу размнажэньня ў тонкім сьвеце выклікала вялікую гаму адчуваньняў. Асабліва ўразілі спосабы: альбо своеасаблівае прыемнае разумова-эмацыянальнае саманапружаньне аднаго індывіду, альбо дзіўна-салодаснае злучэньне двух і болей. Былі і такія, хто дзеля нашчадзі ішлі на самаахвяры.

Уся гэтая інфармацыйная плынь неслася ў сьвядомасьць Яна хутка, бурна і ўмеркавана, як вытвар скразнога зечаньня і праніклівага слуханьня ўласнага нутра.

# 21

Калі ён прыгледзеўся, то знайшоў істотныя адрозьненьні сваёй істоты ад тутэйшых. Акрамя інтэлектуальных, эмацыйных, творчых асаблівасьцяў найбольш выдавалася індывідуальнасьць, самастойнасьць і, безумоўна, зьнешнасьць.

Аселыя таксама заўважалі гэта і з асаблівай пачцівасьцю ставіліся да Яна, хоць ад многіх падвейвала зайздрасьцю і нянавісьцю. Гучаньнем тое было з аднаго боку спакойным, умераным, з другога — непрыемным і раздражняльным.

Асабліва балючымі і колкімі ішлі сігналы ад спагудных, зласьлівых стварэньняў, не падобных уродаю да большасьці.

Ян і ў мінулым сустракаўся зь імі, ведаў іхняе іство, памятаў, як кручана і недарэчна яны могуць падкаціцца, каб спажыць нешта для сябе. Яму раілі быць далей ад іх, але астральны сьвет, наадварот, сваімі ўмовамі садзейнічаў сустрэчам, няхай і прыкрым: чым дабрэй была істота, тым больш усялякай гідасьці і здыхляцьця мітусілася вакол яе, каб пажыраваць на дурніцу.

— Янка, няўжо запамятаваў мяне? — падступіла да яго выразная і сьлічная на выгляд сутнасьць чатырохканчальнай рухавай формы. — А мы раней так добра бавіліся.

Ён пранiклівей узерыўся-ўслухаўся і ўбачыў, як ён некалькімі эонамі раней, у адной з папярэдніх вялікіх расаў[2], калі на Зямлі ўвасабляліся людзі квадратна-сукоснай формы, так званыя рамбоіды, меў прыязныя дачыненьні зь Лёткай, прыгажуняй і заскамкай. Тады яны патаналі ў вялікім шчасьці, высока луналі і спадзяваліся на прасьвяду ды памыснасьць. Але ўсё склалася іначай.

Безумоўна, Лётка зьмянілася і цяпер, захаваўшы прывабнасьць, увасабляла пераважна глыбокі смутак і нуду ад страчанага. Яна засталася недзе далёка *там*, і ўся яе істасьць гукала самотаю, кінутасьцю.

— Што з табою? — не ўтрымаўся Ян ад скрухі і ўсімі пачуцьцямі пацягнуўся да яе. — Я даўно цябе не сустракаў і думаў, што ты пэўна пайшла вышэй.

— Во якую ласку ты мне рабіў! — паспрабавала ўсьміхнуцца Лётка і крыху паружавела абліччам. — Дзякуй. Я трапіла ў пазачасьсе — і адбор не крануў мяне. Ты, мабыць, ведаеш адчаго.

— Зусім не, — усхваляваўся Ян. — Памятаеш, як на сыходзе старога мы чакалі пераменаў і марылі пра новыя падарожжы?

— Так, выбіралі, абмяркоўвалі і… нават сварыліся, — не прамінула нагадаць пра асаблівыя адносіны Лётка.

---

[2] На Зямлі жыцьцё разьвіваецца па касьмічных цыклах, у кожным зь якіх прысутнічае свая *вялікая раса* істотаў (у значэньні ня колеру скуры, а разьвіцьця сьвядомасьці); вялікая раса пашыраецца на мільёны зямных гадоў, і ёй адпавядаюць свае тыпы жывёльнага, расьліннага сьвету ў залежнасьці ад задачаў на канкрэтным этапе існаваньня. У мінулае адышлі чатыры вялікія расы. Цяпер заканчвае свой шлях нашая, вялікая пятая раса.

— Як толькі пачаліся нараджэньні на новай вітуніцы, — працягваў ён, нібыта не пачуўшы, — я атрымаў першае пяцікантовае цела, адправіўся на зямлю і стаў чакаць цябе. Але ты не прыйшла ні тады, ні апасьля. Ведаючы твой характар, я палічыў, што ты з-за чагосьці пакрыўдзілася і выбрала інакшы напрамак, расзлаваўся і таксама пайшоў далей, усё-ткі спадзеючыся на сустрэчу.

— А пацікавіцца, дзе, што? Ох, і ганарысты ты! Застаўся такім ці выправіўся? Дай зірну… Прыкметна, стаў памяркоўным.

Яна адвяла позірк, паглядзела ўдалячынь, распрастала крыльлі ды шырока ўзмахнула імі, як бы апрабоўваючы, — і паўстала як незвычайная птаха рамбічнай формы, адзін кут якой вялікасна ўздымаў галаву, а астатнія прагна цягнуліся ў бакі растапыранымі пальцамі.

Лётка згарнулася, і Ян адчуў, што яна вось-вось адляціць. У прасторы павісла невыносная туга і сумна загаласчэла навакольле. Ён амаль крыкнуў:

— Што адбылося?

— Час вынес свой прысуд, і я скарылася. Жаданьняў няма. Узбуджаць Сусьвет і нешта вяртаць — адмаўляюся. Вунь ты якім зрабіўся! Амаль геній! Ці тое яшчэ будзе! Усіх тут палохаюць, што такія, як мы, адбіраюць у вас, здатных, энэргію, посьпех. Не турбуйся, я не такая і не прэтэндую. Мне проста бажалася зірнуць на цябе яшчэ раз. І якраз склалася нагода. Прабач і дзякуй. Больш мне нічога ня трэба. Лепшага табе кону! Бывай!

— Не! Чакай! Гэта няправільна! Я павінен усё ведаць і зрабіць!

— На жаль, *гэты міг* прайшоў. Ты выбраў. Страціў мяне — значыць, так заплаціў. Сумленьне? Я паклапачуся, каб яно цябе не даймала.

Яна павярнулася і ўжо памкнулася ўперад, як раптам прыпынілася і мовіла:

— Прашу аднаго: ***там***, дзе ўжо нішто ня будзе мець аніякага значэньня і ты будзеш стаяць перад Вечнасьцю, успомні мяне. *Гэты міг* вырашыць.

Ладна раскінуўшы крылы і паслаўшы голкую хвалю, што ўзбудзіла трапяткія кветкі на скронях Яна, Лётка ўзьнялася і паляцела. Ён доўга назіраў гэты мерны і далёкі палёт, аж пакуль кругавід не паглынуў яе зусім.

# 22

А вакол распачалася галгатня. Пераканаўшыся, што Ян нічога не аддаў, гаротныя ўзбурыліся і хціва, настойліва паперліся да яго, галосячы, просячы, нахабна, бяз сораму зьневажаючы ды запужваючы. Гнеўная лаянка цякла адусюль і галосна, і эмацыйна. Неўпрыкметку над мясцовасьцю замітусіліся сьцені, бязладна загудзела, хтосьці дэманічна рагатнуў. Насоўваўся тлум. Шараваты эфір захістаўся і стаў гуснуць. Ян уразіўся такой колькасьці бруду і друхлядзі.

Некалькі разоў зьяўляўся бязмоўны і, як яму падалося, падкрэсьлена суворы вобраз Алеся.

«У фізычным сьвеце бачна толькі рэчыўнае, тут дадаецца пачуцьцёвае, усё агаляецца, празіраецца да дробязяў — і навакольле выглядае як адзін безлад ды сьметнік. Жах! Гэта ад натуры ці ад хворасьці? Пэўна ад усяго разам. Якія жыхары, такая і абастоўка. На ўсё згодныя. Абы *жыць*».

— Доўга думаў? Рушнікоў не засьцілаем, самі чакаем пачастункаў.

— Выкладвай!

— Дзяліся!

— Асадзі назад! Па чарзе!

— Скнара!

— Дай жменьку чысьціні!

— А мне каліўку сьвятла!

— Што ты ўсё сабе грабеш, іншым пакінь!

— Найперш — родным.

— Вы ж гадкія.

— Сама падла.

— Тут усе такія.

— Крыўцы! Пастыдаліся б! Гэта ж гвалт і грабежа!

— Чэсны знайшоўся!

— Ён увесь аж палае энэргіяй — толькі грэцца і браць.

— Чаго перажываць: усім хопіць!

— Цані сябе! На якой вышыні лятаеш! Дастаткова толькі падумаць — і ўсё адбываецца. Мне б такое.

— Не шкадуй! Аддавай!

Ян разгубіўся ад такіх вынятковых варункаў. Ён ведаў пра маштабы і распаўсюд зьнявечанасьці і заганнасьці, але не ўяўляў гэткай масавасьці і спораму сабетніцтва і сквапнасьці. Раней доля калісьці блізкіх душаў бачылася лепшай, больш свабоднай ад едкіх жарсьцяў. Цяпер жа яна замаркоціла.

«Калі ў астрале так, што ж тады па-сапраўднаму адбываецца ў Вердзе? Усё перакручваецца яшчэ больш — і (што скрушней) не відаць гэтага! Сьвядомасьць успрымае, але з-за сьлепаты і глухаты ўяўляе скажона. Выходзіць, тамтэйшыя абставіны ад усеагульнае ўтоенасьці больш гнятлівыя і цяжкія. Вось адкуль пакуты!»

— Усё мазгуеш. Як вы ўжо абрыдлі, усялякія мысьляры! Лятаеце тут, назіраеце, мяркуеце, а толку ад вас нам, про-

стым душам, нямашака. Як былі мы па вушы ў балоце, так і застаемся.

— Ага, пасьля іх заўсёды ў яшчэ большую твань апускаемся.

— Лепш бы вы нас зусім не чапалі.

— Гнаць трэба ўсіх разумнікаў.

Ян ня мог і словам адказаць на такія абвінавачваньні, настолькі шчыльна абступілі яго падобныя настроі. Узлаванасьць і жальба нарасталі. Але ён усё адно гукнуў:

— А ў саміх вас галава ёсьць?

Упэўненая гучнасьць некалькі спыніла апантанасьць гаротных, але сэнсу яны не ўлавілі і ня змоўклі, зноў паперлі эмоцыямі, бо дужа спадзяваліся на чарговага збаўцу.

— Хто спагадае і заступіцца?..

— Ой-ё-ёй! Мы ж без дагляду і заслоны…

— Гора нам, ува ўсіх ёсьць абаронцы, а ў нас няма.

— Ніхто і скарыначкі не падасьць.

— А хто прыходзіць, дык абавязкова брэша і тлуміць. Мы ж не дурныя, усё бачым.

— Гэтага Духа не лічы: ён многіх даглядае, ды ўсё больш шкуматае, падганяе, а сам толькі й пазірае ўгору.

— А нам патрэбны *свой* пастух.

— Кожны сваю нашыну пільнуе, а ты ж — наскі!

— Нам цябе Бог паслаў.

— Дасюль быў адзін, дакладней — адна, вельмі добрая, дбала пра нас, малілася, дык яе прыгнялі ды зганілі суседзі, пасадзілі ў цямніцу — і тут такая ёсьць, нават жудасней, чым людзкая.

— Яна і зараз за нас заступаецца, але зьнясіленая, слабы ў яе голас.

— А чужынцы ня слухаюць. Толькі хвалу. Іншай веры яны, хлусьлівай і жорсткай. Дый глуздамі ня тыя.

— Рабуюць ды марнуюць. Сілы адымаюць.

— Вельмі ім нашая энэргія ды мэнтальнасьць падабаюцца. П'юць з асалодай. Кажуць, лепш за гэтых бязродных сабакаў нямашака.

— А мы ж старажытней за іх. Зь ліку першасных. Як бацькі ім.

У гэтай ачмуце Ян заўважаў праблісі здаровасьці, але яны былі хутчэй натхняльныя, чымся сьведамыя. І ўсё-такі давалі добрую надзею. Гэта падбадзёрвала.

# 23

— Не захапляйся, летуценьнік.

Строга і нядобразычліва прагучаў незнаёмы голас. Януш убачыў, як збоку да яго набліжаецца цёмны й злосны вобраз, і напружыўся.

— Не турбуйся, хоць я і злыдзень, але сваё ведаю і цябе не крану. Раней сьцёр бы ў парашок, а цяпер хай стараюцца іншыя.

Прыбыш спыніўся воддаль, не зважаючы, грэбліва адпіхнуў ад сябе колькі настырных тутэйшых і з выглядам дасьведчанага прадоўжыў:

— Многа тут шнырыла з усялякімі мроямі ды крозамі, толькі сёрбала мала. У мяне тое-сёе атрымалася. Так? — ён павярнуўся да натоўпу і цыкнуў; бліжэйшыя палахліва адхіснуліся. — Нягеглыя! Пасьвіць іх трэба бізунамі. Тады і карысьць будзе.

— Для каго? — цьвёрда і падазрона спытаў Ян.

— Для сябе! — зарагатаў ліхадзей, і нязвыклым нэрвовым рэхам адгукнуўся эфір. — А ты разьлічваў: я адкажу інакш?

— Не. Я чакаў галоснага пацьвярджэньня, — сур’ёзна вымавіў Ян і паглядзеў на прыціхлую грамаду.

— Яны далёкія ад таго, што зараз нас займае, — зноў перайшоў на рэзанёрскі тон злакаман. — Як кажуць *там*, ім падавай хлеба й відовішчаў, а *тут* — энэргію і помач. Пры гэтым самі і пальцам не варухнуць. Затое калі адчуюць *магчымасьць дараваньня і надзеі*, дык пойдуць за *кожным* збавіцелем. Падкрэсьліваю: *за кожным*! І ніякае навучаньне не дапамагае: запаведзі выпараюцца мігам. Няма ўнутранай пануکі жыць па законах.

— Ты ж ня стаў такім *кожным* ні там, ні тут! — прагучала ад зборні. — Усё гнёў, цісноў ды гвалціў. Ніякай аслабы. Адны абяцанкі. Пустабрэх!

— Во-во! — раўнуў грубіян і пырснуў нянавісьцю. — Быдла і цяпер пра сваё, хоць і назірае за намі. Я ад іх нічога ня ўзяў. Толькі намучыўся. Пустэча. Закваскі не стае. Калі і была нейкая, то скісла. Адкіды. Хадзема, я табе іншае пакажу. Вартае і належнае.

— Ня вер яму, Ян! — шматгалосна закіпела гурба і ўзьняла клубістае парыва настрою. — Ён — усяго толькі басалай. Цалкам мы гэта зразумелі толькі тут. У яго няма талані дараваць і абнадзейваць. Дый розумам слабы. Ён — зь іншага лягеру. Але, як бачыш, прыляпіўся да нас. Значыць, *у іх асаблівая хлусьня*, што нават і тут адурвае просты люд. Як гэта можна?

Янук успрымаў усе вылучэньні і губляўся ад іх многасьці, не спраўляючыся адразу перапрацаваць і адпаведна зрэагаваць, знайсьці, як кампазытар, нейкую адну ноту, што падказала б увесь твор. Нешта падштурхоўвала да прапановы госьця, і ён згадзіўся.

Гурма ўміг завыла, загаласіла, завіжджэла. Абурэньне шугнула на дваіх адразу. У эфіры ўтварыўся незвычайны

голс, у якім, нягледзячы на яго бязладнасьць і какафанічнасьць, адчуваўся нейкі адзіны аб'яднальны і суцэльны матыў. Ян яго прыкмеціў упершыню.

# 24

— Што табе яны? — насаджваў шлында падчас палёту. — Пабыў і пайшоў далей. Колькі іх на шляху! Усіх не пераробіш. Дый задача іншая — набываць. Якім чынам? Справа кожнага. Трэба характар адточваць. І нікому не спушчаць! Зрабіць так, каб усе працавалі на *аднаго*. Тады і вынік здатны атрымаецца. А інакш — усё распыліцца, разьляціцца і нічога ня будзе. Энэргія любіць канцэнтрацыю. Трэба змагацца, каб стаць яе магнітам. Тады ўвесь сьвет і пацягнецца да цябе.

— А калі *адзін* ужо ёсьць?

— Ну і што! Іх можа быць некалькі. Ад таго і барацьба — асноўны закон. Адзін з адным — і перамагае *звышадзін*.

— А надалей?

— Я разумею цябе. Ты жадаеш падлавіць мяне на банальшчыне: маўляў, дальш — БОГ, і я буду зь ім ходацца. Найвялікшае глупства і аблуда ўсіх часоў і прастораў! Як можна ваяваць са СТВАРАЛЬНІКАМ?! Нават пабіўшы ўсіх, здабыўшы ўсё і застаўшыся зь ІМ сам-насам, немагчы-

ма і блізка ўявіць ЯГОНУЮ ВЕЛІЧ, ДАСКАНАЛАСЬЦЬ, НЕДАСЯГАЛЬНАСЬЦЬ і паставіць сябе нароўні. Напрыканцы адбудзецца неверагодны, сама заўзяты бой — *з самім сабою*.

— І зноў-такі: а далі?

— Гэтая змагань — невядомы працэс пераўтварэньня. Што ад яго атрымаецца? БОЖАЯ ВЕДА. У любым выпадку — СЛАВА ЯМУ!

Ян інакш зірнуў на праведніка, а ўнутраная пабудка спарадзіла адпаведную афарбоўку аўры.

— Я не крыўдую, і ўжо даўно, — заўважыў перамены хаджанін. — Ёсьць мэта — і ўсё, астатняе — фон. Кім ты быў раней? Бачу, ня толькі з гэтымі няўздоліцамі.

— Шмат кім і дзе. Доўга распавядаць.

— А апошні раз?

— Кампазытарам у Зямеччыне.

— Багатая зямля. Нашыя таксама любяць туды наведвацца. Зусім нядаўна мой кунпан ох як спраўна там прайшоўся: многіх аж зайздрыкі сталі браць... Дарэчы, пара назвацца: Луц, а цябе я знаю. Між іншым, тваё імя вельмі глыбокага сэнсу. Значыць, і пасьля такога досьведу, з тваім талентам ты вырашыў вярнуцца ў Ліцьвінію?

— Я знаёміўся з навізной і адчуў покліч.

— Такіх сігналаў у астрале — на спатыкач.

— У мяне сваё ўспрыманьне.

— Безумоўна. Але галоўнае — не спаймаць падман.

— Я ведаю.

# 25

Мясцовасьць пад імі разгортвалася рознай: узгорыстай і падзістай, занятай і пустой, сельскай і ўрбаністычнай, прыемнай і агіднай — паўсюль адчувалася жыцьцё калі ня душаў, дык стыхіяляў, духаў, сутнасьцяў і ўсялякіх іншых стварэньняў, характэрных ня толькі для тутэйшай Ліцьвініі, але і наогул для ўсяго астральнага сьвету. Чагосьці выключнага Януш не заўважаў.

— А ты добра прыгледзься, — раіў Луц. — Калярыстыя на пачуцьці раёны можна ня ўлічваць — звыкла яны новыя і не ўласьцівыя, хутка распадаюцца. А вось адна-двухколерныя — сама цікавасьць: тут засяроджаныя натуры блізкія і ўплывовыя, аднае ўдачы. Менавіта яны фармуюць асаблівасьць і напрамак краіны. У мяне зь імі заўсёды былі праблемы.

Ян узерыўся і сапраўды прыкмеціў стракатую і бліскучую палітру разлогу. Рабаціньня хапала, але вялікіх аднатонных плямаў было малавата і ніводнай такой, якая б займала значную тэрыторыю, як

у іншых краінах. Тады ён пераключыўся на гукавы фон і знайшоў уразьлівыя адрозьненьні. Пространь вылучала некалькі моцных голскіх, унісонных матываў, да якіх дадаваліся шматлікія гучаньні неафітаў, тых, хто прыбываў у няспыннай плыні зь зямлі. Звонку ўрываліся супярэчлівыя настроі, якія бальшынёю палашылі і гнялі ўнутраны стан. А над усім прасьцягам высока, рэстка і ўпэўнена лілася пяшчотная і кранальная мелодыя, ад якой трымцеў дух.

Творца павярнуў галаву да спадарожніка і адцеміў, што той не заўважае гукавога парадку гэтак, як ён, і спытаў:

— А адчаго ў цябе ня склаліся адносіны з краем ні там, ні тут, і ты ўсё адно тулісься да яго? Пайшоў бы далей.

— Сам сабе дзівую: гэта ж насуперак маім перакананьням! А адарвацца не магу. Цікава, што і пярэсты россып настрояў ды красак зусім не прыцягвае. Хачу махнуць рукой, але нешта ўнутры ные ды быццам бы намаўляе: не сьпяшайся, да іншых пасьпееш, прыкладзіся да гэтай прасторы шчыльней і паслухай: *такога* выражэньня не пачуеш анідзе. Вось я і трымаюся.

— Яны цябе ня любяць.

— Але не адпрэчваюць, церпяць.

— Чаго?

— Адкажу. Ня думай, што я спрыяю табе — гэта не мае правілы. І ў хованкі не гуляю: тут усё навідавоку. Дый птах ты іншы: ня бітны. За доўгі час ваджэньня я ўбачыў *натуру такіх, як яны*. Першасныя прыкметы сьведчаць, што асноўны набор якасьцяў, зручных для нашага брата, у іх банальны і прынятлівы — бяры і карыстайся. Але глупень той, хто спакусіцца тольма на гэта. Я, на жаль, апынуўся ў ліку такіх, бо паверыў розным дарадчыкам. Напачатку ўсё ішло, як мае быць. Распавядаў казкі і кранальна-салодлівыя словы ўпярэмежку з брахнёй — і гэта спрацавала: мяне выбралі.

Дапамагло яшчэ: людзі доўга гаравалі пад прыгнётам і вельмі ўжо праглі самастойнага сытнага едзіва. А мне што — абяцай ды шукай вінаватых! Тут я мастак. Але Час — вось каго я не цярплю больш за ўсё! — заўсёды нешта зьмяняе. Паздыхалі мае прыхільнікі — ты бачыў, колькі іх тут у астрале ацялюгваецца, — і месца старога заняло маладое. Падзьмула новым. Здавалася б, звычайная сітуацыя. Колькі такіх! Але… Я табе не надакучыў сваёй гаварыльняй?

— Не. Мне цікавыя навіны зь іншага лягеру.

— Час навеяў зрухі ня толькі фізычныя, але і сьведамасныя. Пакутніцтва і душэўны боль людзей спарадзілі рэдкую і незвычайную зьяву — *талаку*: яны пачалі злучацца думкамі, пачуцьцямі, справамі. Самі, без староннiх. Я разгубіўся, бо ў гэтым задзіночаньні не было мейсца для мяне. Пераменьваліся характары. Тое ж сабетніцтва стала выглядаць як варты, гожы індывідуалізм, зайздрасьць — як цікавасьць і захапленьне, зласьлівасьць — як жарт і вясёлая гульня. Увогуле заганы, хоць і заставаліся, патроху пераўтвараліся, і зусім не ў жаданым кірунку. Я злаваў, увёў больш люты рэжым. Браты параілі зьнішчаць. Распачаў, нат звышзброю стаў рыхтаваць — дапамагло: людзі зноў прыціхлі, стаіліся — якія б зьмены ні былі, а свая кашуля заўсёды бліжэй да цела, — але, я адчуваў, не скарыліся. І ўсё адно радаваўся: значыць, баяцца. А дарма. Бо наступіла якраз *гэта*.

Луц на хвіліну замоўк, зірнуў удалячынь, і Ян улавіў ад яго хвалю незвычайнай гукавой танальнасьці.

— Далей слухай уважлівей: вашаму брату таксама спатрэбіцца. Вось што я маю на ўвазе. Звычайна ўсе разнамасныя правадыры п’янеюць ад свайго мройнага вялічча і забываюць адну вельмі важную дэталь — калі адбываюцца нейкія турбацыі, то перайначваньні кранаюць усіх, у тым ліку і паплечнікаў, сярод якіх пакрысе сьпее *схоўная здрада*. Я гэтага як

сьлед не ўлічыў і паплаціўся... Карацей, яны мяне зрынулі. Аб'ядналіся зь недарэкамі і ганебна выпіхнулі мяне з краю дый зь зямлі наагул... Не бяда! Усяго толькі адна грань у Сусьвеце. Колькі іх яшчэ! Важна, што *тут* я працягваю кіраваць: дапамагае ўсялякая поскудзь — яе шмат назапасілася і яшчэ прыбывае. Толькі прыкмячаю: таксама падымае крыльле. Абрэжу! Я змагар. А занепакоенасьць усё адно застаецца: штосьці тут не тае, само па сабе нічога не адбываецца, ёсьць нейкая прычына. Якая? Ты, музыка і стварыцель, ці чуеш што?

Хаваць свае адчуваньні было б сьмешна, і Ян адказаў:

— Так, гучаньні разнастайныя, і адразу не разьбярэш, дзе, адкуль і чые.

— Вось і я губляюся ў вызначэньні таго ці іншага зьместу. Намагаюся спасьцігнуць вылучэньні больш адвечныя, карэнныя, а ліпнуць, як трасца, вонкашнія, чужыя і няздатныя.

— Шмат гаманлівых, вярэдлівых і бязладных ідзе ад усходу. Ад захаду і поўначы меней. Ад поўдня зусім мала.

— А-а, гэта суседзі спакою не даюць. Усё лезуць. Асабліва нахрапная Масея. Па шчырасьці, яна мне надакучыла, як горкі яблык. Там зараз многа нашых — камусьці лахва, але ня мне. Адчаго? Растлумачу. Натураю яны ня выйшлі, нават мне гідкія: адны лайдакі і бяспуцьце. Няхай бы за ўладу змагаліся — і я зь імі пацягаўся б ўволю, дык не: толькі крадуць, кішэні набіваюць і распусьнічаюць. Ладна, і з гэтым можна мірыцца. Але на *маё* квапяцца, хамулы! Падавай ім больш земляў, людзей, розуму ды ўсялякага вытвару. Ды ўсё з падманам, пагрозамі, забойствамі! Без разбору! А якія здатныя на зьнішчэньні! Асабліва іхны вадзіла — Плюг кароткі. Амаральней тыпа ня знойдзеш! Многіх нашых пераўзышоў. Ягоная башка толькі на сьме-

рць і звыродзьдзе разьлічаная. А колькі фанабэрыі, задачы! Мазгі затлуміў да няўздольля, паскуда.

— Сапраўды, такога насланьня там шмат. Як усё гадкае і какафанічнае, яно разбурае нармальныя слых і густ. Але заўважаю таксама: ёсьць і тыя, хто не прымае яго, адкідвае.

— Нядзіўна: абрыдла. Але ўсё адно многія заразіліся гэтай поганьню. Дрэнна, бо і нашаму брату карысна спажываць адметнае. А яшчэ якія настроі ёсьць?

— Шуму й гоману стае ўсялякага, але праслухваецца цікавая асаблівасьць: гукавая насычанасьць мясцовых душаў зусім не такая, як візуальная: больш багатая і канцэнтраваная. Раней я таксама яе не прыкмячаў ні ў Ліцьвініі, ні ў якой іншай краіне. А вось цяпер, пасьля такога доўгага растаньня, адчуў.

Луц унікліва выслухаў і дужа разгарачыўся:

— А на што гэта падобна?

— Звычайна *так* гучаць касьмічныя сфэры. На зямлі гэта завецца *чалавечнасьцю і спагадай*.

Выява Луца адразу захісталася, дзіўна зазьвякала, стала перапялёсай, бясформеннай.

— Дарма шчыраў, — панура і бы ў комін прамовіў ён. — Дакладна ня мой кантынгент. Сістэма гэтага не зразумее. Ці мо яна спэцыяльна кінула мяне сюды? Дзякуй за помач. Бывай! — і растварыўся.

Януш некалькі зьдзівіўся ягонаму раптоўнаму зьнікненьню і шчыра пашкадаваў, што *такі* экскурсавод не прадэманстраваў увесь свой эксклюзіў.

# 26

Інэрцыйна ён аглядаў краявіды і кеміў аб магутнасьці *ілюзіі*. Нават аднаму розуму, адной істоце *яна* прыходзіць шматаблічнай ды разнастайнай і можа быць у кожны момант інакшай. А што ж тады казаць пра масавыя зьявы, незьлічоных касьмічных стварэньняў, увесь Сусьвет! Ягоных валадароў! І ўсе яны існуюць, стасуюцца, сутыкаюцца, адчуваюць, разважаюць! Неверагодная карціна! Якое ж трэба мець уяўленьне! *Гэта — жыцьцё? Ці што?*

Нутро занепакоілася неяк па-асабліваму: быццам там нехта варочаўся і намаўляў. Здогад не замарудзіў: «Алесь! Вырашыў так гуляць? Ох, і штукар ты! Выявіся навідавоку, пабалбочам-пажартуем ды смак пачуем.» Тут жа дзіўныя адчуваньні прапалі, і ўсё нанава вярнулася.

«Тады працягнем. Калі мне дадзены абсалютны слых, то трэба і старацца ў гэтым чове. Астатняе — між іншым».

Ян навучыўся распазнаваць па гучаньні. Сапраўдны ці падробны — ён вызначаў беспамылкова. І таго быў упэўнены,

што ня можа падпасьці пад непатрэбную гукавую ілюзійнасьць ці фэнамэнальнасьць і вельмі блізка знаходзіцца да наўмянальнасьці, здольны на аб'ектыўную ацэну. Чэсны, праўдзівы, самалюбівы, лічыў: аблуднасьць яго не кране, а звышздольнасьці, якія звыкла прыходзяць толькі ў вышэйшых касьмічных сфэрах, яму будуць дадзеныя намнога раней.

— Зірні: яшчэ адзін пыхлівы выдумшчык! — даляцела да яго, і мраец хуценька шукнуў слыхам: адкуль?

Воддаль месьцілася дружына нястрымных астральцаў, якія ўраз весела ўскінулі галовы. Ад іх шырока разьбягаліся гукавыя хвалі блажнога зьместу і гарэзьлівая натхнёнасьць. Ян пазнаў блізкіх душаў і сьпікаваў.

— Чаго ты лётаеш тут? Настальгія цісьне?

— Зьбіраю ўражаньні й настроі.

— Наліха?

— Каб геніем будзіць!

— Зашмат бярэш. Ці да мейсца?

— Край прывольны, люд прыстойны — сама то.

— А не памыляесься?

— Ніколькі. Даўно пара.

— А яны?

— Прагнуць.

— Чаго?

— Праўды і радасьці.

— Ня рана?

— Якраз.

— А дадзенае?

— Амаль адпакутавалі.

— Самі гукнулі?

— Пачуў.

— Дый мы тут ня з гліны зьлепленыя.

— Разам.

— А так льга — масава тварыць?

— Не спрабаваў.

— І мы таксама.

— Калі думаем — значыць, можна.

— Ну, дык — за ноты?

— Так!!!

Падобнае тэставаньне Януку спадабалася: коратка, выразна, зразумела. Цяпер ён ведаў, як дзеяць. У такім жа стане знаходзіліся і астатнія шчыракі, таксама гатовыя да зьдзяйсьненьняў.

# 27

Як па камандзе, талака сьцішылася-засяродзілася — і доўгачаканая прасьвяда палілася з вышыні. Колькі ж часу яны чакалі гэтага моманту! Якія прайшлі шляхі!

Януша ахапіла моцнае творчае ўзбуджэньне, і ён па-новаму адчуў сваё цела. Нутро трапятала і парывалася вонкі, як бы павялічваючыся ў памерах і штурхаючы ўсе атамы да невераемных зьмяненьняў і рухаў. Канечнасьці гулялі ў лёгкасьць, свабоду і зграбна-прыгожа краналі-прыстасоўваліся да акольных формаў, атачэньня, кожным дотыкам лагодзячы і ўражваючы. Ад галавы струменілася зыркае сьвятло, даючы неабмежаваны простор квантам думкі і празорлівасьці, а таксама гучаньню блакіту на скронях. Зрок улавіў мімалётны ўзмах крылаў Мары — і ўся істасьць прагна наталілася сьвежай духоўнай амброзіяй.

Абраныя былі аднаго музычнага кшталту і ведалі гукавую напоўненасьць Сусьвету: усё ў мікра- і макракосьме мела сваё адметнае гучаньне, дыяпазон, узровень

і адпавядала астатнім уласьцівасьцям Тварэньня. *Пачуць і данесьці — асноўнае*, дзеля чаго яны існавалі.

Гукам, мелодыяй пераўтварыць Бацькаўшчыну — задача, да якой іх паклікалі Вышыні ў дадзены момант. А для гэтага неабходна было знайсьці, скласьці агульны матыў, попеўку. Спачатку тут, у Нябёснай Ліцьвініі. Каб было што слухаць душой і ад чаго піць-насычацца-праісначвацца. А потым ужо ісьці ўніз ды несьці далей і глыбей.

Падрыхтаваныя, усьведамляючы веліч мэты, творцы разьляцеліся ў розныя бакі.

# 28

Ян паспрабаваў сканцэнтравацца, але замінала мітусьня, дробязі. Кожная справа заўсёды мела галоўны сэнс і некалькі пабочных, прыблудных, другарадных. Як правіла, апошнія з-за свайго svalaчызму па-ўсялякаму перашкаджалі нармальнай вядзежы і паскудзілі. Адсекчы лішняе, вылучыць стрыжань — талент і ўмецтва.

Вельмі выразна, на ўвесь далягляд выявіўся твар Алеся, які спачатку ветла ўсьміхнуўся, а потым мімічна, ківаміглліва стаў выконваць дзіўную мелодыю, на якую здатны толькі аркестр.

Янук уразіўся, зьнерухомеў і заслухаўся. Нешта змусіла намагчыся і глыбока ўявіць місію — неістотнае тут жа адпала. Ува ўсякім разе, так меркавалася.

Як і раней, на ўвагу траплялся мясьціны масавага гучаньня. Такіх хапала ўдосталь: як-ніяк чалавек, а за ім і астралавек — істота індывідуальна-групавая і сацыяльна-калектыўная. Калі ёсьць на сьвеце крытэры прыдатнасьці жывога стварэньня, дык

найважнейшы — *лучнасьць*. Чым далей разьвіцьцё, тым значней і маштабней паўстае адзінка, здольная ня толькі быць у ліку, але і асобна, уплывова.

Акаляючае, прыроднае асяродзьдзе Яна не займала. Яно хоць і было вялікае, жыватворнае, сутнаснае, але стварала, у асноўным, прыгожы, гарманічны фон, спрыяла і не патрабавала пабочнага ўмяшаньня. Усё ж астатняе вялізнае і ўвасобленае — ад вёсак да гарадоў ды мегаполісаў — мела недасканалы выгляд і гучала пераважна брыдка і крыўдна. Паветра літаральна дзіравіла.

«Праекцыя зямнога бязладзьдзя. Там, дзе прайшлі эмоцыі і глупства, парадку мала. А які гуд і зык!»

Януш здрыгануўся і, каб не пашкодзіла, паставіў гукавую абарону.

«Вось тут неабходна папрацаваць. Не сьпяшацца. Напачатку трэба ўслухацца ў гэты шум, перабраць па групах, галасах і прадыягнаставаць. Чаго тут больш? А там? Што на паверхах, у офісах? А гэтыя ў хатах, на вуліцах, у сутарэньнях, падмосьцях. Якая цудоўная мова, а разгалосіца! Колькі выразаў, параўнаньняў, мэтафараў! А як кажуць, гукаюць! Тут войкаюць, галосяць… Сьпяваюць, чытаюць, шэпчуць, крычаць…Маўчаць! Затое як вібруе нутро! У кожнай эмоцыі свой згук. Не прапусьціць. Занатаваць. Узяць з сабой. Якраз да агульнае скарбонкі. Ня трэба й выдумляць. Што атрымалася? Цікавы твор. На сімфонію цягне? Не яшчэ. Дадамо паднябеньня. Падземьмя...»

— Штойта ты тут разгуляўся? — зьнечаку раздалося побач. — Гойсаеш, кранаеш, ківаеш, зыбаеш, зьбіраеш…Хто дазволіў?

Перад кампазытарам выявіўся нахабістага аблічча вобраз, ад якога патыхала і гучала злосьцю.

Ян спыніўся і засьцерагальна настроіўся.

— Зь якім мандатам завітаў? — па-камісарску харкнуў прыбыш.

— Хто ты? — спакойна спытаў Ян.

— Калі б ты самахоцьцю не гарцаў абы-дзе, ня блытаўся з розным гмызам, а адразу сваімі помысламі рушыў да мяне — ведаў бы, — груба навучаў злакаман і ўсё-такі, нібыта ўважыўшы, адказаў: — Горст я, гаспадар усіхны.

— Нічога такога і ні ад каго ня чуў.

— Пачуеш.

— І чаго табе трэба, гаспадар? — падкрэсьлена ветліва і зьедліва пацікавіўся Януш.

— Можаш не выражацца: твая сутнасьць і без таго відочная, — фанабэрыста і пагардліва вымавіў Горст. — Ці ты зь недалугаў?

— Гэта мая справа.

— Хамула, а я думаў: папіхач. Але ўсё адно: наш.

— Прымітыўна бярэш.

— А з такімі так і трэба.

Ён на хвіліну замоўк, а потым больш лагодна зважнічаў:

— Навошта майго брата пакрыўдзіў?

— Якога?

— Луца. Ён да цябе з душой, краіну паляцеў паказваць, а ты адразу: *чалавечнасьць*!

— ???

— Якая, да чорта, тут ча-ла-веч-насьць! Гэта астрал, і ніякіх людцаў нямашака. Адны душы. Праўда, нягеглыя.

— Розныя.

— Гэта табе і такім, як ты, гэтак здаецца. А насамрэч так, як я сказаў.

— Вядома, кожны, хто ня скача пад вашую дудку, дрэнь.

— І ты туды ж. Во сьвет! І як вас павярнуць?

— Да чаго, навігатар? Куды цягнуў Луц?

— Не чапай яго. Ён добры хлопец. Клёку, праўда, малавата. Крыху абмежаваны. Але здатны. А ты ня быў такім? Не падбіраў за іншымі? Было. З усімі. І са мной таксама. Час дасьць і адбярэ. І наадварот. А яму проста не пашанцавала: дастаўся ня сама лепшы кавалак. Больш пашчасьціла браткам, якім выпала Зямеччына й Масея. А Масея дык наогул наш лепшы прыстанак. За апошні час у ёй удала ўвасобіліся аж некалькі братоў. Яны прыдбалі шмат новых тэрыторыяў, хітра зьмянілі геаграфію; глядзіш — і людзі пайшлі іншыя, пакрыўджаныя, злыя, сквапныя. А нам таго і трэба: усё-такі смачны наед. Тая ж Ліцьвінія. Мы яе добра абскублі і маральна, і тэрытарыяльна. Цяпер вось зьмяняем яе агульны настрой з мэтай цалкам падпарадкаваць. Луц тут упарта грыз. Па-нашаму. Толькі вось своечасова не заўважыў падкопу. Вашыя абышлі: хітра перапрацавалі сьведам’е, усё перанайменілі навыварат і наадварот — і яно нібыта перавярнулася. А насамрэч засталося такім, як наш малойца шчыраў. Па *энэргетычнай* схеме інакш і быць не магло: унёсак — вынік.

— Во, закруціў! Па-твойму, Ліцьвінія, як і многія іншыя мэтакраіны, вашая?

— Безумоўна. Які пачатак, такі й канец.

— А як жа адчуваньні, думкі тубыльцаў?

— І гэта пытае надзея чужынца! Божа літасьцівы! Ня дай памерці ад сьмеху! Тлумачу найбольш здольным. **І-лю-зі-я**! Падман! Дастаткова перапраграмаваць сьвядомасьць, настроіць глузд — і белае зробіцца чорным.

— Скуль ты ўзяў, што ілюзія вашая?

— Па праве розуму і першынства. Вы мысьлюеце на крок ззаду.

— Спрэчна і абразьліва. Адтаго размова ня мае працягу.

— Правільна. Лікбез скончыўся. Мы — гульцы і спаборнікі. Як сапраўдны спадужнік, я ніякім чынам не адмаўляюся ад свайго і прашу выдаліцца адсюль.

— Гэтае ж я прапаноўваю і табе.

# 29

Паміж супарамі ўзьнікла энэргетычная напруга і — ашаламляльная бліскавіца! Мігам з двух бакоў, наўспроць адно аднаго, паўсталі цэлыя атрады ваяроў. Сярод сваіх Януш прыкмеціў, узважыўшы ўдзячным глядам ды павагаю, Марка-Марыю, Мару, Гаўрылу, Натальлю і многіх іншых. Гэтак жа адзначыў уласнае войска і Горст.

А Дух мейсца, беручы ў Часу выявы, шляхам глыбокага прасьвятленьня і намаўленьня давёў да сьведам'я войнікаў і паказаў кожнаму моваю ўсіх човаў, як фармаваліся арміі.

Адбывалася тое ў Нулявой Сфэры, якая ёсьць у кожнай душы, у кожным сэрцы, у кожным розуме, у кожным краі.

У Вышынях зайграла дуда і раздаўся бубенны дробат.

Узьняўся вецер, закруціліся віхры, замігцелі маланкі, заляскаў пярун.

І на ўсё існае лінула праўда.

І ня стала ні нянавісьці, ні любові.

І разьдзяліліся душы на правых і на левых.

І злучыліся па веры сваёй.
І не было ні плачу, ні радасьці.
І пісаўся кажнай асобны кон.
І сказана было: бяры сваё.
І давалася па заслугах.
І прымалася ў супакоі і з падзякаю.
І праісначваліся душы, нанова нараджаліся.
І йшлі ў сьвет да новых бацькоў, на новыя землі.
І распачыналася новае жыцьцё.
І так павек.
Хвала БОГУ!

# 30

Янку таксама захапіла мэтамарфоза; кожным атамам ён адчуваў зьмены і падрыхтоўку да чагосьці няведамага, значнага. У галаве мітусіліся кадры жыцьця, ягонага і іншых, прошлага і прышлага. *Нехта* — так і мроіўся шматаблічны і ўсюдыісны Алесь! — як бы дэманстраваў варыянты і падштурхоўваў да выбару, умацоўваючы перакананьні прыкладамі.

У нейкі момант працэс здрыгануўся і спыніўся. У сьвядомасьць прыйшла знаёмая яснасьць, і разгарнуліся пачуцьці.

Па-ранейшаму атуляў астральны сьвет, золатам і музыкай раскашавала прырода. Адчуваньні зрабіліся больш ценкімі і далікатнымі: настолькі паглыбелі — да драбнюткіх дэталяў! — успрыманьні асяродзьдзя. Арганізм унутрана пастрайнеў і радаваўся.

— Бачу: зьзяеш! — абудзіў знаёмы голас, і неафіт крутнуўся.

Перад ім быў Казімір. Ян усхваляваўся, затрымцеў, выпускаючы сызнутры прыязныя эмоцыі. Расьліны побач ад гэтага яшчэ больш папрыгажэлі і ўзьвесяліліся.

«Як ён падобны да Алеся!»

— Ведаю: шмат пытаньняў і бажаньняў, — па-бацькоўску аблашчыў энэргіяй Казімір. — Мая *ідэя* дарэчы. А даводзіць яе я буду і мовай, і выразамі, як дазваляе астрал. Каб менавіта *ад твае глыбіні* праўда сама ўзьнялася і праясьніла.

— Прабач, можа, назаляю, але спрэс цікава: што з табой адбылося на Зямлі?

— Не для гэтага я прыйшоў, і ўсё адно адкажу: у трагічных выпадках, накшталт майго, неабходна заўжды шукаць подступы Горста. Дужацца зь ім, канешне, трэба, але не злаваць. Ён — таксама зычлівец, толькі *іншай справы, супрацоўнай*. Мяркую, і табе карысна гэта ведаць, бо *такое* мне адкрылася толькі тут.

# 31

— А цяпер унікай. У цябе *ёсьць усё*. Ты здолеў дасюль данесьці, не расплюхаў. Малайчына!

У нашым жыцьці музыка — сама лепшая выразьніца касьмічных настрояў. Калі літаратура, мастацтва, архітэктура і іншыя віды творчасьці адлюстроўваюць толькі асобныя бакі Вышэйшага Сэнсу, то музыка выяўляе Воскасьць і ўзьдзейнічае ўсеабдымна, кранаючы людзей ня толькі фізычна, астральна, мэнтальна, але і *духоўна. Ад яе трапечуць усе*, незалежна ні ад чога.

Усе ведаюць гісторыю Арфэя і Эўрыдыкі. Яна адметная ня толькі сілаю каханьня, але і магіяй музычнай падзейлівасьці. Арфэй здолеў успрыняць і выразіць такія касьмічныя матывы, ад якіх атачэньне ўзрушылася-ўзьвялічылася і паспрыяла. А Эўрыдыку чароўная музыка пераўтварыла-праісначыла, надала ёй высасьці і дазволіла імчаць за каханкам цераз усе матэрыяльныя спаткненьні. І толькі звычайнае зямное пахаценьне Арфэя, як

фізычны погляд назад, вярнула яе да ранейшага стану. Гэта ня проста мэтафара, а гучаньне веляй чысьціні і прыгажосьці.

У Сусьвеце існуе **абсалютная**, універсальная **Мэлёдыя**. Тое, што ствараецца музычнага ў выяўленых сьветах, — толькі драбнюткія яе адгалінаваньні, як бы выцягваньне зь яе неабдымнай адзежы невялічкіх нітачак, гукаў, твораў. Цяпер музычныя вытвары робяць індывіды, адзінкі, выкананьне адбываецца і асобна, і групай, а ўсё ідзе да стварэньня, улоўліваньня абсалютнай мэлёдыі **грамадой**, хоць такія спробы ўжо існуюць.

Ты і сябры зрабілі важную справу: стварылі *адзіную Мэлёдыю Ліцьвініі*, альбо запачаткавалі *Вялікі Зыход Космасу* ў нашую брамфатуру.

# 32

Гэтыя словы казытнулі ўсе фібры вучня і запусьцілі ўспаміны: існасьць стала прымаць відарысы ўсіх падзеяў, што адкладаліся ў касьмічнай схоўні і даваліся толькі таму, хто адпавядаў запатрабаваньням. Мяркацыі й уваабражэньне ляцелі ў Сусьвет усё далей.

Яшчэ ніхто дакладна ня вымераў імгненьне і не пазначыў ім Сусьвет. Адтаго ўсе адлікі-разьлікі заўжды ўмоўныя і ўяўныя. *А найлепшай меркай зьяўляецца думка: як памысьляваў, так і адбываецца.*

Падчас сутыкненьня з Горстам у Янука сапраўды ўзьнікла *мэта ператварэньня Ліцьвініі музычным чынам*; бліскаўка толькі адзначыла гэты намер: прастора загучала на ўсю моц, клікаючы руплівцаў.

І яны сабраліся, багатыя на досьвед, поўныя жаданьняў і гарачыя да дзеяў.

Усе адчувалі накіроўваючую Сілу і былі ўпэўненыя, што робяць правільна.

Узрушыліся сэрцы і загучалі ўва ўнісон, выказваючы дарагое, адметнае. Ад

прыгожага сугучча і вялікай лучнасьці ў мэтапрасторы Ліцьвініі ўзьнікла неверагодная *мэлядычная выява*, хвалі якой дасягалі кожнай роднаснай душы, у якім бы вымярэньні і сьвеце яна ні знаходзілася.

— Толькі дзякуючы Часу мажліва зеціць помыслы сэрца на розных касьмічных кірунках, — радаваўся Янка разнастайнасьці быцьця.

— І заўсёды адчуваць сябе датычным да Справаў Адвечных, — дапаўняў Казімір.

— А чаго я тут? Я ж рыхтаваўся да пераходу.

— Ты толькі апамятаўся. Во, як я цябе загаманіў і заблытаў! Значыцца, праняў. Гэта добра. Зручней будзе давесьці наступную задачу.

— Мяне чакае нешта асаблівае?

— Так, і дужа.

— Я саўсім расхваляваўся і мушу запярэчыць: не гатовы я.

— Часам сябе ня ведаеш.

— Я бачу сваё калішняе. У некаторых жыцьцях рабіў нявартае, момантамі — прыкрае. Гэта цісьне мяне. А паправіць нельга.

— Калі расьцеш, уздымаесься і набліжаесься да свайго наўмену, то набываеш усё больш самапераўтваральных якасьцяў, якімі можна карыстацца і ў часе, і ў прасторы, але тольма для ніжэйшых узроўняў.

— Атрымліваецца, я магу з вышыні свайго становішча падкарэктаваць самога сябе ў мінулым і на нешта паўплываць?

— Такое магчыма, але толькі ў згодзе з Тварцом.

— Як гэта?

— Ты можаш пажадаць усяго і стварыць адпаведныя думкаформы. Але яны ажыцьцявяцца толькі ў выпадку адпаведнасьці Агульнай Задуме. Паўтараю: усё залежыць ад твайго пад'ёму — чым вышэй, тым дасканалей. Наступае такі мо-

мант, калі зь цябе *вырастае бог*. Дарэчы, анёлы людзей — гэта большасьцю яны самі, толькі вышэйшага ўзроўню разьвіцьця, ці бо з будучыні наглядаюць за сабой.

— Тады я выпраўлю тое-сёе?

— Паспрабуй.

Ян задорыста ўзяўся за трансфармацыі. У хуткім тэмпе паімчалі малюнкі ўвасабленьняў за доўгія эоны быцьця. Ён засяроджана ўводзіў зьмены, калі-некалі вяртаючыся назад, узіраючыся, перастаўляючы альбо наагул выдаляючы нешта, і задаволена сабе напяваў. Напрыканцы хвіліну памарудзіў, памеркаваўшы, і зрабіў апошні магічны кіў.

Казімір з добрай усьмешкай назіраў, раз-пораз вылучаючы лёгкія і гаманкія хмаркі, і нібыта чагосьці чакаў.

Раптоўна Янук здрыгануўся і нязвыкла гукнуў. Увышыню адляцеў флюід расчараваньня.

— Што гэта? Так мала атрымалася? — занепакоіўся ён.

— Значыць, яшчэ рана і шмат трэба. Галоўнае — не спыняцца і гартаваць дух. Ёсьць веды і праца — будзе ўсё. А зараз — мэта.

Па таму, якім блакітам і зыркасьцю напоўнілася аўра Яна, можна было меркаваць аб ягонай гатовасьці.

— Гэта я прыпыніў тваё новае праісначаньне, — паясьніў Казімір, — каб ты больш спазнаў і паслухаў мяне. Ты зноў народзісься ў Ліцьвініі. І таксама будзеш кампазытарам.

— Тое ж самае... Як гэта ўспрымаць?

— Як давер. Растлумачу. Талакой вы пасьпяхова ўладкавалі музычную сфэру над мэтакраінай — гэта будзе натхненьнем для цябе тамтэйшага. Ты напішаш твор — у цяперашнім разуменьні сімфонію, якая дапаможа перайначыць зямны сьвет. Зараз там многае рыхтуецца да пераходу ў новую, *шостую*, вялікую расу. Да знакавых будзе прыналежаць і твая музыка, якая сваім гучаньнем пяройдзе рубікон

і ў ліку першых стане значнай зьявай новай цывілізацыі. Упершыню выявяцца і адчувальна паўстануць-адкрыюцца ўсе веды, атрыманыя цягам пяці папярэдніх вялікіх расаў. Нарэшце чалавецтва пачне гожы касьмічны ўздым ад зямное прыступкі, на якой знаходзіцца цяпер.

— Я буду ведаць пра гэта?

— На Зямлі не. Але інтуітыўна ты будзеш кіравацца гэтай праграмай усё жыцьцё. Галоўнае — слухай сябе і выбірай бяз гвалту. Спазору ты будзеш сімпатычнага, прыцягальнага і магічнага, як твая музыка. Няпросты лёс. Задачы даюцца па сілах. Вяртаньня няма. Толькі ўзыходжаньне.

кастрычнік 2015 году — люты 2016 году,
г. Віцебск.

# СЬВЯТЫНЯ

культавая праекцыя

# 1

Раніца лашчыла сонцам, замілоўвала зелянівам, грукатала трамваямі і плыўна пераходзіла ў дзень.

Адась у добрым настроі ішоў у офіс, прачуваючы пасьпяховую ўгоду. Як звычайна, павярнуў за рог будынку, кінуў наперад зірк, занёс нагу — і пантофляй нібы лучыў па цагліне, што звалілася зьверху. Болю не адчуў і адразу ўзьняў галаву. Парэпаны гзымс быў без аднае часткі.

Юнак міжволі ўсьміхнуўся, хмыкнуў: яшчэ б адно імгненьне — і мазгі набакір. Дзякуй Богу, пашанцавала. Подзіву было больш, чым сполаху.

«Прыгоды банальней не прыдумаеш. Ніколі ня думаў, што такое можа адбыцца са мной. Што гэта значыць? Часу разважаць няма: чакаюць людзі. Апасьля пакумекаю».

# 2

«Так, як заўсёды: аб сама важным — потым. А тлумачэньне будзе звычайнае: выпадковасьць, недагляд камунальных службаў, дрэнная якасьць матэрыялу і працаў. Зазвычай Адам яшчэ спасылаецца на пагоду і на няўдалы дзень; як ні дзіўна, але апошняе бліжэй да праўды.

Дык, можа, цяпер… Пасунуць яго далей і прыадкрыць сэнс, паказаць краёк іставетнасьці ?..

Чаго ён так пабег? І гэта тады, калі стукаецца лёс! Варта суняць? Не, нязручна ў мэнтальнай праекцыі… Яго помыслы ня тыя: шпаркія ў непажаданым кірунку. Прыйдзецца зноў адхіліць камбінацыю і загадаць, каб усе разыходзіліся. Змайструйма прыдатнае іншым разам, найперш зазірнуўшы ў касьмічны інфармацыйны масіў. Усё адно ён — наскі і нікуды ня дзенецца.

Эх, Адзік, ведаў бы ты, што ў Сусьвеце не адзін, а ў сваім мностве, што па-за гэтай сфэрай табой апякуюцца, вядуць цябе!

Адчаго *здарэньні* не насьцярожваюць людзей? Не змушаюць да роздумаў, аналізу, абагульненьняў?

Каго я пытаюся? Сябе. Сьмешна: мне ж усё вядома. Значыцца, зноў разгуляўся. Тады трэба адказваць — такі парадак.

...У гэтым вымярэньні большасьць лянуецца, мала мысьлюе, пазьбягае нязвыклага. З варыянтаў выбірае прасьцейшы, знаёмы, пратаптаны. Здавалася б, менавіта вынятковыя, дзіўныя, мудрагелістыя павінныя выклікаць натхненьне й асаблівы поцяг. Аднак жа не: неспазнанага на Зямлі ўсё адно безьліч!

Падчас мы, нябёснае павадырства, знарок, сумысна ўжываем трывіяльныя, як вось гэтая, сітуацыі, каб падштурхнуць істоту да патрэбных высноваў, — але і тут марна. Калі ж і намёкі не бяруць, тады проста частуем важкай поўхай ці сэнсавай доўбняй, але і гэта не заўсёды спрацоўвае: чалавек дужа тугі!

Застаецца тольма спрыяць ды чакаць, каб людзі паразумнелі. Але жданкі-спадзяванкі, як і многае ў Сусьвеце, могуць быць бясконцымі.

Надакучыла!

Пазбыцца б *і гэтай* ілюзіі пра чалавецтва, скінуць несуцішны клопат дый заняцца чымсьці больш значным, неараўнаным, уцешным...

Няёмка, але мушу прызнацца: усё, што я стварыў тут, — ня лепшае аж да паскуднасьці! Колькі энэргіі пайшло на пустку!

Досыць марнатраўства!

Аж не! Згарнуць гэтую рэальнасьць, як абрус-самабор, і спрытна закінуць, нібы торбу, на сьпіну не атрымаецца: муляць будзе, бо далёка зайшоў, задаўніла, засмактала... Так, трэба й надалей клапатаць, зазнаваць, старацца, унікаць ліхатні. Наогул сваю працу неабходна цаніць, шанаваць, ставіць

іншым у прыклад. І абавязкова дадаваць патасу і вялічча — гэта ў мяне заўсёды атрымліваецца на выдатна, нават валей.

А калі не вылузвацца і па шчырасьці: галоўнае ў маёй чыннасьці — бава й пацеха, ды яшчэ — невераемная асалода. Такі самавіты і велягурысты майстар, як я, Вадар, на ўсім гэтым добра разумеецца. Мае ўмецтва, вялікасьць і ўзровень пазасланяюць любога.

І ўсё-ткі — зьмяніць бы парадак, увесьці б іншыя правілы дзеля добрага буянства і любаценьня... Эх!

Штойта мяне гэтак разьвярэдзіла-разьятрыла? Ніяк чалавечым пацягнула, людзкім патыхнула. Узапраўды, з кім павядзесься, ад таго і набярэсься.

Льга спацішыць сябе, спамеркаваць настрой. Мне яшчэ дзеяць і дзеяць, столькі спасьцігаць касьмічнага бязьмежжа ды выяўляць асабістага волатаўскага духу, што галоўнае — не расьцерушыць, захаваць сваю існасьць!

Дар і кон у мяне своеасаблівыя. Яны занатаваныя ў Вечнасьці як стваральніцкія, наватарскія і магутныя. Зь імі я дасягну сама запавечных вышыняў. Наперадзе — назьдзіўная і хвалюючая дарога.

А пачыналася яна, як і ўва ўсіх, — ад Нараджэньня.

Яно кожнаму даецца аднолькава: па БОСКАМУ Прызваленьню-Пажаданьню і адзін раз. Апасьля Існаваньне ахінаецца неабходнасьцю, гульнёй-барацьбой, выбарам, сьцьвярджаецца ў Творчасьці ды прымае мноства формаў, вобразаў і кірункаў рэалізацыі.

О! Колькі варыянтаў, варункаў і мэтамарфозаў я прайшоў! Недзе ў касьмічным летапісе, на табліцах сусьветнае кронікі ўсе яны пазначаныя і адцененыя маёй адметнасьцю, характарам, норавам.

Калісьці, выбіраючы цярністы шлях, не жадаючы простых, бясхібных і лагодных лініяў, я апынуўся ў Стане: ня ў тым,

які большасьць ведае як вітунічнападобную скупнасьць яркіх сузор'яў, а ў тым, што існуе наспадобу суквецьцю шматлікіх вымярэньняў, перакрыжаваньняў, ростаняў, завулкаў, тупікоў, узвышшаў, упадзінаў, выгінаньняў, выпукласьцяў, пукатасьцяў, увагнутасьцяў, угнутасьцяў Прасторы, Часу і мае пераважна абсалютную, наўмянальную, сапраўдную, самаістую зьмест-форму. Вандраваць, перамяшчацца, пераўтварацца ў такой зьменчывай зьлітнасьці, злучы выяваў, зьведваць-адчуваць усемагчымыя рэакцыі — найцікавейшы занятак. І я паспрабаваў шмат чаго з гэтага, многа ўзяў, можа, крыху болей, чым іншыя. Здавалася б, упівайся дасягненьнямі, ганарыся нажыткам, спачывай, жыві ў розвалі і чакай БОЖАЕ мілаты.

Але, няўрымсьлівы, я разважыў іначай і пайшоў на ахвяру: вырашыў зрабіць *крывічэсьлівы пастулак і ўпасьці*, то бок спусьціцца ў ніжэйшую слань матэрыі, каб разблытаць блуднікі і прасьвятліць дарогу, дапамагчы аблудным. У ліку іншых канашоў я сьвядома абраў выпрабаваньні і магчымую пагібель. Калі хто ніколі ня бачыў у вачах вырата-ванай істоты агню радасьці, той не зразумее такога ўчынку. Потым недасьведчаныя і проста прайдзісьветы, перакручваючы, выпачаючы сэнс, усё патлумачаць інакш, назавуць наш атрад дабрамысцаў выгнанцамі, палымі, адрынутымі, аддадуць іх асудзе — гэта значыць, пераважыць лухта.

Нічога ня зробіш: у Космасе бясконца, без спачынупрадышкі валадарыць **аскрайнасьць**. Яна настолькі аб'ёмістая, усемагчымая, шматварыянтная, што нават мне ўявіць яе цалкам неверагодна. Што ўжо казаць пра такіх ніжэйшых стварэньняў, як людзі! Для іх разам са звычайнымі і зручнымі шырока ўжываюцца *дзьве процілеглыя формы аскрайнасьці — праўднасьць і ашуканства*. Удатна і ўмейна скарыстоўваць-камбінаваць іх — познатка майстэрства.

Кожны стварае-будуе свой сьвет адпаведна талані і спрамогі. Нашай камандзе — *усемагутным Абстракцыям* — уласьцівыя свае адметныя подступы ў асьвечанасьці і станаўленьні чалавека, і яны, я ўпэўнены, зьяўляюцца ўзорнымі для падобных варункаў.

Азначаны выпадак з Адамам — не вынятковы, стандартны, шырока распаўсюджаны і адначасна своеасаблівы, арыгінальны, як непаўторная і самабытная кожная людзіна. Тым больш што справа тычыцца індывідуальнасьці, якая для нас, творцаў і апекуноў, мае важнае значэньне».

# 3

Сьвятар ненатуральна мітусіўся і няўтомна гаварыў, завіхаючыся над сталом, дзе ў безладзі грувасьціліся нейкія паперы, інкунабулы, старадрукі, кнігі і шмат якое царкоўнае начыньне. Раз-пораз ён выхопліваў з гэтага груду нейкую рэч і, махаючы ёю, нястотна пераконваў:

— Вось яшчэ адзін доказ таго, што сабор належыць мускай крываслаўнай царкве і мае менавіта такі архітэктурны выгляд… А зірні сюды: на старазлавянскай мове падрабязна апісваюцца ўнутранае ўбраньне і вонкавыя асаблівасьці ўсіх памяшканьняў. Ніякіх спамінаньняў аб іншых канфесіях ня знойдзеш, таму што іх не было і няма.

— Нашыя гісторыкі сьцьвярджаюць, што царква (а дакладней: ***сьвятыня*** — так яна называлася ад пачатку) на гэтай гары пабудаваная вуніятамі задоўга да мускай навалы і адабраная ў іх супраць іхняе волі, а сапраўдныя, ліцьвінскія дакуманты масейцы адны зьнішчылі, другія вывезьлі ў метраполію, — пярэчыў Адам.

— Хлусьня! Фальсыфікацыя! Нацыяналістычныя выбрыкі! Нічога такога не было. Усё рабілася добраахвотна, па жаданьні бальшыні вернікаў. Гэта пацьвярджаюць і паперы. Вось яны! Дарэчы, усе людзі скарыстоўваюць больш канкрэтныя назвы — «сабор» і «храм».

— Даўны аблуд. Зь іншых крыніцаў вядома, што мнопія з такіх матэрыялаў сфабрыкаваныя.

— Табе, самавітаму спадару, сорамна разважаць бяздоказна і спасылацца на чыесьці сумніўныя меркаваньні. А можа, ты *нам* наогул ня верыш?

— Пра гэта і размовы няма, але ж я — даражбіт і дасканалае, дакладнае адраджэньне менавіта *гістарычнае сьвятыні* для мяне дый для ўсіх устурбаваных — прынцыповая і важная справа. Не на дзень-два гэта робім. Навечна! Схібіць тут нельга. Разумееце?

— Безумоўна. Ад таго, якой будзе тут царква, залежыць наш духоўны стан.

Сьвятаслужнік глядзеў на дойліда натхнёна, з надзеяй, усьведамляючы, што мэты ў кожнага розныя. Калі Адам казаў шчыра, то ён — хітраваў, перайначваў сэнс.

І ўсё гэта было відочна. Толькі ня ў гэтай, фізычнай, выяве. А ў **той**, якая атуляла-працінала ўвесь матэрыяльны сьвет нябачным сэнсам і рухам, дзе ўладарылі Абстракцыі, адчуваньні і мысьлі, адкуль распасьцілалася ўладная і кіраўнічая сіла. **Яе** яшчэ найменілі шырока — тагасьветная, замагільная, звышнатуральная, непазнавальная, нябачная, паралельная, інакшая, і вузка — інфэрнальная, нябёсная, астральная, мэнтальная, вогненная, духоўная. У **ёй** існавала **ўсё** і куды больш таго, чаго чалавек ня ведаў.

Мана-лжа са сваімі прыяцелямі гамузам кантралявалі сітуацыю, ініцыявалі патрэбныя павароты, узьдзейнічалі на сумоўцаў. Служка культу з-за асабовай прыроды

і дастойніцтва зьяўляўся ледзь ня змалку сталым іхнім аб'ектам, сваёй двудушнасьцю-аблуднасьцю заўсёды наталяў, замілоўваў іх, даваў ім прастор для творчасьці. Яны глыбока шанавалі пароха яшчэ і за тое, што яго — а значыць, і Ману з кампаніяй — часта запатрабавалі для вырашэньня многіх сур'ёзных пытаньняў, якімі кіраваў сам Вадар. Быць навідавоку павадыроў — важная справа.

А вось да Адама брыгада тагасьветных ашуканцаў вялікіх дачыненьняў ня мела: тыя дробныя шабунькі-закабунькі ды бытавуха, якіх хапала ў кожнага, не лічыліся. Хлопец быў мастак валодаць досьціпам, мудрагеліста шкеліць-выдумляць зь лёгкім, незласьлівым падвохам-найгрышам — толькі такога досьведу, каб запрэгчы яго, круцялям было мала. Неабходна было шукаць-ствараць іншыя, значныя і важкія, траплі-камбінацыі.

І вось адная такая надарылася якраз. Нібыта трапна. Але ўсе выдатна разумелі, што нічога выпадковага не бывае: за кожным здарэньнем абавязкова стаяла тонкая, майстэрская работа ўсёй арміі карэлянтаў.

Калі адыёзная ідэалагічная сістэма, на чале якой стаяла нахрапная Масея, ляснулася і атэістычны дурман выпарыўся, людзі зноў зьвярнуліся да БОГА і да сапраўдных каштоўнасьцяў. Дзеля гэтага ўважна і непрадузята зірнулі на гісторыю і знайшлі, што нічога асаблівага выдумляць ня варта, там ужо ўсё ёсьць: толькі тое трэба ўмейна адаптаваць да сучаснасьці.

Сярод шчыракаў і ахвочых да адраджэньня быў і Адам. Ён ведаў, што на высокай гарадзкой гары некалі стаяў вялізманы дом БОЖЫ — і сюды для маленьняў сьцякалася мноства паспалітага люду. Сьвятыня існавала на працягу стагодзьдзяў, зносіла розныя перабудовы і ў выніку была разбураная масейскімі барварамі. Вярнуць ёй першародны выгляд і бажаў Адам

як архітэктар. Ён пачаў зьбіраць неабходныя зьвесткі і, на дзіва, сутыкнуўся зь цяжкасьцямі, якія ўзьнікалі нават там, дзе, па яго разуменьню, іх не павінна было быць.

Ох, і блытанай, выкручастай зьяўлялася гісторыя, дакладней — гістарычная навука! Асабліва ў розных тлумачэньнях, аповесьцях, крыніцах! Ці ведаем мы, як насамрэч яна занатоўвалася і хто такія былі гэтыя летапісцы? А галоўнае — **колькі праўды** ў тым, што яны пісалі? Вось сядзіць такі ціхмянамудры старац у сваёй келятцы, пазірае нібыта ўдалеч, а рэальна — у цёмны кут, старанна-акуратна рыпае пяром, час ад часу калупаецца-сьвідруе пальцам у носе і, знайшоўшы дакладны выраз-азначэньне, натхнёна заўражвае для нашчадкаў чарговае стацьцё. Яшчэ ня йшло, калі ён у добрых стасунках з князем, ваяводам ці іншым панам, — тады і гісторыя атрымаецца лепшай. А калі не? Раптам пісаку грызе крыўда на нейкага ўдзельніка падзеі ці на тое, што ніхто і талеру дадатковага не дае за ягоную важную, нястомную працу? Верагодней за ўсё, пісьмо будзе такое, якое замовілі альбо купілі. Дзе ўжо тут чакаць ахайнага і яснага выкладу, пунктоўных тэрмінаў і вынікаў нейкай прыгоды! Які настрой — такая і гісторыя!

А хіба інакш адбываецца ў нашыя часы? Подступы адныя і тыя ж! Толькі робіцца ўсё ў кабінетах.

І ўсё ж да стараветных працавікоў больш паважныя стаўленьні, чым да тых, хто ўжо зафіксаваную гісторыю карэктуе, перапісвае, фальсіфікуе — а гэта рабілі і робяць многія, асабліва кады ў нейкага «дзеяча», палітычнага, дзяржаўнага, грамадзкага, прыватнага, высьпела неабходнасьць нешта падладзіць пад сябе. Апэтыты ў падобных «творцаў» могуць сягаць у старажытнасьць аж да мамантаў і нават далей. Мала таго: яны, абмежаваныя, яшчэ і будучыню сілуюцца змадэляваць. Асаблівыя думчыны заўсёды выклікае

масавае памяшаньне, калі цэлыя народы лічаць, што варыянт гісторыі, прапанаваны ім уладамі і, як правіла, хлусьліва-прыхарошаны, — выключна правільны і нікім не павінен пераглядацца ў бок праўдзівасьці. А калі такое адбываецца, тады смельчакі-дасьледчыкі трапляюць у разьдзел ворагаў, як тое ня раз здаралася ў Масеі. Насільле і дзікунства для гэтай краіны — звычайная справа ня толькі ў чалавечым, але і ў шматмерным касьмічным сьвеце.

Так, апошнім часам масейскім шавіністым зайшло ў галаву, што наогул уся гісторыя — несправядлівая і напісаная благім Захадам выключна для таго, каб узьвялічыць сябе і зьняважыць мусаў. Маўляў, большасьць крыніцаў, падзеяў, асобаў была выдуманая, падтасаваная, перапробленая, ссунутая ў часе і не адпавядала гістарычным рэаліям, асабліва калі зьвесткі датычылі масейскіх тэрыторыяў. З раздражненьнем і злосьцю яны заўсёды каментавалі мапу Эўропы Олаўса Магнуса 1539 году, дзе было адлюстравана, што далей на ўсход ад Ліцьвініі ніякай дзяржавы няма і толькі мядзьведзі ходзяць ды лазяць па дрэвах за дзікімі пчоламі. А пра тое, што нават масейскія крыніцы сьведчылі аб неразумнасьці мусаў і неаднаразовых запрашэньнях замежнікаў на кіраўніцтва-дапамогу, самі стараліся ня згадваць. Увогуле з нагоды і без яны сьцьвярджалі: тольма летапісцы, гісторыкі Масеі аб'ектыўна асьвятлялі мінулае і давалі правільныя веды. Каб даказаць гэтую мітургу, пачалі, як здурнелыя, гойсаць, гарцаваць па ўсім сьвеце ды шукаць адпаведных сілаў, сродкаў, часоў, настрояў. Мана-лжа, як дападная і актыўная Абстракцыя, ад задавальненьня весялілася, старанна клапатала і зьбірала дужа багаты ўраджай.

Узгадаваны на разнастайных першакрыніцах і ведаючы сапраўдную цану факту, Адам зь недаверам ставіўся да ўсіх, хто яра адстойваў дакладнасьць і дазоднасьць мускіх сьве-

дчаньняў. Ён пераканаўся: адзінае, што было ў іх праўдай, — гэта бессаромная фальсыфікацыя гісторыі і нахабнае, выгоднае яе прыстасаваньне. Уражвала заўсёднае, нават хваравітае ўмецтва мусаў перакручваць падзеі: калі цяпер, у час адкрытасьці, празрыстасьці і ўсялякага кантролю, яны бязочліва і нахрапна хлусілі, дык што ж яны рабілі раней, калі зьвесткі распаўсюджваліся з хуткасьцю чалавека ці каня? Вывучаючы розныя дакументы, сустракаючыся з размаітымі дасьледчыкамі, Адам прыйшоў да высновы: *гісторыю робяць людзі — толькі не яе ўдзельнікі, а апавядальнікі.*

# 4

Калі гэта яшчэ зразумела, дык тое, што менавіта *такі* падыход зьяўляецца асноўным **ува ўсёй шырокамаштабнай касьмічнай сфэры існаваньня**, — цяжкаўяўна!

«Ня можа быць!» — зьдзівяцца адукаваныя і ўніклівыя.

«Так!» — падумаюць, але не адразу пагодзяцца пасьвячоныя і празорлівыя.

Вадар і ягоная дружына адмыслова ўспрынялі ды прыладзілі да сябе законы сусьветнага будаўніцтва, дадалі да іх нямала арыгінальнасьці. Іхны варыянт існаваў у ліку сама разнастайных і мудрагелістых.

Праўда-істасьць, ці тое наўмянальнасьць і абсалютнасьць, была агорнута-ахінута-аблытана такой гульнёй, інтанацыяй, іроніяй, спакусай, каведзьдзю, баламуцтвам, выключнасьцю, незвычайнасьцю, скрыўленьнем, інамыснасьцю, таёмасьцю, недамэтнасьцю і іншым вычварным умецтвам, так майстэрскі перайначвалася, што любы шукач яе ніколі не знайшоў бы. Толькі адзін Творца-Вадар ведаў усе ходы,

чым вельмі ганарыўся. Ён лічыў за **галоўнае дзейнасьць**, якая заўсёды прыводзіла да **выніку**. Якога? Адказ на гэтае пытаньне ў кожнага свой, і давала яго толькі Бясконцасьць. Выраз «мэта апраўдвае сродкі» Вадар успрымаў як павярхоўны і абмежаваны для глыбакадумнага стваральніка.

**Рэальнасьць людзей належала да забаўных**, але пераканаць іх у гэтым было дарэмна: сур'ёзнасьцю яны ўражвалі. Да такога стану ўсе тагасьветныя апекуны, ці бо Абстракцыі, прызвычаіліся і, не зьвяртаючы ўвагі, дзеялі як лічылі неабходным і нікому зь ніжэйшых нічога не тлумачылі: хіба можа дасканаласьць зьмясьціцца ўва ўбогасьці?

У сапраўднасьці любая зьява, падзея, факт, стварэньне мелі такі багаты касьмічны выгляд, што толькі мізэрам, макулінкай, брыжыкам уваходзілі ў чалавечыя ўражаньні — гэтак у асаблівых умовах будынак мажліва заўважаць як адзін кант.

ДОМ БОЖЫ — як ідэя, твор, аб'ект — у Сусьвеце ўяўляў сабой неверагодны сінтэтычны абраз з мноства духоўных, мэнтальных, астральных, матэрыяльных праекцыяў прасторы і часу, а ў фізычным вымярэньні бачыўся-ўспрымаўся людзьмі пад абліччам прыгожай царквы на высокай гарадзкой гары.

Прычым у маштабах часу выява паўставала адразу ў лучнасьці-зьлітасьці ўсіх адменьнікаў праектаваньня, пошукаў, экспэрымэнтаў, падрыхтоўчых працаў, пабудовы, разбурэньня, аднаўленьня, рэканструкцыі, адраджэньня, росквіту, заняпаду і, безумоўна, удзельнікаў — людзей.

Толькі са сьвятыняй *такога* выгляду мелі справу мэтафізычныя руплівцы. Яны ведалі і разумелі зразу ўсё прошлае, сучаснае, будучае, а думкай, адчуваньнямі маглі ахопліваць яву як цалкам, так і ў асобных дэталях — гэта давала ім вялікае пяршомства перад чалавечымі істотамі,

якія былі здольныя ўспрымаць сьвет толькі на адной шкале часу.

Так, разам з будаўнічымі рыштаваньнямі царквы, тагасьветныя сілы дакладна бачылі і яе паэтапнае існаваньне, і моманты зруйнаваньня, адраджэньня, а таксама ролю кожнага чалавека ў гэтай гісторыі.

Яны прызнавалі, што было б **намнога прасьцей, калі б людзі зьяўляліся несьвядомымі і бязьведамнымі, як усе астатнія плянэтныя стварэньні**. Тады зручней скарыстоўваць іх, маніпуляваць імі дый наогул тварыць на Зямлі.

Па сутнасьці, першапачаткова яно так і задумвалася: даць чалавеку адно глузды, ня болей. Але знайшоўся адзін цямкі і сьмелы ўмец (сапраўднае імя запэцкала, перайначыла, заблытала рознымі назовамі фізычная гісторыя, а захоўвала-адлюстроўвала толькі Вечнасьць), які дзеля газарду і шыку, ***параіўшыся з Вышэйшымі***, надзяліў яго сьвядомасьцю і тым самым заблытаў усю гульню. З тае хвіліны і пачаліся ірмосы: Гаспадар-Вадар быццам бы той жа, свайго стаўленьня да зьменаў адкрытна не паказвае, але агульны парадак у брамфатуры не такі, перакручаны, бо *думчывых стала болей*. Нешта зноў мяняць ніхто не бярэцца, а кідаць забаву-пацешкі наогул, гужы ўцяць нікому несамавіта.

Ёсьць шмат касьмічных сістэмаў-гігантаў, дзе матэрыяльнае быцьцё арганізаванае па іншых законах і розум пераўтвараецца інакш, так, як чалавеку і ўваабразіць немагчыма. Гэта толькі на Зямлі лічаць, што тутэйшая рэчаіснасьць уцягвае ўсё, уласьцівае неабдымнаму Сусьвету, і па аналёгіі зь ёй можна скласьці наўмянальны выгляд ТВАРЭНЬНЯ, а насамрэч наш *астранамічна-прадметны сусьвет* — толькі нязначная і пэрыфэрыйная клетка вялізьнейшага *філаменту*, у які аб'ядноўваюцца супергалактыкі воляю АБСАЛЮТНАГА РОЗУМУ.

Вадар пра гэта ведаў і меў зносіны з многімі сваімі калегамі. Чыннасьць адных яму падабалася, другіх — не. Некаторых, энэргетычна несумяшчальных, ён наогул пазьбягаў і заўсёды змагаўся супраць любых замахаў на сябе і ўласную брамфатуру, высока ацэньваючы свой адметны твор. Захавацца сярод разнастайнасьці ды яшчэ ў барацьбе было нялёгка і каштавала шмат сілаў. Здараліся і перамогі, і паразы. Але галоўнае — *радасьць творчасьці!* — прысутнічала заўсёды.

Яму па духу было выпрабоўваць сябе,ісьці складаным шляхам.

Так, калі ўва ўладаньнях пабольшала сьвядомых, Вадар вырашыў павесьці іх да дасканаласьці па аб'ёмістай *матэрыяльнасьці* праз *самаспазнаньне*. Адтаго і зьявіліся розныя *адчуваньні і выразы, мова*. Сваёй мудрасьцю і дасягненьнямі ад такой тактыкі ён ганарыўся, бо яна выкарыстоўвалася мала дзе ў Сусьвеце. Большасьць прыняла адразу *мэнтальныя* мэтады, якія, здавалася, хутчэй праясьняць навародных. На практыцы яно ў многіх так і адбылося, але выйшла, што стварэньні без належнага досьведу самаспазнаньня фізычнай рэальнасьці і ўсіх складнікаў гэтага спосабу атрымаліся недастаткова дасьведчанымі і наўзорнымі.

Асаблівага разьвіцьця індывідуальнасьць дасягнула, калі сьведам'е, як прыналежнае да вышэйшага, сутыкнуўшыся з абмежаванасьцю, загадкавасьцю і нават таямнічасьцю рэчыўнага сьвету, адразу не атрымала дастатковых адказаў на хвалюючыя пытаньні і стала *здабываць веды праз мову*. Дарэчы, так, як гэта выяўлялася зь зямлянамі, было ноўніцтвам Вадара. З аднаго боку, мова навучыла называць усё навокал, абазначаць прадметы і зьявы, мысьляваць вобразамі, з другога — шляхам параўнаньня і падабен-

ства дазволіла абагульняць, выдумляць, фантазаваць і... *падманваць — адмета, бадай, адной Зямлі.*

Вось тады і нарадзілася армія Абстракцыяў, якіх у многіх іншых сусьветах не існавала.

Адчуўшы магію слова і моц усякага гучнага найменьня, людзі сталі настройваць сьведам'е, зеціць-пазнаваць прыроду больш уяўна, ілюзійна, скажона, прыпадобнена, скрыўлена, то бок адступаць ад сапраўднасьці.

Тым ня менш Вадар з памагатымі ўбачылі вялікае раздольле для творчасьці і дзейнасьці ў ваджэньні жыхароў Зямлі па сама складаных шляхах удасканаленьня — гэта памнажала значнасьць і важнасьць выбранага напрамку.

Вось і натужваліся-высільваліся майстры-вярхоўнікі, усё мкнуліся даць рады чалавеку зь яго няпростым розумам-сьведам'ем. Толькі клопатаў і высілкаў набягала больш, чым перамогаў і радасьцяў.

Нават у дробязях было шмат энэргетычных выдаткаў. Пра глябальныя подзьвігі-вычыны заставалася адно што марыць.

У такой вось ілюзіі, супольным падмане прабывалі-векавалі і творцы, і іх стварэньні.

«А праўду казаць страшна, бо будзе яшчэ горшы хаос, — да такой высновы ў які раз прыйшоў Вадар, крануўшы агульнае касьмічнае відовішча Сьвятыні. — Трэба неяк усё дакончыць прыстойна, а то засьмяюць».

Злавіўшы ў сусьветных інфармацыйных масівах нават лёгкі подых антаганізму — нечыя думкі пра Праўду, — чуйная і непрымірымая Мана тут жа паўстала перад Вадаром.

— І адчаго ўжо *тут* узьнікла недарэчнасьць? — нібыта са спадзівам спытаў Вадар. — Хто напартачыў? Мне некалі займацца нягздарамі: ува ўтыль іх!

— Ды не, усё як мае быць, — захвалявалася Мана, бо ведала: ёй, як сама галасістай у нябёсным хоры, калі што — адказваць першай. — Вядзема як і патрэбна, трохі папраўляйма разумнікаў, каб залішне не адхіляліся ад стратэгіі. Калі пратэстуеаскірзаецца Наскі — нам ужо надакучыла зь ім кешкацца, — то мы безь ніякіх тлумачэньняў запрашаем на падмогу Іхнага і нават Усіхнага.

— Толькі не захапляйцеся, ня рушце, бо як-ніяк, людзі — сьвядомыя, і мадзець разам зь імі нам прыйдзецца ой яшчэ колькі. І Наскага ня крыўдзіце, цярпліва перамаўляйцеся, угаворвайце: мала што ён — натурысты, усё ж такі гэта ягоная дзедзіна.

— Няхай так. Кожны ведае сваю задачу, выконвае яе вартна, самавіта, правільна, Крадзеж? — і Мана з асаблівым энэргетычным утрапеньнем прытулілася да, бадай, сама лепшага спакусьніка-баламута выяўленых сьветаў, зь якім усе Абстракцыі, акрамя Праўды і яе памочнікаў, мелі выгодныя і прыязныя дачыненьні. — Але ўсіх грызе агульнае пытаньне: дакуль мы будзем праваджаць гэтае быдла?

— Супакою: *не заўсёды*! А турботы абгрунтаваныя: вы марыце пра іншыя ролі, вычыны. Няўжо запамяталі: адукоўваць і весьці ніжэйшых па лесьвіцы духу — сама богадагодная і натхнёная справа. Што можа быць лепей за нараджэньне і стварэньне! Калісьці і над вамі нехта шчыраў, завіхаўся. Апякунствам, настаўніцтвам усе мы цешымся. А бацькоўства наогул пераважвае ўсё. Няма большай радасьці, чым бачыць, як узьлятае тваё птушаня! Пра канчатковы момант кіраваньня казаць ня буду, інакш у вас прападзе запал. У Сусьвеце ў кожнае імгненьне хтосьці дасягае вышыні. Апошняя прыступка — да ЯГО — перадольваецца самастойна. На ёй усялякі брат-брахна — ужо

дасканалы, *сапраўдны*. Штойта такое? Нават я ня ведаю. І ніхто іншы. Толькі — ЁН.

— Значыць, ад апошняй прыступкі лесьвіцы, па якой ідзе чалавек, мы — вольнікі і маем права выбіраць нешта іншае?

— Так, што заўгодна альбо з канца, альбо з пачатку.

— Зразумела: як і дасюль — *у кругу нябесным*. І больш нідзе?

— А хіба гэтага мала — *паўсюль*? *Калі можна ўсё*?

— І зьнікнуць? Каб і спаміну не было?

— *Гэта* зноў-такі ўва ўладзе толькі ЯГО.

— Ніхто ня ведае — значыць, адбываецца *і гэта, і многае іншае*.

— Ты, Мана, да чаго толькі ні дадумаесься, каб паказаць сваю ўнівэрсальнасьць і ўсюдыістасьць.

— Безумоўна, хлусьня і тайна — сэнс і рухавік Сусьвету. Куды там той Праўдзе!

Праўда здрыганулася-страпянулася, нібы ад калючкі, гурна-незадаволена зірнула навокал: маўляў, хто тут такі спрытны яе зачапіў? — і, знайшоўшы сваю спаборніцу, спакойна-годна паслала мэнтальную хвалю безразрожлівасьці, непрыемную многім.

Сумоўнікаў тут жа крануў іншы настрой.

Вадару былі вядомыя ўсе магчымасьці кіроўцаў, але ён не любіў, калі абсалютызавалі нешта адно, асабліва за кошт іншых, і заўсёды перапыняў ініцыянта. Усталяваць гармонію, асабліва ў падапечным праяўленым сьвеце, было нялёгка, дый, адкрыта кажучы, да гэтага ўвогуле ніхто і нідзе не імкнуўся, каб ня страціць слодыч процістаяньня і барацьбы.

Як і ўсе стасункі, гутарка была адкрытая, парытэтная, успрыманая і даходзіла да кожнага з касьмічных братоў, таму Вадар слушна падагуліў:

— Сярод нас няма такіх, без каго існаваў бы Сусьвет. Усе — патрэбныя, важныя і дарэчныя.

Праўда ніяк не адрэагавала.

Мана зьлёгку смыкнула, але вырашыла не пярэчыць, ведаючы правілы гульні і ролі ўсіх канашоў, і адразу пераключылася на зямныя клопаты.

Між Праўдай і Маной адвечнымі былі ня толькі супярэчнасьці і проціборствы, але і супрацоўніцтва. Гэта было вядома ўва ўсім Космэ. Усё залежала ад характару стасункаў у канкрэтным вымярэньні, ролі ўвасабленцаў, задумаў кіраўнікоў. Часам адна перацякала ў другую і наадварот. Зьмяняць палярнасьць, зьлівацца ўвадно — агульная якасьць усяе істасьці.

# 5

Усе былі зацікаўленыя ў аднаўленьні сьвятыні. Але — у якім выглядзе? Ніяк не маглі дамовіцца. Сутыкнуліся ня столькі розныя гістарычныя падыходы, колькі неаднастайныя сучасныя палітычныя, грамадзкія, нацыянальныя, маральныя і культурныя інтарэсы. Атрымалася, што ведаць гісторыю не абавязкова. Дастаткова ўяўляць прадмет спрэчкі і ягонае сучаснае значэньне-карысьць для бакоў ды ўдала падлучыць зухвальства, балаканьне, дэмагогію, шальмаваньне і многае іншае са збройні Маны-лжы.

Гэтая ў які раз адчувала сябе як на сьвяце, прыбіраючы да сябе ўсё больш ахвочых пацягацца-патузацца-палаташыцца ўва ўсіх вымярэньнях. Найбольш за ўсё яна разьлічвала на Сілу, да якой падкаціцца было няпроста з-за яе высокага попыту: усім была неабходная моцная падтрымка, безь якой у Сусьвеце доўга не працягнеш. У кожнага была свая прычына, неабходнасьць, абаснова і, як правіла, важнейшая і апэратыўнейшая за іншыя. Адно,

што дапамагала Мане заўсёды, — гэта дзіўная і да сьмешнага неабходная яе блізкасьць, нават роднасьць, зь Сілай: абедзьве выпадкамі не маглі існаваць адна без другой, асабліва калі стасункі патрабавалі негатыўных формаў, хітрасьці, карысьлівасьці, хцівасьці, спосабаў блытаніны і выкручваньня, насільля, гвалту, зьдзекаў, захопу і падобнага.

У сітуацыі са Сьвятыняй Мана і Сіла таленавіта, па-майстэрску скарысталі тонкую і ледзь адчувальна-ўспрыманую спохватку — эмацыйна-псыхалягічны ціск шляхам жангляваньня-пералганьня фактамі.

Адам быў сунуўся ў гэтую каламесу-каламуту са сваёй праўдай, упэўнены, што доказы ў яго бясспрэчныя, але, убачыўшы яўную крутню-мутню і друхлядзь, крыху адступіў і разважыў.

Працэсам кіравалі сама лепшыя памагачы Маны і Сілы ў рэальным сьвеце — **улада і рэлігія**: хаўрус небясьпечны, са сродкамі ня чціўіцца. Заўсёды, калі гэтыя заступнікі дамаўляліся і ішлі ўпобачкі, наступала бяда. І зараз яны так спараваліся, што брыдка было назіраць іхныя прылюдныя, выпачаныя акты. Амаральнасьць была навідавоку. Бывалыя махалі рукой: так было заўсёды! А сарамяжлівыя ківалі галовамі: гэтага не павінна быць?

У тагасьветным ракурсе назіралася сумятня: кожны апякунудзельнік склікаў служкаў і не адыходзіў ад свайго чалавека, маніпулюючы ім так, каб ён фізычна-дзейсна не адхіліўся ад галоўнай лініі падзеі і сваімі недалужнымі мысьляваньнямі-развагамі (у собскіх меркаваньнях індывіда гэтыя былі найвышэйшага гатунку) не стварыў інакшую, неадпаведную і цяжкавырашальную камбінацыю.

Іншым разам і Адам адвярнуўся б ды пайшоў прэч: і не такое назіраў за людзьмі! Але справа закранала не яго ўласны твор і праект, а тое, што было зьнітаванае зь векавой

гісторыяй, духам ды гонарам яго народу — нацыянальную Сьвятыню Веры. Хіба можна тут парушаць арыгінал? Нават нязначная староньняя рысачка ня ўпісвалася ў агульную кампазіцыю і шкодзіла гармоніі. Любое ўмяшаньне — і будзе пакалечаны велічны архітэктурны вобраз. А яму стаяць стагодзьдзямі! І надзейна злучаць Зямлю зь Небам! Людзей з БОГАМ!

Трэба ні ў якім разе не скрыўляць гэты шлях!

І ў Паднеб'і спраўна зецілі Сьвятыню ў аб'ектыўнай прасторава-часавай выяве, пранікліва цікуючы тольма тых індывідаў, чые помыслы маглі паўзьдзейнічаць на суцэльны вобраз будынку, ягоную духовую сутнасьць і — барані БОГ! — раскалываць яго ня так, як тое было ў агульнай задуме. Да Адама быў сама пільны нагляд.

А ён хваляваўся, думаючы над спосабамі даказаць непарушнасьць першатвору, ягонае значэньне для ўсёй Ліцьвініі і для кожнага чалавека. Нічога вартага не прыходзіла — і ад гэтага сэрца калацілася яшчэ больш. На жаль, ён ня ведаў (як ягоныя нябёсныя пакрыўцы), чым скончыцца ўвесь амбарас і якім лязом пройдзецца па душы мітусяніна, інакш кінуў бы ўсё і лепш захаваў бы сябе, сваё здароўе для будучых змаганьняў.

«Больш таго, што адведзена, усё адно ня возьмецца і не адбудзецца, а *няведаньне* толькі дапамагае істасьці, загартоўвае дух і мосьціць на сусьветным прасьцягу цераз жыцьцёвыя выбоіны сама надзейныя кладкі. Трымайся, і палёгка прыйдзе», — разважала-спачувала-падтрымлівала Доля, уважаючы Адама за найрэдкую касьмічную асобу. Яна асабліва завіхалася над розумам дойліда і засьцерагала яго ад залішніх узрушэньняў, бо, як ніхто, магла асягнуць агульную неверагодную хаду гэтага майстра.

# 6

Менавіта з-за таго, што гісторыя добра прайшлася па сьвятыні, некалькі разоў зьмяняла яе аблічча, пазьменна аддавала ў духоўнае ўладаньне розных культаў, справа ўскладнялася. Калі Адам настойліва даводзіў важнасьць першароднага вобразу збудаваньня, то ягоныя спапрэчнікі, асабліва масейскія сьвятаслужнікі, упарта абаранялі чародны выгляд царквы, сьцьвярджаючы, што яна пасьля апошніх зьменаў стала адпавядаць канонам мускай крываслаўнай рэлігіі, якая зараз пануе ў Ліцьвініі, а ранейшай, вуніяцкай ці ліцьвінскай, і ў памоўцы няма. Ніхто зь іх, хоць і ўсе добра ведалі, ня згадваў таго, што калісьці якраз Масея зьнішчыла ўсе формы ліцьвінскае веры і сілком зьвярнула ўсіх у сваю.

Пра архітэктурныя каштоўнасьці, мастацкую вартасьць будынку ніхто не гаварыў.

Зь Вечнасьці, дзе ўсё бытавала непахісна, прызначана і што апекуны так самаадана сьцераглі ды распаўсюджвалі ў сваіх выяўленьнях, ішлі ўсяго лё-

гкія павевы, здольныя ўзбудзіць на месцы любы, малы ці вялікі, працэс, — гэтак зямное дрэва, непарушна стоячы, калышацца толькі сваёй лістотай. У гэтых подыхах адчуваліся багавейлівасьць, сакраментальнасьць, жыцьцёвасьць і магчымасьць усяго, у тым ліку і складанасьць лёсу самой сьвятыні. Ёй было наканавана стаць прасьвядай, дабраслаўнасьцю, аздобнасьцю не аднае веры, а некалькіх, не аднаго народу, а многіх. І прычынаў тут шмат.

Хвала БОГУ, калі нейкі люд, падужэўшы і добра высьпеўшы, займеў сабе для маленьняў велічнае і недатыкальнае збудаваньне на вякі, як тое здаўна назіралася ў сталых краінах, — гэтая гістарычная трываласьць і даўгавечнасьць толькі сьведчылі аб богадагоднасьці і сапраўднасьці сьветапогляду, чалавечай натхнёнасьці, крывічэсьлівасьці, дабрамыснасьці, дабралюбнасьці, дабрачыннасьці і багата яшчэ аб чым, што заўсёды дапамагала народам існаваць.

Шкада, што ліцьвіны не належалі да такой катэгорыі з-за шэрагу акольнасьцяў, галоўнай зь якіх, бадай, было геаграфічнае становішча — на мяжы двух сьветаў: цывілізаванага і барбарскага — колькі існавала Ліцьвінія, столькі яна імкнулася да аднаго і змагалася з другім. То бок ужо гэтым краю перадакрэсьлілі *асаблівую ролю*. Нябёсы, стваральнікі выбралі *яе — пакуты*. Ад простых насельнікаў, у тым ліку на мікра- й макраскапічным узроўні, да цэлай дзяржавы, уключаючы і яе мэтафізычны вобраз, — усяму была прышчэпленая гэтая неад'емная якасьць-адмета, якая стала вызначальнай у разьвіцьці: што б ні рабілі ліцьвіны, усё ім давалася зь цяжкасьцю, мукай, цярпеньнем, бытта яны адны ў сьвеце сунуліся па касьмічнай дарозе.

Былі перыяды, калі замагаліся, мажнелі, жылі дон, заможна, спраўна, наедна, адыж яны хутка абрываліся: прагныя суседзі-грабежнікі дый далёкія земляеды ўвесь час перашкаджалі,

не давалі збыту-аталеку, руйнавалі-вынішчалі, усталёўвалі свае парадкі. Безумоўна ліцьвіны баранілі сваю зямлю, змагаліся за ўсё роднае, мацавалі дух і цела, цягнуліся да дасканалага, БОСКАГА.

Здавалася, і розумам, і справамі, і намерамі заслужылі лепшую долю, здабылі сваё шчасьце, але — трасца, усё адно і тое ж: гора зь бядою ў абдымку хадзілі заўсёды і паўсюль! Адчаго?

Адказ трэ было шукаць толькі ў мэтагістарычных праекцыях. Якім бы ён ні быў, відавочным зьяўлялася галоўнае — *ліцьвіны будавалі ў Космас сваю дарогу мэнталітэтам, адрозным ад суседзяў, іншых народаў*.

Адам ужо ня першы раз выступаў на пасяджэньні па разгляду так званай амяркацыі — пляну сабору, хоць, на яго думку, ніякіх праектаў і іх абмеркаваньняў наогул не павінна быць, бо існаваў адзіна правільны й істапраўдны дакумент — цудам ацалелыя ў гістарычнайператрусцы чыесьці даўнія замалёўкі сьвятыні. Іх ён дэманстраваў прысутным як пацьвярджэньне сваіх аргументаў. Тыя з-за далікатнасьці і па абавязку пазіралі на яго, з удаванай глыбокадумнасьцю ківалі галовамі, але больш зацікаўлена глядзелі на аднаго — масейскага патрыярха Афанасія, які нарэшце ўважыў, наведаў правінцыю і цяпер паблажліва слухаў выступоўцаў.

Для сябе герарх ужо даўно вырашыў, як трэба рабіць, але дзеля пристойнасьці трымаўся агульнага парадку, выслухваў розныя меркаваньні, пытаў, нібыта спрачаўся, выклаў свой пункт гледжаньня, чым даў усім зразумець, якое рашэньне неабходна прымаць. Ён быў упэўнены, што паступяць па яго, нягледзячы на разнамаснасьць збор-дружыны: сьвяшчэньнікі, чыноўнікі, прадстаўнікі грамадзкіх суполак, журналісты, проста цікаўныя, якіх звычайна рыхтавала служба бясьпекі для масавасьці, плюралізму і вызь-

ведніцтва. Толькі яго раздражняў гэты настырны дойлід, які ўсё махаў нейкімі паперкамі і казаў пра вяртаньне прыві-даў — нацыянальнай рэлігіі, вуніяцтва, іхнай царквы... Паганец! Хіба быдла можа мець нешта сваё? Існуе толькі муская крываслаўная вера, інакіх — няма!

Дастойнік бачыў, што асноўная аўдыторыя падкапытная, аднакіх зь ім поглядаў, і дарма тут даводзіць штосьці іншае, адрознае ад ягонай пазіцыі. Як ён пажадае — так і будзе!

Вадар сам вёў прабацьку і сачыў, каб той дужа не адхіляўся ад вызначанага, бо ягоныя думкі і словы, як вышэйшай рэлігійнай асобы, сьвятаразьверхніка, мелі асаблівую вагу ў прасторы і маглі паўплываць на падзеі, нават зьмяніць іх. Трымаючы пастаянны атрад набліжаных кваліфікантаў, ірэальны пратэктар далучыў да сходу дадаткова некалькі сваіх ваяроў і загадаў ім, каб дазвалялі ўдзельнікам адхіляцца ад галоўнага напрамку па мінімуму і тольма ў межах зьявы.

У сусьветным аб'ёмным выглядзе ява паўставала больш драматычна, чым у вымярэньні людзей, — на што нябёсная дружына абапіралася ў першую чаргу. Ліхтугі асобы ўлічваліся апасьля, часьцей — як апошнія па значнасьці.

Так, Вадара больш займалі стасункі даўніх супараў — Наскага і Іхнага — гаспадароў двух пярэчлівых мегавытварэньняў Космасу. У фізычным сьвеце на баку аднаго была Ліцьвінія, другога — Масея. Калі ў комплексе чалавечых адносінаў дзе-нідзе яшчэ назіралася ўзаемаразуменьне паміж імі, дык у тагасьветнай панараме — адно разьмір'е, усеабдымнае, непрыхаванае, злоснае, зацятае. Мане-лжы зь яе тайнай, хітрасьцю і іншымі зручнымі якасьцямі-зданямі было зручней намагацца сярод людзей і спаравацца папераменна, у залежнасьці ад энэргетычнай выгоды, то з Наскім, то зь Іхным. А Сіла, шануючы больш адкрытыя паядынкі, аддавала першаўвагу зьнечалавечым

слаям і аднолькава прымала абодвух. Іншыя апекуны, што дзеялі пад кіраваньнем Вадара, таксама мелі кожны вызначаную лінію паводзінаў. Тое цягнулася, як кажуць, спрадвеку, працавала бяз збоеў і ў выніку мусіла скончыцца зьнікненьнем аднаго з павадыроў.

Каго і калі? Ведама было толькі Вадару, але ён аб гэтым нікому нават і не намякаў, паводзіў з кожным аднака.

Калі браць Час і Прастору ўсеабдымна, у гісторыі сьвятыні, як ні ў якой інакшай, яскрава адлюстроўваліся інтарэсы і Наскага, і Іхнага. Таму Вадар яшчэ на золку Тварэньня папярэдзіў іх, што будзе карыстацца магчымасьцямі абаіх нароўні і каб ніхто да большага ня меў ніякай прыкасі.

Камусьці магло падацца, што з патрыярхам Вадар рэальна не захоўваў гэты балянс, бо Афанасій пераважаў над усімі. На такія заўвагі касьмічны кіроўца звычайна адказваў:

— Вам чалавечыя заганы і годнасьці мрояцца, бытта бязь іх нам нельга існаваць. Асноўнае ў нашай справе — ідэя ў руху, то бок дзея, працэс, а ўдзельнікі — усяго толькі носьбіты ідэі. Яны могуць быць розныя — галоўныя, другарадныя, многа, мала, у ігры ці па-за ёй — усё роўна. Трэба заўсёды памятаць адну няўхільную *асаблівасьць: калі ідэя прысутнічае ўва ўсякай зьяве, рэчы, то персанажы — неабавязкова*. Патрыярху, як зьверхніку, суджана пранесьці маю ідэю да канца. А сам ён мяне цікавіць пастолькі-паколькі, хоць сітуацыі могуць быць і розныя: напрыклад, калі Афанасій выступае як ідэя, але такога зь ім ніколі не адбудзецца…

Цікава, што гэтыя словы і рэакцыя на іх выяўляліся ў міжпластавай сфэры своеасабліва і шматзначна: падначаленыя прызнавалі важнасьць і бясспрэчнасьць тэмы, добра ведалі, што і як рабіць, але кожны лішні напамін валадара аб ёй успрымалі як намёк на заўсёднае існаваньне ў сваёй дзейнасьці-

гульне *нейкага* дадатковага, глыбока схаванага сэнсу, падтэксту, які ніколі нельга агучваць, абмяркоўваць, а толькі мець наўвеце, няхай ён па-сапраўднаму нікому й не вядомы.

З-за гэтага ўсялякае станьнё паўставала дваяка, у залежнасьці ад таго, хто за ім, якія сілы былі задзейнічаныя і якія мэты прасьледваліся.

Так, прысутнасьць масейскага герарху на сходзе разглядалася як пратэктура Вадара, а значыць, і абавязковая для ўсёй звышнатуральнай арміі па сваіх задачах. На спрэчнасьць і сумніўную неабходнасьць агульнай ідэі, калі хто яе і ўлоўліваў, амаль не зважалі: трэба — і ўсё.

Дзіўна тое, што па-за зямной рэчаіснасьцю такім чынам вырашаліся-ініцыяваліся-вяліся-заканчваліся многія праблемы, а адказным заўсёды быў чалавек — ахвярны казёл, які, дарэчы, з-за той жа тагасьветнай блытаніны лічыў сябе вышэй за ўсіх.

Гэта якраз і прадэманстраваў Афанасій на закрытым пасяджэньні мясцовай гепархіі, дзе Мана-лжа ўжо ня так прывольна разьлягалася, як дагэтуль на прылюдным, хоць дзе-нідзе ўсё адно і ўстаўляла свае выкруты. Тут было больш Праўды і Іхнага. Намаганьні Абстракцыяў у злучве выказаў мясцовы мітрапаліт, які вёў мерапрыемства:

— Вашая прасьвятарства, гісторыя паказвае, што праўда на нашым баку. Як бы ні разьвіваліся падзеі ў сьвеце, а муская крываслаўная царква заўсёды перамагае. І з гонарам. Характэрнае таму сьведчаньне — наш годны паход па гэтай зямлі. У дзевятнаццатым стагодзьдзі[3] мы зьнішчылі выра-

[3] 12 лютага 1839 году ў выніку шматгадовага жорсткага амаральнага насільля над вуніяцтвам быў прыняты так званы саборны акт аб узьяднаньні, тэкст якога падрыхтавалі ў спэцыяльным сакрэтным камітэце царскага ўраду. Дакумэнт разьвязаў рукі рэакцыйным сілам, стаў пачаткам працяглага ганебнага гвалту над ліцьвіншчынай-беларушчынай,

дка рэлігіі — вуніяцтва — і навечна ўсталяваліся ў Ліцьвініі. Колькі моцы прыкладзена для гэтага! Якія духоўныя сілы задзейнічаныя! Мы памятаем і шануем кожнага, хто пасоўваў нашую справу наперад, змагаўся за веру, выконваючы сьвятыя заданьні відавочна альбо тайна, якім заўгодна чынам, абы мускаму люду на карысьць, як тое неаднойчы адбывалася падчас існаваньня гэтага сабору. Ніхто і ніколі не разбурыць мускай крываслаўнай царквы і яе храмаў. Нам жыць у вяках! З намі Бог!

— Шырокае абмеркаваньне пытаньня — карысная справа: яна дае нам магчымасьць паказаць, хто ёсьць хто, — важна падагуліў патрыярх Афанасій. — Я згодны з нашымі сьвяшчэньнікамі, якія лічаць, што, увогуле, насельніцтва абыякавае да гістарычных рэаліяў і не цікавіцца працэсам з саборам гэтак, як мы. Можа, тое і добра: няма чаго статку ведаць, пра што думае пастух і куды яго вядзе. Галоўнае, каб усе сытна пад'елі Божай ежы — а яе, лепшую, дае толькі муская крываслаўная царква. Мне спадабалася, як пранікнёна, пераканаўча выступалі нашыя людзі, як удала процістаялі гэтым мясцовым крыкунам, але нам не заўсёды ставала важкіх аргументаў. Прыкра, што мы калісьці празявалі і ня зьнішчылі ўшчэнт усе дакумэнты ня толькі пра гэты храм, але і наогул; мабыць, дрэнна дбалі і шукалі. Тое — навука для ўсіх нас і паказальны прыклад, як трэба абыходзіцца з розным фактычным матэрыялам. Нашым гісторыкам неабходна засвоіць, што муская ідэя сама не прыходзіць і не распаўсюджваецца; яе

шляхам якога зьнішчаліся ня толькі людзі зь беларускім словам на вуснах, але і беларускія сьвятыні, кнігі на беларускай мове. Усё, што барбары лічылі каштоўным для сябе, прымусова звозілася ў мэтраполію. У 1840 годзе цар распарадзіўся называць ліцьвінаў беларусамі.

неабходна няўхільна, настойліва пашыраць усімі магчымымі спосабамі, ня грэбуючы фізычнымі, збройнымі і ўсезьнішчальнымі. Вораг нас не пашкадуе. Час ня церпіць, і асабліва разважаць няма калі. Прыслухайцеся да таго, што я сказаў, — а мне яшчэ не даводзілася памыляцца, — настройцеся і не давайце волі такім апантаным ды няўрымсьлівым месьцічам, як гэты Адам. Посьпехаў! І хай дапаможа нам Бог!

Іхны быў задаволены, што Афанасій паводзіў сябе якраз у адпаведнасьці зь ягонай лініяй: згадаў пра мускую ідэю і падкрэсьліў неабходнасьць усемагчымай барацьбы з інакамі. Яму было файна, што адбывалася тое ня ў подумках, а ў размове: слова ў фізычным сьвеце заўсёды мацней за мысьль, у дадзеным выпадку яно прагучала ўва ўладаньнях непрыяцеля — двайны ўдар па Наскаму. Іхны не хаваў свайго задавальненьня, пасылаючы навокал ганарыстыя энэргетычныя хвалі: маўляў, ведайце ўсе, які ён майстар і з кім трэба знацца.

Калі на многіх тое ўзьдзейнічала і фармавала разнаякія стасункі, дык на Праўдзе сутнасна амаль не адбівалася: яна спакойна, безадносна ўспрымала падзеі, аддаючы належнае якасьцям і здольнасьцям удзельнікаў, і зямных і тагасьветных, якія — што і казаць! — працавалі таленавіта. Нават Мана са сваімі хітрыкамі выглядала нядрэнна. Праўда больш зважала на пэўнасьць, дакладнасьць рэалій, іх адпаведнасьць аб'ектыўнасьці. Ёй было бачна, як усё больш напружваецца-хістаецца-вагаецца-матляецца ў напрамку разрыву *лучэньне сьветаў — людзкога і наўмянальнага,* у асноўным з-за асаблівасьцяў-трансфармацыяў чалавека, ягонай здольнасьці маніпуляваць сваёй сьвядомасьцю — а гэта прама адлюстроўвалася на праблеме існаваньня ўсяго пласту. Толькі ў злучы більёнаў людзкіх лёсаў можна было

знайсьці канкрэтны адказ на хвалюючае пытаньне: быць альбо ня быць?

Роля Адама ў такой глабальнасьці была б амаль неадчувальнай, але справа тычылася сьвятыні, а зь ёй — і Нябёснай Сьвятыні. Калі сьвятое мейсца разбуралі-перабудоўвалі на Зямлі, то ў Яго Сусьветным Вобразе таксама адбываліся зьмены, якія скажалі-вызварачывалі ня толькі агульную касьмічную эстэтыку твору, але і духоўны зьмест, напрамак усяе ліцьвіншчыны, што ў агромністай грамадзе насельнікаў зямной брамфатуры мела адметнае прадстаўніцтва і ўплывала на многія мэнтальныя працэсы звышнатуральнага супольніцтва.

Праўда адмячала ў мэтагістарычным ракурсе злуч Ліцьвінія-Сьвятыня-Адам і незвычайную ролю дойліда, якая ў цяперашні час узрасла. Ягонае сьведам'е, як ніколі, жарска палымнела, выкідвала процьму хаатычных, процілеглых парываў і ад празьмернай запальчывасьці магло натварыць немаведама што, і, значыць, абы-як паўзьдзейнічаць на суцэльны працэс.

Далоньню вядзежы трэба было паманіпуляваць.

А гэта лепш атрымлівалася з Доляй.

Праўда зьвярнулася да яе.

Шматзначная і ўсюдыісная, тая пільна назірала за падзеямі вакол сьвятыні і адзначала кожнага чалавека, ці бо працу ягонага мозгу. Адам займаў больш за іншых , бо на дадзеным этапе ад яго залежала многае, а ён не жалеў сябе, вельмі ўзбуджаў сваё мысьленьне тэмпераментам і палкасьцю, зусім ня ўлічваючы, што вышэйшы дар, талент, як і ўсё ў матэрыяльным сьвеце, таксама маюць парцыённую патрэбу і ў жвавасьці, і ў адпачынку.

Праўда з Доляй паразумеліся і вызначылі характар паводзінаў.

# 7

Адам у які раз прыйшоў на гару, дзе павінен быў нанова ўзьняцца Дом БОЖЫ.

Прамысловае памяшканьне, што сьмярдзела на ўсю акружэнь, ужо зьнесьлі, і цяпер рыхтавалі будаўнічую пляцоўку.

Нешта шчымлівае, хвалюючае ахінула сэрца, і зьнекуль зьявілася трывога. Паплылі недарэчныя думкі, што тут ён нешта страціць, што мара не ажыцьцявіцца і льга паклапаціцца пра іншае.

Апошнім часам афіцыйныя асобы, якія вырашалі пытаньне сабору, турбавалі яго ўсё радзей, а калі і зьвярталіся, дык цікавіліся дакументамі, пераважна гістарычнымі, дзе яны знаходзяцца, як іх атрымаць, якія асабістыя пляны ў архітэктара і хто ў яго дарадца. Раілі не сьпяшацца.

Адам бальшынёю самаініцыятыўна ўдакладняў нейкія дэталі будаўніцтва, шукаў выканаўцаў. Толькі тыя ня вельмі рваліся насустрач — і гэта пры дэфіцыце рынку працы!

«Чаго, калі посьпех ідзе ў рукі, яго не ўзяць? Гэта, мабыць, сама кароткі шлях

да досьціву: ня трэба шукаць, выбіраць, ганяцца за вынікам… Хоць кожны вольны на любыя ўчынкі».

Воля плыўна лётала над дойлідам і бавілася ягонымі думкамі.

Ёй імпанавала рэальная *дваістасьць* гэтага матэрыяльнага слою: павялічваліся магчымасьці выбару, памнажаліся супярэчнасьці, рабіўся больш яскравым і насычаным каларыт жыцьця. Сярод розных фізычных, эмацыйных і мэнтальных праяваў, у тым ліку і чалавечых, Воля ўспрымала сябе самадастатковай і амаль нічым ня стрымлівалася. Зь ёю лічыўся аж сам Вадар, які без упынку карыстаўся касьмічнай вольніцай і бязьмежна сьмялеў у сваіх фантазіях. Адно што ён, каб ніхто з падначаленых зусім не разбэсьціўся, заўсёды пагражаў Кармай, да якой толькі адзін меў неабходныя ключы, — і тое мела дужа вялікае ўзьдзеяньне, бо ніхто не жадаў падлягаць суду гэтай вяльможы Сусьвету.

Воля ўваходзіла ў рэальны сьвет як пэўная дадзенасьць, іманэнтнасьць усіх жывых істотаў і сваёй важнасьцю літаральна пераўтварала ўсё навокал. Усе ведалі, што такое Воля і як зь ёю абыходзіцца.

Толькі на Зямлі карыстацца ёю напоўніцу разам з каралямі, манархамі і прэзідэнтамі ніхто ня мог па прычыне той жа пары: гэтак жа, як і Воля, існавала і Няволя. Процівага, супрацьстаяньне гэтай двойкі рухалі прагрэс.

Малы сьвет, удзельнікам якога быў і Адам, зьведваў Волю і Няволю, бадай, найбольш успрымальна і адчувальна, але звыкла і прыстасавана. Дыялектыка жыцьця навучыла людзей розным вынаходніцтвам, адным зь якіх было *цярпеньне*. Узьнікнуўшы ў іхных галовах як выйсьце і рэакцыя на ўсё непажаданае, яно буйна разраслося, сканцэнтравалася і генэравалася ў касьмічную Зносьць, якая добра прыжылася і прывольна існавала ў мэтагістарычнай Ліцьвініі.

Адам раздражняў яе сваёй самавітасьцю, гурнасьцю, нязгодлівасьцю, неслухмянасьцю, праўдашукальніцтвам.

Вось і зараз ён быў неспакойны, мазгаваў над недагоднымі тэмамі, непажадана ўзрушваў эмоцыі. І, каб ня высьпеў у ім пратэст, Зносьць наслала на яго сваіх памагатых — Коесьць і Абыякавасьць.

Адам спыніўся, зірнуў удалячынь, туды, дзе ў яго думках стаяла сьвятыня, і адчуў багавейлівасьць.

«Аслані іх, БОЖА, у імя Тваё! Сапраўды: яны ня ведаюць, што робяць. Хай будзе збожна ў іх сэрцах!» — і перажагнаўся.

Вера ўскалыхнулася і памажнела.

Сьвятыня ўзьнікла як відзеж і завагалася над гарой, нібы ў марыве. Была яна першатворнай, прыгожай і сонечнай. Адам пачуў музыку і анёльскі сьпеў.

У такой якасьці царква яшчэ не паўставала. Наогул яна мроілася паўсюдна і ў розных выглядах, а ў начных трызьненьнях пра яе вярзьліся такія блытаныя і сымбалічныя сюжэты, сапраўдны сэнс якіх паўставаў толькі ў ірацыянальным сьвятле.

Доля імкнулася надаць уваабражэньню Адама пазітыўны кірунак і выдаліць залішнюю прывярэдлівасьць-гімар з працэсу, але іншыя сілы, ініцыяваныя Іхным, танчылі вакол бязладна, уносілі чаўпятню, дадавалі падменьнікаў, то бок зьбівалі дойліда з панталыку. Балазе, што Доля ішла поруч з Праўдай і абапіралася на яе ваяроў, найлепшым зь якіх было Сумленьне, таму Адам перамагаў у асноўным добрапрыстойнасьцю і крывічэсьлівасьцю. Але прыроду, глыбіню многіх падзеяў ён усё адно цалкам не разумеў.

Так, у зямной рэаліі для яго засталося загадкай, адчаго гэтак упарта мускае крываслаўе, а за ім і сучасная ўлада, чапляліся за аднаўленьне на галоўным фасадзе царквы па цэнтры — звычайнага франтону і ззаду — копулу, якія зьяві-

ліся ў пазьнейшых перабудовах, а не фігурна-ступеньчатага зь яшчэ адным крыжападняцьцем, як было першатворна, бо побач іншая, нядаўна спасызноўленая катэдра захавала гэтую прыкмету віленскага барока?

Доля толькі глыбока ўздыхнула, успрымаючы турботы Адама, і паглядзела на ўсё шырэй, у тым ліку і на тыя выявы, як ён у замагільным сьвеце сустракаецца з істасьцю, дакранаецца да велічнай Праўды — і да яго даходзіць сутнасьць, моц розных, здавалася б, нязначных архітэктурных сакральных сымболяў, дэталяў нейкай выявы ў фізычным сьвеце.

Любая *ідэя* — геніяльная і бяздарная, стваральная і разбуральная, малая і вялікая — у касьмічным маштабе складаецца з драбнюткіх часьцінак, квантаў думкі, лічбавай праграмы, і яе генэзіс, жыцьцяздольнасьць мацнеюць, калі яна аб'ёмней і адметней прысутнічае ў выяўленых пластах. Дзесьці зьмяняецца — скасоўваецца-зьнішчаецца, дадаецца-далучаецца — хоць маленькая прыкмета, код ідэі, — яна альбо ператвараецца ў іншую, альбо зьнікае. Гэта ведама — інтуітыўна, сьвядома — тым на Зямлі, хто адпрэчвае-нявечыць, садзейнічае-ўдасканальвае інакшасьць, інамыснасьць, бо тагасьветныя рупліўцы, ці то Абстракцыі, вядуць між сабой нястомную барацьбу і зносяць у такіх выпадках намнога больш за чалавека. Яны добра засвоілі, што ад *ідэяў* залежыць іхнае існаваньне.

Праўда таксама назірала Адама ў іншай уяўнасьці. Яе ўсьцешвала цяга падапечнага да спасьціжэньня Тварэньня і тое, як пластычна і адэкватна рэагуе ягоны мозг на новыя веды. А сам ён, аглядаючы мінулае, нават жахнуўся, калі ў падзеях свайго жыцьця знайшоў — а раней зусім ня ўлічваў — вялікую прысутнасьць усялякіх дробязяў, атрыбутаў, знакаў, накметнікаў, сымболяў, іншых рэчаў і значэньняў, што ўвасаблялі, па панятках фізычнага сьвету, лішнія і недарэ-

чныя крозы-фантазіі, а ў сапраўднасьці, па-наўмянальнаму, мелі велізарны адчувальны і пазнавальны касьмічны сэнс.

Стоячы на гары ў гэтым сьвеце і ў думках асягаючы апошнія падзеі, Адам думаў пра складанасьць жыцьця і гатовасьць людзей гідзіць-гадзіць адно аднаму бяз дай прычыны.

«Тое, што адбывалася вакол сьвятыні, у асаблівасьці з нагоды візіту масейскага патрыярха, інакш, як бруднай справай, не назавеш.

Адчаго з мноства варыянтаў добрага і дрэннага чалавек выбірае пераважна горшае? Такое ўражаньне, быццам яго *нехта адзін* заўсёды падпіхвае і намаўляе-падвучвае-паджартоўвае: зрабі подласьць-паскудзтва — і атрымаеш палёгку! не, не рабі, кепска стане, дай лепш ласкі! — раіць *нехта другі*! нічога ня будзе і ні з таго, і ні зь сяго — мае рацыю *нехта трэці*! ... — толькі і маўчыць *нехта чацьвёрты*! а *нехта пяты* зусім ня пачаўны, хоць і прысутнічае! што ўжо казаць *пра некага шостага, некага сёмага*.., прычым гэтыя *нехта* заўсёды адзінотныя, а не задзіночаныя, яны паасобку, а не разам. І ўсе месьцяцца не абы-дзе, а ў канкрэтным чалавеку, разважаюць, мяркуюць, спрачаюцца. Колькі іх там, унутры мяне? Мноства! А сьцьвярджаюць, што я — адзін! Лухта! Гэта фізычнае цела толькі адно, а прысутных у ім не пералічыць. І дзеюць яны ўсе ў такой пракуднай-вычварнай зьяве, якая завецца **жыцьцём**, сапраўднасьць альбо ўяўнасьць якога яшчэ ніхто дакладна ня вызначыў. Адно ясна: вымярэньняў у яго — мноства. А кіруе ўсімі — Розум! А мо яшчэ хто?»

# 8

— Безумоўна, мысьляр! Нарэшце дайшло! — падбадзёрвала Сумленьне, ініцыяванае Праўдай для маральных выпрабаваньняў і загартоўкі.

Адам ня чуў гэтага голасу, як і іншай звышнатуральнай мітусьні вакол сябе. Яму толькі на нейкі міг здалося, што ён адгадаў нешта правільнае, важнае, і зразу стала лёгка. Няўрочнымі думкамі пра сваю сутнасьць дойлід у які раз узбудзіў вялікую армію нябёсных вартавых, і тыя зьбегліся-зьляцеліся на збор-раду, каб паказацца ды пазабаўляцца.

Спэцыяльнага такога месца ў брамфатуры не было. Яно заўсёды зьяўлялася там, дзе ўзьнікалі актуальнасьць і вайстрыня жыцьця, дзе высьпявала нешта лёсавызначальнае. Дом БОЖЫ ў Ліцьвініі і ягоныя ўдзельнікі сталі такімі ад пачатку і цяпер, на чарговым перавале Прасторы і Часу, патрабавалі асаблівага ваджэньня. Помыслы, энэргетычныя пасылы многіх апекуноў зьбіраліся менавіта тут увадно

і разам уяўлялі магутны пераўтваральны сэнс, датычны выключна чалавека.

— Я вельмі падтрымліваю сьвядомых і там, і тут. Як жа безь мяне? — паперадзе ўсіх вырашыў быць Інстынкт.

— А са мной заўсёды лепш, — таксама пырснула энэргетычнай перавагай Ахоцьце і падкінула задору ўсяму брацьцю.

— Нас затое шмат! — табуном шуснулі неўтаймоўныя Эмоцыі. — І мы ўсіх атакуем-занепакоім-узбудзім-возьмем-запалонім-зачаруем-разьятрым-узьюрым-упадабаем-зьненавідзім-прысвоім-адрынем-пераўторым.

— А каб трохі патрызьніць, у мітурасах дзіўных альбо ў эмпірэях сэнс пашукаць, га? — як заўсёды недарэчы і нібы ў бязуме паказалася Мроя.

— А які сход-кірмаш-майдан-торжышча бяз гандлю? — лапатаў Выбар і, хітра падміргваючы, усіх расхвальваў.

— Асадзі назад! — вычвараў непрыступны Тэмпэрамэнт. — У мяне свае падыходы: трэба адпавядаць і падабацца толькі *мне*. А вы ўсе можаце збочыць ці ўвогуле адысьці. Вось панасылаю на вас, як на людзей, галоўных дароў-удачаў з памагатымі — крэўкага, запальчывага, лентага, хаморлівага, — тады і паскачаце, як ачмурэлыя, пад маю дудку. Во будзе пацеха! Ха-ха-ха!!!

— Досыць, я сказала! Разьвесяліліся! Якая ж балбатня бяз спрэчак, абмовы, пляткарства, нядобразычлівасьці, шкоды? — аж заходзілася ад гневу няўрымсьлівая, лютая Злосьць і тут жа давала рэцэпты-парады: — Трэба ўсіх узрушваць, гнявіць, сварыць — так хутчэй і нутро аголіцца.

— Нельга да аднаго дадаваць другое — залішне будзе! — абуралася і забараняла Хцівасьць. — Апрагуцца. І так шмат маюць.

— Наогул ува ўсіх усяго замнога, — кіпела і зьнемагала Зайздрасьць. — Мне б гэта. Заўсёды мяне абмінаюць.

— Дзіву даюся ў які раз! — гуляў у зьбянтэжанасьць Крадзеж і падбухторваў: — Бытта ня ведаеце, як набываць? Трэба ўсё цягнуць і красьці — і рэчы, і эмоцыі, і думкі. На зладзеях сьвет трымаецца. Хай недарэкі разважаюць пра іншыя магчымасьці, а я заўсёды кажу: зладзежа — лепшы шлях да сапраўднай дасканаласьці і майстэрства. Злыдні мяне зразумеюць.

— Мяне мой бацька Хаос абавязаў быць паўсюдна, дзе хоць колькі натоўпу ці грамады, — усё месьцілася Смутня, нахабна чынячы вакол мітусьню-блытаніну і імкнучыся выціснуць адусюль Лад, што знаходзіла ў многіх ціхмянае задавальненьне.

— Дый мяне ангажавалі на заўсёднасьць, — пазяхала Ленасьць. — З кім тут салодка адпачыць?

— Які глыбокі ілюзійны Сусьвет: нават і мы — несапраўдныя! — скрушна заўважала Сумленьне.

— Ухавай усіх, БОЖА! Я ж тут ня дзеля раздражненьня і нялюбасьці, — мкнулася зьвярнуць на сябе ўвагу Згода, бачачы, як нарастае рэзрух, і ведаючы, як усім патрэбны мір, спакой і помач. — Дазвольце хоць крыху абліць вас гаючай энэргіяй, — але яе ня вельмі заўважалі і наогул лічылі за нешта лішняе, непатрэбнае ўсяму войску Абстракцыяў, для якіх супярэчнасьць, агрэсіўнасьць, канфліктнасьць былі асаблівай стыхіяй жыцьця.

— Бяз ласкі, спагады, мілажалю ніякая асобіна не пражыве на Зямлі, — праменіла радасьць і душэўнае цяпло Добрасьць. — Услухвайцеся майго.

— Што вы верзяце, лаецеся і грэбуеце адно адным? Калі ўжо вы да мяне прывучыцеся? — самавіта, гордзіва і важна разьмяшчаўся Лад, нікога не ўзбуджаючы і не турбуючы, але ўсё адно карыстаючыся пашанай вельмі малой колькасьці апекуноў ува усіх вымярэньнях.

Бальшыня яго не любіла і ніца баялася, бо ведала, што рана ці позна ўсім прыйдзецца падпарадкавацца Закону аб Усекасьмічным Парадку і адмовіцца ад цяперашняга стану, бязладзьдзя, настрою, ператварыўшыся ў іншыя выявы-значэньні. Якія — ніхто ня ведаў, але нічога вартага, як і ад усялякай сутнаснай перамены, не чакаў, адтаго сваю цяперашнюю, хуткую і часам няўдалую, рэалізацыю ўсе лічылі за нармальны стан.

Да ўзаемаразуменьня пастаянна заклікаў Вадар. Вось і цяпер, вынікнуўшы пасьля словаў Ладу, ён неяк адразу астудзіў усеагульную гарачлівасьць і нецярплівасьць:

— Бачу, полымя пачынае шугаць. Колькі тут вас? Не пералічыць. І ўсе прагнуць выказваньня. Шмат гаварыльні распаўсюдзілася, лепш бы чыну пабольш. Некаторыя, мабыць, і забыліся, калі апошні раз дзеялі. Так?

Усе Абстракцыі, а іх процьма, захваляваліся, кожная — па-свойму. У многасьці, агуле гэта нічога зь зямнога, са звыклага не нагадвала — такой незвычайнай і звышнатуральнай была зьява. Чалавечае ўвабражэньне ня ў стане ўявіць яе, намаляваць такую карціну, калі ўсе вядомыя і невядомыя бязвобразныя назовы-найменьні раптам энэргетычна ажываюць, набываюць невераемнае касьмічнае аблічча, увасабляюцца ў фантастычных астральных-мэнтальных-духоўных істотаў і багата дэманструюць сваю сутнасьць, адчувальную і зразумелую тольма для сама высокага тэасофскага мысьленьня.

Вадар кінуў моцную тэставальную бліскаўку, і ў агністай праяве ўсе адразу зрабіліся сапраўднымі, беспрычыннымі: адны — значнымі да ўзьвелічэньня, другія — нікчэмнымі да зьнікненьня.

— Вось і ўсё бачна, хто ёсьць хто, — і зрабіў яшчэ адзін адчувальны энэргетычны пасыл, ад якога ўспыхнула *агнявi-*

*ца адбору* і разьдзяліла ўсіх ініцыянтаў брамфатуры. — Хто прапаў, зьнеціўся — няхай не крыўдуюць: такія правілы — праз колькі эонаў яны зноў зьбяруцца ў нешта цэлае і ўчцяцца-ганаруюцца высокімі справамі. Пашлем ім жыватворныя помыслы і лепшыя пажаданьні.

Гэтая акцыя была нечаканай для ўсяго збору: дужа рэзка і бязьлітасна распарадзіўся правадыр, — і многія зьбянтэжыліся-прыціхлі, бо ведалі, што ў яго ёсьць і іншыя спосабы ўзьдзеяньня на свае войска. Сама жудаснае — зьнікненьне наагул. Нават цяжка ўроіць каму б там ні было, што **побач зь вечнай прысутнасьцю існуе і вечная нябытнасьць** з аднолькавай незьлічонай колькасьцю варыянтаў. І магчымы пераход з аднаго стану ў другі. Толькі стварэньні зямной брамфатуры, у тым ліку і звышнатуральныя, чамусьці яшчэ ніколі не назіралі, каб хтосьці ўвачавідкі прыходзіў альбо вяртаўся зь нябыту ў быцьцё. Мабыць, магчымасьць гэтая вядомая толькі БОГУ.

Тыя, хто ня зьнік, крыху павесялелі, бо чакалі ад свайго кіраўніка яшчэ аднаго акцэнту — падвышэньня, і кожны спадзяваўся на сваю ўдаку: нягледзячы на магутнасьць у Прасторы і ў Часе, нябёсныя ваяры не валодалі поўнай свабодай і інфармацыяй адносна асабістага лёсу і залежалі ад пірамідальных герархічных парадкаў Сусьвету, то бок ад рачаньня вышэйшых. Ведаючы гэтую абумоўленасьць і вялікую прагу ўсіх да жыцьця, Вадар усё адно лічыў нялішнім нагадаць:

— Там, адкуль вы бераце натхненьне і дзе гойсаеце, ёсьць і ваш кон, вашая роля ў гэтай Вялікай Гульні. Усялякае стварэньне распараджаецца сабой і дадзенымі магчымасьцямі ў адпаведнасьці са сваім разуменьнем, якога, здавалася б, дастаткова, каб дзеяць годна. Але такое ўсьведамленьне сябе заўсёды спараджае самахвальства і сама-

ашуканства. Толькі вядзежа, думка пра БОГА дае правільны шлях.

Вадар на імгненьне спыніўся, умысна й прыкметна вагануў сваімі фібрамі — і каманда адчула ягоную значнасьць таксама. Токі зігнулі вартыя, і ён прадоўжыў:

— Добра, што ўсе на такой вялікай збор-дружыне памяркоўныя, зважлівыя, узбуджаныя, пазьбягаюць спакою ды прагнуць актыўнасьці, змагані. Ведаю, што многія тут жа гатовыя да спохваткі. Але час разьвязваць жарсьці яшчэ не прыйшоў. У тых падзеях, што намі кантралююцца, мы не напоўніцу паказалі людзям мірныя, умеркаваныя спосабы вырашэньня праблемаў. Трэба глыбей і разнастайней павучыць іх удумлівым стасункам у супярэчлівых, канфліктных сітуацыях, пераканаць, што скрайныя, агрэсіўныя захады, вайна, *зьнішчэньне* ідуць супраць агульнай лініі разьвіцьця і дасканаласьці, ганьбяць *ідэю жыцьця* і не адпавядаюць асноўным касьмічным замыслам. Раю ўсім Абстракцыям, асабліва стваральніцкім, больш шчыльна падысьці да галоўных герояў нашае драмы, але не забываць, што *разнаякасьць* — адно з важных сусьветных правілаў. А да ваяўніцтва мы яшчэ дабяромся. Усім усяго хопіць.

Кармічныя шчыракі чалавека, добра ведаючы Вадара, умомант сьцямілі: ніякай рэвалюцыі ў вымярэньні пакуль ня будзе, трэба дзеяць па-ранейшаму і берагчы сябе як касьмічную індывідуальнасьць.

# 9

Варункі пераканалі Адама ў марнасьці якой-небудзь натугі ў справе адраджэньня: у каторы раз афіцыёз прыняў бок Масеі, і муская крываслаўная царква працягнула сваю пастыдную хаду. Надалей ужо ніхто нічога не абмяркоўваў, не тлумачыў, і сабор ладным чынам, звыкла, прошта нічога не адбылося, паступенна нарастаў цаглінамі за кошт мясцовай улады.

Як і казалі сьвятаслужнікі, тутэйшыя ніяк не цікавіліся ні новай будоўляй, ні мітусьнёй вакол яе, балазе такіх, у тым ліку і культавага значэньня, навокал было некалькі. Адно што яны згодна і замілавана ківалі галовамі ды ксьціліся, калі масейскія сьвятары з амбону казалі пра веліч новага храму на гарадзкой гары, які месьцічам падаравала і ўзводзіць муская крываслаўная царква за свой кошт з-за адвечнае сваёй ласкавасьці і дабрачыннасьці.

Больш за іншых тут завіхалася Маналжа са сваімі падначаленымі, сярод якіх

асабліва вылучаліся Аблуднасьць, Хітрасьць, Прытворнасьць, удала злучаныя з Тайбай. Поруч заўсёды ацялюгваліся Жах, Гнеў, Злосьць, Зайздрасьць, Нянавісьць, Хворасьць, Абыякавасьць. Быў Мэнталітэт са Зносьцю і Згодаю ўпобачкі — гэтыя пачувалі сябе як у родным асяродзьдзі, шмат тлумілі мазгі, наводзілі гмур. Доля пільна назірала за парадкам і не дазваляла разгуляцца Стыхіі зь яе дужа расьперазанымі паплечнікамі, якія ўсё адно пранікалі да людзей і дзе-нідзе ўзбуджалі бязумныя настроі і ўчынкі. Лад наогул не зьяўляўся, а Праўда, хоць і ведала абастоўку ў краі, чакала спрыяльнага моманту, зрэдзь засылаючы сваіх даручнікаў — Шчырасьць, Сумленьне, Ахоцьце, Сьмеласьць — з умыслова-сьветлавымі паведамленьнямі, каб неяк рыхтаваць глебу пад будучыню.

Над усімі цараваў Іхны і заўжды зьедліва, злацешна пасьмейваўся з Наскага, рыхтуючы ўсё новыя фармаваньні сваіх армейцаў-абраньнікаў для нападу на супара церазь Сьвятую гару.

Можна зрабіць допуст: хтосьці са сьмяротных зазірнуў у паднеб'е, у паралельныя сьветы і ўбачыў не наўмянальную, абсалютную, а тольма фэнамэнальную, шматрэальную мэтапанараму Ліцьвініі. Нават Жах і Эмоцыі зь іхнымі касьмічнымі мажлівасьцямі ня здолелі б перадаць тое агромністае ўзрушэньне, якое ахапіла б такога сьмелача ад яе зечаньня.

*Многія* астральныя, мэнтальныя, духовыя слаі мэтакраіны літаральна палымнелі-кіпелі ад творчага напружаньня, процістаяньня, дужаньня, а яго насельнікі ў радасьці праглі-лакнулі, крэпка бажалі і мітусіліся думкамі ад энэргетычнага багацьця Сусьвету, у якім раскашавалі рух і зьмены…

…*А тыя*, дзе людзі дачасна адмовіліся ад нацыянальных каштоўнасьцяў, гісторыі ды жылі па дурнаце пад ганебнай

акупацыяй, зьнікалі ў страшэннай цямрэчы і пагіне. Апошнія, а таксама той, хто іх ствараў альбо ім садзейнічаў, бязьлітасна выдаляліся з Космасу, як брыдасьць.

Пагроза зьнікненьня вісела і над Ліцьвініяй. Абстракцыі, якіх непасрэдна гэта тычылася, часта сварыліся між сабой, адстойваючы кожная сваё, і нястомна клапаталі, каб давесьці да людзкога розуму, пераканаць, што *індывідуалізацыя* жыцьця — БОСКІ дар і апірышча ўсяго касьмічнага парадку, а захаваньне, удасканальваньне *яе* — галоўная адметнасьць і ўнікальнасьць чалавека. У Сусьвеце няма пашаны да таго, хто імкнецца падагнаць усё пад адзін капыл. Толькі выканаўшы сваё, непадобнае да іншых, прызначэньне і атрымаўшы адпаведны знак звыш, істота разьлічвала на далейшы шлях у рэінкарнацыі.

Нябёсныя вартавыя ведалі аб'ектыўныя законы разьвіцьця і стараліся ўсімі магчымымі спосабамі ўзьняць да такога ўзроўню жыхароў Зямлі, ахоўваючы і максімальна зьберагаючы кожнае трансфармаванае, уцелаўшчанае сьведам'е.

# 10

Адам перажываў з-за паразы. Душа моцна балела галоўным чынам з-за таго, што ягоная пакутная зямля страціла вельмі важнае і неацэннае месца духоўнасьці. Тое, што там адцяпер і, верагодна, давеку будзе дзеяцца, — гэта хлусьня ў прыгожай абгортцы, ад якой крыўцам толькі горш. Сама страшнае, што яны таго ня ведаюць і аблудна пакланяюцца чужому.

Дбайнікі спаверху, нягледзячы на тое, што будучыня перад імі была яснай, таксама шкадавалі, але іначай: непажадана, каб сьвядомасьць Адама і ўсіх уплывовых асобаў перакруцілася ад цяжкасьцяў і збочыла, — тады трэба намагацца больш і прымаць непапулярныя меры, цягам якіх дакладна не пазьбегнуць карэктовак і няласкі Вадара.

Усё ж мяноўна ў такую пераробку, але іншага зьместу, і трапілі ліцьвінскія Абстракцыі, калі нечакана адчулі новы загад дужа ўзбуджанага кіраўніка:

— Вашыя заходнія браты маюць патрэбу ў помачы. Трэба пайсьці насустрач,

балазе яны вас выратоўвалі неаднойчы. Нейкая Сюзана, па-вашаму Зулька, Зуля, вынайшла цікавы і арыгінальны культавы сродак зносінаў зь Нябёсамі — *энэргетычную вежу*. Ніводнага прыдатнага месца ў сябе яна не знайшла. Праналізаваўшы аднака-падыходныя сілавыя кропкі плянэты, вучоная ткнула пальцам у ваш горад і прамовіла: «Тут — найлепшы канал касьмічнае лучнасьці і творчасьці. Як мы раньш яго ня ведалі?! Ён ужо неаднойчы даваў славутасьцяў і знакамітасьцяў, многія зь якіх вядомыя на ўвесь сьвет. Адзін Марк чаго варты. Энэргетычная вежа трансфармуе дабрародлівыя сігналы з Космасу і паспрыяе распаўсюджваньню ў краі прасьвяды і дабрабыту». Сюзана мела рацыю. З улікам пераменаў у галовах туташніх асельнікаў надабе падмацаваць іх найноўшым вынаходніцтвам. Мне ўжо паведамлялі пра яго прышласьць. Дый сам я праглядваў Інфармацыйныя Масівы. Многія зь іх — таёмыя. Ня буду казаць далей і ўсё адчыняць, але даручаю ўзяць гэтую падзею для далейшай вядзежы.

# 11

— Адась! Ёсьць цікавая справа. Якраз для цябе, для тваіх помыслаў і таленту.

Пачуць такую прапанову падчас доўгага творчага застою і расчараваньняў, тым больш ад таварыша, — значыць, паверыць у свой лёс.

Пра выбранасьць, прызначэньне і нават містычнасьць існаваньня Адам зрэдзь мысьляваў, рабіў высновы, але пад націскам сумятлівых жыцьцёвых абставінаў забываўся на тое.

І вось зноў пабеглі асацыяцыі... Лагодная хваля збудзіла нутро… Хлопец адзначыў момант, стрымаў хваляваньне і ўвесьператварыўся ў слых.

— Праектам Сюзаны заінтрыгаваны многія, — даводзіў падрабязнасьці Антук, які толькі што вярнуўся з паездкі па Эўропе. — Сыплюцца прапановы адусюль: з Эўропы, Амэрыкі, Азіі, Афрыкі, не паверыш — аж з Антарктыды. І спонсары ўжо ёсьць. Але аўтарка нікога і нічога ня слухае і налягае: толькі Ліцьвінія, наш горад.

— А што яе тут прыцягвае?

— Да аканчальнага выніку яна прыйшла пасьля падрабязнага вывучэньня дадатковых матэрыялаў. Як ні дзіўна, але *ў іх* для гэтага больш дакументаў, чым у нас. Першы і значны штуршок даў мастак Марк, які ўсё сваё жыцьцё захапляўся сваёй радзімай — ліцьвінскім краем. Затым Сюзана пазнаёмілася з рознымі сьведчаньнямі аб нашых мясьцінах і людзях, з жыцьцяпісамі некаторых слынных грамадзянаў, паходжаньнем адсюль. Асабліва ёй спадабаліся тубыльцы за памяркоўнасьць, душэўную цеплыню, сардэчнасьць, унутраную прыхільнасьць да незвычайнасьці і разнастайнасьці.

— Толькі не да ноўніцтва, — пакпіў Адась і засьмяяўся.

— Як бы там ні было, — зь лёгкай усьмешкай падагуліў Антон, — але рыхтуйся сустракаць госьцяў: Сюзана едзе да нас.

— Ідзі ў балота! Хто яе будзе прымаць?

— Не пужайся — улады. Як жа бязь іх? Яны ўжо далі дабро.

— Вось гэта і турбуе мяне больш за ўсё.

— Адчаго?

— Антось! Там столькі ўсялякіх разумнікаў, што залухцець любую справу ім — адзін плявок.

— А ты?..

— Пасьля гісторыі з саборам яны мяне ня слухаюць.

— Так, тады ты ім паддаў добра! Малайчына!

— З тае нагоды мяне выклікалі кампэтэнтныя органы. Ніякіх рэпрэсіяў не было, але сказалі прама: да рэлігіі ня лезь! Маўляў, яна ў нас — сьвятая карова.

— Сьмешна: ці даўно? За саветамі аж са скуры вылузваліся, зьнішчаючы і забіваючы ўсё, лучнае з БОГАМ.

— Відаць, паступіла новае ўказаньне. А ўвогуле, справа не ўва мне.

— А ў чым?

— У тым, што ў нас свабоду веры разумеюць як панаваньне толькі адной мускай крываслаўнай царквы. Ёй усё можна, і адну яе трэба падтрымліваць, абараняць, а астатнія рэлігіі — так сабе, для бачнасьці!

— Памыляесься, бо не адчуваеш моманту! — зноў узяўся за кпіны Антон.

— Жартуеш?

— Не, удакладняю: іншыя веравучэньні трэба лічыць за няправільныя, шкодныя, нявартыя. Нашая ўлада і мускападобныя істоты настолькі прасякнутыя ідэалёгіяй прыхадняў, што ўжо і без падказкі робяць, як той Масеі выгодна — спрацоўвае так званы сіндром калябарацыяніста.

— Сапраўды, усялякую бяссэнсіцу, друхлядзь прымаюць, бяруць на ўзбраеньне. Колькі высакародных грамадзянаў абразілі, называючы іх і зараз сэктантамі, дэструктыўнымі элемэнтамі, адшчапенцамі, звыродцамі! А якую брыдкую лексіку ўжываюць пры гэтым! Якімі мацюкамі абкладваюць! І ўсё дзеля чаго? Каб начапіць на нас чужародзьдзе і пасварыць людзей.

— Так, і гэта насуперак прыроды ліцьвінскага духу — нашай талерантнасьці, памяркоўнасьці! Атрымліваецца: сама вялікая дэструктыўная і агрэсіўная секта ў Ліцьвініі — муская крываслаўная царква.

— Гэта я пэўна зразумеў, калі меў зносіны з масейскімі служкамі і на паверхню вылезла іхная пазіцыя датычна нашае гісторыі: акрамя брахні, якую яны любяць гарадзіць і вельмі клапатліва маскаваць пад праўду, не ўспрымаецца а-нічо-га. Нармальна размаўляць зь імі проста немагчыма. Меркаваньні, адрозныя ад іхніх імпэрскіх, разглядаюцца як пагрозьлівыя альбо варожыя. Сама галоўнае: такі бруд што-

дня выліваюць на галовы нашых няшчасных вернікаў у цэрквах мускай веры па ўсёй краіне.

— І ўжо не адно стагодзьдзе… Тут будзе дарэчы, калі я распавяду адну цікавую гісторыю, якая прылучылася са мной і маёй сям'ёю.

— Уважліва слухаю.

— Было гэта якраз у той час, калі да нас завітаў масейкі патрыярх Афанасій. Ты ж ведаеш: ён тады асьвянчаў новабудаўніцтва нашага сабору. Пасьля ўсяе стандартнае похадзі першасьвятар вырашыў публічна выказаць сваю невычэрпную дабрыню да паствы і дабраславіць дзетак, якіх бацькі прывялі з сабой. Тых паставілі ў шэраг — і ён пайшоў, кладучы сваю далонь на галаву кожнага. Мы з жонкай таксама зьлёгку падпіхнулі свайго хлопчыка наперад. Афанасій ідзе зь нязрушным выглядам уздоўж малечы, падыходзіць да нашага сына і заўважае, што той у шапцы: мы і не ўяўлялі, што гэта так важна для саноўніка, і наогул ня ведалі, як трэба паводзіць сябе ў такіх выпадках. На нейкі момант сьятаверхнік запавольвае ход і, нічога ня кажучы і не ўздымаючы рукі, абмінае нашага сына. Усхваляваліся-разгубіліся і мы, і тыя, хто быў побач. Але дзея адбылася — і нічога не паробіш. Урэшце ад усяго гэтага стала брыдка. Мы хуценька засьпяшаліся далей ад такога гідкага прадстаўленьня. З тае пары ні я, ні мае родныя больш не наведваем падобных відовішчаў мускай крываслаўнай царквы і ня верым ніводнаму слову і руху яе служкаў. Вось так…

— А нічога не нагадаў табе гэты маскарад? — да больш рэзкага павароту пасунуў Адам сябрука.

— Так, я ўбачыў! Раней зусім не прыглядаўся да абраднасьці мускай крываслаўнай царквы дый увогуле не надаваў значэньня розным там спосабам, рухам, апраткам сьвятароў, а цяпер угледзеў усё зблізку.

— І што?

— Па шчырасьці, асалапеў! Малітоўныя прыхамаці, каляровая палітра ўбраньня, надпісы на рызе патрыярха, ягонае прыкметнае важнічаньне і ўяўнасьць усяго паказвалі на азіяцкі характар, на бусурманцтва. Хрысьціянствам ня тхнула ні ад-ча-го!

— Вось! Бальшынёю такое ж ўражаньне пакідае і ўсё мускае рэлігійнае дойлідзтва. Самі яны кажуць: гэта — наш, мускі стыль. Ну, уяві! На што падобныя залатыя і бліскучыя копулы, шатры, вялікія непрапарцыйныя цыбуліны, аркі, дахі, выявы зорак, месяца, наогул — уся будаўнічая геаметрыя з пpастораўвымі абмежаваньнямі і паўсюдны зялёны колер? А моташны агрэсіўны дух мускай крываслаўнай царквы, асабліва яе служкаў?.. Годзе! У сябе хай робяць што заўгодна — гэта іхная справа, а да нас найся ня лезуць са сваімі ўзорамі і вычварамі, не перайначваюць нашыя сьвятыні!

— Хто аб гэтым думае? — уздыхнуў Антон.

— Занадта цярплівыя мы, — прыкметна хваляваўся Адам, — і сваю гісторыю занядбалі! Нічога ведаць не жадаем! Ня слухаем разумных людзей! Усамчас адзначу важную асаблівасьць. Калісьці мусы, саманайменіўшы сваю сталіцу трэцім Рымам («а чацьвертага ня будзе» — казалі яны), вырашылі пабудаваць у ёй Сьвятую Сафію як галоўнае пацьверджаньне сапраўднасьці веры. А для гэтага патрэбны быў адпаведны дазвол Канстанцінопалю — такое пазваленьне ўжо мелі Кіеў, Полацак, Ноўгарад, якія і ўзьвялі сабе Сафійскія саборы. Але мускія крываслаўнікі, як ні намагаліся, як ні задобрывалі канстанцінопальскіх герархаў, як ні выломлівалі ім рукі, нічога і блізка не атрымалі. Так і па сёньняшні дзень. Вось справядлівае ўспрыманьне іхняе царквы і месца ў сьвеце!

— Адзік, ты ўзрушыўся, досыць, а то дагамонімся: усёткі мы не адны, — перасьцярог Антух, колам круцячы вочы.

Што ён меў на ўвазе, можна было толькі здагадвацца, а ў звышнатуральным разрэзе тое выглядала без двухсэнсоўнасьці, досыць яўна.

У змрочных пакоях, абсталяваных сучаснай тэхнікай, сядзелі ў навушніках дзяўчаты і маўкліва слухалі-глядзелі іхныя і яшчэ чыесьці перамовы, раз-пораз пазначаючы нешта на паперы альбо стукаючы па клявіятуры кампутара.

Над усімі лунала ня толькі Абстракцыі, але і ўсякае тлумнае інфэрнальнае паскудзьдзе, сутнасьцю якога заўсёды было зло.

— Тым больш, — узбуджана і раздражнёна адрэагаваў Адам. — А каму *гэта* цікава? І для больш шырокага распаўсюду адцемлю: тыя ліхатня і немарасьць, што гнятуць наш гаротны край і люд, спарадзіла ў першую чаргу акупацыйная муская крываслаўная царква, якая ішла і ідзе заўжды паперадзе любой масейскай зьявы. Таму сьпярша трэба разьбірацца — зь ёю!

# 12

Яны разьвіталіся маркотна.

Ніколі Адам ня думаў, што можа гэтак прыкіпець да жанчыны за такі кароткі час. Яна была сталей за яго гадоў на дзесяць.

Усяго некалькі дзён зь ёю — і жыцьцё ў іншым вымярэньні, імя якому — Каханьне.

Ніхто і ніколі не намалюе істапраўдна гэты цудоўны слой Зямлі, дзе квітнее столькі непаўторных сьветаў, колькі ад веку існуе шчасьлівых закаханых.

Тут Час мае адзіны стан — *ёсьць*, без было і будзе.

Прастора — зьменлівая толькі ад пачуцьцяў улюбёных.

Усё зьяўляецца і зьнікае ад жаданьня, духу мілосьнікаў.

Для таго каб трапіць сюды, трэба ня проста любіць, а сустрэць суджанага, прызначанага доляй.

Звычайная рэальнасьць з атачэньнем іншых людзей таксама прысутнічае паўсядзённа, але да яе дадаецца ўспрыманьне сапраўднасьці яшчэ аднаго напластаваньня, знаёмага толькі ўкаханцам.

Сюзана ўвайшла ў залу — і менавіта такая сфэра адразу адчынілася перад Адамам. Ня ведаючы, што адбываецца, ён, агаломшаны, глядзеў на яе і ў глыбежы сваёй душы дзіваваў, чаму раней не было такога бачаньня.

Жанчына паўставала грацыяй, хупава і прыгожа дэманстравала нейкія слайды, малюнкі, макеты, нешта казала — і пакрысе рассоўвала, пашырала новы, незнаёмы сьвет, у якім былі зусім інакшыя людзі, усе такія родныя і блізкія, што хацелася іх кунежыць і цалаваць. Але сама панадлівай і прывабнай здавалася толькі Яна, добаю нагадваючы чароўную каралеву, ад кожнага руху постаці якой адбываліся цудоўныя перайначваньні.

Толькі тады, калі падчас абмеркаваньня да Адама зьвярнуліся непасрэдна, ён ацяміўся і наўсьпеш, запінаючыся, выказаў сваю думку наконт праекту энэргетычнай вежы. Усе пачулі, што ідэя яго ўразіла і павінна неадкладна зысьціцца ў рэальнасьці.

Выказваньні многіх удзельнікаў азнаёмленьня-слуханьня былі процілеглыя, спрэчныя, у асноўным эмацыйныя, мала абгрунтаваныя, але ўсе краналі адно: ці варта ў горадзе, дый наогул у Ліцьвініі, будаваць энэргетычную вежу?

Асабліва націскаў на немэтазгоднасьці і нават шкоднасьці пабудовы той самы сьвяшчэньнік, што некалі хлусіў наконт сьвятыні на гарадзкой гары:

— Гэтую вежу ні ў якім разе ня трэба ўзводзіць ня толькі ў нашым краі, але і наогул на зямлі. Яна зьяўляецца чарговай падманкай цёмных сілаў і закліканая трансфармаваць зь неба сатанінскую энэргію да нас, псаваць, разбэшчваць наш крываслаўны, ды і ўвесь злавянскі народ, глуміцца над намі. Толькі заганны і бездухоўны Захад мог прапанаваць такую згубную рэч.

Тагасьветная акружэнь, як ніколі, віравала. Хоць і адбывалася падзея ў непрыкметным правінцыйным мейсцы, значнасьць пытаньня была найвялікшай: на Зямлі ўпершыню без маскаваньня і мэтавай таямнічасьці рабілася спроба не фантазійна, а прадметна, увачавідкі злучыць розныя касьмічныя пласты і запачаткаваць цэлы кірунак прасьвятленьня чалавецтва. Усе Абстракцыі працавалі з поўным аддаткам, натхнёна, шчыра, адтаго й барацьба была напружанай, няўтомнай. Гэта было тое рэдкае стацьцё, калі поруч дзейнічалі Ўсіхны, Наскі, Іхны, але з рознымі задачамі.

Нямала натужвалася Мана-лжа са сваімі дбайнікамі, палымнелі ўсе Эмоцыі, каламесіла Смутня, кідаўся, нібы ў гары, Выбар, прымервалася, каб падступіцца, Сіла.

Праўда, ведаючы пра хісткасьць многіх дачыненьняў на гэтым этапе, самавіта і зладжана кіравала сваімі ваярамі для таго, каб пашыраць сьвядомасьць людзей, даваць ім больш новых ведаў і рабіць сьвятлейшымі іхныя думкі. Разам з Доляй і Сумленьнем яна таўхнула Адама і скіравала на выступ. Усхваляваны, ён мовіў удумліва:

— Мяне ў які раз узрушвае цемрашальства, аблуда мускай крываслаўнай царквы і яе ваяўнічы шавінізм. Тое, што прапануе нам Сюзана, — гэта хада вышэйшага сэнсу, сьвятло ў глыбокім для нас значэньні і вялікая карысьць для кожнага чалавека ад дотыку да праўды. А калі казаць мовою таго хлусьлівага рупліўца справядлівасьці, што тут нядаўна плявузгаў, дык адзначу: сатанізм ідзе не ад райскіх Нябёсаў, а ад пякельнага падзем'я, ад дэманічнай збродні. І гэта ведае кожны граматны служка культу. Можа, спадар не такі? Тады — хто ён?

— Прашу бязь зьдзеклівых намёкаў! — успыхнуў сьвятар. — Усе ведаюць, хто я. І выказваю ня толькі свае асабістыя меркаваньні, але і пазіцыю ўсіх прыхаджанаў. Так,

нашая крываслаўная вера ня церпіць зла ў любой выяве, а менавіта такой, як зло, мы разглядаем гэтую энэргетычную вежу. Нашых людзей яна абражае, адлучае ад сапраўдных каштоўнасьцяў, якія ім дае толькі муская крываслаўная царква. Выключная духоўнасьць — нашая асаблівасьць, і мускі чалавек ніколі не паквапіцца на брыдасьць нейкага супэрмадэрнавага жалезьзя.

— Толькі гнюсота часта і недарэчна ліпне да такога высокага паняцьця, як **духоўнасьць**! — ня вытрымаў і ўзбурыўся Адам, выпускаючы сваю нянавісьць і даўно схаваны боль ад крыўды. Праўда ўважліва кантралявала, каб яго не пакінулі лёгіка і разважлівасьць. — Вы ўсё далдоніце пра сваю духоўнасьць *самі*. Хай бы хто іншы, староньні сказаў! Дык не: не чуваць, бо з вамі **яе** не відаць. Хіба можа быць **духоўнасьць** там, дзе галеча розуму, бруд эмоцыяў, нікчэмасьць жыцьця і ўвесь час балюе несусьветная брахня? — менавіта такія ўмовы вы ствараеце для сваіх вернікаў. Бедныя людзі!

Сюзане прыйшліся даспадобы словы Адама, а пасьля знаёмства зь ім — і ён сам. Яе заняволілі спачатку сьмеласьць і высакароднасьць гэтага гожага ліцьвіна, затым — яго непрыхаваная шчырасьць і сугучнасьць зь ёю. Яна захаплялася ягонай энэргетычнай моцай, талентам, умецтвам адчуваць прыроду рэчаў і зьяваў. У нейкі момант ёй здалося, што абодва яны з сама зыркага спагвезьдзя і випраменьваюць аднолькавае жыватворнае сьвятло. Гэтая відзежа так калыўнала рэчаіснасьць і ўстарнавала яе нутро, што жанка ўжо не магла існаваць без, як ёй здавалася, свайго дрыжонага.

Вышыні люлялі-песьцілі закаханых, даючы ім сама лепшае, што мелася ў іх арсенале. Абстракцыі блазнавалі ад цікавай і зьмястоўнай ролі — перастачаць-перакшталчаць сваю энэргію толькі ў міласьць, шчасьце, радасьць, памыснасьць, сьвятло.

За ўсім гэтым неяк губляўся-хаваўся-мроіўся драматычны кон абодвух. Іх галоўны сэнс, будучыню ведалі ўсе на Нябёсах, як і тое, што каханьня ў выяўленым сьвеце вельмі мала і на ім трымаецца Зямля, адтаго ўлюбёным многае даравалася і давалася з асабліваю ласкай — гэта, мабыць, *адно*, што было крыху не па правілах, але на *яго* ішлі ўсе, нават сам Вадар.

Адам і Сюзана праз вякі, на перавалах касьмічнага быцьця, на адным са шматлікіх прыступкаў Вечнасьці, убачаць, што цалкам іхняе каханьне было падобнае да аднаго глыбокага ўздыху прыгожае істасьці і шчасьлівымі набыткамі засланяла многа і многа іншых бязрадасных жыцьцяў.

Цяпер, перад растаньнем, калі яны глядзелі адно на аднаго і трымаліся за рукі, ніхто пра тое ня думаў. Як і ўвогуле не мысьлюе каханьне. Інакш яно такім не было б.

— У нас яшчэ колькі часу, давай сходзім на гару, — прапанаваў Адам.

— Канешне, калі яшчэ я тут буду, — зь лёгкім сумам згадзілася Сюзана.

— Любая, не журыся, мы хутка пабачымся, я абавязкова да цябе прыеду і забяру сюды, каб заўсёды быць разам, — зь пяшчотаю абняў яе Адам.

— Так, — радасна мовіла яна і таксама прыгарнулася да яго.

Яны моўчкі ішлі па ўтульнаму гайніку, які пышна і прыгожа засьцілаў гару.

— Вось тут магла б стаяць нашая энэргетычная вежа, — паказала рукой Сюзана. — Колькі гаючай сілы яна распаўсюджвала б навокал! У якой цемрадзі жывуць вашыя людзі і не разумеюць таго! Не прымаюць нічога новага, карыснага нават для сябе, і не жадаюць слухаць ніякіх тлумачэньняў. Шкада. Значыцца, зноў нехта іншы будзе спажываць дабро і быць бліжэй да Нябёсаў. Сьвет вялікі.

— Я таксама ў роспачы і гарую, — Адам шчыльней прыхінуў любку да сябе, — хоць і абвык да гэтага. Так, у вас народ іншы, прайшоў вялікі шлях свабоды і дэмакратыі. А ў нас… што і казаць: цёмны й забіты. Па-мяр-коў-ны! Брыдка ад гэтага! Тут дбайна пастараліся суседзі — і ўсходнія, і заходнія злыдні. Дарэчы, кожны з гэтых так званых братоў заўсёды добра нажываўся і рэалізоўваў свае комплексы за кошт мэнталітэту і дабрыні нашага люду, маіх крыўцаў. Усяго не перакажаш. Сэрца баліць, усё нутро кныхае… Што рабіць?

— Я пераканалася, як цяжка табе і такім, як ты, Адась, — па-мацярынску зазірнула ў вочы суджанку Сюзана. — Толькі абезнадзейвацца нельга. Выйсьце заўсёды ёсьць. Толькі яго трэба бачыць.

— Здаецца, у нашым выпадку цемра зазасьціла ўсё.

— Не, засьветачка існуе, — ціха і пяшчотна прамовіла Сюзана. — І я табе пакажу яе.

Адам зьдзіўлена паглядзеў на яе і адчуў, як прылівае дух і радасьць.

— Калі ласка, любая.

— Надоечы я шмат чытала пра Ліцьвінію. Многа розных меркаваньняў, але найбольш мяне прыцягнулі развагі амэрыканскай пісьменьніцы Эмы Сьміт пасьля наведваньня вашай краіны, — Сюзана глыбока ўздыхнула і працягнула: — Хвалююся ня менш твайго. Пад тым, што яна адцеміла, цяпер падпісалася б і я, маючы за сьпінай неаднаразовыя стасункі зь ліцьвінамі. Дык вось, сутнасьць яе ўражаньняў у наступным: *народ спазнаў, што значыць чалавечнасьць*, з тых нязьмерных пакутаў, якія прынёс яму найстрашнейшы з усіх жыцьцёвых настаўнікаў — скрайняя бесчалавечнасьць, і замест таго, каб дазволіць таму ліхому досьведу, які забраў чвэрць насельніцтва фізычна, зьнішчыць астатнія тры чвэрці і духова, ён

неяк — неяк — здолеў пératварыць яго ў глыбокую пашану да самога жыцьця, у глыбокае разуменьне, што *ўсё робіцца добрым або благім праз чалавечыя дачыненьні*, у пэўнасьць, што *навучыць чалавечнасьці дзяцей мусіць толькі чалавечнасьць*[4].

— Трапнае назіраньне, — дрыготкім голасам заўважыў Адам. — Я таксама рабіў падобныя высновы, але думаў: падманваюся, абагаўляю свой народ, а аб'ектыўны погляд можа быць толькі збоку, здаля. Аж не. Атрымліваецца, што нашыя выказы супадаюць і *там* таксама знаходзяць вартыя адрозьненьні ліцьвінаў ад суседзяў… Дадам, што за Бацькаўшчыну пад час апошняга ліхалецьця і ўсялякага падняволеньня палегла ад рук усходніх і заходніх зламысцаў ня чвэрць насельніцтва, а значна больш. Наогул нашая зямля памятае такія бітвы з захопнікамі, калі гінула 70-80 адсоткаў месьцічаў, як, напрыклад, 13-гадовую вайну 17 стагодзьдзя, якую, дарэчы, масейцы ня вельмі любяць згадваць, бо яна яскрава сьведчыць аб іхняй неверагоднай лютасьці.

— Так, вы нацярпеліся, але галоўнага — **чалавечнасьці!** — ня страцілі, значыць, сапраўды вашыя людзі інакшага кшталту, самабытныя, прыстойныя і добралюбівыя, а той, хто іх зьневажае, — злыдзень і набрыдзь. Менавіта *гэта* павінна натхняць цябе і такіх, як ты.

— Каханая, асабліва калі побач ты і вось так пазіраеш на мяне. Дзякуй табе! — Адам абняў Сюзану і пацалаваў. Яна прыемна ўсьміхнулася, але стрымала ягоны похап:

— Пачакай, яшчэ ня ўсё. Ты, мабыць, заўважыў: і Сьміт, і я падкрэсьлілі слова «неяк» ці тое, у нас не атрымалася вызначыць, *якім чынам* пры такіх неверагодных жыцьц-

[4] Smith E. Village children. Moscow, 1982, p. 69–70.

цёвых нягодах ваш народ захаваў *чалавечнасьць*. Можа, у яго своеасаблівы генэтычны код? А мо дзякуючы адметнай БОЖАЙ ласцы? Тады зноў-такі: за якія заслугі і дзеля якой будучыні? Пытаньне адкрытае і найцікавае. Вось дзе *прастор для роздумаў* над лёсам твайго народу і тваёй краіны, даражэнькі. *І вера*, што ў Ліцьвініі — адмысловая роля, памысная будучыня, і ліцьвіны ў сьвеце яшчэ скажуць сваё важкае слова. Так?

Сюзана пяшчотна пацалавала Адама і, шчасьлівая, моцна прыціснулася да яго.

Яны запаволілі крок і спыніліся акурат там, дзе пачыналі ўжо адбудоўваць сабор.

— А вось і мая параза, — горка сказаў Адам. — Не магу на гэта глядзець. Цяпер *так* будзе заўсёды: звыродзьдзе на сьвятым мейсцы. Ратаваньня душы тут не атрымаюць. Іх стануць заліваць атрутай усё больш і больш, і яны ніколі не зразумеюць, ад чаго ім насамрэч робіцца дрэнна. Адчаго так адбываецца ?

— Я ня ведаю адказу на тваё пытаньне, дый пэўна ніхто, — уздыхнула Сюзана. — Мне часам здаецца, што ты, я, нашыя аднамысцы — створэньні зь іншых ці то зорных сістэмаў, ці то вымярэньняў і пасланыя сюды, каб дапамагаць нягеглым, узвышаць іх і астатні жывёльны сьвет. Усё гэта больш падобна на містыку, але інакшай абасновы я не знаходжу, бо дужа розныя па сваёй прыродзе істоты насяляюць гэтую плянэту.

— Значыць, мы — бацькі, апекуны?

— Так, накшталт таго.

— А ці ня шмат мы на сябе бярэма? Самі недалужныя, а туды ж — у настаўнікі.

— Не, жыцьцё на тым і базуецца, што заўсёды нехта кагосьці вучыць. Над намі таксама павадыры ёсьць.

— Калі глядзець на нашую рэальнасьць, дык можна вывесьці, што яны — бяздарныя, — злосна крутнуў галавою Адам.

Абстракцыі ўспрынялі гэта за абразу і, не змаўляючыся, моцным энэргетычным штуршком гнеўна тузанулі Адама, ад чаго ў таго пацямнела ўваччу і ён, калі б не абапёрся на Сюзану, страціў бы прытомнасьць. Жанчына адчула нелады і асьцярожна пасадзіла яго на лаўку. Праз хвіліну гарапяка аджартаваўся:

— Вось і атрымаў па заслугах: нельга мяньціць языком, калі чаго ня ведаеш.

Касьмічная панарама аб'ектыўна адлюстроўвала ролю кожнага ў такіх гульнях ды паказвала вагу слова і ўсялякага, нават нязначнага хваляваньня розуму. Адам і Сюзана адчувалі толькі сваё, зямное, і ня бачылі, як строга пакараў Вадар тых сваіх падначаленых, што дазволілі сабе расслабіцца і супраць правілаў рэзка адказаць фізычнаму ўвасабленцу на *безаблічную і порсткую* крыўду, якая наогул зьяўлялася нонсэнсам, бо ў мэтафізычных стасунках настаўнік павінен пераканаць, упэўніць вучня іменна ў *пэрсаналізацыі і бязжарснасьці* ўсяго, што адбываецца ў Космасе: за кожнай падзеяй, явай, турбацыяй і на Зямлі, і ў Сусьвеце абавязкова стаіць канкрэтны незапальчывы ініцыянт, аўтар; умець знайсьці, вылічыць яго — *здольнасьці, якія сьведчаць аб узроўні чалавека і адрозьніваюць людзей між сабой*; калі нехта зь іх пырснуў і робіць *увогуле* — значыць, яшчэ не навучаны і мае патрэбу ў паблажлівасьці.

Некалькі хвілінаў супакою, адпачынку зьнялі напружаньне абодвух і вярнулі ранейшую лагоднасьць ды пяшчоту. А такі ўнутраны стан найбольш успрымальны да новых ведаў, блізкі да спасьціжэньня іншасьці.

Спаверху адразу паплылі адпаведныя ініцыяцыі-зычэньні-настроі-вобразы-відзежы.

Тое, што гэта не трызьненьне, Адам зь Сюзанай зразумелі ад пачатку, бо назіралі зьявы адныя і тыя ж разам.

# 13

Паветра над будаўнічымі рыштаваньнямі нечакана задрыжала і зрабілася марывам, празь якое патроху праступіла царква. У хісткай выяве можна было добра разглядзець абрысы апошняга збудаваньня, зробленага масейцамі. Дзьверы былі адчыненыя, і туды ішлі людзі. Побач узвышаўся помнік мускаму патрыярху Афанасію. Крыху воддаль, на высокім узьбярэжжы, гурна стаяў крыж Ефрасіньні Полацкай, ад якога прыкметна бруілася гаючая, прасьвядная энэргія.

Нечакана мроіва асьляпляльна азарылася і ад усходу на сабор ашаламляльна хутка навалілі слупы з пылу, попелу, сьмецьця, гольляў, шмацьця, розных прадметаў, пачалася сумяціца і паніка сярод людзей. Храм стаў імгненна бурыцца, раскідваючы вялізныя аскепкі і друз ува ўсе бакі, у тым ліку і на людзей, якія спрабавалі разьбягацца, але моцная хваля агню і ветру хапала-кідала-паліла іх ды несла жудасным роілам з гары. Хутка негавіль

скончылася і засталіся крушня, бязладзіца, цёмна-шэрае наваколье. Толькі адзін велічны крыж Ефрасіньні Полацкай стаяў непарушна і крэпка.

Прастора ізноў завагалася — і зь неверагоднай імклівасьцю, нібы кінакадры, замітусіліся новыя падзеі, асноўным аб'ектам якіх заставаўся храм. Найперш зьніклі руіны, хмыз, каламеса. Затым пасьвятлела, зьявіліся людзі незвычайнай аздабы і ў дзіўнай вопратцы. Адны проста рухаліся, другія зьнекуль прылятали, трэція казачна выніkалі з паветра. Заўважнай была шматнацыянальнасьць вернікаў. Адзетак у кожнага быў розны, адпаведна месца ўжытку, але, як толькі нехта набліжаўся да сабору, ён дзівачным, магічным чынам зьмяняў яго на аднолькавы для ўсіх сьвяточны ўбор і па прыступках уваходзіў унутр.

Сьвятыня была велізарная і велягурная.

Адам нават ахнуў і схапіў Сюзану за руку:

— Такая, як у першатворным выглядзе, толькі куды прыгажэйшая!

Матэрыяльную абалонку пабудовы зрозь атачала блакітна-празрыстая навалока, якая выглядам уяўляла сабой сьлічную і вабную ружу, што хупава цягнулася ў неба разам зь лісьцем і ўсёй порасьцю.

Атмасфэра пракудна мільгацела пярэстымі бліскаўкамі, гучала касьмічным хваласьпевам БОГУ.

Люд лавіцаю выцякаў з храма і запаўняў усю акругу. Сярод іх Адам і Сюзана прыкмецілі дваіх закаханых, і нешта ім падказала, што гэта — яны самі, толькі будучага інкарнацыйнага кшталту. А яшчэ ім здалося, што ў працяглай і заблытанай гісторыі сьвятыні заўсёды прысутнічалі іхныя душы, якія альбо фізычна, альбо нейкім іншым чынам уплывалі на яго мэтамарфозы ў вызначаныя перыяды.

*Такое* творцы не зусім уцямілі, моцна жахнуліся і яшчэ больш узерыліся ў зьявішча. А яно працягвала разгортвацца далей, зьмяняючыся і ў часе, і ў прасторы. Падзеі ж на сучаснай Зямлі для іх непрыкметна прытармазіліся.

Нябёсы цешыліся ад дагоднага стану падапечных і, карыстаючыся максімальнай адкрытасьцю іхных мазгоў, нагрувашчвалі сэнсу як мага больш ды валілі да аднае кучы праўду з крыўдаю ад розных вякоў, пластоў, індывідаў, ідэяў. Многае тыя адразу не ўспрымалі, было лішніцай, затое адпавядала цудоўнаму мэтаду — узбуджаны розум можа прыняць *усё*, нават немагчымае ў нейкі пэрыяд, і затым, у стане рацыянальнасьці, перапрацаваць *яго* спакваля, далучыць-прыстасаваць да сябе, да свайго ўзроўню, колькі б часу гэта ні займала.

Менавіта таму відовішча набыло яшчэ больш загадкавы і містычны характар.

Перад вачыма ўзрушаных Адама і Сюзаны раскручваўся клубок падзеяў, што адбываліся невядома дзе, калі, з кім. Увагу прыцягнулі, запомніліся толькі некаторыя.

# 14

...Ад усяе істае Зямлі, ад шматлікіх часоў і прастораў, ад сапраўдных і ўяўных падзеяў, радок за радком, бачына за бачынай зьбіралася ў сьвятыя кнігі **праўда**...

...Сьвятар ад амбону патрабаваў пакараньня адступнікаў, інакадумцаў, заклікаў да зьнішчэньня іншасьці, збройнага паходу ў суседнія краіны, супраць няверных...

...Несамавіты і заганны кіраўнік апошняе імпэрыі, злосны і агрэсіўны шавініст, заскарузлы розумам і целам, шалеў ад нянавісьці, істэрыі і націскаў прысьцібкі...

...Над прыгожым і ўрбанізаваным горадам паднімаўся ядзерны грыб...

...У іншых ракурсах той жа зьверхнік-злыдзень ніякавеў і зьнікаў, адчуўшы незвычайны энэргетычны пошуг у Космасе. За ім, як аднолькава хворыя і заразныя, увачавідкі раставалі многія, нат не пасьпеўшы штосьці ўцяміць...

...Разбураліся культавыя збудаваньні, стоды дзе ад нападу, дзе ад стыхіі, дзе ад слабасьці, дзе ад нявер'я...

...Атуга, гмур навісалі над гаротным і бядотным краем...

...Сонца прабівалася праз хмары, цемру, немарасьць і асьвятляла гару...

...Дзіўныя людзі мітусіліся перад сьвятыняй, загадкава маніпулявалі рукамі, часта паказваючы ўгору, і, мажліва, бескантактна кіравалі працэсам будаўніцтва, якое адбывалася назвочна безь якогасьці фізычнага ўдзелу...

...Асамісты і прыстойны герафант натхнёна кіраваў містэрыяй на Сьвятой гары, ужываючы аўтапсію і псыхатэхніку адзінай усеагульнай рэлігіі на Зямлі.

# 15

Нечакана ляснуў пярун, і ўлеўны дождж пагнаў сьпякоту ды мроі прэч.

Адам зь Сюзанай схаваліся ў альтанцы і шчасьліва назіралі, як пераістачалася наваколле — імгненьні, але такія цікавыя, у гэтым вечным і няспынным руху.

Нешта абмяркоўваць і рабіць не было аніякай ахвоты.

Колькі яшчэ будзе часу для гэтага!

красавік-жнівень 2015 году,

г. Віцебск.

# КАХАНЬНЕ

**псыхічная праекцыя**

# 1

Зноў яго прыцягнуў гэты шабас асудавішча. Ён ужо змучыўся ад шматлікіх паўтораў такога знушчэньня. Калі яно скончыцца?

Звычайна ўсё адбывалася па адным сцэнары зь некаторымі карэктоўкамі абставінаў.

У нейкі момант слых пачынаў запаўняць прыкры манатонны гуд, за якім вынікала зьява, поўная нянавісьці і нечысьці. Яна шчыгульна акаляла яго і не адпускала.

Ён, да драбніцаў ведаючы працэс па ранейшых выявах, адразу канцэнтраваўся і спасобіўся да вытрымкі і адпору.

Зьнекуль нальлем зьбіраліся-зьляталіся бязжаласныя душы, фантомы жывых людзей і іхныя думкаформы. Поўныя гневу і злосьці, яны распачыналі свае кляцьбы, зьдзекі са спадзевай канчаткова зглуміць яго, кінуць у сама горшае месца астралу.

— Каб ты спруціўся, гад!

— Хай цябе трасца возьме, паганец!

— Здраднік шалудзівы!

— Распусьнік!

— Гэтак зганьбіць дзяўчыну: перад самым вясельлем уцячы да іншай!

— Як цябе зямля насіла столькі гадоў жыцьця?

— Ты думаў, што расплаты ня будзе і пакараньне абміне?

— Не, паскуда! Калі там, ва ўвасобленым сьвеце, ты трымаўся дзякуючы недасканаламу ладу і заганнай сістэме ўтоенасьці, дык тут не здабруеш: счэзьнеш і канеш безагаворачна.

— Пра аталек забудзься. Мы паклапоцімся, каб табе было як мага горай і каб твае мучэньні працягваліся даўжэй.

— Во будзе вартая бава!

— Заслужана!

— А пакуль будзем усё выразьней паказваць тваю віну, гусьцей і пранікліве насычаць прастору, што цябе атачае, помстай і зьнішчальнымі настроямі.

Уся гэтая благата вырыгвала брыдоту наўзахапкі, ашалела, і часам зьвяга так распаляла ўдзельнікаў, што яны сашчупляліся між сабой, сьпіраліся і рэзаліся да тамаваньня, забываючыся на яго.

Ён такія выпадкі скарыстоўваў, засьцерагальнымі думкамі хуценька ствараў вакол сябе абарончы вопрадзень, апраставўся і ўвобміг выдаляўся. Гэтым разам нічога падобнага не адбывалася.

Злосьнікі не адхіляліся, не давалі яму збыту і сабе спачыну, узмацняючы свой наступ і лаянку. Клёнкі сыпаліся градам. Сама дападныя нагняталі акропнасьць, бязьлітасна доргалі і каёчылі яго.

Момантамі ім авалодвалі роспач і жуд, але ён ня быў баязьлівым і ўляклівым. У яго, выцяглага і мужнага, уся гэтая ліхатня ўзбуджала моцны супраціў.

Ён ніколі ня здраджваў праўдзе, заўсёды імкнуўся жыць пасьціва, з дабром у сэрцы. А калі няўзнак каго і крыўдзіў, дык шчыра выбачаўся, дапамагаў, ужо ня кажучы пра згрызоты сумленьня і каяньне.

Менавіта з-за такога ягонага іства і адбывалася-паўтаралася гэтая мітрэнга.

Так, пад час апошняга ўцелаішчаньня, Лявон сапраўды зьбіраўся ўзяць шлюб зь пекнай, зычлівай дзяўчынай, але не да канца разабраўся ў сваіх пачуцьцях да яе. Перад самым вясельлем стрэў Вольгу — і ў яго душы ўсё перавярнулася. Ён зразумеў наканаванасьць: лёс доўга вадзіў абодвух па выбоінах жыцьця, кідаў у агонь і ваду, выпрабоўваў, каб нарэшце падараваць ім такое вялікае шчасьце — быць заўсёды разам.

Тады ўзьняўся невераемны вэрхал. Асуджэньне і зласлоўе ліліся цераз край. Лявона бэсьцілі, шальмавалі бязь меры, пагражалі, даставалася і Вользе. Іх гэта балюча кранала, нервавала, засмучала. Сваякі падтрымлівалі, як маглі, але галоўным ратаваньнем і ўцехай было каханьне.

Усё гэта не магло не адлюстравацца ў астрале, ня легчы кармічным цяжарам на душу Лявона, але асноўнае напружаньне надавалі ўдзельнікі канфлікту, як памерлыя, так і ўвасобленыя: яны спараджалі негатыўныя думкаформы, якія накіроўваліся да мэты і адпаведна ўзьдзейнічалі.

На гэты раз паблізу зламысцаў ён заўважыў тую, зь кім хацеў паняцца. У цкаваньні ўдзел яна не прымала, тужліва пазірала на яго, як бы аб нечым молячы, і горка зохала. Пагуднасьці і дакору ў вачах не было. У роспачы дзяўчына кінула апошні погляд на любага і таропка паімчала ўдалячынь.

Яму зрабілася прыкра, ад чаго абарона аслабла — і становішча пагоршылася: зграя залютавала яшчэ больш.

Лявон тарапліва ўкульміўся і настроіўся на барацьбу, зусім ня думаючы, што сілы няроўныя.

Моцным разумовым штуршком і эмацыйным выбухам ён агаломшыў нянавіднае скопішча і суняў напад. Але яно прыпынілася не надоўга, сабралася і кінулася нанова.

У гэты момант Лявон адчуў брую пяшчоты і дабрыні, якая хутка ператварылася ў імклівы вадаспад каханьня — гэта Вольця малілася за свайго мілосьніка і слала яму шчырыя пачуцьці, ад якіх той адразу адужэў духам. Пырскі жыватворных пацераў кранулі зьвяглівую арду — і яна асалапела-насьцярожылася.

Лявон якга скеміў, што змагацца трэба не нянавісьцю і злосьцю, а любоўю і дабром. Ён зноўку намогся — і выклікаў у сябе адпаведны настрой.

— Чаго ўсхадзіліся, даражэнькія? Тое, што вы робіце, не пасуе вам, абязьвечвае ваш гожы выгляд. Я назіраю за вамі і захапляюся вашай самаадданасьцю, згуртаванасьцю, энэргетычнай дужасьцю. Маё стаўленьне да вас сама лепшае. Давайце паладзім, узрадуемся. Я вас люблю, паважаю і ад усяго сэрца жадаю вам шчасьця, дабра і памыснай будучыні. Божухна, аслані іх у імя Тваё!

Хэўра здрыганулася і абмякла. Адзінкі яшчэ паказвалі свой нораў, лена скаліліся, кідаючы апошнія пагрозьлівыя эмоцыі. Паступова адны ўвачавідкі сталі зьнікаць, другія незадаволена адлятаць, трэція, мабыць, пад вялікай кармічнай ношкай, зморана пасунуліся, як няўздоліцы.

Лявон са скрухаю назіраў гэтую карціну і ад усяе душы шкадаваў небаракаў.

Ці працягнуцца адрыгі гэткай гораснай падзеі? Ён ня ведаў.

# 2

Пасьля сьмерці на зямлі Лявон трапіў у свой астральны сьвет.

Змрочным і пахмурым выглядаў гэты ўдол. Убачыўшы ўразьлівае бязладзьдзе і цёмныя мясьціны, ён занепакоіўся і засумаваў: няўжо яму суджана існаваць у такой брыдкай і недарэчнай абастоўцы, дзе неверагодным чынам зьмяшаліся-пераблыталіся прадметы, вобразы, пачуцьці, паняткі? Што з гэтым рабіць? Адчаго адразу ён апынуўся менавіта тут? Куды дзеліся людзі?

Напачатку яму дапамагла сястра Алена, якая спачыла задоўга да яго.

Яна аднекуль вынікла, узбуджаная, вясёлая, і абдала брата хваляй шчырых пачуцьцяў.

— Вітаю ў новай выяве! — усёй душою зьзяла яна. — Я радая цябе бачыць.

— Дабрыдзень! І мне прыемна зноўку стрэцца з табой. Толькі я не зьмяніўся: такое ж аблічча, як і раней.

— Табе так здаецца. Я бачу цябе іншым.

— Наогул я многага не разумею.

— Не хвалюйся. Ты яшчэ разгублены, трымаесься за мінулае — гэта натуральна. У астрале на першую пару такое адбываецца з кожным.

— Я разумею, што памёр, але не зусім ведаю, што гэта, — Лявон позіркам і рукой паказаў на агідны разлог.

— Гэта вынікі твайго апошняга ўвасабленьня: усё створанае тваімі дзеямі, эмоцыямі, думкамі, а таксама іншымі людзьмі датычна цябе, і пераломленае праз тонкі сьвет.

— І што мне зь ім рабіць?

— Разьбірацца і працаваць.

— Як?

— Я патлумачу ўвогуле, а дэталі і падрабязнасьці асэнсуеш сам з дапамогай астральных законаў. Дык вось, тут жыцьцё зусім інакшае і мала падобнае на фізычнае. Усе насельнікі — астральцы — істасьцю адкрытыя і тайнаў, як чалавек, ня маюць. Звыкнуцца з гэтым няпроста. Адчуваць і думаць толькі для сябе ты ня зможаш: усё адразу будзе вядома атачэньню. Адтаго раю сьпярша навучыцца кантраляваць сваё нутро. Жадаць, марыць і заразом атрымліваць скутак тут можна без абмежаваньняў, але першаснымі і галоўнымі зьяўляюцца кармічныя парадкі, якія могуць адмяніць любое тваё памкненьне і прадыктаваць сваё. Прычым адбываецца гэта бязь ціску і насільля: у асобныя моманты паступаюць няўлоўныя сігналы-арыенціры, якімі ты кіруесься. То бок карма тут не адвалочнае паняцьце, а рэальная сіла, якой ты, калі сказаць трапней, *дыхаеш*. Яна ўсюдыісная, абстрактная, незаўважная і — абавязковая, неабходная для існаваньня.

— Значыць, я павінен адбываць сваю карму… сярод вось гэтага бардаку?

— Ты цямкі. Іншага шляху ў цябе пакуль няма. Намагайся — і аднойчы ты ўловіш першы покліч: гэта значыць,

атрымаеш дазвол пакінуць свой сьвет і ажыцьцявіць запаветныя мары, пабачыць іншыя куткі астралу, але зноў-такі ў абмежаваным, слаба акрэсьленым выглядзе. Толькі не журыся: паступова такіх дазволаў стане больш, астральны Сусьвет паўстане перад табой выразьней, глыбей, паўней, пачне аддаляцца твая прошласьць і набліжацца будучыня — новае ўвасабленьне.

— Дзякуй за тлумачэньне, безь цябе я б зьнямог ад роспачы, а так ушчоліў духам. А ты на якой стадыі?

— Большасьцю я яшчэ знаходжуся на сваім прыстанку, але ўжо даволі доўга і свабодна магу рухацца па астралу, зносіцца зь іншымі, знаёміцца з акольнасьцямі. Упэўненасьці прыбывае, надзеі растуць.

— Алена, а дзе… людзі?

— Астральцы, астралавекі. Яны, а часьцей іхнія вобразы, выплывуць тады, калі ты пачнеш працаваць у сваім сьвеце і кранеш нейкую канкрэтную зьяву, падзею, залеж мінуўшчыны. Наравістымі зданямі прыйдуць і ўвасобленыя на зямлі… Мяне нехта кліча. Трэба імчаць. Калі я табе спатрэблюся, падумай пра мяне альбо глыбока адчуй — і я буду тут. Жадаю посьпехаў. Да пабачэньня!

Тая размова палепшыла настрой Лявона, падштурхнула жаданьні і імпэт.

Ён стаў зьвяртацца да Алены часьцей.

Яны радзіліся, шукалі шляхі пераадоленьня цяжкасьцяў, выдаленьня альбо нейтралізацыі шкодных напластаваньняў усялякага сэнсу, прымалі рашэньні, а бальшынёй проста гутарылі, каб неяк прыхарашыць адзіноту. Брат і сястра здаўна цягнуліся і паважалі адно аднаго, хутка знаходзілі паразуменьне, шчыра дзяліся патаемным. Мабыць, між імі быў своеасаблівы кантакт, бо Лявон, як ні намагаўся, больш нікога выклікаць дакуль ня мог.

— Гэта покі, — заспакоіла сястра. — Прыйдзе час — і ты здолееш мець зносіны з кім заўгодна па жаданьні і па думцы.

— Пра які час ты кажаш? — весела заўважыў Лявон. — Яго тут няма!

— Так. Мы яшчэ доўга, аж калі цалкам не пазбудземся вынікаў апошняй інкарнацыі, будзем ужываць зямныя выразы і словы. Звычка многае значыць. Заўважыў, што я сказала «доўга»? Ха-ха-ха!

Сапраўды, у астрале час не адчуваўся так, як у Энрофе[5]. Некаторыя з упэўненасьцю сьцьвярджалі пра яго тутэйшую адсутнасьць: настолькі марудна і непрыкметна ён рухаўся. Многія тубыльцы, калі лічыць па зямных мерках, існавалі тысячы гадоў, зьмяняючыся толькі ледзь-ледзь. Адных да гэтага змушала бязьлітасная адплата, і яны шмат мучыліся, прагнучы паслабленьня пакутаў, іншых, наадварот, вяла адносна ўдалая пляніда, якая іх задавальняла, і ім не хацелася ніякіх дадатковых памкненьняў і зрухаў.

Лявон спачатку губляўся ў вызначэньні часу, жыцьцёвых этапаў, затым, каб не запасьці ў роспач і ня зглуздзіць, знайшоў для сябе выйсьце: пакуль суадносіць сваё існаваньне зь Вердам[6], тым больш што гэтага вымагала і ягоная праца над мінулым.

Рознасьць плыняў Часу сфармавала своеасаблівыя зносіны тонкага сьвету з матэрыяльнымі пластамі, для якіх была характэрнай і яўнай зыначанасьць, хуткасьць, імклівасьць. Пераважная бальшыня астральцаў рвалася да ўвасабленьня ў фізычным целе, бо такім чынам дух разьвіваўся і ўдасканальваўся шпарчэй, зьмястоўней, аб'ёмней, што найбольш

[5] Імя нашага фізычнага слою ў сучасным астранамічным Сусьвеце.

[6] Імя нашага фізычнага слою ў сучасным астранамічным Сусьвеце.

адпавядала Боскім Мэтам. Пераход ад разрэджанага да шчыльнага аблічча адбываўся толькі з дазволу і дабраслаўленьня ўладароў, якія кіравалі душамі. У адных выпадках гэта выглядала як відавочная ўсьвядомленая трансфармацыя, у другіх — як праіснaчаньне ў стане бяспомнасьці, у трэціх — як пераход мяжы і паступовае набыцьцё неабходнай фізычнай абалонкі, у чацьвертых — як самастойнае стварэньне свайго выгляду ў адпаведнасьці з унутранымі якасьцямі і ўяўленьнямі, у пятых — як займеньне пераменлівай формы для вандровак па матэрыяльных пластах і г.д.

У Верд душы траплялі складаным шляхам: праходзілі Нулявую Сфэру, працягла сьпелі ў чэраве маці і ў муках нараджаліся-адаптаваліся, нічога не памятаючы.

Лявон ніяк ня мог зразумець, адчаго гэты працэс невядомы чалавеку, не адлюстроўваецца ў ягонай сьвядомасьці? Існавала шмат вэрсіяў, але ніводная не была стоадсоткава пераканаўчай. Ён быў упэўнены: *дзе таемнічаюць, там і падманваюць, хаваюць праўду*; значыць, жыцьцё на Зямлі ня проста ілюзорнае, а несапраўднае, нячыстае, хлусьлівае, пабудаванае на недасканаласьці, эгаізме, амаральнасьці ягоных творцаў альбо створанае для задачаў, да якіх людзей падпускаць нельга.

Астральцы ўспрымалі Энроф у шырокім і глыбокім разьліве Часу, то бок учарашняе, сёньняшняе і заўтрашняе чалавека было перад імі як на далоні. Дзякуючы гэтаму яны маглі прылучацца да падзеяў фізычнага сьвету, а найбольш моцныя — нават уплываць на іх, але толькі ў межах свайго разьвіцьця, веданьня зямных абставінаў, адчуваньня канкрэтных увасабленцаў. Такія здольнасьці некаторыя скарыстоўвалі, каб духам, вобразам прысутнічаць сярод родных і блізкіх, спажываць іхную энэргію, а таксама дапамагаць ім ды засьцерагаць.

Лявону гэта прынесла вялікую радасьць і ўцеху. Ён адчуваў кожны рух, настрой, помысл сваёй каханай і па жаданьні мог прыйсьці ў яе думкі ў любы момант; яна таксама вельмі часта ўспамінала яго і, ня ведаючы таго, сваёй цеплынёю, сардэчнасьцю спрыяла яму, дапамагала пераадольваць усе церні.

Калісь, як толькі з тонкага сьвету ў шчыльны паляцеў яго першы палкі сігнал, Лявон зьніякавеў ад таго, што ўбачыў: Вольга паўстала ў нязвыклым і дзіўным абліччы — фізычная абалонка адсутнічала, флюідная постаць пярэсьцілася, гуляла ўсімі колерамі ды водценямі вясёлкі і, пастаянна зыбаючыся, палаючы, вылучала прыемныя, пяшчотныя гукі, нават мелодыі. Яе жывое атачэньне, акаляючае асяродзьдзе таксама мелі прывідны выгляд, увесь час зьмяняліся ад сьветлых да цёмных тонаў і наадварот.

Апасьля, калі яму сталі зразумелымі асаблівасьці ўзаемапранікненьня абодвух сьветаў, ён ня толькі прызвычаіўся да такога ракурсу ўспрыманьня, але і ўпадабаў яго, бо той даваў шмат ведаў, якія звычайным людзям былі невядомыя.

Лявон кунежыўся ад такога вобразу любай, захапляўся ім, а інкалі, у зачыснай нудзе, уяўляў дрыжоную ў паглядных, павабных цялесных формах — і атрымліваў дапаўняльную асалоду.

# 3

Чарговы напад крыўднікаў сапсаваў настрой, разьвярэдзіў нутро, зблытаў думкі — і, як заўсёды, толькі Волька магла палепшыць ягоны стан.

Лявон паслаў ёй палымяны кліч — і той, усёпранікальны, праз густую разгалістасьць і спляценьні Часу, цераз бясконцасьць і перакрыжаваньні Прасторы, уміг працяў сьвятло і цемру, жыцьцё і замсту, крануў каханку.

Была ноч, і яна спала.

Прывідам ён лунаў над ёю, упіваўся яе прыгажосьцю, млеў ад шчасьця. Яму бажалася абняць сваю ясачку, пацалаваць, сьціснуць у абдоймах і бясконца сунежыцца. Але зрабіць гэта было немагчыма: рознасьць сьветаў няўмольна перакрэсьлівала ўсе намыслы і жаданьні, дадавала мучэньняў.

Адчаго столькі перашкодаў у Космасе? Каму гэта трэба?

Лявона не заўсёды намагалі такія пытаньні, пераважна ад скрайнасьці, бо ў дадзенасьць і наканаванасьць ён верыў. Цяпер таксама было не да роздумаў.

Ён аблашчыў мілосьніцу сваім духам і нырнуў у яе сон — зараз адзінае, дзе можна было наталіцца ёю ўдосталь.

Ёй мроілася нешта бязладнае, недарэчнае — і ад гэтага яна хвалявалася, варочалася ў ложку.

Лявон вырашыў суняць бязглузьдзіцу і ценем мільгануў у яе сьвядомасьці. Тут жа кашмар адышоў — і ў змрочным марыве Вольга ўбачыла любага, паімчала да яго. Ён пранікліва пазіраў на яе і ўзбуджана, таропка цераз завалы нейкіх агрэгатаў, мэханізмаў, каменьня, кніг, часопісаў, газетаў, адзежы, абутку, хабаўзьдзя, сьмецьця і іншай звалачнай усячыны прабіраўся-рухаўся насустрач. Мройная смуга хутка расьсеялася, яркім сьветам напоўнілася наваколье — і яны стрэліся, моцна і жарсна абняліся, абсыпаючы адно аднаго пацалункамі ды мілоснасьцямі. Не кантралюючы сябе, у імгненьне ўзьюрыліся і дасягнулі найвышэйшай асалоды...

Іх яшчэ не пакінула зачысьць і жада, а думкі пачыналі ўжо роіцца: адбылося штосьці нязвычнае, ненатуральнае, і яно, мусібыць, паўторыцца. Калі ён ведаў, *што гэта*, дык яна яшчэ не ўсьведамляла, ад чаго ёй так ніякавата і нязручна.

Вольця аслабанілася ад абдымкаў мілосьніка і стала ўглядацца ў наваколье. Яе асмужаны позірк адразу зрабіўся зыркім, ясным — і Лявон зразумеў, што яна перайшла ў сьвядомы этап сну. Значыць, іхнія стан і ўяўленьні цяпер былі блізкія, падобныя і спрыялі адэкватным стасункам, але абставіны абнадзейвалі мала: звычайна ў такіх выпадках сьведам'е чалавека, моцна зьнітаванае зь фізычным целам, доўга ня можа вандраваць само па сабе, свабодна, незалежна; яно зазнае замяшаньне, узрушэньне і сьпяшаецца выйсьці з-пад улады Гіпносу, вярнуцца да свайго наканаванага жытла — галавы.

Лявон не прывык марудзіць і любы адцінак часу імкнуўся скарыстоўваць напоўніцу, а такі — тым больш.

— Волечка, любка мая, дзякуй табе за гэтыя імгненьні шчасьця, — ён зноў прыгарнуў яе да сябе. — Што цябе ўсхвалявала?

— Дзе мы? — быццам ня чуючы яго, зьбянтэжана спытала яна.

— У тваім сьне.

— А-а, зразумела, — Вольга ўнікліва паглядзела на Лявона. — А цябе няма. Гэта толькі твой вобраз, які я заўсёды нашу з сабой.

— Не, родненькая! На гэты раз усё інакш, ня так, як ты звычайна трызьніш і бачыш мяне, былога, у мінулым часе. Цяпер я прыйшоў да цябе сьвядома з забыцьця, у тым выглядзе, які маю там.

— Лёвачка, міленькі! Дык ты жывеш?

— Так, толькі іначай, чым да… сьмерці на зямлі.

— А як там?

— У нас мала часу, распавяду іншым разам.

— А пра мяне ты ўспамінаеш?

— Кожную хвілінку, родненькая. Адно, што робіць падобнымі гэтыя сьветы, — нашае каханьне.

— Я знудзілася безь цябе, Лявонка, мне цяжка…

— Трывай, даражэнькая. Што б ня здарылася — мы заўсёды разам і можам выклікаць адно аднаго ў любую хвіліну. Памятай гэта.

Раптам нешта тужлівае загучала ўдалечы і адцягнула ўвагу. Узмацняючыся па меры набліжэньня, гуд узрушваў сьвядомасьць і скажаў-сьціраў візуальны плян.

Разумеючы, што зноўку расстаюцца, закаханыя роспачна абняліся, пацалаваліся — і зьніклі.

Так перапыніўся сон Вольгі — адзін з сама прыдачлівых і чароўных момантаў іхняга каханьня пасьля пагібелі Лявона.

# 4

У сьвятле пачуцьцяў яны б яшчэ доўга ішлі па зямлі ўпобачкі, калі б не *бяда*, якую злавала-раздражняла шчасьце ўмілаванай пары і якая неадступна цікавала за ёй, выбіраючы зручны момант для нападу. А такі звычайна надараўся, як толькі адзін з закаханых інакш паглядзеў на другога, кінуў напажаданае слова, выказаў крыўдны сумнеў…

Неяк ён затрымаўся ў паездцы, патэлефанаваў ёй і растлумачыў сітуацыю, яшчэ раз запэўніў, што ўсё будзе добра, пацалаваў.

Яна абняла маленькага сына, усьцешылася-супакоілася, пачала рыхтавацца да сустрэчы.

І раптам ні адтуль, ні адсюль у думкі скокнуў халерычны імпульс, які мігам разгарнуўся ў карціну здрады. Вольга панічна ўспыхнула і пасьпяшалася адагнаць брыдкае насланьнё.

Бяда зларадна хмыкнула, заўважыўшы шчылінку ў адносінах любых, і ўвішна праціснулася церазь яе. Агледзеўшыся,

яна адразу прыкмеціла, хто зь іх знаходзіцца ўва ўмовах, больш спрыяльных здарэньню.

Канешне ж, Лявон: скрозь цемрадзь, дождж, імчыць па сьлізкай шашы на заняпалым аўтамабілі, адрамантаваць які ўсё адкладваў.

Бяда ўкульмілася, налілася нянавіднасьцю і, жутка здрыгануўшыся, дзьмухнула ў прастору.

Машына тут жа чмыхнула, не ўпісалася ў заваротак і паляцела пад адхон.

Вольга ўбачыла перад сабой жудасныя вочы Лявона — і закрычала.

# 5

Гэтая трагедыя ўскалыхнула-замаркоціла ўсіх родных і блізкіх, па дажывоцьце зьнявечыла душу і жыцьцё Вольгі. На жаль, ніхто не глядзеў далей праяўленага сьвету. А той нікога не выпускаў з абдымкаў скажоных уяўленьняў і звычкаў, не даваў сягнуць думкаю ў іншыя вымярэньні, зразумець усеагульнасьць, узаемазлуч касьмічных працэсаў.

У замагільлі Лявон бачыў свой адыход інакш. Па-першае, з-за заўчаснай сьмерці, па правілах кампэнсацыі, часткова палегчыўся ягоны кармічны цяжар і скасаваліся некаторыя праблемы, зь якімі сутыкаюцца душы пасьля натуральнага скону. Па-другое, ніякага засмучэньня, акрамя змушанага і вынятковага расстаньня з жонкай і сынам, ён не адчуваў.

Наадварот, прыйшло незазнанае задавальненьне, лёгкасьць: фізычнае цела адсутнічала і больш не турбавала сваімі мімаходнымі патрэбамі, мройнай значнасьцю і важнасьцю; душа выслабанілася зь ягоных цiскоў і пакрысе прыста-

соўвалася да новага, больш прыдатнага для сябе асяродзьдзя, скідваючы, як непатрэбнае халусьце, агіднае мінулае, сьмялела і спрабавала сябе ў палётах.

Гэта давалася нялёгка.

Астральныя праекцыі зямных думак, настрояў, спраў бязладна і выродліва грувасьціліся навокал, энэргетычна скоўвалі і проста так не адпускалі. Яны мазолілі вочы, дакаралі, кпілі і дакучліва-зьвяглліва патрабавалі ад Лявона разбору, вызначэньня. Ён ніколі ня думаў, што ягонае зямное жыцьцё ў нейкі час паўстане як сюррэалістычная карціна, убачыць і зразумець якую дадзена толькі яму. Здавалася, і яна правнікліва глядзела на яго, зьдзекліва пытаючыся: «Ну, як? Задаволены сваім існаваньнем у Вердзе? Жадаеш яшчэ адправіцца туды? Не? Ха-ха-ха! Табе не пазьбегнуць заслужаных кармічных увасабленьняў і не адкараскацца ад мяне. Я — твой навігатар, арыентыр у гэтым тлумным Косьме».

Сапраўды, паклады мінуўшчыны ў сьвеце Лявона — адначасова і падрабязная карта, і прычынна-вынікова схема ягонага жыцьця. Іх трэба ўспрымаць не пагардліва, а добразычліва, паважна, удзячна, бо яны паказваюць дарогу, дэманструюць, як трэба дзейнічаць і паводзіць сябе, каб правільна рухацца.

«Ніколі ня ведаеш, зь якога боку і ў якім выглядзе да цябе прыйдзе праўда. Ня ўсё вонкава прыгожае і ўпарадкаванае спрыяе: хутчэй за ўсё, яно затлумляе мазгі, заспакойвае, падманвае. А трэба актыўна мысьляваць, бударажыць ды ўзрушваць сябе, да чаго вельмі часта падштурхоўвае пачварнае і бязладнае».

Лявону падалося, што вонкавы гармідар з удзячнасьцю прыняў ягоныя думкі і цяплей стаў пазіраць, мкнучыся насустрач.

«Сьвет цудоўны сваёй брыдасьцю!» — з такім выслоўем ён пачаў разьвязваць чарговы жыцьцёвы вузел і адразу адчуў, што нехта дапамагае, накіроўвае, засьцерагае ад хібаў. Не стрымаўся і паслаў атачэньню шчырую ўдзячную ўсьмешку, а яно ў адказ аблашчыла яго лагоднай хваляй — і агульны настрой у навакольлі палепшыўся: паразуменьне дасягнутае.

Іншымі вачыма паглядзеў гаспадар на свой сьвет — і ўпадабаў яго: ува ўсім прысутнічаў няўрымсьлівы дух пошукаў і тварэньня. Праўда, штосьці не атрымалася, сказілася, зьнявечылася, паўстае як недарэчная абракадабра — не бяда; галоўнае — яно апавядае касьмічным патрабаваньням руху і барацьбы.

Лявон задаволіўся такім падыходам.

Каб крыху адпачыць, а прадышкай у астрале было пераключэньне на іншы занятак ці намер, ён уздыхнуў і нягадана — о, цуд! — узьляцеў. Ад зьдзіўленьня залыпаў вачыма, замахаў рукамі, затрымцеў нутром, прыстасоўваючыся да новага стану. Але хутка ўсё спынілася — і невядомая сіла вярнула яго назад гэтак жа, як і ўзьнесла. Яму спадабаўся такі высокі скачок, і ён стаў азірацца, шукаючы таго, хто зь ім практыкуецца. Сваю наіўнасьць ён тут жа зразумеў, успомніўшы, дзе знаходзіцца: як казала сястра, астрал — сьвет, у якім колькі ні існуй, ніколі цалкам не спазнаеш яго чароўных нечаканасьцяў.

З ахвотай узяўся Лявон за працу, упэўнены, што іменна такім чынам даб'ецца лепшых вынікаў. Але колькі ні высільваўся, новых палётаў не адбывалася. Гэта яго азадачыла і нават астудзіла.

Быўшы ўніклівым, ён стаў аналізаваць тое, чым займаўся.

Пройдзены надоечы этап памардаваў: напластаваньні так перамяшаліся і згрувасьціліся, што разабраць-падзяліць

іх на самастойныя, зьмястоўныя часткі, адчуць іх сапраўдны, а не перакручаны сэнс і значэньне для сябе было нялёгка. Лявон прыкмеціў: яны былі водгукамі, адлюстраваньнямі пераважна фізычных высілкаў, матэрыяльных здабыткаў і пабудоваў яго зямное хады.

А дагэтуль ён шчыраў больш над залежамі эмацыйнага ды інтэлектуальнага кшталту — і ўзьняўся ўгору.

Асенены, Лявон вырашыў аканчальна пераканацца, што пачуцьцёвы і разумовы досьвед узвышае, дае крылы. Капаючыся як крот, ён пахапліва папоўз па няроўнасьцях ды выгінах лёсу і хутка знайшоў неабходныя астральныя адбіткі сваёй эмацыйна-мысьлявой дзейнасьці ў Вердзе. З натхненьнем пачаў прасейваць іх церазь сьведам'е, даючы ім новае, больш трывалае мейсца ў сваім жыцьці і вызначаючы характар уласнай будучыні.

Сярод усялякага астральнага рызьзя і рухавых, пярэста-празрыстых калматых круглячкоў, што выражалі дзіцячыя настроі-капрызы і лёгка паддаваліся апрацоўцы, трапілася дрыготкае, цёмнага колеру, плазмападобнае стварэньне, якое перапаўнялі жах і боль. Вызначыцца зь ім, суаднесьці яго з чымсьці знаёмым адразу не атрымалася. Гаспадар затрымаўся і паглыбіўся ў гэты вобраз. Адразу паўстала жудасная карціна: немаўля выпускаюць з рук на дол — і яно зазнае балючасьць, вялікае ўнутранае страсеньне. Гэты выпадак залягаў недзе ў падсьвядомасьці і на працягу ўсяго зямнога жыцьця пасылаў сігналы, уплываючы на паводзіны Лявона: боязь усялякіх падзеньняў і скачкоў праследавала яго пастаянна.

Ён уважліва паглядзеў на стварэньне і, глыбока асэнсоўваючы жудасьць здарэньня і пераЖытых наступстваў, клапатліва прыцягнуў яго да сябе, даў яму надзейны прытулак у сваіх памарках. Гэтым Лявон запачаткаваў свае доўгае

вызваленьне ад страху, якое мусіць скончыцца толькі ў апошняй інкарнацыі.

Такое рашэньне ўсьцешыла нутро, палегчыла пошукі.

Дадалі ўзьнёслага настрою і наступныя крокі, асабліва тыя, што прыйшліся на вехі жыцьця: першыя ўражаньні ад сьвятла; твары маці і бацькі, якія радасна схіліліся над дзіцём; тлумны і часам надакучлівы гуд атачэньня; хатні лямант і задушлівая трывога; знадворны шум, брэх сабакі, крыкі і смурод жывёлаў; ванітны пах і надакучлівае вуркатаньне машынаў, тэхнікі; суседзі, вяскоўцы, аднагодкі; хвалюючая школа і чароўны лемантар; настаўніца-фея; прыгожы твар суседкі па парце; нянавісьць равесьнікаў і бойка зь імі; хлапечыя адчуваньні і дзіўны эратычны сон; новыя веды і думкі пра сусьвет; дзяўчаты і нясьмелыя заляцаньні; выпускны баль і першы сэксуальны вопыт; унівэрсытэт, навука, свабода і неабдымны акіян пазнаньня; сустрэчы, сябры, краіны, інтэнсіўны тэмп розуму і пачуцьцяў; навуковае асяродзьдзе, загадкі і таямніцы гісторыі, Космасу, адкрыцьці; зайздрасьць і жорсткасьць людзей; роздумы; роспач і перамогі; імкненьне ўвысь і пашырэньне сьвядомасьці; адчуваньне моцы і веліччы праўды; вера ў гармонію і дасканаласьць сьвету... — гэтае і многае іншае было перад вачыма ў астральных, знаёма-незнаёмых, звыкла-нязвыклых, варыяцых, стукалася ў душу, сэрца, галаву, патрабавала і знаходзіла разуменьне, прымірэньне.

І над усім лунаў дух каханьня.

Лявон глядзеў на свой сьвет і зьдзіўляўся, як яно паўплывала на многія працэсы, перайначыла іх. Сама прыкметнымі былі сьветлавыя эфекты, якія кранулі-зьмянілі навакольле, надалі яму больш фарбаў, адценьняў, яркасьці, глыбей паказалі яго сэнс. Крыху пазьней, назіраючы сьветы іншых астральцаў, Лявон

убачыў, як аднастайна і змрочна выглядалі некаторыя зь іх без каханьня.

Зноўку патануўшы ў ім і адчуўшы яго жывільную моц, ён не заўважыў, як узьняўся над сваім хаморным і захламленым краявідам. Зразумеў гэта, толькі калі бязрадна закуляўся ў паветры — і адразу збаяўся вышыні. Але падзеньня не адбылося: нейкая сіла трымала і дапамагала.

Хвалюючыся і дрыжучы, Лявон стаў ліхаманкава балянсаваць, выбіраць зручны стан. Неўзабаве тое атрымалася — і ён, задаволены, у вертыкальным становішчы, упэўненым глядам акінуў наваколле.

Верхняя пазіцыя давала поўнае ўяўленьне пра ягоны сьвет, але нічога новага не адкрывала, калі не лічыць вузкай сьветлай аблямоўкі небасхілу, якая зьнізу не была бачная.

«Што там?» — мільганула думка.

Нечакана для сябе Лявон страсянуўся і, выгінаючыся ад нязвыклага руху, паляцеў. Інтуітыўна спрабуючы розныя падыходы, ён абраў латвую для палёту форму і натхнёна панёсься.

Незвычайныя адчуваньні зьведваў нэафіт: яму здавалася, што сьвет пашырэў, адчыніў новыя тайны, узмацніў ягонае іства.

«Калі лунаеш — спазнаеш і можаш больш», — радасна абагуліў ён першыя ўражаньні і пасьмялеў думкамі.

Заманулася ўзьняцца вышэй — і ён узьляцеў. Паспрабаваў яшчэ — і атрымалася. Праз колькі разоў ягоны край з вышыні стаў выглядаць ледзь ня выспай сярод змрочна-шэрае бясконцасьці. Выразнасьць страцілася. Зьнікла і аблямоўка — гэта Лявона азадачыла, але толькі на імгненьне: пераважыла імкненьне ўгору. Калі ён распачаў чарговы ўздым — стукнуўся аб нябачную перапону. Спробы абляцець яе нічога не далі: зьверху была нібыта столь.

Расчараваны экспэрымэнтатар паступова пачаў зьніжацца, хоць гэтага й не жадаў.

Нанова намалявалася сьветлая палоска — і ён завіс, разгублена пазіраючы наўкола.

«Калі ўвышыню шляху няма — паляцім ушырыню. Толькі ў які бок?»

Без ваганьняў паімчаў, куды кінуў першы зірк.

# 6

Колькі ні ляцеў — прынаднае краймо не набліжалася.

«Калі і тут небасхіл такі ж падманны, як на зямлі, тады няма чаго і спакушацца».

За гэтай думкай яго торгнула і кінула ўніз.

Зноўку Лявон апынуўся сярод сваіх завалаў, якія адразу страсянуліся, убачыўшы бацьку.

«Узрадаваліся новай сустрэчы? Усё спадзеяцеся на ратаваньне? Канешне, гэта — вашае права і мой абавязак. Мы адно без аднаго нікуды…»

Ад уяўленьня далейшага ачамярэлага мутару яму стала блага.

«А ці ня рана прыйшла стома?» — аднекуль вынікла незнаёмая інтанацыя.

«Хто тут?» — насьцярожыўся Лявон.

«*Твая праўда.*»

«Яшчэ адна!» — яхідна заўважыў ён.

« Я — адзіная!»

«Ха! Няўжо? А гэта тады што?»

Лявон нервова паказаў на свой абсяг і пачуў:

«Гэта — дробная і нікчэмная патуга твайго апошняга ўвасабленьня. Яна — усяго толькі кропля ў тваім касьмічным акіяне, дый тая хутка выпарыцца».

Такія азначэньні пакрыўдзілі і разьюшылі.

«Досыць! Нахаба! Ты што — акіян?» — злосна выгукнуў ён.

«Не. Я тое, што ад яго застаецца», — спакойна і загадкава прагучаў адказ.

Лявон нічога не разумеў і няўцямна пазіраў навокал, шукаючы сумоўцы. Нікога не было. Унутранае напружаньне нарастала і шукала выйсьця.

«Мабыць, мяне аблытаў бязум», — трывожыўся ён.

«Дарма нэрвуесься, — суцяшаў голас, які ішоў зьвіхроў. — З глуздам у цябе парадак. А ня ўбачыш ты мяне яшчэ вельмі доўга. Я ня тая праўда, пра якую так шырока і легкадумна плявузгаюць на зямлі, абвалакваючы яе недарэчнымі тлумачэньнямі і найменьнямі, — гэтая бліжэй да мрояў, зману. Я — *тая праўда,* што залягае на сподзе тваёй існасьці: як ветрыцца-выпараецца ад павеваў часу і сонечных промняў акіян, адкладваючы на дне каштоўную соль, так вытыхаецца з душы ўсё прайдучае-мінучае, пакідаючы ў ёй крышталікі мудрасьці, дасканаласьці і прыгажосьці, зь якіх утвараецца бясцэнны богадагодны скарб».

«І што застанецца пасьля майго апошняга жыцьця? Можа, наогул усе мае цяперашнія высілкі марныя і выскваркі ня вартыя?»

«У сьвеце нішто не дарэмна: усё мае сэнс, які ня кожнаму адкрываецца цалкам. Менавіта адтаго я не адказваю на такія пытаньні. Магу толькі адцеміць, што каханьне, якое ты напаткаў, паспрыяе табе. Працуй — і жаданы плён заўсёды будзе».

# 7

Вось так і на зямлі: жывеш усялякімі думкамі, эмоцыямі, справамі і ня ведаеш — навошта? Па праўдзе, не зусім і мазгуеш над гэтым. Але калі выпадае хвіля-другая для летуценьняў, дык абавязкова вынікае пытаньне пра сэнс жыцьця, пасьля якога звычайна застаецца сум. І ня важна, каго напаткаў роздум — сьлесара, аратага, вучонага, маладога ці старога, — усе блукаюць-блытаюцца і ня маюць пэўнага адказу.

Канешне, кожны прапануе-абгрунтоўвае свой пункт гледжаньня.

Колькі іх было за ўсю гісторыю існаваньня чалавецтва?! Безьліч! Беспамылкова можна сказаць, што ўсе яны насілі прызямлёны, прыватны характар, бо ніводзін зь іх не авалодаў галовамі людзей назаўжды і ня вызначыў магістральнага шляху разьвіцьця ад пачатку і да скону сьвету. Інакш гісторыя мела б зусім іншы выгляд, не была б такой выкручастай, выбоістай, жорсткай, а пра белыя плямы ды лакуны і гаворкі не існавала б. Паэтапныя ідэі,

якімі засланая дарога многіх пакаленьняў і якія то нараджаюцца, то паміраюць, толькі пацьвярджаюць выснаў пра іх зямное паходжаньне і абмежаваныя, дастасоўныя мажлівасьці.

Лявон прытармазіў і крыху збочыў у разважаньнях, прыцягнуўшы іншыя акалічнасьці.

Складнасьць гэтага меркаваньня губляецца, калі ўлічыць уплыў пазазямных і тагасьветных сілаў. Яны, безумоўна, разумней за людзей, можа, нават стварылі і вядуць-апякуюць іх, маюць нейкія далёкія мэты і, каб не зьнявечыць ды не пашкодзіць свой твор, час ад часу робяць карэктывы-зьмяненьні, парцыённа падтрымліваюць ідэямі, пашыраюць сьвядомасьць… Але пры гэтым адчагосьці — Лявон ня мог без свайго канька! — *хітруюць-падманваюць, маскуючы альбо зусім хаваючы галоўны сэнс,* замест таго каб расчыніцца, прасьвятліць і ўзбагаціць дух чалавека.

Асабліва гэта бачна адсюль, з астральнага сьвету.

Сьлепата, глухата і невуцтва чалавецтва ўражваюць. Вельмі рэдка яно зьвярае-ўзгадняе свае крокі з Космасам. А калі робіць гэта, то з падазронасьцю, страхам і нават — нянавісьцю. Дзіўна, але такое становішча задавальняе *гэтыя сілы* — і яны працягваюць свае жорсткія досьледы (а як яшчэ назваць іх таемную дзейнасьць?), не зважаючы на зямныя пакуты — як можна перақанацца, абавязковую ўмову ўсіх мінулых і будучых экспэрымэнтаў над людзьмі.

Лявон задаволіўся, што знайшоў у астрале дадатковыя доказы слушнасьці ды трапнасці сваіх колішніх высноваў, і дадаў важкіх аргументаў да цяперашніх абагульненьняў: вонкавыя сілы маюць немалы інтарэс да Зямлі і, пераканаsuccessfully ныя ў недасканаласьці чалавека, нагарадзілі шмат бар'ераў на яго шляху ў Сусьвет; асаблівае значэньне, зусім не дасьледава-

нае, таксама маюць нябачныя цывілізацыі зь іншых вымярэньняў, якіх на зямной апуцы шмат. Увогуле лёс плянэты залежыць ня толькі ад homo sapiens — і гэта трэба засвоіць кожнаму сьвядомаму.

# 8

«Новы Ёў[7] зьявіўся!»

Лявон зноўку скалануўся: незвычайны голас прагучаў зьнянацку, нібыта з усіх бакоў адразу, а можа, нават і ў галаве.

«Яшчэ нехта прычапіўся! — мільганула думка, і ён хвацкі крутнуўся, але, як і раней, нікога не знайшоў. — Так, *тут* галасы жывуць самі па сабе, бяз формы і выгляду».

«Колькі іх было! А колькі будзе!.. Канца і меры няма!»

«Хто вы ўсе такія?» — маючы сумнеў наконт няпрошаных гасьцей, Лявон усё хацеў даznацца праўды.

«Вось што значыць даць нядбалым розум, — працягваў нябачнік, не зважаючы на яго паводзіны, — замест працы яны разважаюць над сэнсам жыцьця, прымітыўна мудруюць і ніяк ня могуць даўмецца, што ён вынікае менавіта з працы».

[7] Кніга Ёва.

«Мяне ня чуюць. Грэбуюць. Затое як рэзанёрнічаюць!»

«Кожны зь іх упэўнены: іменна ён валодае ключамі ад праўды і асобным каналам сувязі з Богам, а Той толькі тое і робіць, што клапоціцца выключна пра яго. Сьмешная заблудзь і недарэчнасьць! Сонца ходзіць па нябесным коле, сьвеціць усім аднолькава і пра нейкую там травінку зусім ня ведае. Гэтаксама і Бог. Затое ***сістэма***, створаная Ім, пільна сочыць за кожным і нікога не пакідае без увагі. Вось да ***яе*** і трэба зьвяртацца-апеляваць усялякаму стварэньню — колькі прыкметаў, азнакаў, сымболяў, падказкаў, тлумачэньняў давалася і зараз параскідана вакол пра гэта! Бяры і карыстайся! А няўклюды, хоць і глядзяць на іх, ня бачаць ды выдумляюць глупствы».

«Паўсюль адна і тая ж крутня-мутня! Няхай на зямлі *ім* цяжка жыць у целе і яны яго амаль не скарыстоўваюць, а ў астрале ўжо маглі б набыць хоць якое тонкае аблічча… Не, і тут важнічаюць, фанабэрацца! Усё пад покрывам, затуленьнем…»

«Нават трапляючы *сюды*, дзе ўсё празрысьцей і ясьней, і пазнаючы многія сусьветныя тайбы, яны ўсё адно застаюцца ў палоне ранейшых памылкаў і забабонаў, сягаюць помаракамі не туды. Як вось гэтая прастадушная істота, якая не кумекае, што мудрасьць пачынаецца са страху Гасподнягa, а не з таго, каб паказаць Нябёсам свае кулачкі».

«Добра, што хоць размаўляюць — у фізычным сьвеце такога няма. Там загадкава і пагражальна маўчаць, не давяраючы людзям і ўспрымаючы іх як ворагаў альбо турзаючы рознымі мукамі як паддосьледных. Пры гэтым самі чакаюць ад іх *любові*. Дзівакі: скуль *ёй* узяцца?»

«Яны дайшлі да дзёрзкасьці і сапраўды лічаць, што могуць апрастацца, выслабаніцца, быць з намі нароўні. Пацеха!.. Доўга мы зь імі цацкаемся, усё шкадуем, песьцім, спадзяемся…»

— Лявон! Што з табой?

Шквал эмоцыяў абрынуўся на яго — і нянаджана перад ім узьнікла сястра. Узбуджаная, спалоханая, яна стала літаральна трэсьці брата.

Ён нічога не разумеў і толькі трымцеў.

— Бачыў бы ты сябе збоку! Разьлезлы бясформавы студзень! — працягвала тармасіць Алена.

Хутка Лявон ачомаўся і памкнуўся нешта ўспомніць. Але не атрымлівалася.

— Нядзіўна! *Такое* можна тварыць толькі ў бесьсьвядомым стане, — супакойвала сястра.

— Не, да мяне вяртаецца... Нейкі голас, нібыта этэрны... Гучыць звонку, здаля, пакрысе набліжаецца і...

Лявон ускрыкнуў і нанава закалаціўся.

Алена торапка абхапіла яго добразычлівымі думкамі, стварыўшы наўкруг своеасаблівы засьцерагальна-гаючы кокан.

— Зараз будзе ня так цяготна, — супакойвала яна, дадаючы гарачых пачуцьцяў. — Я зразумела, *што* цябе напаткала... Ты трапіў пад узьдзеяньне *Кіроўцаў*.

— А я думаў — багоў.

— Гэта тое ж самае.

— Значыць, тут зь імі можна зносіцца?

— Лепей гэтага пазьбягаць, хоць яны і любяць усялякія цудатворствы з нашым удзелам — толькі ў нас ад іх марока.

— Я чуў чыйсьці голас...

— Але на твой ніхто не рэагаваў.

— Адчаго?.. Хоць пачакай, мне вядомы адказ: я — недасканалы, ніжэйшага ўзроўню і не заслугоўваю *іхняе* ўвагі.

— Ня толькі з-за гэтага.

— З-за індывідуальных якасьцяў?

— І гэта не асноўнае.

— Тады што?

— Ты кемлівы і празь нейкі час спасьцігнеш усё сам. Але з улікам таго, што зараз для цябе многае ў навіну, я ўсё ж такі сёе-тое распавяду, каб надалей ты быў асьцярожным. Маё тлумачэньне гэтых працэсаў можа паказацца табе недастатковым, спрошчаным — прабач, бо я ніколі не цікавілася Космасам, мэтафізыкай, а тут вось даводзіцца ўнікаць.

Алена кіўнула-ўсьміхнулася Лявону і прадоўжыла.

— Дык вось, матэрыяльны сьвет, у якім мы існавалі дасюль, наклаў сваё адбіцьцё на нашую сьвядомасьць і ўбіў у галаву, што ўсё ў Космасе тыповае, падобнае. Калі ж трапляем сюды, у астрал, сутыкаемся зь іншымі прынцыпамі існаваньня — уяўленьні зьмяняюцца. Як вынік — псыхічнае ўзрушэньне, замарачэньне. У кожнага гэта адбываецца па-свойму. Агульнае адно: сьведам'е скалынаецца, губляе цэласьць і быццам бы раскідвае нашую істасьць. У такія моманты мы выразна адчуваем прысутнасьць *іншасьці*, звычайна бліжэйшай, якая добра нас ведае. *Яна* нічога дрэннага нам ня робіць. Наадварот, дапамагае і нахлашч адчыняе дзьверы ў тонкі сьвет, але яе ўладная моц і жорсткасьць адчувальна б'юць па нашай ганарыстасьці, раняць нас, кавенчаць... Потым мы звыкаемся, пачынаем адэкватна ўспрымаць навакольнае асяродзьдзе, і нас ужо не зьдзіўляюць розныя галасы ды выявы іншасьці. Усё гэта лягчэй пераносіць, калі побач знаходзіцца *блізкі, астралец або чалавек*.

Алена яшчэ доўга разважала пра асаблівасьці новага сьветаўспрыманьня, свой шлях спазнаньня, шкадавала, што многае прыйшло позна — і гэта запаволіла яе рух...

Лявон спагадліва слухаў, падбадзёрваў Алену, абяцаў дапамагаць, бо ягонае разьвіцьцё на гэтым напрамку было значна шырэй і глыбей, а ў думках ужо даўно быў з «*блізкім чалавекам*», пра якога, сама таго ня ведаючы, нагадала сястра.

# 9

Адчаго на помач першай прыйшла Алена, а ня Вольга?

Няўжо любоў мацней за каханьне?

А мо *такое* каханьне?

Наогул, што ёсьць любоў і каханьне?

Ніколі гэтыя пытаньні так шчыльна не падступалі да Лявона і не трывожылі яго. Што такое?

Непадалёку як бы ў нерашучасьці калыхаўся вобраз мілосьніцы: ён то набліжаўся, то падаляўся, выяўляючы розныя настроі.

Лявон парываўся насустрач, жадаючы іх распазнаць, прачуць, адгукнуцца, але *нешта* перашкаджала, спараджаючы рой нявартых думак, якія выклікалі раздражненьне і злосьць.

Ужо ведаючы, да чаго гэта можа прывесьці, ён сілаю волі пераключыўся на іншую хвалю — і ў чыстым сьвятле ўбачыў сваю каханую.

Яна была ў гарадзкім садзе, павольна ішла сьцежкаю.

Веснавое сонца лашчыла маладую зеляніну, песьціла першыя кветкі, узбуджаючы ўва ўсім радасьць і надзею.

Вольга, хоць і ўспрымала гэтае хараство, была сумнай.

Ужо колькі часу яе не пакідала *тая* трагедыя: яна смугою вісела ўнутры і ўсім думкам, пачуцьцям надавала невыразнае, сутонлівае адценьне. Сьвятлей станавілася, калі захапляў нейкі занятак, клопат, адцягвалі будзённыя справы і займалі шчырай увагай людзі, калі побач шчабятаў сын, які ўжо хадзіў у школу і цешыў посьпехамі, то сьмехам, то паваротам галавы, то зіркам блакітных вачэй усё больш нагадваючы Лявона...

Калі ж здаралася адзінота — насоўвалася памрока, скажаўся сьвет. У гэтых умовах Вольга адчувала толькі горыч ды невыносную тугу. Яе каталі ўспаміны. Ёй здавалася, што самота існавала менавіта для таго, каб выварочваць нутро і дэманстраваць яго напаказ усяму Сусьвету — маўляў, глядзіце, як і ад чаго пакутуе душа! — то бок была своеасаблівай споведзьдзю перад Нябёсамі, калі атуляў страх Гасподні і ўва ўвесь голас пачынала гаварыць сумленьне.

Дзіўна, але, нягледзячы на ўсе мучэньні, Вольга аднойчы зразумела, што ня можа абыходзіцца без адзіноты, безь яе ўтульнасьці, цеплыні, шчырасьці, а галоўнае — без цудоўных энэргетычных зносінаў зь Лявонам, якія пакрысе выцясьнялі з памяці скруху.

Лагодны ветрык крануў твар, варухнуў валасы — і Вольга адчула знаёмы прыемны подых. Яна падняла вочы і ўсьміхнулася: перад ёю быў невялічкі гушчар, у якім хаваліся, тулячыся адно да аднаго, клён і бярозка. У засені гэтых дрэваў Лявон і Вольга любілі адпачываць, марыць, мілавацца.

Вольга пяшчотна пагладзіла маладую кару — і яе захліснула шчымота. Дрыготкі імпульс пабег па руцэ, усяму целу, абласьціў грудзі, казытнуў сэрца. Ад зачысьці страпянуліся пачуцьці, абудзілася жаданьне. Яна млява ўздыхнула, заплюшчыла вочы — і ўбачыла сябе ў абдымках Лявона.

Ён цалаваў яе, гаварыў п’янлівыя кунежныя словы, ад якіх кружылася галава…

— Вам дрэнна, спадарыня?

Незнаёмы голас абудзіў, вярнуў да рэальнасьці. Вольга схамянулася, адхіснулася ад дрэва, да якога ў замарачэньні тулілася, і павярнула галаву.

Побач стаяў малады мужчына і занепакоена пазіраў на яе.

— Не, усё нармальна.

Атросшы мрою, яна сабралася і пайшла.

— Прабачце, але я вас усё-такі правяду, — настойліва прамовіў мужчына і пакрочыў поплеч.

Па-ранейшаму маркотная і ўнураная, Вольга не адказала.

Вецер-свавольнік ірвануў крысо яе паліто.

# 10

Адчайным віхарам пранёсься Лявон над сваімі ўладаньнямі, крышачы і зьнявечваючы ўсё, што траплялася на шляху. Многія аб'екты, у тым ліку і тыя, зь якімі ён кармічна разабраўся, набылі выродлівы і агідны выгляд. Беспарадку стала больш. Аднак гаспадар не зьвяртаў на гэта ўвагі і працягваў глум, тым больш што ні абмежаваньняў, ні забароны на волю не было.

Але ўсё, і свабода таксама, рана ці позна заканчваецца, асабліва калі вычэрпваецца неабходнае шышланьне — можа, такое і адбылося б, толькі да гэтага справа не дайшла, бо Лявон зноўку пачуў этэр:

«Лепш гэта рабіць *агнём*. Тады наогул нічога не застаецца, акрамя попелу ўспамінаў».

Яго гэта спыніла і разьятрыла, і ён панасердзю кінуў невідзімцы:

«А дзе мне *яго* ўзяць? У гэтым друзе запалак няма».

«Трэба было перад сьмерцю пакласьці ў кішэнь. Ха-ха-ха!»

«Каб ты спрогся, дарадчык хрэнавы!» — Лявон канчаткова разьюшыўся і ня стрымліваў сябе.

«Які кіпень эмоцыяў! Ды ў цябе ўвесь глузд выпарыўся — і без дадатковых высілкаў! Ну і унікум! Сапраўдны жыхар астралу! Вось што значыць каханьне! Пабольш бы такіх».

Найзыркі пошуг сьвятла неўспадзеўкі асьляпіў Лявона — і ён адчуў, як ліюцца неверагодныя гукі, пахі, жарсьці, як яго працінаюць зьвінячыя промні і ўнутры ўзьнікае дзіўная супярэчнасьць: усё іства, дагэтуль мелае форму і суцэльнасьць, выяўляе сваю ілюзорнасьць ды нетрывульнасьць, дзеліцца-распадаецца на драбнюткія часьцінкі, якія захоплівае і нясе касьмічны вецер. Лявон прысутнічае ў кожным гэтым мікраскапічным аскепку і бачыць сябе ў небывалым мностве.

Зь неверагоднай хуткасьцю мільгацяць-зьмяняюцца знаёмыя і незнаёмыя вобразы, што ўвасабляюць розныя пачуцьці, — яны імгненна растаюць і пакідаюць пасьля сябе featured рознакаляровыя іскрынкі, якія таксама падпарадкоўвае вецер.

Увесь гэты працэс, хоць і нагадвае роіла, уражвае ўпарадкаванасьцю: кожны суб'ект імчыць толькі яму вызначаным шляхам, шукае-знаходзіць сабе падобных і зьліваецца зь імі — такім чынам фармуюцца эмацыйныя зоркі, галактыкі, якія ў злучве складаюць вялізманны *Сусьвет пачуцьцяў*.

Палымянае жаданьне патануць і цалкам растварыцца ў гэтым чарадзействе ўсё ўзрастае... Але раптам здалёк даносіцца малітоўны голас — і сьведам'е вяртаецца.

Зіготкай маланкай усё ляціць назад...

«Ня кожнаму выпадае мажлівасьць зьведаць над цудам Цуд — Абсалютны Астрал — і застацца ў Ім. Многія вушлыя ёлупні палічылі б такі шанец за вялікае шчасьце. А гэты...»

# 11

Невядомая сіла пляснула яго аб земку — і ён застагнаў ад болю. Адчуваньні былі такія ж, як у дзяцінстве, калі ўпаў з гарышча.

Лявон расплюшчыў вочы і ўбачыў над сабою цёмнае неба.

Думкі ўспырхнулі, як ад сполаху птушкі.

«Што са мной? Дзе я? Чаго так блага?»

Паспрабаваў паварушыцца — не атрымалася: цела было проста ў цісках.

«Нешта вылучнае адбываецца... Зноўку багі... Я расчапляюся... і нанава зьбіраюся... Толькі ў іншай выяве... Няспынны вар'яцкі палёт!.. І вось цяперашні стан...»

Намаганьнем волі ён прыўзьняў галаву — і жахнуўся: замест цела быў шчарбаты валун.

«Ага, значыць, ён мяне прыціснуў, а мо наогул ушчэнт раздушыў?»

Лявон яшчэ раз напружыўся і зірнуў на спод валуна, на далоўе: нічога падобнага на калатушу не было.

«???»

Раптам зьверху з пранізьлівым сьвістам грукнуўся камень, за ім — другі, трэці... — і густы мэтэарытны град скалануў навакольле.

Лявон інтуітыўна сьцяўся, баючыся ўдараў. А яны ўсё адно пасыпаліся адзін за адным, павялічваючы пакуты.

Хутка гэта скончылася. Пыл і смурод павісьлі над зямлёй.

Небарака апынуўся пад крушняй і працягваў енчыць, хоць вялікага вонкашняга цяжару не адчуваў: больш вярэдзілі ўнутраныя раны — жах і роспач.

Зьнянацку яго кранулі нейкія напружаныя токі. Ён укульміўся і зразумеў: яны ідуць ад іншых камянёў і супадаюць зь ягоным настроем...

Карціна зьявы стала праясьняцца — і нечаканы здогад спаталыжыў: усе гэтыя абломкі сусьветных узрушэньняў маюць сьвядомасьць, аднолькавага зь ім лёсу, а сам ён — таксама камень.

# 12

Лявон, змардаваны і распластаны, ляжаў на сваім полі: усе нібыта здаволіліся і пакінулі яго. Здавалася, і іство на нішто зьехала.

Але ён памыляўся: у астрале немагчыма зьнебывацца і існаваць без пачуцьцяў; унутры заўсёды знойдзецца хоць адна засьветачка, якая можа разгарэцца да вогнішча, і ня важна, хто гэтаму паспрыяе — сама істота ці нехта іншы.

Менавіта гэты працэс і распачаўся ў душы Лявона, калі ён у другі раз пачуў малітоўны голас.

У першы раз яго адцягнулі, а дакладней — прымусова кінулі ў малатарню Тварэньня. Навошта? Ён ня ведаў. Хтосьці жадаў нагадаць яму аб пракаветных ды спрэс забытых пакутах — і гэтым нешта паказаць? Што? Чаму менавіта мучэньні, а ня радасьць, узятыя за прыклад? З чым можа асацыявацца гэтая каменная непагадзь?

З ударамі лёсу? Цяжкасьцямі? З жыцьцёвай праўдай? Выпрабаваньнямі? Зь ягонай істасьцю? З пазнаньнем?

Пытаньняў мноства. Толькі адказаў на іх няма.
«Ёсьць, даўбяла!»

# 13

Быццам электрычным разрадам Лявона страсянула і падкінула. Напалохацца ён не пасьпеў, бо адчуў, што лунае.

Яму гэта спадабалася, і ён стаў азіраць незнаёмую ваколіцу.

Летні сонечны дзень разліваўся пяшчотай, прырода патанала ў асалодзе.

Неба было чыстым і вольным. Ад прастору і вышыні кружылася галава.

Да Лявона данёсься вясёлы зычны сьмех — і ён паляцеў на яго.

Воддаль то ўверх, то ўніз радасна гойсала прыўкрасная серабрыстая птушка.

— Даганяй, любы! — спадманліва крычала яна, вабячы жвавай жарснай гульнёй.

Яны імчалі навыперадкі, куляліся, танчылі, цалаваліся — забавам, як і шчасьцю, здавалася, ня будзе канца.

Над усім павольна кружыў беркут. Вострым зіркам ён сачыў за наваколлем, прыкмячаючы нават сама нязначныя рухі і зьмяненьні. Раз-пораз драпежнік складваў крылы і нёсься стралой — тады пад небам на жыцьцё менела і крыху хмурнела.

Толькі закаханыя нічога не заўважалі і працягвалі любіцца-весяліцца, купаючыся ў пахацімстве і ў юры. Для іх, гарачых і гальлівых, усё заставалася па-ранейшаму ў ружовым колеры.

Час ляцеў — і кругом стала гмурна ды немарасна. Многія, хто сам, а хто са спамогай, адгаравалі сваё на зямлі, рушылі па шляху ўвасабленьняў далей, у іншыя сьветы.

Аднойчы вока беркута ня ўзерыла церазь цемрадзь нікога, акрамя шчасьлівай пары. Магутны, ён быў вышэй за ўсялякую мітусяніну, умоўнасьці, жыў пазывамі страўніка і, не раздумваючы, адразу кінуўся на птахаў…

Калі яны адчулі боль і немінучую пагіну, ліхаманкава закруцілася сьвядомасьць, дэманструючы свае адмысловыя запісы. Сярод мноства радкоў касьмічнага досьведу вялікай лакунай зеўрала іхняе *нерэальнае пачуцьцё*.

Абодва яшчэ пасьпелі жахнуцца ад такіх вынікаў — і адышлі ў нябыт.

Колькі іх, палоненых *гэтай прыгожай ілюзіяй*, на пакручастым шляху да Вечнасьці! Тых, што патрапілі пад яе чары і спакусіліся, зрабілі неабдуманы прыпынак, пярэдых, у выніку чаго адсталі, заблыталіся, зьбіліся з галоўнага кірунку, набылі другараднае значэньне… Ім няўцям, што цана *гэтай аблуднасьці* вялікая, і яе ведаюць толькі Час ды Прастора, якія зараз зьбяднелі на яшчэ двух апантаных і няўрымсьлівых шчыракаў.

Безумоўна, яны, як і ўсе іхнія канашы, пойдуць-паплятуцца далей па пуцявінах лёсу, але па заморных забочных дарогах ужо, будуць зьбіваць ногі, спатыкаць атугу, блытацца ў роздумах пра сэнс жыцьця, злаваць на ўвесь сьвет, зайздросьціць першапраходцам, якіх не атлуміў *салодкі квапунак* і па-ранейшаму вяла па магістралі прага барацьбы ды адкрыцьцяў…

# 14

«І хто зь іх дойдзе да канчатковае мэты?»

Пытаньне громам пракацілася ўгары — і чарговая ява разьвеялася.

Лявон ачуўся, агледзеўся — паўсюдна ягоны сьвет — і паспрабаваў асэнсаваць мэтамарфозы.

Адразу хацелася думаць, што нехта тэстуе, правярае, выпрабоўвае яго, прычым робіць гэта жорстка, зьняважліва, бязьлітасна. Калі такім выпытам падвяргаюцца ўсе, тады ўсялякія пытаньні залішнія і ён змушаны цярпець ды падпарадкоўвацца.

(«Вось да чаго прыводзіць масавая псыхалёгія!» — няўзнак стрэліла ацэнка.)

У выпадку ж выбранасьці падспытнага ўзьнікае безьліч пытаньняў, непаразуменьняў і нават пратэстаў.

(«А да гэтага лёгка падштурхоўвае псыхалёгія эгаізму!» — адбыўся новы стрэл.)

Вызначыць сваю ролю ў тлумным і кіпучым астрале Лявон ня здолеў, бо ў трэці раз яго торгнуў малітоўны голас.

(«Як быццам у фізычным сьвеце ты ведаў свае задачы!» — пасьпеў прагучаць яшчэ адзін выстрал.)

Лявон мігам паляцеў на заклік, рашуча адпрэчваючы новыя сьцені, якія ўжо рыхтаваліся паўстаць зь небыцьця.

# 15

Вольця стаяла перад абразам у царкве і шаптала пацеры.

«Пачуй маё маленьне, Божа! Зрабі водпуст і ўмілажалься нада мною! Усім сэрцам, душою і помысламі прашу Цябе! Памяцьцю майго каханага гукаю! Уваж мне, дапамажы!»

Вакол мятушыліся нахабныя і задзірыстыя здані, якія крывіліся і ашчэрваліся ад кожнага слова Вольгі, імкнучыся перашкодзіць ёй, асяціць. Яна ня бачыла іх, упэўненая, што адна.

«Ну і поскудзь! — абураўся Лявон, напальваючыся гневам. — Як сабакі! Няйначай нехта нацкаваў».

Ён скокнуў на нечысьць і ўсёй сваёй лютасьцю раскідаў яе ў розныя бакі.

Цяпер нішто не замінала — і Лявон наблізіўся да любай, прытуліўся і задрыжаў ад шчасьця.

Яна адчула цеплыню, супакаеньне і на імгненьне заплюшчыла вочы.

«Дзякуй табе, Спадару!» — прашаптала, перажагналася і выйшла са сьвятыні.

Але на вуліцы неспакойны стан вярнуўся, і ёй зноў зрабілася няўзмог: захвалявалася сэрца, загойсала душа.

Лявон заўважыў, як зашугала яе аўра, і адхіснуўся ад Вольці.

З асьцярогай ён стаў назіраць, як кідаюцца і блытаюцца яе думкі, пачуцьці, як няўцешна яна ўсхліпвае, калоціцца: упершыню ўнутраная барацьба так цынічна авалодала ёю і не адпускала, выяўляючы немаведама адкуль столькі то яркіх, то цьмяных вобразаў, блізкіх і далёкіх, родных і чужых, выбітных і шараговых, жаданых і ненавісных.

І ў гэтай таўханіне Лявон прыкмеціў аблічча незнаёмца, спачатку простае, шэрае, а потым усё больш адметнае, выразнае і сьмелае.

Крык горычы страсянуў этэр.

Вольга скаланулася ад грому, які нечакана завуркатаў у небе, і абудзілася.

На твар упалі першыя кроплі дажджу.

# 16

Нечакана ў прасторы зьявіўся нейкі фантом, які нагадваў чалавека, прычым ён калываўся-хваляваўся, як бы нешта шукаючы. Пакрысе вымалеваліся адчувальныя формы. Лявон напачатку дзіваваў, а потым яго ахапіў жуд: выява была незнаёмцам.

Адкуль ён узяўся ў ягоным сьвеце? Тут прысутнічаюць толькі тыя, з кім Лявон меў нейкія дачыненьні ў рэальнасьці альбо ў думках. З гэтай істотай ён аніяк ня злучаны.

Не, ён памыляецца. Незнаёмец трапіў у ягонае жыцьцё дзякуючы Вользе. Тая, сама таго не жадаючы, дала яму месца ў сваіх думках, а пра гэтыя Лявону было добра вядома. Апошнім часам дрыжоная стала вельмі непакоіць, бо ён стаў заўважаць за ёй зьмены: яна паступова адыходзіла ад яго, а да незнаёмца ўсё больш набліжалася. Зямное жыцьцё дыктавала свае законы, і Вольга змушаная была ім падпарадкоўвацца, хоць унутрана і змагалася зь імі, процістаяла нечаканым спакусам, якіх

рабілася ўсё больш. Яна па-ранейшаму кахала Лявона і шчыра малілася:

— Божа Праведны, дапамажы мне. Просам прашу: не вымай з майго сэрца Лявона, не пакідай мяне бяз думак пра яго, не давай волю іншаму. Чаго гэты мужчына ходзіць за мной, тэлефануе, дабіваецца сустрэчаў, абсыпае падарункамі і жарснымі словамі? Чаму ўсё часьцей стукаецца ў мае думкі і сэрца, вярэдзіць мяне? Я ўжо стамілася і нястанная падужаць такую навалу і спыткі. Няхай усе мае намыслы будуць толькі зь Лявонам, маім любым. Яму і сабе зычу сумеснага вечнага каханьня і ўцехі.

У такія хвіліны Лявон заўсёды парыў паблізу і трымцеў аднначасова ад шчасьця і гаркоты. З астральнай далечыні ён бачыў, чым могуць скончыцца зямныя турботы (і зусім не на яго карысьць) і што на іх ніяк нельга паўплываць. Ён па-ранейшаму атуляў Вольку каханьнем і верыў, што толькі яно можа ўсё і сваёй моцай зробіць іхнія душы непарыўнымі.

«Дарэмныя і сьмешныя спадзяваньні», — зноўку ў прасторы загучаў голас, які ня слухаць было нельга.

— Чаму? — выгукнуў Лявон. — Хіба не каханьне кіруе сьветам?

«Такімі дурнямі, як ты, — безумоўна».

— Я таксама ўмею абражаць.

«Ты можаш тут нават мацюкацца — ад гэтага нічога ня зьменіцца. А вось маё казаньне такіх ёлупняў, накшталт цябе, праясьняе і робіць Сусьвет чысьцейшым. Калі ўжо гэты бруд разьбярэцца, што да чаго?»

— Ты, гаўкала, можа хопіць хадзіць агародамі?

«Глядзі ты: сьпее на вачох. Даўно б так. А то сваім каханьнем ужо затлуміў галаву. Адпусьці жанчыну, неназаляй ёй, дай свабоду».

— А хіба мы існуем не адно для другога?

«Ты яшчэ многае не зразумеў і ня бачыш. Глядзі!»

Тонкі сьвет Лявона зьнік, і ў неабсяжнай прасторы зашугала вогнішча, ад якога ў розныя бакі разьляталіся іскры. Ім, здавалася, ня будзе канца, настолькі моцным і жыцьцядайным быў агонь. Адляцеўшы, адны займалі асобнае месца, іншыя злучаліся ў яркія суквецьці і бесьперастанку гулялі між сабой. Былі і такія, што згасалі альбо проста несьліся ўдалячынь. Сярод гэтых агнявых пырскаў Лявон разгадаў сябе, Вольгу, незнаёмца і многіх знаёмых.

Карціна зьмянілася, і ён апынуўся ў іншай рэальнасьці. Гэта былі зямныя варункі, толькі не такія, як у яго апошняе ўвасабленьне. Нешта старажытнае, лясістае, у драўляных халупах, з мноствам жывёлаў ды птушак рознага роду і веку. Паўсюль сноўдалі нейкія абадранцы, што нешта рабілі-ладзілі, між імі бегалі-гулялі дзеці. Увагу Лявона прыцягнула жанчына, што завіхалася каля адной з хатаў і гучна размаўляла зь якімсьці мужчынам. Па ўсяму было відаць, што яны жывуць разам і трымаюць гаспадарку. У іх былі сумесныя дзеці. Нейкае невядомае пачуцьцё падказала Лявону, што гэта Вольця і незнаёмец. Сябе ў гэтай эпосе ён не знайшоў. Жах абняў Лявона, і яго занава кінула ў астрал.

Але тут ён знаходзіўся нядоўга. Зь небыцьця выявіўся сярэднявечны замак і баль у ім. Прыгажуня-прынцэса (як потым зразумеў Лявон — Вальціся) прыдзірліва выбірала сабе пару. На Лявона і незнаёмца яна паглядзела толькі мімаходзь, а вочы спыніла на нейкім панадным герцагу, зь якім пасьля танцу выйшла з залы.

Наступнае відовішча таксама ўразіла Лявона. Яно было з будучага. Лявон мілаваўся з тою, ад якой зьбег напярэдадні вясельля да каханай Волькі, а гэтая ў дадзеным нараджэньні доўга і нудна прыглядалася да жаніхоў, ды толькі нікога не знайшла і засталася адна.

Усе прыклады зямнога жыцьця нагадвалі маляўнічае аб'ёмнае відэа і давалі дастатковае ўяўленьне аб рэінкарнацыі, але нічога новага Лявону не адкрывалі: ягоны сьвет мог прадэманстраваць і не такое. Ён дзёрзка выпаліў:

— Ну, і што?

«Атрымліваецца, табе, воталапень, гэтага мала. Колькі ж тысячаў зямных гадоў ты будзеш корпацца ў сваім друхле, пакуль да цябе дойдзе сэнс!? Ты гэта шалопаеш?»

— Не твая справа, — працягваў грубіяніць Лявон. — Пакінь мяне.

«Не, проста так я не адчаплюся. Я — твой Кіроўца і буду выхоўваць-прасьвятляць цябе далей. Гэта — астрал, і ты, ялдон, павінен па-сапраўднаму зьведаць яго характво. У гэтым дапамогуць і тваё поле, і касьмічная памяць, да якой ты не зьвяртаесься з-за свайго каханьня. Ха-ха-ха! Ну, нічога, зараз мы гэта выправім».

У галаве нешта клацнула, і шматлікія ўвасабленьні Лявона паплылі чарадою. Спачатку было нават цікава бачыць, кім тольма ён ня быў, у каго толькі не пераўтвараўся на доўгім шляху жыцьця. Цяжка было вызначыць, па якіх законах адбываецца трансфармацыя і хто кіруе гэтым працэсам. Здавалася, усё здараецца неяк само сабой і часам выпадкова.

«Во, хаўбень! У Космасе ўсё ўпарадкавана і вынікае адно з аднаго. Нават я, калі ты і надалей будзеш такім глумным, з-за цябе атрымаю кармічную пстрычку. Так што май на ўвазе: мы з табой злучаныя. Якім чынам? Спадзяюся, да цябе гэта дойдзе».

Потым успаміны надакучылі. Чамусьці не спадабаліся гаротныя жаночыя ролі, двухполыя інкарнацыі. Лявону зрабілася непрыемна і моташна, калі ён убачыў, што вельмі часта жыў без каханьня, любаблуднічаў, быў жо-

рсткім, несправядлівым, хлусьлівым і з-за гэтага атрымліваў у якасьці пакараньня ніжэйшы ўзровень разьвіцьця, горшы лёс. Тады пакуты ўзмацняліся і сьведам'е перакручвалася — гэта было балюча. Адзін раз нават кіраваў нейкай краінай і наламаў столькі дроў, што наступнае зыходжаньне ў пласт адбываў як вар'ят.

— Досыць! — крыкнуў ён. — Калі скончацца гэтыя зьдзекі?

«Як толькі ты паразумнееш».

— Няўжо я такі дурны?

«Цябе не пакідае *чалавек*. Зямная істота зь цябе так і прэ. Можна праіснавацца сотні разоў, але калі ня ўцееш, што Верд — тольма частка Космасу, да таго ж не сама лепшая для станаўленьня, то душа рызыкуе апынуцца ў вечным палоне прымітыўных ілюзій».

— Ты мяне зьдзіўляеш. На Зямлі амаль усе лічаць сваю плянэту абранай і сама ўдалай для жыцьця. Нават многія геніі, а яны пацалаваныя Богам і валодаюць ключамі ад Праўды, — прыхільнікі такое думкі.

«Гэта — вялікая аблуднасьць. На фізычнай Зямлі пануе мноства памылковасьцяў, заблудзяў наконт ролі плянэты ў Сусьвеце, значэньня некаторых паняткаў. Дамінантная ілюзія — трымайся, інакш ты гэтага можаш ня вынесьці — *каханьне*, у шырокім сэнсе — *любоў*».

Лявона страсянула і стала быццам расчапляць на кавалачкі, ад эмоцыяў этэр закалыхаўся і запярэсьціўся. Толькі думка пра магчымы зман вярнула яго ў звычайны стан.

— Мне казалі, што будуць вадзіць за нос, пасыпаць глупствамі, каб спакусіць і адвесьці ад правільнага шляху, але на такую недарэчнасьць я не разьлічваў.

«А я на іншую рэакцыю. Дзякуй Богу, ты здолеў *падумаць* — гэта дае нам шанц».

— Для чаго?

«Тое, што ты мысьлюеш у крытычных абставінах, спрыяе табе шпарчэй ісьці па лесьвіцы духу».

— Зноў нейкая бязглуздзіца і, мабыць, пастка.

«Так, адразу цябе не адукуеш: могуць быць эксцэсы. Трэба спакваля. Уважліва слухай. Тое, што я распавяду, не даецца нават вашым геніям».

Пакуль ішла навука, у Вердзе прайшло шмат часу. Кіровец, каб не перарываць сваю справу, гасіў некаторыя сігналы, якія ішлі адтуль, адтаго Лявон ня ведаў, што адбываецца з Вольгай.

Але ў нейкі момант апеклы ўсё адно адчуў гаротную жаночую хвалю, якую Кіровец, не жадаючы канчатковага разладу ўлюбёных і ўлічваючы далёкія мэты, спэцыяльна прапусьціў і паўбіраў ад яе перашкоды.

Лявон махнуў рукой на павучальную прамову Настаўніка і паімчаў да сваёй суджанкі.

Яна была дома, у роспачы кідалася ў розныя бакі, ненатуральна заломліваючы рукі. Тут жа знаходзіўся незнаёмец, які прызнаваўся ёй у каханьні, угаворваў паняцца, абяцаў вялікае шчасьце ад сумеснага жыцьця. На канапе сядзеў сын, панура апусьціўшы галаву. Толькі цяпер Лявон заўважыў, як ён падрос, памужнеў дый наогул, як зьмянілася Вольця і якім зрочцам выглядаў незнаёмец. Сапраўды, на зямлі прайшло некалькі гадоў, пакуль яны зь Кіроўцам прымяраліся адзін да аднаго і перабіралі касьмічны лёс Лявона, а яму здавалася, што праляцела некалькі імгненьняў. Між іншым ён падумаў: вось што значыць Час — магутны Ўладар Сусьвету.

Вакол кружлялі розныя астральныя сутнасьці, і кожная настойліва навязвала сябе, імкнучыся астатніх адпіхнуць ды зганіць, адтаго ў хаце панавала атмасфэра ўсхваляванасьці, супярэчнасьці, незразумеласьці. Ніякай згодай тут і ня тхнула.

Людзі, як звычайна, не заўважалі іх і былі ўпэўненыя, што выказваюць свае ўласныя думкі і адчуваньні. Лявон ужо добра ведаў гэтыя міжпластавыя стасункі і дужа злаваў, калі ўсялякае нябачнае паскудзьдзе ўмешвалася ў справы людзей і шкодзіла ім. Як мог, ён стаў разганяць гэтую набрыдзь, якой такі падыход не спадабаўся. Але яна ўсё-такі стала расьсейвацца. Нейкае суцяшэньне Лявону гэта прынесла. Ён назіраў, як Воля, нягледзячы на тое, што незнаёмец усё ж неяк займае яе, выказала яму сваю поўную адмову, яшчэ раз у голас заявіла пра каханьне да Лявона і абняла ўзрадаванага сына. З астралу было бачна, зь якім цудоўным настроем трапеча пры гэтым яе душа, і Лявона таксама закалаціла ад шчасьця.

Вярнуўшыся ў свой сьвет, ён адчуў, што той зьмяніўся. Якім чынам? Разьбірацца ня стаў, бо яго апаноўвала зачысьць, а думкі былі лёгкімі, сьветлымі, чыстымі, свабоднымі. Душа прагла палёту. Але не ляцела, і этэрныя галасы адсутнічалі. Значыць, так трэба. Ягонае іства павінна заняцца чымсьці іншым. Чым? Адразу за пытаньнем зьявілася неабходнасьць даведацца пра далейшы лёс Вольгі. Ці магчыма гэта? Безумоўна. Яна злучана зь ім такімі трывалымі ніткамі, што паўстае як ягоная істасьць. Пры жаданьні ён можа зьведаць яе ўсю. Не, хапіў залішне. Лявон пра сябе ня ўсё знае, а тут іншая істота… І ўсё-такі яна бліжэй да яго, чым хтосьці. Трэба паспрабаваць.

Ён уключыў усе свае думкі пра Вольку. Адразу зьявіліся адпаведныя пачуцьці, за якімі паплылі адзін за адным яе сьветлыя вобразы. Яму было прыемна іх назіраць і любавацца імі. Мінулае, сапраўднае, прышлае стужкай круцілася перад вачыма і адпавядала сама лепшым марам пра любку. Неверагодная поцяга авалодала Лявонам, ён узьюрыўся і пажадаў яе, як некалі ў матэрыяльным сьвеце.

Нечакана кадры сталі смутнець, аж пакуль не пацямнелі зусім, і на іх нічога нельга было разглядзець. Потым відовішча наогул прапала. Гэта магло азначаць толькі тое, што зямны плян сьцёрся, а чалавек пасьля працяглай хваробы памёр. Лявона адразу торгнула: што адбылося з Вольгай і калі? Ці стрэнуцца яны ў астрале?

Ён перапыніў сваё падарожжа па касьмічных абшарах і ўсхацеў дазнацца, што будзе далей. Толькі, як ні стараўся, веды не паступалі і ніякіх сігналаў наконт лёсу не было. Гэтак адбывалася заўсёды, калі чалавекам, у дадзеным выпадку — астральцам, ушчыльную займаўся нехта зь іншага вымярэньня. На Зямлі звыкла лічаць, што «чалавек — каваль свайго шчасьця». Дудкі! Чарговая прывіднасьць. Як вырашаць звыш, так і будзе.

Раптоўна зьявілася невядомая сіла і літаральна яго пацягнула, затым падкінула і птушма кудысьці накіравала. Лявон дзіваваў сваёй гатовасьці падпарадкоўвацца, ды менавіта так, як таго патрабуюць. Адчуваючы прыемны палёт, ён нават паіранізаваў:

— Ну, вось, кавалі пагналі па шчасьце.

Наперадзе намаляваўся прыгожы квяцісты *луг* — Нулявая Сфэра. Яе Лявон зьведваў неаднойчы, але ніколі гэтага ня помніў. Не таму, што быў няпамятлівы (тут у яго ўсё ішло на выдатна), а з-за таго, што сенажаць адымала памяць у наведвальнікаў дзеля захаваньня касьмічнае тайны. Якой? Яна была дужа шчасьлівай, неверагодна ўзбагачала касьмічную радасьць — і такую яе асаблівасьць стваральнікі не жадалі раскідваць па галовах недасканалых, якія з прычыны сваёй заганнай уроды маглі ёй нашкодзіць. А гэтых хапала — увесь матэрыяльны сьвет.

Так, кожнае разумнае фізычнае стварэньне, незалежна ад пласту, праходзіла цераз луг, то бок атрымлівала *нараджэньне*

і крочыла далей па інкарнацыі. Яно, як толькі наступала пара, наведвала гэты запаветны поплаў і знаходзіла бацькоў. А іх тут было відзьма-нявідзьма, ці тое астральных праекцыяў тых, хто ў розных вымярэньнях займаўся сэксам. Душа, каб увасобіцца, трапляла ў гэты жужалож, прыглядалася да юрліўцаў, выбірала — і адбываўся засьнітак.

Лявон усё гэта зразумеў адразу, але лучыцца да абраньнікаў ня меў поцягі. Яму сьмешна стала ад зямнога ўстойлівага выразу — «бацькоў не выбіраюць». Глупства! Выбіраюць! Ды яшчэ як! Праўда, адбываецца ўсё гэта па законах. На каго хоця душа ня можа прэтэндаваць. Дастаецца толькі тое кола мілосьнікаў, якія ўнутрана адпавядаюць ёй і да якіх сама яна пасьпела. Ёсьць такія высокадухоўныя асобы, што ім дазволена карыстацца ўсімі на лузе, і тыя, каму даецца толькі адна жадлівая пара.

Лявон стаў сьведкам таго, як адны астральцы былі задаволеныя выбарам, весяліліся, а другія маркоціліся, плакалі і прасілі ў Бога іншай долі. Але ніякія літаньні не дапамагалі.

«Ну, вось надышоў і твой час».

— Я пакуль не жадаю нараджацца. Буду чакаць Вольгу.

«Дурасьць. Табе трэба зьведаць тое, пра што я пачаў гаварыць. У выяўлены сьвет ты пойдзеш зараз. На жаль, выбар у цябе невялікі. Так трэба, хоць ты заслугоўваеш і большага».

# 17

Жыцьцё трымаецца на пытаньнях. Чым больш на іх адказаў атрымлівае істота, тым вышэй яе духоўнае ўзыходжаньне. Дзеля гэтага адбываецца рэінкарнацыя, нараджэньне. Колькі б ні працягваўся касьмічны рух, апошняе слова за Богам.

Атрымаўшы новае ўвасабленьне, Лявон, як і бальшыня людзей, ня ведаў, па якія адказы завітаў у Верд, дый наогул наліха існуе. Менавіта *на гэтай невядомасьці, тайбе* ўсё і заснавана. Таму, як бы ні напружваўся наш мозг, мы ніколі не спазнаем сакрэт жыцьця. То паасобку, то гуртам будзьма толькі набліжацца да разгадкі, але Праўды ўсё адно ніколі не дасягнем — гэта *галоўны рухавік* усяго існага.

Як і ўсе, Лявон ня вельмі мазгаваў над гэтым, паступова наладжваючы свой розум пэўнымі сентэнцыямі, што давала жыцьцё. Да апошняй мяжы ён назапасіў шмат. Але, у чарговы раз адыходзячы, як лічаць на Зямлі, у нябыт, так і ня мог сказаць, для чаго жыў. Памыляюцца тыя, хто думае, што, «навечна» заплюшчваючы вочы,

чалавек нічога ня бачыць. У апошнія хвіліны яму адкрываецца сэнс, і хваля ўражаньняў захліствае. Але ўжо нічога зрабіць нельга.

«Вітаю. Зь вяртаньнем!»

— Дзе я? На тым сьвеце?

«Ты, як кажуць, дома. Насамрэч гэта зусім ня так, бо да дому яшчэ далёка. Многае залежыць ад цябе. Табою яшчэ валодаюць разгубленасьць, узбурэньне».

— Знаёмая абастоўка, тыя ж галасы. Чаму вас няма *там*?

«Ха-ха! Мы і *там* ёсьць. Толькі людзі ўспрымаюць такіх асобінаў як звар'яцелых. Ты шкадуеш, што адным зь іх ня быў? Гэта ня твой фатум».

— Я шкадую, што зноў жыў як сьляпое кацянё і толькі на парозе сьмерці прыйшло разуменьне. Гэта жорстка.

«Такі парадак. Ня я яго ўстанаўліваў, і ня мне яго карэктаваць. Мая справа іншая».

— Вось вы *ўсе* так: зрабілі з чалавека ляльку, гуляецеся зь ёю, а як што — у кусты. Не жадаю з вамі вадзіцца. Прэч ад мяне!

«Не, гарапяка, мяне не адцураесься. Я заўсёды буду поблізу. Бачу, апошняя вандроўка ў пласт табе сапраўды пайшла на карысьць: ты стаў бліжэй да Праўды. Значыць, цябе можна пасоўваць далей».

— Вось табе падабаецца зьдзеквацца! Хіба адсутнасьць гэтым разам у мяне каханьня на Зямлі лічыцца за набыцьцё чагосьці вартага?

«Ня гэта. А тое, *што* ты зразумеў у выніку».

— Доўга распавядаць. Лепш пакапайся на маім полі: там хутка ўсё знойдзеш. Брыдота адна.

«А мне і так усё вядома. Галоўнае: да цябе дайшло».

— Так, я ўсьвядоміў насуперак таго, што ты мне баяў: на Зямлі каханьне, любоў мацуюць усё.

«Правільна, але ты ўжываеш ня тыя акцэнты — і аб гэтым ведаеш. Навошта прыкідвацца, падманваць сябе?»

— Не нэрвуй мяне: заўважаеш, якія цёмныя аблачынкі паплылі?

«Канешне, ты памнажаеш хлусьню. Дзе твой розум?»

— Лухта ўсё. Дзе Волька? Чаго я яе не адчуваю?»

«Яна ў сваёй прасторы. Чакае цябе».

— Тады досыць разводзіць тлум! Пра Вольгу трэба казаць у першую чаргу.

Адразу ўключыўся адпаведны эмацыйны канал, і Лявон мігам паляцеў.

# 18

Вольга корпалася на сваім астральным полі і ад нечаканасьці войкнула, адчуўшы любага.

Іхнія душы хуценька і нема зьліліся ў адзіную трапяткую сфэру, якая запярэсьцілася на розныя лады. Гэта працягвалася доўга, бо яны ніяк не маглі адарвацца адно ад аднаго. Нарэшце ўзаемны парыў дазнацца пра жыцьцё-быцьцё кожнага адасобіў іх і разьмясьціў упобачкі.

— Як даўно мы ня бачыліся!

— Ой, не кажы, Лявонка! Я ад нуры амаль зьвялася.

— Цяпер, Волечка, не трывожся: мы заўсёды будзем разам.

— А хіба такое *тут* магчыма? Я столькі ўсялякага начулася.

— Канешне, гэта — астрал, а мы з табой аднаго пачуцьця, кахаем, значыць, злучаныя навечна.

— Баюся я. А як жа наступныя ўвасабленьні? Яны могуць падзяліць нас.

— Ты жадаеш гэтага?

— Ніколечкі.

— І я. Адтаго станем змагацца, каб альбо застацца *тут* без далейшага ўвасабленьня, альбоісьці ў пласт удваіх адначасова і з пэрспэктывай сустрэчы.

— А як гэта зрабіць? *Тут*, кажуць, такія законы дзейнічаюць, што іх ніяк не абмінуць.

— Мы і не зьбіраемся іх парушаць, тым больш што гэта немагчыма. Наш настрой, упэўненасьць і, галоўнае, думкі ствараць адпаведную атмасфэру і такую лучнасьць, нібыта мы адно цэлае, суцэльныя.

— З табой, Лёвачка, любы лёс прыму. Я ўпэўненая, што мы не адныя такія. Трэба даведацца, як іншыя вырашаюць падобныя пытаньні.

— Згодзен. Склаўшы рукі сядзець ня варта. Усё залежыць ад нас. Тут шмат нашых знаёмых, родных, калі так можна сказаць, яны зносяцца і нават дапамагаюць адно аднаму, высьветлім цераз іх, якія ёсьць шанцы.

— А пакуль як мы будзьма існаваць?

— Кожны на сваім полі і часьцей страчацца — такія тут парадкі.

— Мне сказалі: калі збольшага разабрацца са сваім сьветам, то можна далучыцца да якой-небудзь кампаніі.

— Ну, і цудоўна. Мы створым свой прытулак, глядзіш — зь цягам часу і дзеці прылепяцца.

— А ці можна тут мець сям'ю, нараджаць? Нешта я нічога такога ня бачыла.

— Не забывай, што тут жывуць душы, якія пра ўсё гэта толькі мараць, а набыцьцё фізычнага цела лічаць за лепшую долю; праўда, стасавацца між сабой нам можна і даволі шырока. Галоўнае, каб была пра некага іншага думка альбо эмоцыя.

Флюід Вольгі зводліва прыцягнуўся да Лявона, і яны патанулі ў пяшчоце і жарсьці. Калі, задаволеныя і крыху стомленыя, яны млява лашчыліся, ён мовіў:

— Мне ніхто не патрэбны, акрамя цябе, ясачка ты мая, хоць маё поле і перапоўненае рознымі выявамі, прадметамі, стасункамі, даўгамі, на якія трэба марнаваць сябе, час, разьбірацца... Пайшло яно ўсё ў балота.

— Не хвалюйся, любы. Нічога ня зробіш: такая наша доля. Хто думаў: тое, што нас кране ці мы зачэпім на зямлі, хай выпадкова і крышку, вернецца зноўку да нас і будзе патрабаваць-адбіраць ад нас энэргію, ладзіць такія пакутныя разборкі. Адчаго ніхто нам пра гэта не паведаміў ці не намякнуў, я ўжо не кажу пра тое, каб паказаць? Несправядліва! Дый наогул хто мы такія ў гэтым вялізным сьвеце?

— Вось і я пра тое. А ён, гэты назойлівы дабрадзей, усё нябачна плявузгае і да нейкага сэнсу кліча. Дарэчы, ты чуеш галасы?

— Так, я ўсё баюся табе аб гэтым гаварыць, думаю: а раптам ты мяне за ашалелую палічыш?

— Ніколі, дурнічка. Я ж цябе кахаю.

— Ён якраз пра каханьне большасьцю і кажа. Увесь час навязвае, што мы існуем у аблуднасьці, павінныя адкінуць зман і дазнацца праўды. Мне здаецца, так некалі паводзіў сябе зьмей перад Евай.

— Ну, ты і малайчынка ў мяне, нават я да такіх асацыяцыяў не дайшоў.

«Ну, што, галубкі, усё буркуеце? Спадзяецеся: у рай трапілі? І можаце вычвараць што заўгодна? Не разьлічвайце на палёгку, нейкую паблажку. Тут законы суровыя, але справядлівыя, ня тое, што на зямлі. І адвакатаў, заступнікаў няма. Падзеі разьвіваюцца па карме. Безумоўна, выбар ёсьць, толькі вам, як зацятым дурням, раю ім не карыстацца. Навошта? Нічога талковага не здабудзеце, толькі дадаткова сябе абцяжарыце. Усё адно шлях прадвызначаны. Кожны атрымае тое, што, як кажуць, напісана. Дзеля аднаго-двух

асталопаў ніхто ня стане нічога перапісваць ці карэктаваць. Так што гуляйце па правілах».

— А як пра іх даведацца?

«А я *што* ўбіваю вам у галовы? Забаўляю? Ха-ха! Сьмешна. Вашая няўклюдная ўпартасьць і непаслухмянасьць, мякка кажучы, зьдзіўляюць. Насіцеся з гэтым каханьнем як з пісанай торбай».

— Волька, нас па-ранейшаму абражаюць. А мяне вучылі з хамуламі не вадзіцца. Іх, выходзіць, паўсюль хапае. Давай ня будзьма зьвяртаць увагі і зоймемся сваімі справамі. Знойдуцца іншыя шчыракі.

# 19

Сапраўды, нехта падхапіў закаханых і панёс. Напэўна, ён быў з атраду дабрадзеяў, бо Лявон і Вольга адчулі пяшчотную хвалю. У палёце яны нічога асаблівага не рабілі, толькі імкнуліся трымаць раўнавагу, каб не перакуліцца. Невядомец кіраваў працэсам, маўчаў, але без тлумачэньняў было ясна, што іх знаёмяць з астралам больш шырока і дэталёва.

Якія толькі карціны не траплялiся на шляху! Вялікія і малыя паселішчы з мноствам душаў, рух і заняткі якіх зьдзіўлялі сваёй зацятасьцю і ўпартасьцю; аднаасобныя палі, дзе, як асуджаныя, зьнемагалі ад працы змушаныя гарбаціцца істоты; вандроўнікі, хадзьбіты і тулягі, якіх кудысьці несьлі іхныя абавязкі, пераважна трывожныя. Велягурныя палацы ў зеляніне садоў і паркаў, шчабятаньні разнастайных птушак, атачэньні дзівосных машынаў і мэханізмаў. З адным казачным лятальным апаратам экскурсанты ледзь не сутыкнуліся. Іх увагу прыцягнуў цудоўны паветраны замак, ад якога адʼяжджалі-адляталі ў суправа-

джэньні чароўнай музыкі, разнастайных гукаў неверагоднага асьвятленьня экіпажы, фантастычныя карэты і фаэтоны, нейкія сьветлавыя стварэньні — усе яны праменілі лагоду, радасьць, шчасьце і несьліся кудысьці ўдалячынь. Захопленых укаханкаў дужа пакарабаціў комплекс аднатыпных безгустоўных і змрочных збудаваньняў, дзе выдзяляліся стромкія вежы, крывава-чырвоная сьцяна і надзіва прыгожы храм. Над ансамблем, нібыта вялізны веер, высока ўгору ішло барвовае мігатлівае сьвячэньне. Такіх пабудоваў, якія розьніліся архітэктурна, яны сустрэлі нямала. Трапляліся вельмі часта шматлікія культавыя канструкцыі. Усе былі своеасаблівыя і зьбіралі вакол сябе мноства душаў. Лявон і Вольця заўважылі нешта аднастайнае, што, як вэлюмам, пакрывала ўсіх; чамусьці на розум прыйшоў ягоны назоў — фанатызм. Сэрцы многіх забірала скруха.

Большасьць таго, што сустрэлі і назіралі Лявон з Вольгай, выклікала горасьць і крычала аб ратаваньні. Такі настрой асяродзьдзя ім не падабаўся, і яны пажадалі зьмяніць занятак. Але ніхто ня ўлічваў іхны стан, і відовішча працягвалася. На гэты раз з усіх бакоў абняў туман. Калі падспытныя паглыбіліся ў яго, адчулі, што трапілі ў атмасфэру стыхіяў, станаў і эмоцыяў. Пры гэтым яны былі рознай канцэнтрацыі. Найбольш цяжкія і негатыўныя залягалі бліжэй долу, лёгкія і пазітыўныя знаходзіліся вышэй, сама сьветлыя і празрыстыя групаваліся на высачыні. У залежнасьці ад месца знаходжаньня душа зазнавала адпаведныя пачуцьці. Ніхто ня прагнуў тут быць пастаянна, але абавязаны быў прайсьці гэты куток як выпрабаваньне.

Наогул розных па характару мясьцінаў існавала шмат. Наведаць усе было немагчыма дый неабавязкова. Душы сутыкаліся толькі з тымі, якія былі бліжэй па нутру. Так, Лявон і Вольга мігам праскочылі хлусьню, прагнасьць, зай-

здрасьць, злосьць, зваднасьць, мсьцівасьць, нечасьць, лянoту, разбэшчанасьць, нянавісьць, лютасьць, падазронасьць, некалькі затрымаліся на сьціпласьці, дабрыні, шчодрасьці, гуманнасьці, шчырасьці, сьмеласьці, памяркоўнасьці, абмінулі такія, ад якіх на зямлі здараюцца войны, канфлікты, забойствы, непагадзь, розныя ўзрушэньні і катастрофы. Пры гэтым яны адчулі (так, як зьяўляецца прадчуваньне бяды, здарэньня, надвор'я), што адны собскія якасьці выветрываюцца, другія ўмацоўваюцца, трэція ўзьнікаюць, чацьвертыя (дзіўна!) асядаюць лакунай, як бы чакаючы свайго часу і абставінаў для рэалізацыі; якімі тыя будуць — невядома. Апошняе ўразіла абодвух надзвычай. Яны неяк інакш паглядзелі і на сябе, і на атачэньне. Міжволі ўспыхнула думка: а ці было *такое* раней? Ня ведаючы, што адказаць, закаханыя ўсьміхнуліся, абняліся і сталі мілавацца.

Любошчы надалі іхным пачуваньням незвычайную зыркасьць і найбуйнейшае зьліцьцё.

# 20

Неяк Вольця ўспрыняла невядомыя токі і паведаміла аб гэтым Лявону. Той чамусьці ўсхваляваўся, бо сам нічога такога не адчуў. Празь нейкае імгненьне перад імі выявілася душа суперніка. Абодва зацікаўлена глядзелі на яго. Яны зразумелі, што ён нядаўна ў астрале і шукае Вольгу.

— Прабачце, я перашкодзіў вам, — вінавата сказаў госьць, — але мне патрэбная Вальціся.

— Яна — мая суджаная, — рашуча заявіў Лявон, — і нашыя лёсы зьнітаваныя.

— Гэта памылка, — пярэчыў незнаёмец. — Мы з Вольгай заўсёды былі разам.

— Няпраўда! — нарэшце змагла ўставіць слова Вольга. — Калі-некалі рок зводзіў нас, але ніколі мы як душы не належалі адно аднаму. Мой любы — Лявон.

— Воленька, што ты кажаш? — роспачна загаварыў госьць. — На маім астральным полі ўсё прасякнута і насычана табою. Хіба магло гэта ўзьнікнуць само? Не! Так не адбываецца. Ты — мая, і я не магу безь цябе.

— Шаноўны! — гучна вымавіў Лявон. — Маё поле таксама ўсё занятае Волькай, як і яе — мной. У цябе там сама нязначнае месца. Нашае каханьне — вечнае. Зразумей гэта і пакінь нас. Інакш я буду дзейнічаць жорстка.

— Вольця! Гэтая істота не для цябе. Яшчэ адно-два ўвасабленьні — і ты гэта ўбачыш. Я, толькі я павінен быць з табой.

— Адчапіся! — ня вытрымала Вольга і паслала гнеўную эмоцыю.

Незнаёмец адскочыў, але сваіх дамаганьняў не спыніў:

— Калі так пайшла справа, давайце спытаем у Нябёсаў. Калі бліснe маланка — мая праўда, калі дзьве — вашая.

— Згодныя! — зь нянавісьцю гаркнуў Лявон.

Вольга палахліва ўзьняла галаву.

Вышыні тут жа асьвяціліся спачатку адной, а затым другой бліскаўкамі. За імі завуркатаў працяглы гром.

Незнаёмец зароў як дзікая жывёліна. У роспачы ён кінуў апошнія словы:

— Несправядліва! Нехта *ня так* распараджаецца лёсамі. Калі вам дадзеная магчымасьць, то што адведзенае *мне*? Адчаго наогул існуе неўзаемнае каханьне? Для новых пакутаў? Каб пацешыць творцаў? Ну, тады няхай атрымліваюць і ад мяне «вясёлы» падарунак. Ведай, Волечка: зараз я іду на квяцісты луг, у Нулявую Сфэру, і раблю там сама горшы выбар. Мне ўсё адно, бо са мною няма цябе.

Яго выява растала, а ўлюбёным зрабілася адчагосьці сумна.

— Шкада яго, — уздыхнула Вольга. — Ён абярэ цяжкую, гаротную долю і будзе мучыцца на зямлі, ня ведаючы чаму. Сапраўды, нешта ня тое.

— Можа, яго час яшчэ не прыйшоў, і ён сустрэне сваё каханьне, — разважыў Лявон як бы апраўдваючыся, хоць і ведаў, што ніякай іхнай віны тут няма.

— Лявонка, ён ужо знайшоў сваё каханьне. Хіба толькі яшчэ адно будзе? А па-сапраўднаму ці бывае такое? Калі так, тады насамрэч штосьці недарэчнае атрымліваецца. Ува ўсякім разе, дасканаласьцю тут і ня пахне.

— Такіх выпадкаў шмат. Падобнае можа адбыцца і з намі.

— Як гэта разумець? Ты лічыш, што нашае каханьне несапраўднае, трэнавальнае, і ў будучым мы напаткаем тое, якое патрэбна?

— Ні ў якім разе, любка мая! Мы прызначаныя, каб кахаць адно аднаго вечна. Інакш і не павінна быць.

— Тады чаму рок зьвёў нас так позна?

— Родненькая, ня рый так глыбока! Я аб гэтым зусім ня думаў.

— А я мяркую: наш прыклад — яшчэ адзін доказ таго, што вакол робіцца нешта незразумелае. Можа, і трэба прыслухацца да галасоў? Чагосьці яны дамагаюцца ад нас. А раптам рацыя на іх баку?

«Нарэшце певень дзяўбнуў у галаву. Забалела? Мутарна? Дапамога спатрэбілася? А я разьлічваў, што вы будзеце кемлівей усялякай халібы і хутка ўшалопаеце. Атрымалася, не. Вас таксама прыйшлося доўга раскалыхваць. Ну, чым заклапочаныя?»

— Калі ты і надалей будзеш размаўляць з намі такім тонам, мы ня станем з табой знацца і нічога ня скажам.

«Ой, напалохалі! Ды я і без вас ведаю, аб чым вы кумекаеце, а спытаў, каб прыстоіць. Нікуды вы ад мяне ня дзенецеся».

— Своеасаблівая ў цябе прыстойнасьць. Апошнім разам на зямлі такая была ў палітыкаў.

«Адзін зь зямных грахоў, што вы ўсе ніколі ня кажаце праўды. Вось і зараз я бачу вашыя шчырыя адказы на ўсе пытаньні, але вы іх замоўчваеце, маскуеце, хітруеце, разь-

лічваючы на няцямлівасьць сумоўцы, як у Вердзе. Астральны досьвед вас яшчэ не навучыў. Дарма. Няхай будзе так. Усё адно рана ці позна вы прыйдзеце да якіхсьці вынікаў. Многія так паводзяць сябе. Майце на ўвазе: кожнае слова, думка, учынак будуць служыць вам столькі, колькі праўды, шчырасьці нясуць. Чым больш супярэчнасьцяў будзе паміж імі, тым далей вы ад высокае мэты. Былі выпадкі, што дух не вытрымліваў такога напружаньня і трапляў у зусім благія, брудныя месцы Сусьвету. Не жадаў бы я бачыць вас там».

— А якая *мэта*?

«Яна будзе адкрывацца вам спакваля. І паверце: як толькі вы адчуеце яе смак, яна будзе вабіць вас усё больш».

— Таемнасьць будзе працягвацца?

«Гэта не таемнасьць, а вашая неадукаванасьць, неасьветнасьць. Усё навідавоку, толькі трэба ўнікліва спасьцігаць жыцьцё, вучыцца, гнацца за сэнсам, знаходзіць і адкідваць прывіднасьць».

— Што ты нам нясеш лухту? Як быццам ня вашая дружына ставіць перашкоды, ахінае ўсё тайбай. Ты выдатна ведаеш, што *невядомасьць* спараджае ўвесь чалавечы страх (як ён вам падабаецца!) — і яе вы не прыбіраеце, а абнаўляеце, памнажаеце, лічыце за рухавік жыцьця.

«Бессэнсоўная размова. Гэта вы ўсьвядоміце потым, а зараз вам трэба кіраваць туды, дзе найбольш разаўецца вашая сутнасьць, — у *сфэру каханьня*. Астрал вялікі, з многімі яго куткамі вы пазнаёміліся. Дастаткова. Іншае вам не патрэбнае. Вы стаіце на такой прыступцы разьвіцьця, што далейшы ўздым магчымы толькі тады, калі вашае нутро адчуе адпаведную атмасфэру. Заўважце, як ветліва і ласкава я з вамі гутару. Да пабачэньня. Посьпехаў!»

# 21

Ураз зьмяніўся антураж — і Лявон з Вольгай апынуліся на прыгожай сонечнай палянцы. Яны адразу адчулі дзіўную адпаведнасьць з навакольлем. Мілату і добрасьць струменіла ўсё атачэньне, а яно было прыўкрасным, цудоўным і незвычайным. Калі б людзі пажадалі апісаць яго, звычайных зямных азначэньняў было б недастаткова, трапных словаў не знайшлося б. Яно мела падабенства з квяцістай сенажацьцю, зялёнай дубровай, летняй паўдзённай сьпёкай. Прыемныя пахошчы дурманілі, п'янілі, кружылі галаву, нібыта надзілі: «Чувайце! Атрымлівайце асалоду!» Да слыху даносілася чароўная музыка, якою быў запоўнены ўвесь этэр. На ўсе лады шчабяталі птушкі, чуліся іншыя шматлікія гукі, якія цешылі нутро, але паходжаньнем былі невядомыя.

— Сапраўдны рай! — захоплена ўсклікнуў Лявон. — Такога я яшчэ ня бачыў.

— Якое хараство! — зьзяла ад шчасьця Волька.

Не пасьпелі мілосьнікі налюбавацца, як у прасторы ўзьнік зазыўны сігнал і яны

адразу падпарадкаваліся яму ўсім іством. Як высьветлілася затым, гэтак падавалася спавешчаньне аб агульным зборы астральцаў сфэры.

Лявон і Вольга прыбылі ў вызначанае месца (знацьцё аб ім прыйшло само сабой) і былі ўражаныя мноствам душаў, якія амаль усе былі па парах, хоць траплялiся і адзінотныя. Апошнія выклікалі вялікае зьдзіўленьне, нават большае, чым адна-, двухполыя каханцы.

— Наш хаўрус папоўніўся яшчэ двума закаханымі, — гучала наўкруг зь невялікага ўзвышша, што было паводдаль, — і мы радыя бачыць іх сярод нас. Павітаем нэафітаў!

Лявон і Вольга адчулі, што гавораць пра іх. Грамада ўскіпела радасьцю. Такога масавага воплеску эмоцыяў у свой адрас яны не памяталі.

— Дазволім ім удасканальвацца поплеч, — жадаў ужо другі голас, — зычым набыць лепшыя веды і дасягнуць вышыняў інкарнацыі. Перамогаў!

Пазьней Лявон і Вольга даведаліся, што іх віталі і давалі наказ Рамэа і Джульета. Гэта яшчэ больш уразіла іх і пасунула да высьвятленьня сутнасьці месца знаходжаньня. Ведалі б яны, як у гэты час трыюмфаваў той, хто некалі навучаў іх і адпраўляў у сфэру каханьня.

А таемнасьці і невядомасьці, перашкодаў ніякіх вакол не існавала насамрэч. Шчырасьць, чысьціня намераў сталі лепшым ключом. Дастаткова было ўва ўнісон пажадаць, падумаць, нацэліцца — і мроя расьсейвалася, выйсьце знаходзілася, запаветнае ўзьнікала.

Іншыя астралавекі дапамагалі і разьлічвалі на такую ж помач.

Спачатку было цяжка раскрываць сябе, а потым стала зразумелым, што чым шырэй расчыненыя дзьверы, тым больш сьвятла, ведаў пранікае ўнутр, тым далей бачная дарога.

# 22

Цікава квітнелі пачуцьці ўлюбёных. Крыху інакш, чым на зямлі, дзе адчувальным складнікам былі ўмовы жыцьця і грамадзтва, якія ўвогуле перашкаджалі каханьню. Тут, наадварот, усё садзейнічала. Сама галоўнае — у кожнай пары быў свой куток асноўнага знаходжаньня, які цалкам адпавядаў характару стасункаў, і аб ім ніхто не клапаціўся, як гэта адбывалася ў Вердзе. Усё фармавалася, узьнікала,ператваралася ў залежнасьці ад эмоцыяў гаспадароў. Так, для Лявона і Вольці прытулкам засталася першапачатковая палянка. На ёй час ад часу зьяўляліся ўсё новыя краскі, птушкі, зьвяры, гукі і яшчэ фантомы нейкіх дзіўных стварэньняў, зьяваў, што бавілі-лашчылі іх, стваралі лепшыя ўмовы, цешылі-радавалі сваім цудоўным настроем, жвавасьцю, гульнёй. Дастаткова было штосьці пажадаць — і яно тут жа ажыцьцяўлялася, прычым аднастайнасьці ніколі не было, як ніколі не бывае аднолькавых ахоцьця, запалу, жады, зьнібы, хізі.

Лявон з Вольгай былі здатныя на выдумкі і часта знарок складвалі розныя сюжэты дзеля весялосьці ды пацешкі. Усё адразу малявалася відочна і нямала іх займала. Сумных варыяцыяў яны пазьбягалі, а калі і трапляліся панурыя ноткі, дык гэтыя ўсё адно былі спэцыяльнымі, для настрою і разнастайнасьці.

Іншых клопатаў каханкі не спараджалі, бо не адчувалі ў іх патрэбы.

Так доўжылася невядома колькі, бо часу яны не заўважалі, дый яго тут і не было.

Але адна падзея змусіла іх паглядзець на сябе і навокал інакш.

# 23

Агульных збораў было шмат. Большасьцю яны былі прысьвечаныя папаўненьню альбо нейкім выбітным душам, а такіх тут хапала — за ўсю гісторыю чалавецтва іх назьбіралася мільёны. Такія сходы хоць і былі цікавымі ды расквечвалі сфэру, але даўнім астральцам ладна надакучылі, і яны, было прыкметна, нудзіліся.

У чарговы раз Лявон і Вольга прыбылі на талаку і заўважылі незвычайнае ажыўленьне. Усе зацікаўлена ўслухваліся ў прамову з амбону.

— У нас зноўку вялікае сьвята: мы адпраўляем вышэй па лесьвіцы духу новую рацьць ваяроў. Яны з посьпехам прайшлі ўсе выпрабаваньні астралу, зразумелі мінучасьць эмацыйнага асяродзьдзя, ілюзорнасьць атачэньня, узгадавалі патрэбныя думкі і робяць першы крок у мэнтальную сфэру Сусьвету.

З грамады адразу вылучыліся станістыя і велягурыстыя адзінотныя. Яны велічна праляцелі над натоўпам і паімчалі ўвысь пад акампанемент нябачнага нябеснага аргану і масавага захапленьня.

І толькі зараз Лявон і Вольга зразумелі прызначэньне гэтых адзінокіх, але ***як*** імі становяцца, яны не ўяўлялі. Ім па-ранейшаму было няўцям, *што* робяць гэтыя абраньнікі ў сфэры каханьня?

Пасьля такой імпрэзы гуляць у прыдумы, казкі расхацелася.

Узьнікла пытаньне: а што яны ўвогуле ведаюць пра сфэру каханьня?

Настрой у іхняга астральнага павадыра зноў палепшыўся, толькі небаракі гэтага ня бачылі.

Яны вырашылі глыбей вывучыць сфэру, атрымаць больш інфармацыі пра надворны сьвет.

Якім чынам?

Калі будаваць сваю цікавасьць да існага накшталт ранейшых намераў і бажаньняў, ці будуць гэтак жа зьяўляцца патрэбныя адказы? Яны паспрабавалі, жадаючы даведацца, колькі насельнікаў знаходзіцца ў сфэры каханьня, і ледзь не абамлелі, калі ў паветры намалявалася шматзначная лічба. «Як яны тут месьцяцца?» — аўтаматычна ўзьнікла пытаньне, і ў іхных галовах мігам праявіўся адказ-парада: «*Спазнавайце*».

# 24

Усё акаляючае асяродзьдзе пранізвае каханьне, якім, нібы паветрам, *дыхаюць* жыхары — кунежныя душы, — узбагачаючы сваё іства. Так як яны здольныя існаваць дзе заўгодна, і ўверсе, і ўнізе, у сфэры адсутнічаюць пустэчы ў зямным разуменьні: кожная кропка прасторы запоўненая імі і іхнымі справамі, то бок відавочным сэнсам. Лявон і Вольга менавіта тут пераканаліся ў правільнасьці выразу: Сусьвет наогул ня мае пустэляў.

Больш глыбокае азнаямленьне з краем шакавала і азадачыла навасельцаў: астрал, тонкі сьвет — своеасаблівае вымярэньне ўсяго Космасу, а вось сфэра каханьня — уласьцівасьць толькі Зямлі.

Каго яны ні сустракалі, усе былі з гэтай блакітнай плянэты. Няўжо за яе межамі няма каханьня? Чаму тольма земная апука валодае такім цудоўным пачуцьцём? Ці цудоўным?

Чаго ж дамагаўся ад іх астральны Кіроўца?

Прайшло нямала часу ў звыклым значэньні, і пакрысе стала вымалёўвацца агуль-

ная карціна. Да таго, што здабылі Лявон і Вольга ў астрале, дадаліся ўражаньні і досьвед шматлікіх увасабленьняў у рэальным сьвеце, асабліва апошніх.

Атрымалася, што Зямля перажыла шмат поўных *цыкляў* разьвіцьця, і апошні, ці бо той, што яшчэ працягваўся, ёй даўся ня так проста. Ніводзін *цыкль* ня быў нармальна завершаным і ўзорным, і Час пакалашмаціў плянэту ўдосталь. Або так неабходна было, або Творцы трапіліся нягеглыя — Лявон з Вольгай не зразумелі. Ясна вынікала адно: кожны раз, каб дасягнуць *нейкай мэты* (якой — дапытлівыя таксама не дазналіся), насельнікам патрэбная была ін'екцыя чагосьці экстраардынарнага. Тое, што жыхары і прырода заўсёды выступалі паддосьледнымі, удзельнікамі невядомага экспэрымэнту, у Лявона і Вольгі сумневу не выклікала. Асноўнай умовай усіх выпрабаваньняў заўжды была *тайба* — гэта таксама зьяўлялася відочным. Якая і дзеля чаго — ніхто ім так не сказаў і не адкрыў. Яны зь зямной практыкі ведалі, што *так* звычайна сакрэтнічаюць тады, калі насамрэч ніякай тайны нямашака і хтосьці прагне ўволю нагуляцца, маючы подлы, антыгуманны інтарэс.

Як бы там ні было, а Творцы замест таго, каб паказаць *Праўду* ўва ўсім *яе* касьмічным багацьці і дасканаласьці, укараніць сярод разумных істотаў даходлівыя спосабы *Яе* спасьціжэньня, вырашылі падвергнуць іх псыхічнаму апраманеньню альбо захворваньню — *каханьню*, надаўшы яму розныя формы: ад інстынктыўнай да звар'яцелай з абавязковымі пакутамі. Яны яго ня вынайшлі (такога нельга зрабіць у прынцыпе, бо ў Сусьвеце ***ўсё*** ёсьць), а выцягнулі зь нейкіх сусьветных засекаў, сховішчаў, інфармацыйных сістэмаў — увогуле з акашы — па коду «**F-63,9**» і зрабілі ўсеабдымна значным. Усё, да чаго датыкаўся homo sapiens, атрымала прышчэпку, вірус каханьня, было трансфармаванае і ператворанае пад

новы дыягназ. Гэткім чынам кожны павінен быў праявіць у сабе здольнасьці пачуваньня да кагосьці крэпкай прывязанасьці, прыхільнасьці, духовай магнасьці.

І што атрымалася?

Лявон і Вольга асалапелі, калі ўбачылі, як неверагодна зьмяніліся ўмовы і вобраз жыцьця, якой антыкасьмічнай зрабілася плянэта пад узьдзеяньнем каханьня. Было зьнішчана ўсё, што альбо не адпавядала, альбо процідзейнічала яму: віды, этнасы, прырода, тэрыторыі, прадметы, рэчывы, соцыюм, характар, стыль, паводзіны, заняткі, захапленьні, каштоўнасьці і многае іншае, усталяванае за мільёны гадоў. Прычым адно прыбіралася адразу, бязьлітасна і балюча, другое — паступова, натуральна і непрыкметна. Асаблівыя зьмены перажыла *сьвядомасьць*, якой, хоць і дадзеная была ўсёдасягальнасьць, ніколі не дазвалялася даведацца пра сябе даўнейшую.

У выніку *галоўнае* было дасягнута — чарговая рэчаіснасьць распаўсюдзілася шырока і глыбока, новыя ілюзіі і міты жыцьця зрабіліся ўстойлівымі і непахіснымі, асабліва тыя, што прыносілі жарсьць, юр, пералюб, блудадзейства, асалоду, задавальненьне, любату... — бяз гэтага каханьне ну ніяк ня йшло! Плянэту асягнуў неверагодны дурман, але людзі пра гэта ня ведалі і лічылі, што жывуць у сама лепшым мейсцы Сусьвету. Яны ганарыліся сваімі парадкамі, прымалі іх за дасканалыя і праглі распаўсюдзіць на ўвесь Космас. Жаданае выдавалася за існае.

І каханьне тут іграла галоўную ролю. Усё, што адбывалася, прама ці ўскосна тычылася яго. Колькі значэньняў, сэнсаў, найменьняў, вобразаў, падзеяў, справаў, якасьцяў, прыкметаў было нагрувашчана пад словам «кахаць», а таксама — «падабацца», «да сэрца», «да душы», «да густу», «імпанаваць», «любасьць» і пад многімі іншымі вытворнымі!

Прыгожасьць як спадарожнік каханьня набыла магічную сілу, і яе нарэшце сталі заўважаць, разумець. Нехта з разумнікаў, нацярпеўшыся ад звыродзьдзя, нават сказаў, што яна выратуе сьвет. Відавочная бяссэнсіца: вечнае ня мае патрэбы ў ратунку, тым больш ад самога сябе.

Усё, з чым сутыкнуліся Лявон і Вольга, казала за тое, што чалавек і каханьне як касьмічныя зьявы моцна зьнітаваліся і цяжка вызначыць, хто ад каго больш залежыць. А што ўзьдзеяньне двухбаковае і выняtковае — сумневу не выклікала. Каханьне па сутнасьці стала вяршыняй *эгаізму* (і чаго *яго* лічаць недахопам?) і значна пасадзейнічала індывідуалізацыі. Наяве закаханая асоба жыла па асаблівых законах і ўспрымала сябе ледзь ня цэнтрам Сусьвету, вакол якога круцілася ўсё. Ёй здавалася, а мо і ўзапраўды так (хто дасьледаваў?): яна здольная на неверагодныя ўчынкі, пераўтварэньні, подзьвігі, нечуваную дабрадзейнасьць. Яе душа нібыта пашырылася, пранікла ў дасканалыя сфэры, адчула іншае сьвятло. Прыкметна адышла мітусьня, узрасла ўласная значнасьць — і асяродзішча, грамадства заўважыла-ўспрыняло гэтыя мэтамарфозы, абудзілася (спачатку нясьведама, ледзь прыкметна, як і ад усялякай вартай навіны) і пакрысе рыхтавала сябе да лепшых узораў лучнасьці і супольнасьці. Такім чынам, закаханыя, самі таго не разумеючы, зьмянялі і ўдасканальвалі жыцьцё.

Але Лявон і Вольга знайшлі, што зь цягам часу засталіся існаваць *толькі* форма, канструкцыя каханьня, а зьмест, сутнасьць яго выветрыліся, калі тыя наогул былі (і такое магчыма). Дзесьці Творцы напартачылі. А каб ніхто не здагадаўся, зноўку нацягнулі на многія зьявы покрыва *таемства* — гэта рабіць яны мастакі: увесь сьвет у тайніцах.

Кожны дапытлівы і кемны зьверне ўвагу на ілюзорнасьць каханьня, яго неадпаведнасьць, як адзінай і важнай эмоцыі,

нават фізычнай будове чалавека: любіць сэрца, усьведамляе і выказвае галава, а асалоду даюць іншыя органы, то бок яно распыленае па ўсяму целу, *ня мае суцэльнасьці*, каб высьпець у якасьці высакароднай ідэі для вечнага быцьця і захапіць увесь Сусьвет.

Каханьне, як і ўсялякая радасьць, расслабляе, не выхоўвае і не загартоўвае, яно — толькі спачын на доўгім шляху пазнаньня.

Якім настроям яно садзейнічае? Такім, якія не прыжываюцца ў рэальнасьці і наогул нідзе, ці бо непапулярным, непрыстасаваным, летуценным.

Няцяжка было знайсьці прыклады прывіднасьці гэтага пачуцьця. З нейкіх невядомых прычынаў яно давалася ня ўсім, можна нават сказаць — адзінкам, дый то з аглядкай, бытта са шкадаваньнем, асабліва калі адбыўся фізычны падзел чалавека: з андрагінаў былі вылучаныя мужчыны й жанчыны. Чаму тое было зроблена? З-за прарухі: андрагіны не апраўдалі надзеяў і паланіліся ня столькі духовай павабнасьцю каханьня, колькі яго фізычнай понадзьдзю і спакусамі, чаго ў іх саміх, як у самадастатковых біялагічных стварэньняў, хапала зь лішкам, а на іншых яны зіркалі большасьцю ад жадлівасьці і пералюбу. Але і чарговая мэтамарфоза ня стала панацэяй: ад дзяленьня стала ўдвая больш пакутаў, дадаліся новыя мукі, зьвязаныя з павелічэньнем дробнага насельніцтва, міжасабовымі і нацыянальнымі канфліктамі, непавагай да Багоў, якіх людзі вінавацілі ў адсутнасьці любові і чуласьці, ува ўкараненьні ўсялякіх хваробаў і нэгатыву.

У рэальнасьці рэдка страчалася пара, працятая ўзаемным каханьнем. Такіх, як Лявон і Вольга, было вельмі мала. Самі яны сіліліся ўспомніць яшчэ кагосьці — і не маглі: побач іх не існавала, а людзей вакол былі тысячы. Гэныя прыцягваліся-ядналіся па іншых рысах, асаблівасьцях: вабнасьці,

прыгажосьці, панадлівасьці, пахаценьню, бязульству, спакусе, сунезе, жадобе, мэркантыльнасьці, шкадобе, прымусу, свавольству, эратызму, то бок усіх тых, якія не зьяўляліся, як казалі, сапраўдным каханьнем, а былі яго эрзацамі ці сурагатамі. Прычым самыя людзі іх не маглі прыдумаць, а атрымоўвалі ад Творцаў як характар, як кармічны дар.

Уніклівыя Лявон і Вольга тлумачылі гэта зноў-такі недалужнасьцю валадароў і іхняй забаўкай.

# 25

Так атрымалася, што пра каханьне больш казалі, сьпявалі, пісалі, малявалі, стваралі, выдумлялі, складалі ўсялякія байкі, у якіх да дойснасьці было вельмі далёка. Да ўсяго імкнуліся яго прышчапіць, дадаць небывалых, нерэальных ілюзіяў. Ніводная зьява не існавала, ня ўзяўшы ад каханьня хоць макулінкі (трэба было тое ці не — ніхто не правяраў). Адчувалася, што Нябёсам падабаецца і сьвярбіць гэтая тэма, што яна мае прынцыповае значэньне, і ад яе Яны не адмовяцца, нягледзячы на нестасоўку з усекасьмічнымі законамі і нездавальненьне (а гэтае ўсё расьце і выяўляецца як дадатковыя праблемы для чалавецтва, немаведама адкуль узьніклыя, заблытаныя і цяжка вырашальныя) сусьветнага супольніцтва.

Пра гэта неяк выказаўся сам Рамэа:

— Хіба была б сфэра каханьня, калі б ня высілкі Творцаў? Дзеля яе Яны робяць неверагоднае і ўкладваюць многа сродкаў. Узяць нас з Джульетай, герояў мастацкага твору. Чаму мы жывём разам

з душамі ды яшчэ кіруем імі? Таму што ідэальна адпавядаем задуме. Дзе ў рэальнасьці сустрэнеш такое? Чаму нашай трагедыі надаецца такая ўвага на Зямлі? Няўжо Шэксьпір так геніяльна напісаў яе? Нічога падобнага — звычайны твор! Сюжэт, як празаічны, вядомы ў Італіі даўно і створаны задоўга да Шэксьпіра. Той проста яго запазычыў. А ўсё ад таго, што на гэтую банальную гісторыю Нябёсамі выдаткавана шмат энэргіі, і, дзякуючы Шэксьпіру, іхняму пасланьніку, яна набыла неабходнае афармленьне. Пасьля напісаньня твор працягвае атрымліваць вялікае энэргетычнае забесьпячэньне — тым і жыве ў вяках, займаючы важнае месца ўва ўсіх жанрах культуры.

Джульета дадала:

— Такі ж падыход захоўваецца і ў выпадках Трыстана і Ізольды, Атэла і Дэздэмоны, Прынца і Папялушкі, Андрэя і Наташы, Грыгорыя і Аксіньні, Сымона і Ганны, Васіля і Ганны ды іншых слынных персанажаў, якіх, дарэчы, вы таксама бачылі ў нашай сфэры. Дзіўнага тут нічога няма: трэба ж дэманстраваць узоры каханьня, калі рэальнасьць такіх прапануе недастаткова.

— Затое фізычны сьвет багаты на прыклады моцы каханьня *іншага* кшталту, — заўважыў Рамэа, ад чаго Джульета чамусьці насупілася.

— Я ведаю якія, — без ахвоты адказала яна. — Гэныя больш зьневажаюць пачуцьцё, чымсь узьвялічваюць яго.

— Але нічога не паробіш: Творцамі яны ўжываюцца часта і шырока, — прадоўжыў Рамэа. — Не хвалюйся, даражэнькая: нас з табою скарыстоўваюць тольма ў высакародных мэтах. Значыць, калі адна істота (лепш уплывовая ды знакамітая) кохне па другой, яна злашча патрапляе каханай, задавальняе ўсе яе выбрыкі і хітрыкі, з-за чаго робіць усялякія бязумлівыя і настырчывыя ўчынкі — менавіта гэтая аса-

блівасьць шмат эксплуатуецца, каб сярод людзей укараніць непапулярныя мысьлі. Тады і адбываюцца розныя працэсы, сацыяльна-грамадзкія, нават палітычныя, зьмены, назіраецца прагрэс. А то, што здуру, — не бяда.

— Наогул, — раззлавана абагуліла Джульета, — калі Творцам нешта вельмі патрэбна, Яны ідуць на ўсё. І ніякія нормы прыстойнасьці ці гуманізму, на што спадзяюцца людзі, іх не спыняюць. Вы думаеце, што Яны ў Космасе адны такія? Зірніце на зоркі!

Лявон і Вольга некалькі сумеліся, бо, сапраўды, у сваіх пошуках забыліся пра Сусьвет, дзе адказы на пытаньні больш пераканаўчыя, чым у зямным колазвароце. Адзін толькі аналіз уласных ведаў *што* дае! А калі далучыць навуку, тэасофію?

*Галоўная выснова: Сусьвет трымаецца на катаклізмах і катастрофах*. Адно зьнішчае і нараджае другое, другое — трэцяе, трэцяе — чацьвертае і г.д. Бясконца! І ніякай згадкі пра каханьне. Хіба ёсьць яно, калі галяктыкі, зоркі, камэты, астэроіды, мэтэарыты ляцяць адно на аднаго і сутыкаюцца? Няўжо каханьне творыць шматлікія касьмічныя выбухі на мікра- і макраўзроўнях? Ці наўрад гэтае пачуцьцё штурхае араву іншаплянэтнікаў да блуканьня ў міжзор'і, у тым ліку да нашай Зямлі. Сьмешна было б бачыць вірлавокае зялёнае стварэньне, якое пакутуе і пятрэе ад каханьня па нейкай зямной Маньцы альбо наадварот! А што прымушае касьмічныя целы круціцца адно вакол другога? Яўна не каханьне. Якая сіла нясе Сусьвет ушыркі і ўглыбкі? Пэўна, ня дзеля пошукаў дрыжоных.

Засмучэньне ахапіла мілосьнікаў. Што ім рабіць? Яны разьлічвалі на вечнасьць. А ці такую? Яна нядрэнная, і ім суджана заўжды быць разам. Ды і наперадзе шмат невядомага — таксама добрасьць. Але… Калі іх прытуліць да сябе Бог? Можа, апекан падмануў і пакінуў?

«Я ня з той кагорты і ў такое не гуляю. Я заўсёды каля вас і пастаянна назіраю за вамі. Можаце мне нічога не распавядаць: ведаю ўсё».

Лявон з Вольгай узрадаваліся і прама расквітнелі, пачуўшы знаёмы голас. Ім здавалася: найшчаснай хвіліны не было.

— Чаго ты хаваесься ад нас?

«Так трэба. Я паўстану перад вамі крыху пазьней, і вы ўсё зразумееце».

Каб не астудзіць запал падапечных і падтрымаць іх, ён працягнуў:

«Па шчырасьці, вы мне падабаецеся. І я нікольki не шкадую, што ўзяў вас і вяду. Вы прайшлі доўгі шлях. Часам здавалася, што хтосьці з вас ня вытрымае, сыдзе альбо загіне — такое таксама адбываецца, калі душа становіцца на няправільную ці зваротную дарогу. Але вы ўсё перадолелі. Малайчыны!»

— Ты, мабыць, зноў над намі пацяшаесься: хіба кахаць цяжка?

«Яшчэ як! Каб атрымаць каханьне, вы прайшлі шмат выпрабаваньняў і ў фізычнай, і ў флюіднай формах на многіх плянэтах, а на Зямлю трапілі кузуркамі... Гэтага я вам не дэманстраваў, каб не адцягваць вас і не псаваць».

— Дзякуй. Мы многае зразумелі. Але, упэўнены, на гэтым веды не заканчваюцца. Вечнасьць, якую мы з Волькай будзем праводзіць у сфэры каханьня, адкрые нам усе свае таямніцы.

«Спадзявацца заўсёды трэба, але не на гэта».

— Чаму? Няўжо мы нешта прапусьцілі, ня ўбачылі?

«Не, разьвіваецеся вы нармальна, але тое, чаго дасягнулі, можа адкрыць для вас іншую прышласьць, і не благую».

— Мы з Вольгай кахаем адно аднаго і ніколі не расстанемся, а сфэра для гэтага толькі адна ў Сусьвеце — вось гэтая. Іншыя нас разлучаць.

«Вы яшчэ ня ўсё спазналі. Ёсьць варыянт, які дае вам шанц. Між іншым, вы зь ім сутыкаліся, але далей зьдзіўленьня ў вас гэта не пайшло».

— Які? Мы, здаецца, з усім разьбіраліся.

«Не зусім. Вы заўсёды заміралі, калі сустракалі *адзінотных*, асабліва на сьвяце ў іх гонар, і так не даведаліся, *хто* яны».

— Сапраўды, тут мы схібілі. Надта таёмае пытаньне.

«Нічога сакрэтнага — усё відавочна: яны заўсёды былі паблізу. Ня буду стамляць, распавяду. Адзінотныя — гэта былыя закаханыя, якія абралі шлях удасканальваньня».

— Ты нас не зразумеў. Паўтараю: мы з Вольгай не зьбіраемся расставацца, нават дзеля ўдасканальваньня.

«А гэтага і ня трэба».

— Як? Яны ж існуюць у самоце.

«Ні ў якім разе! Адзінотныя — гэта цудоўная зьява астралу, калі двое закаханых, каб рухацца далей у вечнасьці, аб'ядноўваюцца, зьліваюцца ў адзіную дасканалую істоту, духоўна вышэйшую, чым іншыя».

— Такое магчыма? Мы шакаваныя. А што для гэтага неабходна зрабіць?

«Дастаткова мець жаданьне і неабходны ўзровень падрыхтоўкі».

— А мы падыходзім пад такія патрабаваньні?

«Пакуль не».

Лявон і Вольга засумавалі, бо ўнутрана былі ўжо гатовыя на такі (яны былі ўпэўненыя) прыемны акт.

«Чаго вы так спахмурнелі? Я кажу «не», бо, сама галоўнае, вы ня выказалі сваёй гатовасьці *ўголас*».

— Так, мы згодныя! — разам выгукнулі яны. — А што нас чакае?

«Мэнтальны сьвет, касьмічная ўсёдасяжнасьць, напружаная праца розуму, духу. Майце на ўвазе: у новай выяве вы павінныя найперш прайсьці спэцыяльнае навучаньне і тэставаньне, каб з чыстымі намерамі ступіць на больш высокую прыступку духу. У добры шлях!»

# Эпілог

На Зямлі ўсе чакалі сутыкненьня з астэроідам. Навуковыя разьлікі казалі за тое, што ў бліжэйшы час касьмічны вандроўнік абавязкова ўварвецца ў Сонечную сістэму і накіруецца прама да нашае плянэты. Ніякае альтэрнатывы ніхто не абяцаў. Ратаваньня — таксама.

Такім масава нікчэмным і бездапаможным чалавецтва яшчэ не было. Упершыню людзі зразумелі, што ўсе роўныя, каштоўнасьцяў няма і ўва ўсіх адзін лёс.

Напярэдадні катастрофы яны з асаблівай цікавасьцю ўглядаліся ў неба. Але тая марудзіла, як быццам прагла зьвесьці ўсіх ад чаканьня альбо, наадварот, скасаваць сябе, стаўшы подзівам...

І сапраўды, цуд адбыўся!

Астэроід насуперак усіх фізычных законаў на поўным хаду павярнуў убок перад самай Зямлёй і прамчаўся міма, ледзь крануўшы яе атмасфэру. Усе ўразіліся, бо такога ня мусіла быць.

верасень 2013 году — кастрычнік 2014 году,

г. Віцебск.

# ВЕЖА

## апошняя гульня лёсаў
## канодная праекцыя

Росквіт цывілізацыі дасягнуў такіх памераў, што былі вычарпаныя ўсе магчымасьці матэрыі і паўстала неабходнасьць вызваленьня чалавецтва ад яе ціскоў. Але яна ўпарцілася і не хацела губляць уладу. Узрастала пагроза ўсеагульнае дэградацыі.

Сусьвет ведаў, што спакойнага, эвалюцыйнага ўзыходжаньня Зямлі на чарговую прыступку ўжо ня будзе. Таму кардынальныя зьмены, новыя касьмічныя ідэі і формы жыцьця рыхтаваліся прыйсьці шляхам імгненнага жорсткага дзейства.

Распачынаўся чарговы Вялікі Этап Жыцьця, і Яго вяшчун — усемагутны Пярун — ужо занёс свой вогненны меч над людзьмі, якім упершыню было дадзена шырокае веданьне ўсеплянэтнай катастрофы.

Бліск агромністай маланкі павінен адсекчы будучыню ад мінуўшчыны, душы ад целаў і засьведчыць пачатак Новае Эры. Нябёсныя Сілы, засьцерагаючы зямлянаў ад залішняга ўзрушэньня і зьбянтэжанасьці, спагадліва падарылі ім магчымасьць для роздуму і пакаяньня: канчатковы пераход на той сьвет адбудзецца толькі пасьля грому, які скалане кожнага чалавека празь некалькі хвілінаў пасьля маланкі.

Але гэта не кране тых, хто прагне расьцягнуць сваё матэрыяльнае існаваньне. Для гэтага на плянэце пабудавалі шмат **вежаў**. Жаданыя дзьверы адчыняцца толькі на час паміж маланкай і громам. Таго, хто пасьпее ўнутр, глабальныя зьмены абмінуць. Але як толькі ён нейкім чы-

нам апынецца вонкі, для яго таксама лясьне пярун і надарыцца адыход.

На **вежы** спадзяваліся многія, але ня ведалі, што за імі можа быць.

ДЗЕЙНЫЯ АСОБЫ:

АЛЁНА — хатняя гаспадыня.
ЗАХАР — мэр.
МАРТА — феміністка.
МАЦЬВЕЙ — бадзяга.
НАДЗЕЯ — закаханая.
ПІЛІП — навуковец.
ТАНЯ — прастытутка.
ЦІМОХ — вар'ят.
ЮРКА — студэнт.

Сцэна мае выгляд прасторнага памяшканьня з шырокімі вокнамі. Стол, крэслы, канапа, кніжная шафа, лядоўня, розныя мэханічныя і аўтаматычныя прыстасаваньні — увогуле выгляд сучаснае беларускае гасподы альбо кватэры. Збоку лесьвіца. Канца яе не відаць. Уверсе лунаюць літары, якія ў асобныя моманты рэагуюць на настрой герояў і складваюцца ў словы і выразы. Цяпер можна прачытаць: «ЧАС НАРАКАЕ: ЖЫЦЬЦЯ ЗАШМАТ». Напачатку гэтага ніхто не заўважае.

Зьвяртае на сябе ўвагу шматгранны ўваход. Паветра ў яго праёме бліскаціць ды патрэсквае і, як толькі ўбягае чалавек, гучна разрываецца, нібы ўскрыквае ад болю. Таропка, хто разгублены, хто зьдзіўлены, хто з уздыхам палёгкі, перад гледачамі зьяўляюцца ТАНЯ, ЦІМОХ, МАЦЬВЕЙ, АЛЁНА, НАДЗЕЯ, ПІЛІП, МАРТА, ЮРКА, ЗАХАР. За апошнім раздаецца моцны гром — і на ўваход імгненна падае чарната.

Усе нерухома сочаць за гэтым, апасьля ўсхвалявана падбягаюць да вокнаў, якія яшчэ некалькі секундаў жывуць жудаснай какафоніяй Канца і затым таксама паглынаюцца цемрай.

Нейкі час на сцэне зьбянтэжанасьць і маўчаньне.

МАЦЬВЕЙ: Чаго прыціхлі? Язык праглынулі? Радуйцеся: нам пашанцавала! Вы толькі ўявіце: мільёны людзей ураз апынуліся на тым сьвеце, а мы засталіся жыць! Мы — выбраныя!

ЦІМОХ: Для гульні.

ПІЛІП: (*невядома каму*) Дурань думкай багацее.

ТАНЯ: Вар'яцтва.

ЮРКА: Цудоўна!

НАДЗЕЯ: Для адзіноты…

МАРТА: І жанчын, як заўсёды, меней.

Усе пачынаюць знаёміцца з абстаноўкай, разбрыдаюцца, кранаюць прадметы, аглядваюцца, зь цікавасьцю пазіраючы адно на аднаго.

ЮРКА: Што гэта такое? Куды мы трапілі? А дзе электроніка, гаджэты? Візуальнае, забаўляльнае быцьцё? (*Спрабуе ўласны апарат*) І асабістае не працуе? У кошык яго!

ТАНЯ: Пячора! Пракаветнасьць! Дадаць валуноў — і каменны век!

ПІЛІП: Так, сьціпленька. Я разьлічваў на офіснае абсталяваньне, кабінэтную ўтульнасьць.

МАРТА: А я думала, будзе прастора, каштоўнае велягурнае ўбраньне, мадэрнісцкі стыль.

НАДЗЕЯ: Мы ўяўлялі цёплае хатняе жытло, сьветлы камфорт.

АЛЁНА: І ніводнае расьліны! (*Да МАЦЬВЕЯ*) Вы лічыце: нездарма ўсё?

МАЦЬВЕЙ: Канешне. Адчаго гэта выпала толькі нам? Выпадкова? Не! Многія днявалі і начавалі ля вежаў, каб

злавіць момант, а калі адышлі па патрэбе — маланка бліснь!, гром бабах! — і ўсё, нават успомніць няма каму. Я залішне не мітусіўся. Што мне, валацугу, губляць? Жыццё? Я за яго ніколі не чапляўся. Яно ў нашага брата гадкае. Давялося чарвяку на вяку. А ў прызначаную хвіліну ля вежы чамусьці апынуўся я. Гэта нешта значыць. Што? Пакуль невядома, але пажывём — пабачым. Так што не сумнявайцеся... Прабачце, як вас зваць?

АЛЁНА: Алёна.

МАЦЬВЕЙ: А мяне — Мацьвей. І чым, Алёна, займаецеся, калі не сакрэт?

АЛЁНА: (*з натужлівай усьмешкай*) Вялікі: я — хатняя гаспадыня.

МАЦЬВЕЙ: І таксама тапталіся ля вежы?

АЛЁНА: Не. На гэта часу не было. Нашая сям'я — вялікая: дзеці... былі (*жахнулася і заплакала*).

ЦІМОХ: Ты і сьлёзы ўзяла з сабой? Цяжка?

АЛЁНА: Невыносна. Хіба мне тут быць? Маё месца зь дзецьмі. Іх забіў пярун, а я не абараніла... берагла, берагла... Не магу, не магу!.. Хто ж ведаў, калі неба трэсьне? Пайшла ў краму, усё купіла, вярталася... Акурат ля вежы, дзе куча людзей, маланка й паласнула. Я была кінулася хутчэй дахаты, але натоўп сьціснуў мяне і панёс да вежы. А перад гэтымі дзьвярыма наогул ледзьве не задушылі... Супроць волі я тут. Дзетак бы маіх сюды...

Споведзь АЛЁНЫ крыху разрадзіла атмасфэру і нібы паклікала ўсіх да стасункаў. Але ніхто не сьпяшаўся. ЮРКА заўважыў у паветры надпіс.

ЮРКА: Што за шоў? І як гэта разумець?

Усе скіравалі позіркі ўверх і захапіліся відовішчам, на хвіліну сьцішыліся.

ТАНЯ: Як прыгожа! Нібы птушкі.

НАДЗЕЯ: Я хвалююся...

АЛЁНА: І мне не па сабе. Трывожна.

МАРТА: Незразумела.

ПІЛІП: Чыясьці воля.

МАЦЬВЕЙ: Так, мы не адны.

ЮРКА: Можа, хто наверсе забаўляецца? Варта зірнуць (*узьбягае па лесьвіцы*).

ЦІМОХ: (*усьлед ЮРКУ*) Трэба бегчы ня целам, а духам.

МАЦЬВЕЙ: Ніколі нельга сьпяшацца, тым больш зараз.

ПІЛІП: А я па-іншаму і ня жыў: усё бегма.

МАРТА: Адчаго так?

ПІЛІП: Мая стыхія — навука. Ёй аддаваўся цалкам... Атрымлівалася няблага. Спадзяваўся на посьпех. А тут уміг усё ляснулася.

МАРТА: Таксама гора.

ПІЛІП: Яшчэ якое! Я меркаваў, што катаклізму ня будзе альбо ён здарыцца па-іншаму. Таму накіраваўся да вежаў, каб весьці назіраньні ў незвычайных умовах. Калегі казалі: «Пілiп...» — гэта маё імя...

МАРТА: Марта.

ПІЛІП: «Піліп, кінь дурное. Усё гіне. Нікому твае высілкі не спатрэбяцца». А мне карцела. Я захапіўся ад усеагульнага шаленства. Яно мне дапамагала ўбачыць цікавыя асаблівасьці. Магчымасьці і ўмовы былі найцудоўныя! Я аж калаціўся, калі бачыў, якія вынікі атрымліваюцца... І вось — усяму капец. Шкада. Прапаў такі багаты практычны матэрыял!

МАРТА: Дык вы ж выратаваліся, дый веды пры вас...

ТАНЯ: (*абыякава разглядваючы судзьдзё-посуд*) Навошта гэта? Што зь імі рабіць?

НАДЗЕЯ: (*ля стала*) Ня трэба й шукаць, усё побач.

ПІЛІП: Я памятаю толькі асноўныя паказчыкі. А дэталі?.. Для ўзнаўленьня неабходная спэцыяльная апаратура, тэсты, дапаможнікі. Тут нічога такога няма. Адно што я магу цяпер — тэарэтызаваць. У паветра.

ЦІМОХ: У Космас. Яго скрыжалі захоўваюць усё.

ПІЛІП: (*зьдзіўлена*) Цікавая заўвага.

На лесьвіцы зьяўляецца ЮРКА, крыху ўзбуджаны і вясёлы.

ЮРКА: Там, як і тут, толькі бязь літараў і ўспрыманьне іншае. Атульле шыкоўнае: можна добра адпачыць і пазабаўляцца. Тут — празаічна, а там — сьвяточна. Ступаеш — і адразу пекна. Адчагосьці адразу забірае сьмех і радасьць. Жаданьні ўзьнікаюць… Дзіўна!

ЗАХАР дагэтуль усхвалявана мітусіўся, падыходзіў да дзьвярэй, вокнаў, лесьвіцы, кратаў іх, як бы правяраючы на трываласьць, пазіраў на іншых, але ні з кім не размаўляў. Калі выбег ЮРКА, ён апантана праглядваў кнігі. Твар быў сур'ёзны, заклапочаны. Уважліва выслухаўшы ЮРКУ, ЗАХАР узяў адну з кніг і пайшоў наверх.

МАЦЬВЕЙ: (*да ЮРКІ*) І чаму ты там не застаўся?

ЮРКА: Я не дурны.

МАЦЬВЕЙ: А хіба толькі дурням весела?

ЮРКА: Анягож. Калі раптам, бяз дай прычыны робіцца ўцешна — значыць, цябе апрацоўваюць і нешта адымаюць. Энэргетычная вычарпка ўсьляпую! Я — студэнт і ўжо

наўчомны. (*Махае рукой у бок МАЦЬВЕЯ*) Ат, што вам казаць: усё адно не зразумееце.

ПІЛІП: (*з інтарэсам*) Ты слушна разважаеш, але наіўна.

ЮРКА: (*абыякава*) Я чуў пра вашыя вышуканьні: насамрэч нічога карыснага. Марная, безужытная справа.

МАРТА: (*зьдзекліва*) Экспэрт!

ЮРКА: (*не зважае, а затым, падумаўшы і ўспыхнуўшы, да ПІЛІПА*) Хм, зараз усё можна. А калі я буду вучыцца ў вас, слухаць і запамінаць вашыя ідэі? Як у Сакрата. Толькі дзякуючы вучням захавалася ягонае мудрае слова.

ПІЛІП: Не сьмяшы. Па-першае, я не Сакрат, а ты, мяркую, не Платон. Па-другое, каму гэта патрэбна? Якая вось тут можа быць будучыня і нашчадкі? Спадзяюся, вы не зьбіраецеся пладзіцца.

ЮРКА: Ха-ха-ха! А чаму б і не? Так, дзяўчаты? Катастрофа здарылася, але ж нашую прыроду ніхто не зьнішчаў.

МАРТА: Супакойся. Абыдземся без бугаёў.

ЮРКА: Рэзкі паварот!

НАДЗЕЯ: (*з ТАНЯЙ разглядвае карціны на сьцяне*) А гэта ўжо цікава: каларытная пара.

ТАНЯ: І мне абрыс падабаецца. Сама тое.

МАЦЬВЕЙ: Не хвалюйцеся. Ён жартуе. Малады, гарачы, мазгі разбэрсаныя.

ЮРКА: У мяне ўсё ў парадку, а некаторым раю сходзіць наверх.

НАДЗЕЯ: (*задуменна, адыходзячы ад экспазіцыі*) Столькі мець — і адразу ўсё страціць!..

МАЦЬВЕЙ: У вас было вялікае багацьце?

НАДЗЕЯ: (*скаланулася*) Вельмі.

ТАНЯ: (*таксама павярнулася*) Ня вымераць!

МАЦЬВЕЙ: Якое?

НАДЗЕЯ: Каханьне.

ТАНЯ: Жарсьць.

ЦІМОХ: Стаміліся. Затое прыдбалі. Адпачніце.

НАДЗЕЯ: (*абыякава паглядзела на ЦІМОХА і, засяроджаная, пайшла па сцэне*) Мы з каханым не жадалі паміраць і вырашылі трапіць у вежу. Кінулі ўсё і пасяліліся каля яе. Умовы былі дрэнныя: бруд, цесната, шмат людзей, і кожны мкнуўся бліжэй да ўваходу… Многія дзеля гэтага йшлі на падман, подласьць, гублялі сумленьне. Нам крыху пашанцавала, і мы занялі месца паблізу вежы. Вельмі баяліся прапусьціць час. Але патрэбы — такі няўрымсьлівыя! — вельмі даймалі і ўрэшце даканалі. Любы пайшоў па харчаваньне, пацалаваў мяне, доўга трымаў у абдымках... Я чамусьці ўсхвалявалася і параіла затрымацца. Ён мовіў: «Трэба, Надзейка!» — і пайшоў. Нешта нядобрае стукалася ў душу. Калі дзьверы расчыніліся, яго яшчэ не было. Я стала шукаць вачыма і заўважыла, як ён здалёк прабіраецца да мяне, усіх расьпіхвае, нешта крычыць. Але ўсё было дарэмна: мяне ўкінулі сюды, а ён не пасьпеў.

МАРТА кінула прагляд мастацкай кампазыцыі і заслухалася. ТАНЯ спачатку скептычна, нават грэбліва ўспрымала шчырасьць НАДЗЕІ, але паступова яе захапіла цікаўнасьць і зьдзіўленьне.

МАРТА: Чаму такія драмы выпадаюць толькі на долю жанчыны? Што атрымлівае ад гэтага сьвет?

ТАНЯ: Неверагодна! Як у кіно! Я і ня думала, што такое яшчэ можа быць. Мне шкада цябе, дзяўчынка. Ня трэба так кахаць. Навошта цалкам аддавацца мужчынам? Ім дастаткова аднаго нашага цела.

АЛЁНА: Што за брыдоту вы несяце? Як вам ня сорамна? Трэба шанаваць такія пачуцьці. Яны ня кожнаму даюцца.

ТАНЯ: Яны ёсьць ува ўсіх. Толькі вось карыстаюцца імі пароснаму.

АЛЁНА: Нешта новае.

ТАНЯ: Ніколечкі. Адна справа — стаць рабою каханьня да аднаго чалавека, іншая — разьліць пачуцьці на ўсіх.

АЛЁНА: (*падазрона*) І якая даспадобы вам?

ТАНЯ: Апошняя. (*Пасьля паўзы*) Што вылупілі зекры! Дайшло-такі! Так, у мяне сама старажытная прафэсія, і мне яна падабаецца.

НАДЗЕЯ: (*больш сама сабе*) Вось і выказалася! Ці зацікавіла?

ЮРКА: І чым жа?

НАДЗЕЯ: Шчырасьцю.

ТАНЯ: Свабодаю творчасьці.

ЮРКА: Глыбінна! (*З намёкам*) Усялякая творчасьць мае абавязковы плён.

ТАНЯ: Я вельмі добра ведаю такіх, як ты, хлопчык. Перада мною вы агаляеце ня толькі целы, але і душы. Колькі там чорт натаптаў грахоў? Не пералічыць. Але я за іх не ўшчуваю і не караю, як сварлівыя ўласьніцы, а даю асалоду. То бок павялічваю радасьць на зямлі! Ушалопіў, куранятка?

ЮРКА: (*іранічна*) Ага. Прастытуцыя — вышэйшы альтруізм. Я так і ўяўляю: вялізны ложак, ты, побач чалавецтва — і ўсе радасныя ды шчасьлівыя.

МАЦЬВЕЙ: Сучаснай моладзі палец у рот не кладзі!

ПІЛІП: Мы неяк іначай знаёміліся: культурна, паважліва.

ТАНЯ: Я ніколі не азіраюся на мужчынскую балбатню, якая горш за каросту.

МАРТА: Вядома ж, усе хваробы ад мужчынаў.

ЮРКА: Мабыць, вы добра «захварэлі», што змаглі трапіць сюды?

МАРТА: Хам!

ТАНЯ: Ня ўкусіш, сысунок! Зубкі яшчэ не прабіліся... Але ж і нудотна. На вуліцы было весялей.

АЛЁНА: Жахліва было.

ТАНЯ: Гэта вам няёмка ад бруду, а мне звыкла. Я цешылася, што вашая быццам бы непахісная мараль так хутка адкінулася і ўсе сталі быдлам. Калі гора бярэ за глотку, галоўнымі робяцца інстынкты.

АЛЁНА: Вам яны спрыяюць?

ТАНЯ: Заўсёды, бо чалавек — сама неразумная жывёліна. Улашчыць яго — што плюнуць. Я хутка апынулася перад дзьвярамі. З адным, другім, трэцім... перамовілася... Ля ўваходу на ўсіх рыкаў спартовец. Здаровы, нахабны. І што: некалькі словаў, позіркаў, рухаў — і ён мой. Мы зь ім добра ладзілі. Нагледзелася паскудзтва — не перакажаш... А сюды я ўвайшла лёгка, бязь цяжкасьцяў... Заўважаю: майго спартоўца тут няма. Значыць, ня трапіў. Шкада. Ласкавы ён быў. Добра ведаў людзей.

НАДЗЕЯ: (*сумна разважае*) Атрымліваецца, ні знацьцё, ні пачуцьці не спрыяюць. Па нейкаму ж парадку мы трапілі сюды!

ПІЛІП: Хіба па парадку?

ЦІМОХ: Чарга разладзіцца: першы стане апошнім, апошні — першым...

МАЦЬВЕЙ: Асабліва калі за кусок сварацца ды б'юцца.

ТАНЯ: А я заўсёды буду зь першым. Ха-ха-ха! Твар мне твой знаёмы. Дзе я цябе бачыла? А-а! Ты нейкі сваяк спартоўцу. Амаль заўсёды моўчкі сядзеў на прыступках. Ён цябе вельмі шкадаваў і засьцерагаў. Здаецца, дасюль ты быў у псыхушцы?

ЦІМОХ: Мы ўсе з аднаго дому, толькі з розных пакояў.

ТАНЯ: Так і ёсьць. Не крыўдуй на мяне. Ты шчыры і мне нават падабаесься. Хто ты?

ЦІМОХ: Брат.

ТАНЯ: Спартоўца?

ЦІМОХ: Усіх.

ТАНЯ: Цікавы ты і, мабыць, адзінокі, як і я.

ЦІМОХ: Маё імя — Цімох.

ТАНЯ: А маё — Таня.

ЦІМОХ: Ты прыгожая, і ўсё табе да твару.

ТАНЯ: Так. Густ у мяне выдатны.

ЮРКА: (*двухсэнсоўна*) Гэта правільна. Твой стыль унівэрсальны — задаволіць усіх.

ПІЛІП: Нікога ня крыўдзі!

ТАНЯ: Дзікун.

МАРТА: Хлопча, чаму ты зьневажаеш нас, жанчынаў?

ЮРКА: Гэта вам так здаецца. Я вас люблю, паважаю і бачу толькі прыгажунямі.

АЛЁНА: (*скрушна*) Зараз, у такіх умовах, гэта зусім ня важна. Мы тут усе… аднолькавыя.

ПІЛІП: Не. Прыродай запавечана быць рознымі: мужчынамі і жанчынамі. Нашая біялёгія не залежыць ад акружэні.

МАЦЬВЕЙ: Патуляліся б вы па сьвеце, як я, — стрэлі б усялякую і біялёгію, і батаніку, і геамэтрыю — і ўсе падручнікі жыцьця. Паваротлівыя глузды трэба мець — і ніколі не засмуцяць ні рознасьці, ні падабенствы. Чалавекі мы!

ТАНЯ: (*гучна*) У мяне спытайце!

НАДЗЕЯ: (*ціха зьдзіўляецца*) Пра што яны гавораць!

АЛЁНА: Што каму бліжэй.

ЮРКА: (*забаўляецца*) А як жа дух, мараль, пачуцьці…

ПІЛІП: Гэта — заўжды другараднае, вынікі аб'ектыўнага разьвіцьця віду. Галоўнае: чалавек — матэрыяльнае стварэньне. Нават згубіўшы розум і эмоцыі, мы працягваем жыць фізычна і, такім чынам, застаемся людзьмі. Так што...

ЮРКА: ...Юрка.

ПІЛІП: Так што, Юрка, натурай і цынізмам можна перакрыць усе нормы — усё адно ты застаесься чалавекам.

ЮРКА: Слаўна! Надзвычай зручная канцэпцыя, якраз дарэчы. Дзякуй. Аж лягчэй стала.

МАРТА: Як хутка мужчыны разумеюць адзін аднаго, калі тлумачаць і шукаюць апраўданьні!

ЮРКА: Якія мы далікатныя!

МАЦЬВЕЙ: Змоўкні, чмут!

ПІЛІП: Я коратка паведаміў пра навуковую тэорыю, якую распрацоўваў доўгі час. Нічога амаральнага ў ёй няма.

МАРТА: А выглядае не зусім прыстойна.

ПІЛІП: Вы памыляецеся. Навука заўсёды правільная і праўдная.

МАРТА: Можа і так. Нэрвовы зман. Выбачайце! Апошнім часам я сама не свая.

ТАНЯ: Мы тут усе — ніякія. Без жаданьня, імпэту.

НАДЗЕЯ: Душы на ростанях.

МАЦЬВЕЙ: Вызначаемся, мяркуем. Нешта ж у галаве кожны мае.

ЦІМОХ: Бяз думак ніхто не жыве.

НАДЗЕЯ: Мы яшчэ не ўяўляем, як жыць, страціўшы... чалавецтва.

ЮРКА: Весялей! Шчыльней! Толькі ўдумайцеся: хіба раней мы маглі ведаць кожнага чалавека на плянэце, а цяпер — калі ласка!

МАЦЬВЕЙ: Правільна. Менш людзей — больш дастанецца.

МАРТА: Усіх можна вызнаць даастатку. І на новы капыл!

АЛЁНА: Толькі разам, бяз крыўды, па праўдзе.

ПІЛІП: Ніякае навізны! Мы не пачынаем, а працягваем. Ад нуля ідуць яны. (*Ён паказаў на вокны, а затым стаў пазіраць уверх, навокал*) Нейкія чалавечыя якасьці патрабуюць

завяршэньня — і мы, па лёгіцы тутэйшае прысутнасьці, абавязаныя тое паказаць.

ЮРКА: (*узбуджана*) А якія?

ПІЛІП: (*пасьля паўзы*) Пакуль ня ведаю. Паглядзім.

МАРТА: Тады і казаць ня трэба. І ніякіх абавязкаў тут у нас няма.

ТАНЯ: Ох, інтуіцыя падказвае, што будзе сумна.

ЦІМОХ: Што было, тое і будзе...

НАДЗЕЯ: (*задуменна*) Прасторы тут мала, ісьці няма куды. Пастка.

ЦІМОХ: Зямля — вежа Космасу, пастка.

Над галовамі паплылі словы: «ЧАС АДКРЫЦЬЦЯЎ». Усе прыкмецілі іх, але без ранейшае цікаўнасьці. ПІЛІП на чымсьці засяродзіўся.

НАДЗЕЯ: Хто аб гэтым думае. (*Скаланулася, заўважыўшы, з кім размаўляе; стала глядзець на ЦІМОХА.*)

ЦІМОХ: Высока мысьляваць — ісьці да Вечнасьці.

НАДЗЕЯ: Тут, здаецца, можна дайсьці да чаго заўгодна.

ТАНЯ: (*двухсэнсоўна*) Некаторыя ўжо адправіліся.

АЛЁНА: Трэба хоць што-небудзь рабіць.

ПІЛІП: Будзем рухацца разам. І кіраваць сітуацыяй. Разважліва, памяркоўна, у згодзе, калі ніхто не ўмяшаецца. (*Красамоўна паглядзеў угору.*)

Усе таксама задралі галовы, павялі вачмі і, апусьціўшы іх, утаропіліся ў ПІЛІПА. Таго ахапіла задумлёнасьць.

ПІЛІП: Мы ня ведаем гэтай гульні і сваіх роляў. Што б ні выбраў кожны — сысьці са сцэны мы ня можам. Так што будзьма граць! Напэўна, у апошні раз!

МАРТА: Неспасьціжны кон: бачных персанажаў — адзінкі, няўгледных — процьма! Галоўныя, другарадныя — не зразумееш. Ці адной мэты яны?

МАЦЬВЕЙ: Ат! З патасам ці безь яго — усё адно прыйдзецца жыць і слухацца. Інакш ня дадзена.

Вяртаецца ЗАХАР. Ён усхваляваны. Накіроўваецца да лядоўні і дастае адтуль бутэльку напою. П'е з ахвотаю, прыглядаючыся да прысутных і прыслухоўваючыся да іх размовы.

ЮРКА: А наш маўкун малайчына: намацаў жыцьцёва важную артэрыю. Нядрэнна было б падсілкавацца (*таксама адкрывае лядоўню*). Што тут ёсьць? О-о! Харчу колькі і на любы густ! Як гэта мы раней не заўважылі? Дзякуй невядомаму дабрадзею, што так паклапаціўся пра нас.

У паветры ўзьнікае надпіс «БЯРЫ І АДДАВАЙ». ЗАХАР абыякава ўскінуў вочы. ЮРКА таксама, уголас прачытаў.

ЮРКА: Як гэта разумець?

ЗАХАР: За ўсё трэба плаціць.

ЮРКА: Каму і чым?

ЗАХАР: Невядома.

МАРТА: А ён наогул не ўяўляе, куды трапіў.

ЮРКА: Ня трэба. Гэта я ведаю добра. Я столькі зрабіў, каб апынуцца ў вежы, — ня тое што некаторыя. Хто з-за дурасьці, хто выпадкова, шкадуеце, слёзы льяце — значыць, займаеце чужое месца, спадары. Вам ня сорамна сваімі паводзінамі ганьбіць вежу — гэтую сьвятыню, дзеля якой загінула столькі людзей? Яны хацелі жыць, спазнаваць. Але лёс распарадзіўся інакш. Я выстаяў і дамогся свайго.

МАРТА: Чым жа?

ЮРКА: Сваім моцным духам. Таму прашу не перашкаджаць мне дыхаць на поўныя грудзі.

МАРТА: Для чаго?

ЮРКА: (*нечакана нават для сябе*) Каб выяўляць свой сьвет.

МАРТА: (*пасьля кароткае паўзы*) Неверагодна, і які ж ён у цябе?

ЮРКА: Вялікі і годны. Усім на зайдрасьць.

ТАНЯ: (*ацэньваючы*) У нашых шэрагах месца ты знайшоў бы.

НАДЗЕЯ: (*задуменна*) Ці спатрэбіцца гэта для каго?

МАРТА: І чым яго будзеш запаўняць?

ЮРКА: Я багаты на ідэі. Яшчэ пабачыце.

МАРТА: Задавака. Практыкі ў цябе мала.

ЮРКА: Нам усім не стае досьведу, інакш не сядзелі б тут: камусьці спатрэбілася дабаўка.

МАРТА: Гэта правільна: асабіста мне не хапіла часу, каб выканаць свае пляны. Таму ў вежу прыйшла таксама не абы-як, а мэтанакіравана. Цяжкасьцяў стрэла шмат, ня менш за цябе. Дзякуй Богу, усё недарэмна і я тут.

ЮРКА: А вам што трэба?

МАРТА: «Сьвет недасканалы, і чалавек таму доказ» — вядомы многім выраз. Гэта — мужчынская праўда. Жаночая гучыць інакш і ня вельмі папулярна: сьвет недасканалы, таму што ім кіруюць мужчыны. Калі мы зразумеем, што ўсё лепшае ад жанчыны, што посьпех жыцьця ў яе разьняволеньні, тады Зямля стане раем. Гэта я сцьвярджаю заўсёды і сюды прабілася, каб захаваць і рэалізаваць гэтую ідэю.

ТАНЯ: Мне падабаецца такі падыход.

ЮРКА: Ты ж згубіш свой занятак пры матрыярхаце.

ТАНЯ: Затое атрымаю ўладу. А маёю... справай будзеш займацца ты. Ха-ха-ха!

МАЦЬВЕЙ: (*жартоўна*) Бедны наш брат!

АЛЁНА: Няўжо так важна, у чым цараваць — у штанах ці ў спадніцы? Галоўнае, каб з галавою і з сэрцам.

ПІЛІП: На Зямлі такога ніколі не было.

НАДЗЕЯ: А мне думаецца, што сьветам кіруе толькі любоў.

МАРТА: Ідэалізм. Любоў і каханьне — прывілея жанчынаў. Бадай, усё гожае — ад нас і насуперак мужчынскаму прагматызму.

ЮРКА: Знаёмая хвароба: калі дзеляць — прысвойваюць лепшае.

МАЦЬВЕЙ: Колькі ж цяжару мы захапілі з сабою! А кажам: пустыя.

ЦІМОХ: Мы ўсе з аднаго матэрыялу.

Над сцэнай закалыхаўся выраз «АКРАМЯ БОГА НЯМА НІКОГА». Марта з захапленьнем стала глядзець уверх.

ЦІМОХ: Жанчына і мужчына доўга плацілі за грэх, але мала.

ПІЛІП: Марта, вы перабольшваеце і ня верыце ў гармонію прыроды.

МАРТА: Як казалі некалі ўсходнія мудрацы: калі б я ўладарыла над гэтым злым небам, я б замяніла яго іншым.

ЮРКА: Таму вы і не на небе.

ЦІМОХ: Зло не ад неба, а ад зямлі.

ЗАХАР: Дзівакі!

ПІЛІП: А чаму вы з намі не размаўляеце? Грэбуеце?

ЗАХАР: Зусім не. Прабачце, калі што ня так. Крыўдзіць я нікога не жадаю. Дасюль не магу прыняць гэтую містыку.

ПІЛІП: Гонар не дазваляе?

ЗАХАР: Уяўленьні. Шмат блытаніны! Вось, кнігі. Зірніце сюды!

АЛЁНА, ТАНЯ, МАРТА, ПІЛІП, ЮРКА падыходзяць да кніжнай шафы. Астатнія паглядаюць здалёк.

ЗАХАР: Колькі кнігаў?

ЮРКА: Восем.

ЗАХАР: У мяне адна. Дзевяць. А нас колькі?

ЮРКА: Таксама дзевяць.

ТАНЯ: Ну і што?

ЗАХАР: На кожнага па кнізе. Далей. Толькі ў маёй ёсьць тэкст, у астатніх — няма. І ведаеце, які ў яе зьмест?

ПІЛІП: Які?

ЗАХАР: Маё жыцьцё ў падрабязнасьцях.

ПІЛІП: Неверагодна! Можна зірнуць?

ЗАХАР: Толькі на хвілінку!

ПІЛІП узяў кнігу ЗАХАРА. Хутка пагартаўшы бачыны, зьдзіўлена ўтаропіўся ў яго. Тым часам ЮРКА, а затым і МАРТА пачалі праглядваць астатнія асобнікі.

ПІЛІП: Тут жа пустыя старонкі!

АЛЁНА: (*кінула позірк у кнігу ЗАХАРА*) Сапраўды!

ТАНЯ: (*як і АЛЁНА*) Так!

ЗАХАР: Ды вы што! Вось жа выразна надрукавана! Дзе я быў, што рабіў, з кім страчаўся! Амаль на тысячы старонках!

ЮРКА: (*узрадавана*) А-а! Тут ёсьць яшчэ адна напісаная! (гартае) Ого! Пра мяне! Здранцьвець можна!

МАРТА: І мне трапілася з тэкстам! Няўжо мая біяграфія?

АЛЁНА, ТАНЯ, ПІЛІП усхвалявана замітусіліся і таксама ўзяліся за кнігі. Гэта зацікавіла МАЦЬВЕЯ, НАДЗЕЮ, ЦІМОХА, і яны далучыліся да іх. ЗАХАР разгублена сачыў за ўсімі. Урэшце кнігі разабралі, апошняя дасталася ЦІМОХУ. Кожны стаў чытаць, раз-пораз пазіраючы на суседзяў.

У паветры склаліся словы «ЖЫЦЬЦЁ — ІЛЮЗІЯ».

ПІЛІП: Усё зразумела. (*Трасе кніжкаю*) Выдатны прыклад матэрыялізацыі сумленьня! Асабістае жыцьцё на далоні! Пры гэтым тэкст бачны толькі герою, іншым — ні-ні! Гуманны прынцып тайны! Проста ня верыцца!

ЮРКА: Мая гісторыя абрываецца падзеямі перад вежаю.

МАРТА: І мая. Быццам далей ужо і не жыцьцё.

Астатнія пацьвердзілі тое ж самае.

МАЦЬВЕЙ: Вось вам і доказ, што мы абраныя. Кнігі акурат пра кожнага з нас. Нехта загадзя ведаў, хто трапіць у гэтую вежу.

ПІЛІП: Тут нейкія асаблівыя правілы. Нам невядомыя.

ЮРКА: Гэта надзвычай цікава!

АЛЁНА: Напісаны такія падрабязнасьці, што мне не па сабе.

ЦІМОХ: Успаміны — катаваньне душы.

НАДЗЕЯ: А мне соладка. Столькі старонак пра маё каханьне і пра любага! Больш, чым пра што іншае.

МАРТА: Адно мінулае. Ні слоўца пра будучае. Сумна.

ТАНЯ: А мне гадка. Навошта лішні напамін пра тых, з кім я была? К чорту іх!

ЮРКА: Камусьці не падабаецца сваё жыцьцё? А я задаволены. Такія дэталі — дух захоплівае! Гэта трэба прачуць! Пайду наверх: узбуджуся мінулым — хай сілкуюцца, крывасмокі! (*Ідзе па лесьвіцы.*)

ПІЛІП: (*глядзіць усьлед, ківаючы галавой*) Ну і пракуда!

ЗАХАР: Я думаў над гэтаю дакладнай справаздачай жыцьця. Падобна на вельмі ўдалы жарт. У іншае я паверыць проста не магу. Так не бывае.

МАЦЬВЕЙ: А я ведаю, хто вы, Захар. Мэр. Напярэдадні выступалі ля вежы, заклікалі ўсіх разысьціся. Палымяна гаварылі — гэта мяне і спыніла. (*З усьмешкаю*) Так што я тут дзякуючы вам.

ЗАХАР: Так, я імкнуўся пераканаць людзей у бязглуздзіцы таго, што яны чакалі ад вежаў. Нашае жыцьцё ня любіць цудаў. Яны ня ўпісваюцца ў яго лёгіку. А тут знайшліся прайдзісьветы і паабяцалі ўсім выратаваньне. Дарэчы, хто яны? Іх бачыў хто-небудзь?

ПІЛІП: Не, у нашым краі яны не зьяўляліся. Да нас толькі чуткі даходзілі, як яны дзейнічалі ў іншых мясьцінах.

ЗАХАР: Вось-вось, у сваёй айчыне прарокаў няма — галеча. Усё адбываецца недзе і з кімсьці — і з такімі падыходамі які кіраўнік паверыць містыфікатарам і шарлятанам?

МАРТА: Гэтыя людзі не падманвалі, а першымі ў сьвеце паказалі рэальнае месца, дзе можна выратавацца.

МАЦЬВЕЙ: Даверлівыя мы, усё прымаем.

НАДЗЕЯ: Яны далі людзям надзею.

ТАНЯ: Я калі пачула пра вежы, дык адразу сюды захацела. Гэта так цікава і незвычайна.

НАДЗЕЯ: А я, як і многія, спадзявалася на цуд, бо прагла жыць і кахаць.

МАРТА: Я ўзрадавалася, бо глыбока адчула, што сьмерці няма, хоць вы (*да ЗАХАРА*) увесь час пераконвалі нас у адваротным.

ЗАХАР: Ну і што ўрэшце атрымалі?

НАДЗЕЯ: Цуд!

МАРТА: Жыцьцё.

ЗАХАР: Сьмерць. Толькі іншую.

ЦІМОХ: Кожнаму сваё.

НАДЗЕЯ: Проста для людзей, што засталіся там, не хапіла часу паверыць.

ЗАХАР: Яны былі маладушнымі. Слабымі і глумнымі. Толькі ідыёт мог разьлічваць, што ў такой вось маленькай вежы менавіта яму падрыхтаванае месца.

МАЦЬВЕЙ: Кожны спадзяваўся на ўдачу.

ЗАХАР: І паводзіў сябе, як жывёліна.

МАРТА: А мне здаецца, аўтары ідэі хацелі вежамі неяк ускалыхнуць і пераўтварыць сьвядомасьць людзей, зьмяніць іхняе жыцьцё.

ПІЛІП: (*з усьмешкай*) Ага, паказаць выварат і жахнуць перад чарговым канцом сьвету.

АЛЁНА: Часам бываюць моманты, калі ты зусім ня ведаеш сябе.

ПІЛІП: Большасьць так і жыве.

НАДЗЕЯ: Шмат тайны.

ТАНЯ: Не ўскладняйце — і без таго галава тлумная.

ЗАХАР: Сьвет суровы і халодны, а ў жыцьця няма літасьці — аб гэтым трэба помніць і часьцей аглядацца.

МАЦЬВЕЙ: Вы, я бачу, абышлі ўсіх: думалі адно, казалі другое, рабілі трэцяе — і апынуліся тут, быццам бы выпадкова.

ТАНЯ: Сапраўдны дзяржаўны чалавек.

ЗАХАР: Анёлаў сярод нас няма. Тое, што з намі адбываецца, пакуль не паддаецца ніякаму тлумачэньню.

АЛЁНА: Усё залежыць ад Бога. А хто ведае Ягоную Задуму?

НАДЗЕЯ: Мы павінны адчуваць яе.

ЦІМОХ: Што не зразумелі і не пачулі, тое гіне.

Сталі лятаць словы «АХВЯР ЯК ЗОР, ШТО ПАТУХЛІ». НАДЗЕЯ пасаблівому пранікласа іх сэнсам.

НАДЗЕЯ: (*з горыччу*) Калі не заўважаеш сьвятла, яно для цябе зьнікае. Колькі ж промняў мы зьнішчылі ў сабе! Кожны чалавек — хранічны забойца.

ЦІМОХ: Ты — сонечная дзяўчынка. Каля цябе сьветла.

ТАНЯ: Усе разумнеюць на вачох. Няўжо мы прыйшлі сюды толькі дзеля гэтага?

НАДЗЕЯ: Вой, нешта павяло… Любы мой, чаму цябе няма побач? Ты б дапамог мне. Разам нам было б лягчэй... здурнець... Не, добра, што ты ня трапіў сюды. Імгненьне, няхай балючае, — і ты недзе там, бліжэй да Бога. А я цягнуся…

АЛЁНА: Надзейка, супакойся. Нельга так бедаваць.

ТАНЯ: Ненармальная. Вось да чаго даводзіць каханьне! Трэба прыглядаць за ёю.

МАРТА: Нядобрыя сімптомы.

ЗАХАР: Мэлянхолія і ўсялякія летуценьні нас губяць. Аддавацца ім — значыць гараваць. Мы павінны жыць рэальнасьцю, а ня лезьці ў зааблочныя высі. Там нічога ня знойдзем.

МАЦЬВЕЙ: І што вы за людзі такія, начальнікі: усё, што па-за вашаю ўладай, быццам бы ўжо й не існуе? Вам так хочацца, каб усе былі падначаленымі і думалі толькі па вашай указцы. На першы погляд — вы пры справе, а прыгледзісься — нараст, пустазельле, тормаз. Прыбяры — толькі на карысьць усіх.

ЗАХАР: Іншымі кіруе глупства — ад такога начальніка нікуды ня дзенесься.

ПІЛІП: Чаму гэта вас так прарвала, Мацьвей? Нехта зь іх перайшоў вам дарогу?

МАЦЬВЕЙ: Яны ня ходзяць, а езьдзяць, дый мае жыццёвыя калдобіны не для іх. Проста абрыдла ўся гэтая гульня ў пустое: званьні, тытулы, пасады... Напрыдумвалі дрэні... Самагубства дый толькі. І ні ў кога не хапае рашучасьці спыніцца! Жывёльны сьвет неяк жа абыходзіцца бяз гэтага?

Па лесьвіцы ў прыўзнятым настроі скача ЮРКА, размахваючы кнігаю. Усе заўважаюць, прыглядваюцца.

МАЦЬВЕЙ: Наш герой нагадвае дуроніка. Там узапраўды нешта адбываецца.

ЮРКА: Ну і вежа! Якія сюрпрызы! Але я абдурыў! Калі і надалей будзе гэтак настраёва, жыцьцё стане малінаю. А кнігу — на месца. Летапіс працягваецца! Я крочу ў будучыню! (*Да ўсіх*) Вас гэта не датычыць! Вы дужа сур'ёзныя! Такія важныя праблемы вырашаеце! Вунь ужо і да жывёлаў дабраліся.

ЗАХАР: Языком часаць — мы ўсе мастакі.

АЛЁНА: А што яшчэ рабіць?

ЦІМОХ: Нават адна душа можа распачаць новы сьвет.

ЗАХАР: Задаволенае і тлустае гультайства — рухавік філязофіі.

МАЦЬВЕЙ: (*пра Захара*) Сама заняты чалавек. Ён і маўчаў доўга, таму што быў пры справе: вырашаў, што рабіць са штанамі, у якія наклаў. Ха-ха-ха!

ЗАХАР наблізіўся да МАЦЬВЕЯ, каб ударыць таго. ПІЛІП пераняў яго, адвёў убок.

ПІЛІП: Пасаромеліся б.

ЗАХАР: Брыдоціна!

МАЦЬВЕЙ: Нарэшце наш мэр загаварыў нармальна, без выкрунтасаў, часьцей бы здараўся канец сьвету — глядзіш, і ўся праўда выявілася б.

ЗАХАР: У некаторых наогул няма чаму паказвацца: галеча ды пустэча.

МАЦЬВЕЙ: Вось-вось: далей — ясьней. Хутка, Захар, і тваё нутро высьвеціцца.

МАРТА: Як ачмурэлі! Вам усім трэба здаць аналізы, каб даведацца, у каго яно лепшае.

ЮРКА: Як тут у нас стала цікава!

НАДЗЕЯ: (*сумна*) Так, пакрысе спадае хлусьня.

АЛЁНА: Толькі б гэта скончылася дабром!

ЮРКА: Арыгінальна: усе будзем голенькімі! (*да Тані*) А гэта так узбуджае!

ТАНЯ: Прэч, маньяк, ліха на цябе! Лячыцца трэба.

ЮРКА: На жаль, урачоў сярод нас няма, таму мы павінны лячыць адно аднаго. Інакш згінем.

ТАНЯ: Дык ня гвалтам жа!

НАДЗЕЯ: Мы ўжо даўно прапашчыя. Але не ўсьведамляем гэтага.

ЮРКА: Глупства! Я адчуваю сябе на ўздыме і ўпэўнены, што ўсё ладна.

МАЦЬВЕЙ: І то праўда! Кожны чалавек жыве з задачаю. Калі шанцуе — значыць, вядзе лёс і рыхтуе да нейкае ролі. Да якой — невядома. Я, напрыклад, так і ня ведаю, чаму цягаюся па сьвеце без прытулку і дагляду?

АЛЁНА: Столькі цудоўных людзей зьнікла! Чаго чакаць ад мяне, звычайнай хатняй гаспадыні?

МАРТА: У жанчыне больш і надзейней захоўваецца тайна Сусьвету. А раптам у табе, Алёна, ёсьць нешта такое, чаго няма альбо недастаткова ў іншых?

ЦІМОХ: Дабрыня.

АЛЁНА: Ой, не сьмяшыце! Я слабая, хворая, і тут (*кладзе руку на грудзі*), акрамя пакутаў, нічога няма.

ЗАХАР: Адыёзьней сітуацыі не бывае: усе трапілі ў вежу абы-як, але чамусьці пачалі зазнавацца і лічыць сябе выбранымі.

ЮРКА: А ты, Танька, чаго сьцішылася? Табе варта пазыцыянаваць сябе лепш за іншых.

ТАНЯ: Толькі ня перад табой.

ЮРКА: Глядзі не памыліся, каб потым не шкадаваць. Нездарма я тут: ад мяне пойдзе незвычайны чалавечы род.

НАДЗЕЯ: (*мроіць*) Якія б былі добрыя дзеткі!

МАРТА: Ага, такі ж гнюсьлівы, як і сам.

ТАНЯ: У цябе ж няма сродкаў.

ЮРКА: Кінь свае старыя звычкі. Мы тут усе з пустымі рукамі.

ТАНЯ: А хіба дзяцей робяць рукамі?

Усе засьмяяліся. Юрка крыху разгубіўся. ЗАХАР стаў пазіраць на ТАНЮ зь цікавасьцю.

МАЦЬВЕЙ: Навучы яго, дзеўка, а то ня будзе незвычайнага чалавечага роду.

ЮРКА: Знаёмыя матывы. Паважаю прафэсіяналаў, але ня скнараў, а шчодрых, бескарысьлівых і (*двухсэнсоўна націскаючы*) са-ма-ад-да-ных.

ТАНЯ: Сабе нічога не застанецца, калі раздаваць дарма.

ЮРКА: Дзеля будучага чалавецтва можна пайсьці і на ахвяры.

ТАНЯ: Яшчэ чаго! Мяне хвалюе толькі мая будучыня. Надакучыла ўсё. Пазабаўляцца б хвілінку-другую.

ТАНЯ ўзьнімаецца па лесьвіцы, за ёю парываецца ЮРКА. Нечакана яго перапыняе ЗАХАР.

ЗАХАР: Чакай, хлапец, астынь (*па прыступках імчыць за ТАНЯЮ*).

ЮРКА асалапеў. Усе зьдзіўлена пераглядаюцца.

ЮРКА: Начальства згубіла сорам — і гэтым, як заўсёды, дае нам прыклад.

МАЦЬВЕЙ: Ня дзіва: яно, як і ты, ужо двойчы туды ўзьлятае.

ПІЛІП: Кожны інтуітыўна ведае, на што здатны. Бальшынёю мы па мінімуму скарыстоўваем сябе і задаволеныя гэтым — адсюль і праблемы. Напоўніцу жыць спачатку ня хочацца, а потым ужо і ня можацца — за многія тысячагодзьдзі гэта адклалася на генэтычным узроўні ўсяго людзтва.

МАЦЬВЕЙ: Што нам да чалавецтва? Няма ўжо яго, прапала. Туды яму і дарога. Што яно мне дало? Адчужэньне. Жабрацтва. Немач.

ПІЛІП: Мы нясем яго ўнутры. Кожны з нас — мікраадлюстраваньне чалавецтва.

МАЦЬВЕЙ: Глупства. Калі я хацеў есьці, яно ікала ад сытасьці — дзе ж тут гэтае адлюстраваньне?

ЮРКА: (*насьцярожана абводзіць усіх позіркам*) І адзін можа быць усімі?

ПІЛІП: Ён ёсьць усе.

ЮРКА: (*з палёгкай*) Значыць, мільярды — лішнія, дастаткова адзінкі.

Над сцэнай замітусіліся літары і склалі выраз «УСЕ — АДНАМУ!» ЮРКА стаў сур'ёзным і рашучым.

АЛЁНА: Як гэта зразумець?

ЮРКА: А так: ёсьць нехта, каму суджана ўвабраць усю чалавечую энэргію і быць адзіным здатным прадстаўніком плянэты ў Косьме.

АЛЁНА: А астатнія?

ЮРКА: Яны — усяго толькі рабочы матэрыял, зь якога створаная яго сутнасьць...

АЛЁНА: Ня можа быць! Што іх чакае?

ЮРКА: Які лёс у адкідаў, думаю, тлумачыць ня трэба!

МАЦЬВЕЙ: Што ты пляцеш?

ПІЛІП: Во напрыдумваў! Фантазёр.

МАРТА: Здурнеў хлопец.

ЦІМОХ: Бяз подзьвігу — не герой.

ЮРКА: Мяне вядзе Вышэйшая Праўда. Я чую Яе Голас. Тое, што мне адкрываецца, вам не пад сілу.

АЛЁНА: Глядзіце: ён на вачох марнее, твар, рухі, голас — усё мяняецца.

ЮРКА: Трэба жыць унутраным сьветам, а не надворным.

ПІЛІП: Юрка, у цябе нічога не баліць?

ЮРКА: Мне хораша! Ніколі так не было. Вось ён, сэнс майго жыцьця: я — адзіны!

МАРТА: Я заклікаю паставіць яго на месца!

ЮРКА: (*паднімае рукі*) Яно — там!

АЛЁНА: Не чапайце яго, ён захварэў.

ЮРКА: Наадварот: я вылечыўся і бачу вас, як сваё пітво. Сілкуйце мяне, выслабаняйцеся даастатку!

МАРТА: Вось суччын сын!

АЛЁНА: Ня злуйцеся, лепш пашкадуйце яго.

НАДЗЕЯ: Юрку забірае вежа.

МАРТА: А калі ён пачне дзейнічаць?

ЮРКА: Зьнішчаць вас я не зьбіраюся, вы самі хутка адкінецеся. Але спачатку аддасьце мне сваю энэргію, якая ёсьць праўда пра вас. Я і бяз вас уздымуся ў Вышыні. Проста з вашай — ха-ха-ха! — дапамогаю гэта будзе хутчэй. Дык хто будзе першым?

МАЦЬВЕЙ: (*хітравата*) Юрка, не сьпяшайся.

ПІЛІП: (*падыгрывае*) Калі ты адзіны — часу ў цябе хопіць, заўсёды пасьпееш набраць неабходную форму.

ЮРКА: Не тлуміце галавы. Мой розум павінен быць чыстым, без вашых шкодных парадаў.

ПІЛІП: Табе ніхто не жадае зла. Ты стаміўся, адпачні.

АЛЁНА кінулася да лядоўні, знайшла там лекі і асьцярожна падышла да ЮРКІ, рукой махнула НАДЗЕІ. Абедзьве клапатліва ўзялі яго пад рукі, падвялі да канапы.

ЮРКА: Вы хочаце мяне атруціць. Прэч! Касьмічны плян вам не зьмяніць!

ЮРКА самастойна кладзецца на канапу, заціхае.

ЦІМОХ: Вар'яцее розум, а пакутуе душа.
АЛЁНА: Што зь ім здарылася?
ПІЛІП: Перанапружаньне.
АЛЁНА: Дык малады ж яшчэ, псыхіка трывалая.
МАЦЬВЕЙ: Не забывайма пра гарышча. Там ён быў першым.
ПІЛІП: Так, трэба памазгаваць.
МАРТА: Ніякае містыкі! Проста ён нахабны і робіць паскудзтва. Калі й надалей мы будзем дазваляць, усё можа скончыцца вельмі дрэнна. Падумаць толькі: палічыў сябе галоўным!
МАЦЬВЕЙ: (*няўпэўнена*) Ніякай бачнай нагоды не было.
АЛЁНА: Ага, усё адбылося неяк раптоўна... Дзіўна!
ПІЛІП: Прычыны ёсьць, у тым ліку і схаваныя, у нутры. А там — цемра.
АЛЁНА: Так дадзена, і ня трэба корпацца.

Усхваляванае маўчаньне.

НАДЗЕЯ: А мне дапамагае любы. Ён у такім асяродзьдзі, адкуль усё бачыцца лепш. Я лаўлю яго флюіды, ня ведаю як, — і ўсё разумею. Надараюцца імгненьні, калі яго пяшчота так абдымае, што зьнікае рэальнасьць, і я нібыта лунаю. Ён заў-

сёды побач, але чамусьці да сябе ня кліча... Кожны нясе ў сабе абсалютную змогу. Мабыць, і Юрка знайшоў да яе свой шлях?

МАРТА: На якім хоча разабрацца з намі.

МАЦЬВЕЙ: Ня варта глыбока капаць і шукаць, усё неабходнае само цябе знойдзе. Дазваляе Бог — жыві, спажывай што ёсьць і ня лезь на ражон.

АЛЁНА: Ён нешта мармыча. (*Падыходзіць да канапы*) Сьпіць. Які шчасьлівы твар! Мабыць, сьніць прыемнае. Небарака, ён яшчэ дзіцё, застаўся без бацькоўскае ласкі і лічыць, што ўсе яго крыўдзяць, таму і кідаецца на ўсіх, бароніцца.

ЦІМОХ: Нашага брата прыбывае, вось і страх цісьнецца да нас, але пакуль сонны.

ПІЛІП: Юрка зрабіўся агрэсіўным і яго не пераканаеш.

МАРТА: У такім стане ён здольны на горшае.

МАЦЬВЕЙ: Не па Сеньку шапка.

МАРТА: Падкрэсьліваю: кожны можа стаць аб'ектам ягонага шаленства.

ПІЛІП: Так, ягоная манія небясьпечная. Колькі такіх было ў гісторыі!

МАЦЬВЕЙ: Танька завязала вузел: адштурхнула хлопца. Хай бы ён трохі пакуёўдзіўся зь ёю, можа, дурноту і прагнала б.

МАРТА: (*узрушана*) Ізноў жанчына вінаватая! Мужчынская разбэшчанасьць грахом не ўважаецца?! З-за яе сьвет перакуліўся, а яны ўсё адно сваё!.. Якім жа дрынам вас вучыць?

ПІЛІП: Цяперашнія праблемы маюць канкрэтнага носьбіта — Юрку. Вось ён зараз прачнецца...

МАЦЬВЕЙ: А калі сапраўды застанецца нехта адзін? Юрка гэта будзе ці хто іншы...

Раптоўна ўсе насьцярожыліся, сталі маўкліва абменьвацца позіркамі. Праз нейкі момант маўчаньне зрабілася няёмкім.

АЛЁНА: (*спрабуе разьвесьці сітуацыю*) Адначасна палюбому ўсе мы не памрэм. Па чарзе адыдзем. Хтосьці і будзе апошнім. Звычайная зьява. Чаго хваляваацца? Давайце лепш пачастунак наладзім. Упэўнена: есьці хочацца ўсім. Так? Марта, Надзея, дапамагайце!

Жанчыны сталі завіхацца і накрываць стол. Але прыпасаў у лядоўні ня меншала: як толькі дзьверы зачыняліся, прадукты нейкім чынам аднаўляліся да першапачатковай колькасьці. Усіх гэта надзвычай уразіла.

АЛЁНА: Дзівосы! Няўжо так будзе бясконца? Проста ня верыцца!

МАРТА: Як у казцы!

МАЦЬВЕЙ: Але і казка калісьці заканчваецца.

ПІЛІП: Усё для таго, каб мы матэрыяльна не пакутавалі.

ЦІМОХ: (*патасна*) І ўсю энэргію скіравалі на духоўныя патрэбы!

МАРТА: А як яны тут выявяцца?

НАДЗЕЯ: Шляхам міжасабовых дачыненьняў.

МАЦЬВЕЙ: Не кудахтайце! Калі ня будзем клапаціцца пра фізычнае цела — загнемся, і ніякая духоўнасьць ня выратуе.

МАЦЬВЕЙ задаволена напаўняе шклянкі. Усе акружылі стол.

МАЦЬВЕЙ: За таго невядомага, хто гэтак дбае пра нас. Шчыры яму дзякуй!

ПІЛІП: Ён жадае, каб мы жылі.

МАЦЬВЕЙ: Каб смачна харчаваліся. (*Нахіляецца над стравамі*) Такой багатай дармавінкай…

НАДЗЕЯ: Каб цуд адбыўся таксама і тут (*паказвае на сэрца*).

МАРТА: Мы прызвычаімся, і ўсё будзе як і заўсёды.

АЛЁНА: Мяне ўсё гэта непакоіць. Проста так нічога не бывае. Ад нас нечага чакаюць.

ЦІМОХ: Нешта адбываецца за стагодзьдзе — звыкла, за імгненьне — дзіўна. Час розны, а не аднолькавы.

МАЦЬВЕЙ: Вохці-вох! Вы згаладаліся больш галавой, чым трыбухом. Ежце, а то здарыцца няладнае і ўсё гэтае зьнікне.

ПІЛІП: Непажадана, інакш сапраўды будзем змушаныя разважаць толькі страўнікам.

Ха-ха-ха!

МАРТА: (*са сьмехам*) А мужчыны думаюць бытта нечым іншым.

МАЦЬВЕЙ: Гэта вы зрабілі нас такімі.

МАРТА: Няўжо?

АЛЁНА: І настолькі вы ручныя?

МАЦЬВЕЙ: А як жа! Рахманыя, як авечкі.

ПІЛІП: Разумныя.

МАРТА: Як вы сябе любіце!

ПІЛІП: І жарсна кахаем вас!

МАРТА: Каханьне — меч жанчыны. Толькі яна здольная трымаць яго.

МАЦЬВЕЙ: Адна? Без мужчыны?

ПІЛІП: Неверагодна! Дык вы як на ратным полі!

МАРТА: Так, мы змагаемся за чысьціню стасункаў і мячом-каханьнем адсякаем усялякі бруд.

МАЦЬВЕЙ: Нізкі вам паклон, жанкі, за такую барацьбу. Браткі, будзьма пільнымі, а то застанемся без галоў.

ПІЛІП: Калі б яны ў нас былі! Мы згубілі іх тады, калі Адам паспытаў яблык ад Евы.

МАРТА: Дурноту ўчыніла Ева. Ня трэ было частаваць гэтага недарэку. Хавала б у сабе тайну і па-свойму кіравала б сьветам.

ЦІМОХ: Вінаватыя і пакутнікі засьцілі б сьвятло больш, чым цяпер.

МАЦЬВЕЙ: Марта, куды цябе нясе?

АЛЁНА: Насамрэч, ты вельмі захапілася. Так недалёка і да сваркі.

НАДЗЕЯ: (*узьнёсла*) Закаханыя — людзі асаблівага кшталту. У іх свае правілы.

МАЦЬВЕЙ: Вось гэта і шкодзіць.

НАДЗЕЯ: У каханкаў душа зьзяе радасьцю. Усё магчыма. Цела такое лёгкае, што бажаецца імчаць за аблокі, да зораў. Вышэй і вышэй!.. У іншы Сусьвет! Зямля здаецца маленькай, цеснай і не такой ужо роднай, бо цалкам забірае Космас... Вось толькі каб любы быў побач... А людзей шкада, бо мала хто зьведаў такое пачуцьцё. Замест яго прысутнічае цяжар, які ціcне да Зямлі, робіць кожны рух цела і думкі складаным, пакутным. Жыцьцё змрочнае. Што ўжо казаць пра спакой і згоду? Людзі злуюцца адно на аднаго і нават не задумваюцца, што вінаватыя тыя, хто жыве на Зямлі і не кахае.

ПІЛІП: Якія гарачыя абмеркаваньні і высновы! На іншай вучонай радзе такога не пачуеш. Адкуль гэткія здольнасьці?

АЛЁНА: І то праўда. Можам быць акадэмікамі.

МАЦЬВЕЙ: Мабыць, умовы спрыяюць. Вастрэй бачым праблемы.

МАРТА: Ад адчаю чаканьня.

АЛЁНА: Чаго?

МАРТА: Таго, чаго ня можам пакуль выразіць.

ЦІМОХ: Шукаем, блукаем, крычым, каб ЯНА (*рукамі маніпулюе ў паветры*) пачула кожнага і не пераблытала.

ПІЛІП: Памылкі ня будзе: мы сьвецімся ад індывідуальнасьці.

МАЦЬВЕЙ: Больш за ўсё — ад балбатні.

ПІЛІП: І гэта патрэбна. Дойдзе чарга і да астатняга.

НАДЗЕЯ: То бок вызвалімся ад усяго назапашанага.

ЦІМОХ: Ачысьцімся!

АЛЁНА: Ох, нагаманілі хоцькі-няхоцькі! Каб толькі добра ўсё было! Цімошка, ты разумны, больш чуйны, чым усе, адкажы: калі ачышчэньне пачалося ад слова, якім яно будзе далей?

МАЦЬВЕЙ: (*сьмяецца*) А так, як пасьля клізмы.

ПІЛІП: (*ушчувае*) Мацьвей!

ЦІМОХ: Слова было ў пачатку, будзе і ў канцы.

АЛЁНА: А пасярэдзіне што?

МАЦЬВЕЙ: Мацюкі!

ПІЛІП па-сяброўску дае МАЦЬВЕЮ лёгкага кухталя.

АЛЁНА: Мацьвей, нельга так. Я сур'ёзна.

МАЦЬВЕЙ: А тут што жартоўна, што сур'ёзна — сэнс адзін: першае слова было лаянкавае. Паглядзіце на чалавека: хіба такая пачвара нарадзілася ад прыстойнага?

ЦІМОХ: Галава баліць...

У паветры закружыліся словы — «АСЬЦЯРОЖНА: СЛОВЫ ШЧЭМЯЦЬ ДУХ!».

АЛЁНА: Цімошка, ідзі я цябе пашкадую. Вось бачыце: нешта няладнае творым. Распусьцілі языкі.

НАДЗЕЯ: І думкі.

МАРТА: Сеем жуду.

АЛЁНА: Трэба быць больш стрыманымі.

ПІЛІП: Чым далей, тым цяжэй гэта даецца.

МАЦЬВЕЙ: (*з чаркаю ў руцэ*) Няўжо ў нас не засталося нічога радаснага? Хто распачне прыемнае?

АЛЁНА: (*сьпявае*)

Месяц разгуляўся,
Зоркі распаліліся,
У чаканьні шчасьця
Сэрцы расчыніліся.
Хто сядзіць у хаце,
Скрухаю прыкуты?
За акном агнішчы
Песьняю разьдзьмуты
І дзяўчаты, хлопцы
Весялосьцю зьзяюць,
У купальскім віры
Жарсьці разьліваюць.

Песню падхопліваюць МАРТА і НАДЗЕЯ. Атмасфэра стала цяплейшай, усе расслабіліся, павесялелі. Па лесьвіцы спускаюцца ТАНЯ і ЗАХАР.

ТАНЯ: О, тут у іх таксама хораша! Як на сьвяце. А які стол!

ЗАХАР: Бяз нас яны хутка сьпеліся.

ТАНЯ: (*прытворна*) Мы ім гэтага не даруем.

ЗАХАР: (*абдымае і цалуе ТАНЮ*) Ніколі!

ТАНЯ і ЗАХАР накінуліся на ежу. Сваім зьяўленьнем яны некалькі астудзілі агульны прыўзьняты настрой, вярнулі напружанасьць.

ТАНЯ: Адкуль усё гэта ўзялося?

МАЦЬВЕЙ: Бог паслаў.

ЗАХАР: Заўваж, Танюша: і акурат у той час, калі нас не было.

ТАНЯ: Чаму так? Мне гэта не падабаецца. Захар, я жадаю, каб усё прыемнае было сьпярша для мяне...

ЗАХАР: Не хвалюйся. Твае жаданьні як загад царыцы. Імі будзе высланая нашая агульная дарога.

МАЦЬВЕЙ: На якой ты застанесься ня толькі без штаноў, але і без галавы.

ЗАХАР: Не гаўкай, ярыга, а то заткну тваю сьмярдзючую глотку!

ПІЛІП: І гэтага прыбрала лесьвіца.

АЛЁНА: Ці ж можна так гнявіць Усявышняга? Пабойцеся!

ТАНЯ: Захар, віно скончылася.

ЗАХАР: Дзе вы яго бераце?

ПІЛІП: Адчыні лядоўню.

ЗАХАР: Сапраўды, а я заблытаўся. Вось дзівак!

МАЦЬВЕЙ: Выходзіць, розум наш мэр ужо згубіў. Ну, Танька, ну і малайчына!

ЗАХАР падбягае да МАЦЬВЕЯ і б'е яго. Той дае здачы. Пачынаецца бойка. Жанчыны хвалююцца, крычаць. ПІЛІП і ЦІМОХ разьнімаюць задзірак. Пад гэты шум прачынаецца ЮРКА.

ЮРКА: (*спрасонку трэ вочы і занепакоена ўглядаецца*) Яны, мабыць, нешта дзеляць. А-а! Уладу! Пакуль я дрыхнуў, у мяне яе перахапілі.

ЦІМОХ: Агрэсіўнасьць — маска слабасьці.

ЗАХАР: А ты, ідыёт, наогул сьціхні. Інакш я цябе падлячу.

АЛЁНА: Божа мой! Становімся зьвяр'ём!

НАДЗЕЯ: А калі мы ім не былі?

ЗАХАР: Майце на ўвазе: калі хтосьці скажа нешта паганае пра Таццяну альбо мяне, будзе вельмі дорага плаціць.

ПІЛІП: Захар, чаму ты лічыш, што мы абавязкова будзем вас абгаворваць?

ЗАХАР: Я адчуваю.

МАЦЬВЕЙ: Ён нячысты, з-за таго і злуе, кідаецца на ўсіх, баіцца, што мы яго раскусім.

МАРТА: Кіраўнік павінен быць вышэй за звычайнае атачэньне.

ТАНЯ: Правільна! Захар, ня слухай іх, яны нам зайздросьцяць. Лепш паўтары тое, што ты мне казаў наверсе.

ЗАХАР: Я кахаю цябе, Таня!

МАРТА: Ня можа быць!

АЛЁНА: Які цуд!

МАЦЬВЕЙ: Сьпявайма згубу!

ЗАХАР: Такой жанчыны ў мяне яшчэ не было. Цяпер я разумею, чаму сюды трапіў. Тацянка, там (паказвае на цёмныя вокны) у цябе і ў мяне не хапіла часу для сустрэчы, таму лёс стварыў гэтую вежу, каб усё-такі зьвесьці нас і распаліць агонь нашага каханьня. Гэта нашая з табой хата і больш ні-чы-я.

АЛЁНА: (*разгублена*) А мы?

ТАНЯ: Вы? Госьці. Няпрошаныя. Ха-ха-ха!

ЗАХАР: І стасункі павінны быць адпаведнымі.

МАЦЬВЕЙ: Зноў я бяздомны!

ПІЛІП: Гэта ўжо занадта.

МАРТА: Празьмернае нахабства!

АЛЁНА: Па-мойму, ад каханьня людзі робяцца дабрэй і сумленьней, а ў вас неяк усё наадварот.

ТАНЯ: Ох, і моташна з вамі!

ЗАХАР: Вы нас вельмі раздражняеце.

ЮРКА: Цётка Алёна, у іх усё наадварот таму, што яны водзяць нас вакол пальца. Якія яны закаханыя? Паглядзіце на іх! Сучка і сабака. Зьнюхаліся і вырашылі нас пазбавіцца.

ЗАХАР: Ах, ты падла!..

Падбягае да ЮРКІ і замахваецца, каб ударыць, але той адхінаецца, б'е ЗАХАРА пад дых і спрытна заламвае яму руку. ТАНЯ імкнецца бараніць ЗАХАРА. ПІЛІП і МАЦЬВЕЙ таксама падключаюцца да разборкі.

ЮРКА: За дзьверы яго, гада!

ЗАХАР: Таня!..

ЗАХАРА кідаюць у чорны праём дзьвярэй. Раздаецца гром. ТАНЯ гаротна ахнула і зьнерухомела. На сцэне гнятлівая цішыня.

ТАНЯ: Забойцы!

ЮРКА: Не захапляйся, путана! Трагічнасьць табе не да твару.

ТАНЯ: (*разьюшаная падыходзіць да ЮРКІ і замахваецца, каб ударыць*) Падонак! Чаму ты ня здох у дзяцінстве?

ЮРКА: (*сунімае яе*) Без эмоцыяў, зязюлька! А то паляціш за сваім каханкам.

ПІЛІП: Юрка, спыніся!

Жанчыны падыходзяць да ТАНІ, супакойваюць, спачуваюць, шкадуюць.

ТАНЯ: (*усхліпвае*) Як мне быць? Куды пайсьці? Да каго прытуліцца?

АЛЁНА: Што мы ўчынілі?

ЮРКА: Расправіліся зь нягоднікам.

АЛЁНА: У нас няма такога права.

ЮРКА: Раней не было, а цяпер ёсьць.

НАДЗЕЯ: А хіба законы залежаць ад колькасьці людзей?

МАРТА: (*зьедліва*) Яны залежаць ад маралі гэтай колькасьці.

НАДЗЕЯ: Боскія Законы ні ад чаго не залежаць.

ЮРКА: Наіўныя! Мы ў экстрэмальнай сітуацыі, якая ёсьць вызваленьне ад людзкіх парадкаў! Чым вузей чалавечая прастора, тым менш патрэбы ў якіх-небудзь правілах. Ня-

ма людзей — няма і законаў. І для аднаго яны губляюць усялякае значэньне.

АЛЁНА: Нас жа пакуль болей.

НАДЗЕЯ: Вар'яты! Забойства разбэсьціла ваш розум!

ЦІМОХ: А душы сьціснула.

ТАНЯ: Страшней за ўсё — сьвядомы зьвер.

МАЦЬВЕЙ: Шчыра кажучы, мы трохі пагарачыліся. Трэба было неяк інакш, мякчэй. Але ж ён сапраўды ўсім нам пагражаў.

ПІЛІП: Вось-вось, а права абароны — сьвяшчэннае ў прыродзе.

НАДЗЕЯ: Жыцьцё належыць толькі таму, хто яго дае, — Богу. Астатнім распараджацца ім — грэх.

ПІЛІП: (*задумліва*) Гісторыя сьведчыць аб адваротным. Чалавек заўсёды лічыўся толькі з сабою і скарыстоўваў іншых па свайму разуменьню, часам парушаючы законы. З Захарам мы павялі сябе менавіта так.

НАДЗЕЯ: Гэта значыць, па-злачынску.

ПІЛІП: Па абставінах. Невядома, як бы разьвівалася сітуацыя, калі б ён застаўся тут і працягваў нас даймаць. Можа, хто іншы быў бы першым.

МАРТА: Што? Вы ўжо думаеце пра чаргу? І хто наступны?

ПІЛІП замаўчаў, засяродзіўся на сваіх думках і, быццам нешта зразумеўшы, стаў пазіраць ніякавата. Астатнія разгубіліся. Сьвятла на сцэне паменела, як знак разрастаньня нэгатыўнае энэргіі.

ЦІМОХ: Галоўнае — пачаць.

МАРТА: Выдатна! Мужчыны прагрэсіруюць у шчырасьці! Ліхадзейства можа быць прадоўжанае.

АЛЁНА: Які жах!

МАЦЬВЕЙ: Піліп, не пужай нас. Ад сваёй навукі ты ўжо зглузьдзіў. Мы тут усе з розумам і нічога дрэннага рабіць не зьбіраемся.

ТАНЯ: (*зьдзекліва*) Як у выпадку з Захарам.

ЮРКА: (*ходзіць і разважае*) Падыход цікавы. Слушны. Тут насамрэч мала месца. Задаволіць усіхнія патрэбы складана. Патрэбны талент.

НАДЗЕЯ: Цяпер гэта гучыць так?

ТАНЯ: Сынонімаў у забойства шмат.

ЦІМОХ: Таленту духу не выяўляем.

НАДЗЕЯ: Значыць, нас няма. Прывіды.

МАЦЬВЕЙ: А ты, Юрка, бачу, кемлівы і настойлівы.

ЮРКА: Ага, мне хочацца зрабіць усё.

АЛЁНА: (*палахліва зіркнула на ЮРКУ і перажагналася*) Хіба ж такое па сілах?

ЮРКА: Толькі мне!

МАЦЬВЕЙ: Хлопца зноў панесла.

МАРТА: (*іранічна*) Мы вельмі заклапочаныя тваім здароўем, супэрмэн. Глядзі не надарвіся.

ЮРКА: Ведаю, чым вы турбуецеся: расправай.

МАЦЬВЕЙ: Што ты вярзеш?

ЮРКА: Агучваю вашыя думкі.

ПІЛІП: Шмат на сябе бярэш.

ЮРКА: Я дужы, вытрываю.

ПІЛІП: Вайны ня будзе!

ЮРКА: Ха-ха-ха! Яна ўжо ідзе!

ТАНЯ: Гэты мярзотнік праўду кажа. Вы што, не заўважаеце? Ён даўно пазначыў тэрыторыю і зьнішчае нас.

ЮРКА: Не прыкідвайцеся, злыдні! Нібыта я адзін такі! Кожны толькі і марыць, каб зьесьці бліжняга.

АЛЁНА: Жудасьць!

МАРТА: Небясьпека ня йдзе, а бяжыць.

ЮРКА: Так і павінна быць! Досыць хлусіць і балбатаць пра гуманізм! Пара прызнацца самому сабе: я ненавіджу і жадаю, каб нікога не было! Усё адно ўсім ня выжыць. Лепей высакародна і добраахвотна сысьці дзеля адзінага.

ПІЛІП: Вось ты і пакажы прыклад.

ЮРКА: Я... апошні, ці бо вечны.

МАРТА: Мы ненармальныя, што трываем яго.

МАЦЬВЕЙ: Ну ты і камбінатар, Юрка! Хто ж табе дазволіць?

ЮРКА: Вы! У мяне вытрымкі хопіць, а ў вас — не.

ЦІМОХ: Будзе дрэнна.

ЮРКА: Правільна, Цімох! А яны не кумекаюць, думаюць, што ў рай трапілі.

АЛЁНА: Людцы родненькія! Чаму ж мы грыземся? Хіба ж нам месца мала? Вунь яго колькі! Ежы дастаткова: такую чароўную лядоўню маем! Усе цікавыя, разумныя — ёсьць пра што пагаварыць. Давайце жыць талакою і ў міры. Бог дапаможа.

НАДЗЕЯ: Усё дарэмна, Алёна. Людзі даўно ня чуюць. Колькі выратавальных словаў гучала! Якімі тольма прыкметамі і падказкамі ні напаўняўся сьвет! І што? Як елі адно аднаго, так і ядзім.

ТАНЯ: А я пра што казала?

АЛЁНА: Дык нас жа цяпер зусім мала, усе знаёмыя — лягчэй дамовіцца.

ЮРКА: Чым вас меней, тым адзінаму лепш.

НАДЗЕЯ: Эгаізм — ні родны, ні блізкі, хоць і жыве з намі. Ён разбурае любыя гурты і наогул жыцьцё.

МАЦЬВЕЙ: (*насьмешліва*) Чуеш, Юрка? З-за цябе мы ня злучымся ў калектыў.

ЮРКА: Вось нягоднікі! Усё абгрунтуюць і знойдуць крайняга! Вельмі добра, што вы гэтак перакручваеце сэнс, —

лепш бачыцца вашае фальшывае нутро. Значыць, я не памыляюся наконт вас.

АЛЁНА: Нешта мяне муціць. Мабыць, ня тое зьела.

МАРТА: Тут такая атрута — лепей ісьці наверх. Там, кажуць, іншая атмасфэра.

АЛЁНА: Сапраўды. Цімошка, хадзем з намі, весялей будзе.

АЛЁНА, МАРТА, ЦІМОХ падымаюцца па лесьвіцы. ЮРКА, МАЦЬВЕЙ і ПІЛІП глядзяць ім усьлед, у залу. ЮРКА разгублены. НАДЗЕЯ і ТАНЯ засяроджаныя на нечым сваім.

МАЦЬВЕЙ: І гэтыя адурманяцца.

ПІЛІП: Настрой атрымаюць. Ад радасьці нічога не баліць, усё ідзе як шчасьце.

ЮРКА: Ніхто не сьпяшаецца. Дзіўна!

ПІЛІП: Ува ўсяго свой час.

МАЦЬВЕЙ: Дый ня ўсё яшчэ вядома.

ЮРКА: І ніколі ня будзе, калі сядзець і не варушыць мазгамі. Вы разьлічваеце, што і тут нехта будзе вырашаць усе праблемы за вас? Ох і экзэмпляры! Ну і адбор! Адна прафанацыя! А яшчэ носам круцяць, калі я бяруся кіраваць.

МАЦЬВЕЙ: Які няўрымслівы! Быццам чэрці яго падштурхоўваюць!

ПІЛІП: Паверце, ён — знаходка для дасьледчыка. Там (*махае рукой убок*) я займаўся яшчэ і тэсталёгіяй, па арыгінальнай методыцы вызначаў людзей на дабро і зло. Я вынайшаў сістэму, якая расшыфроўвае кожнага чалавека, паказвае яго як на далоні і выдае рэкамэндацыі, што рабіць яму альбо зь ім. Калегі прарочылі вынаходніцтву вялікую будучыню. Цікавыя вынікі былі б пасля тэставаньня Юркі!

МАЦЬВЕЙ: А-а, зь ім і так усё ясна! А вось з астатнімі не зусім. Твая сістэма магла б распавесьці шмат чаго пра кожнага, так?

ПІЛІП: Безумоўна! Няўжо, Мацьвей, ты б згадзіўся, каб цябе вывернулі?

МАЦЬВЕЙ: Не! Навуцы я не давяраю. Усё ў ёй прыблізна. Яна адлучыла чалавека ад прыроды.

ПІЛІП: Ты проста баісься праўды.

НАДЗЕЯ: Праўда палохае ўсіх, таму што разбурае жыцьцё, якое ёсьць хлусьня.

ТАНЯ: Нікому ня трэба таго, што вядзе да згубы.

ПІЛІП: Праўда — рэдкая сіла, якая і ратуе, і зьнішчае.

МАЦЬВЕЙ: А калі так, то лепш яе і ня ведаць.

НАДЗЕЯ: (*з усьмешкай*) ...І ня жыць.

ЮРКА: (*доўга глядзіць на яе*) Шкада мне цябе, Надзейка. Усё бядуеш. Блытаесься ў пачуцьцях. Нельга. Ты маладая, прывабная. Адно каханьне сыходзіць, другое прыходзіць.

МАЦЬВЕЙ: А кавалер усё пляце павуціньне.

НАДЗЕЯ: Маё каханьне — адно. Вечнае. Табе гэтага не зразумець.

ЮРКА: Чаму ж? Я дасьціпны, здольны. Дзяўчатаў люблю. Ты толькі падкажы, пашлі намёк.

ТАНЯ: Пашлі яго на тры літары.

ЮРКА: Не зважай на гэтую нявыхаваную ляльку. Яна сьвет бачыць толькі цераз прарэх мужчынскіх штаноў.

ТАНЯ: Дагаўкаесься, вылюдак!

НАДЗЕЯ: Цябе хтосьці дужа пакрыўдзіў. Інакш як растлумачыць, што чалавек твайго веку такі злы?

ЮРКА: А я зьбіраю злосьць. Ведаеш, колькі ўсяго параскідана на зямных прасторах? Любоў, павага, абыякавасьць, непрыязнасьць, нянавісьць... Гарачыя пачуцьці нарасхват, а халодныя — залежваюцца. А ім жа таксама існаваць! Інакш

раўнавагі ў сьвеце ня будзе. Вось я і клапачуся аб іх, набываю, пешчу. Хочаш, падзялюся з табой?..

МАЦЬВЕЙ: Добраахвотны пакутнік, Хрыстос! Узваліў на сябе ўсе нашыя грахі.

НАДЗЕЯ: Няшчасны!

ТАНЯ: Пачвара!

ЮРКА: ...А мо абмяняемся? Дай крышачку цеплыні, ласкі.

НАДЗЕЯ: Адыдзі, назола! Для цябе ў мяне нічога няма. Сэрца з каханым.

ЮРКА: Не мані. Тады што ты тут робіш? Цела сваё ратуеш? Для каго? Яно ў цябе прыгожае, любое мужчынскае вока запалоніць. Каханку твайму яно ўжо непатрэбнае, але па любошчах сумуе, гарыць... (*Набліжаецца да НАДЗЕІ, імкнецца абняць яе.*)

НАДЗЕЯ: (*адбягае ад ЮРКІ*) Адчапіся, чорт лазаты! Надакучыў ты мне!

ЮРКА: Эх, Надзейка! Сьветлым промнікам ты была ў гэтай журбе. Не разьлічваў я на такую крыўду ад цябе. Дзякуй! Цяпер мяне нічога ня стрымлівае.

МАЦЬВЕЙ: Нешта ўжо надумаў.

ПІЛІП: Юрка, не дурэй!

НАДЗЕЯ: (*быццам абудзілася*) Я табе, Юрка, таксама ўдзячная. Ты скалануў мяне... Сапраўды, чаго я тут бадзяюся, чаго чакаю? Новых грахоў? Тлену? Хутчэй адсюль... Маё ўсё там...

НАДЗЕЯ стала хадзіць ля вокнаў, дзьвярэй, аглядаць усё навокал, самую сябе. Усе ўважліва і занепакоена назіраюць за ёю.

ТАНЯ: Надзя, што ты робіш?

НАДЗЕЯ: Зьбіраюся ў дарогу. Колькі пры мне лішняга! Такі цяжар! І ніяк ня скінуць!

ТАНЯ: Табе дапамагчы?

НАДЗЕЯ: Не, я сама. Ледзь не згубіла сябе! Дзякуй Богу, своечасова апамяталася. Як хораша, калі ты жывая! Нават пасьвятлела ўсё.

ПІЛІП: (*падыходзіць да яе*). Вось і добра. Малайчына! Звычайна мы губляемся ў дробязях, не заўважаем галоўнага. Знайсьці сябе, адчуць душу — надзвычай складана.

МАЦЬВЕЙ: Навошта? Каб больш гараваць?..

ТАНЯ: (*рэзка, але ціха перапыняе яго*) Мацьвей! Асьцярожней! Не пашкодзь!

НАДЗЕЯ: Ад каханьня мы выйшлі, да каханьня й вяртаемся. Кожны сваёю сьцежкай. Мая — вось тут... (*Ідзе да дзьвярэй.*)

ТАНЯ: Надзя, спыніся!

Усе, акрамя ЮРКІ, кінуліся да НАДЗЕІ, спрабуюць затрымаць яе, але яна наперакор усё-такі робіць крок за парог. Аглушальны гром скоўвае ўсіх.

МАЦЬВЕЙ: Загубіла сябе дзяўчына.

ПІЛІП: Не, яе дагнала катастрофа.

ТАНЯ: Хто наступны?

ПІЛІП: (*пасьля невялікай паўзы*) У каго на тое будзе жаданьне.

МАЦЬВЕЙ: Правільна! Менавіта так!

ТАНЯ: (*двухсэнсоўна*) Толькі па асабістай ініцыятыве.

МАЦЬВЕЙ: Як з Надзеяй, хоць і горка ад гэтага.

ТАНЯ: (*уколвае*) Альбо як з Захарам.

ПІЛІП: (*катэгарычна*) Чалавек сам вырашае свой лёс. Спосабаў процьма, у тым ліку і з дапамогаю іншых.

ТАНЯ: За аднаго вінаватыя ўсе.

ПІЛІП: І адзін вінаваты за ўсіх.

МАЦЬВЕЙ: Увогуле спакусы меней тады, калі людзей мала.

ПІЛІП: Ага, у вежы грахоў паменела на два.

ТАНЯ: Ненармальныя! І на лесьвіцы не былі. Значыць, ад роду.

ЮРКА: Толькі канца яшчэ нябачна, хоць напрамак ужо вызначыўся.

МАЦЬВЕЙ: Падбухторшчык ты, Юрка. Спадзяесься балявацъ на нашых касьцях?

ЮРКА: Во загнуў! Па-іншаму ўжо і думаць ня можаш! (*Хітра*) Я хачу вас выратаваць!

ТАНЯ: Які дабрадзей!

МАЦЬВЕЙ: Нешта новае.

ЮРКА: (*разважае*) Чым карацей чалавечы век, тым менш забруджваецца душа і часьцей можна ўвасабляцца на Зямлі. Ад доўгага жыцьця якасьці грубеюць, камянеюць, узрастае нэгатыў і цяжэе ўдасканаленьне. Шалопаеце? Усе зьніклі, каб хутчэй зьмяніцца, а вы засталіся. Вас выкінула з асноўнае плыні жыцьця!

МАЦЬВЕЙ: Ну і што?

ЮРКА: Вы працягваеце бязмэтна існаваць і пакутаваць.

МАЦЬВЕЙ: Гэта нам толькі на карысьць, бо гора Богу за ласку.

ТАНЯ: І Нябёсы кінулі нас у вежу, каб мацней палюбіць? Вось дык лафа!

ЮРКА: Толькі аддаўшы жыцьці за мяне, вы набываеце сэнс — і я дазваляю гэта!

ПІЛІП: (*пад стыль агульнае забавы*) Юрка, навошта такая шляхетнасьць? Мы ня можам прыняць яе. І адмаўляемся ахвяраваць! Нас чакае неверагодная радасьць! Малавата яе было на шматпакутнай Зямлі, ад таго нам, як сама здольным на вясёлае жыцьцё, даручылі кампэнсаваць гэты недахоп і надаць плянэце прывабную райскую лёгкасьць. Высакароднай справы не знайсьці!

ЮРКА: (*сур'ёзна*) Не, даражэнькія! Вам нікуды і ні за каго нельга. Вы заразьлівыя. Такім суджана жаласнае беспрасьветнае быцьцё.

Усе заўважылі, як уверсе зь мітусьлівых літараў склаўся выраз «КОЖНАЕ СЛОВА — ПРАЎДА».

ЮРКА: Вось бачыце: ісьціна на маім баку.

МАЦЬВЕЙ: А мы што — нямыя?

Усе сьмяюцца, акрамя ЮРКІ.

ПІЛІП: Ці, можа, ты лічыш, што ісьціна размаўляе з табой адным?

ЮРКА: Дык вы ж памножаныя прыдуркі: вунь які сьмех вас душыць — і без гарышча!

ПІЛІП: (*высільваючыся разам з астатнімі*) Ха-ха-ха! Сапраўды, немагчыма спыніцца...

ЮРКА: Значыць, хутка будзеце плакаць.

ТАНЯ: Калі ты тут, ня будзем. А безь цябе зальемся сьлязамі. Ха-ха-ха!

ЮРКА: Вам пара ўжо, спадары: калонай па аднаму і... (*паказвае на дзьверы*)

ТАНЯ: А ты на чале...

Па лесьвіцы ідуць АЛЁНА, МАРТА, ЦІМОХ.

МАРТА: Навошта мы сюды вяртаемся? Там так прыемна! Нічога падобнага не сустракала. Усім падабаецца, а табе, Цімох, чамусьці стала дрэнна.

ЦІМОХ: Галава баліць...

АЛЁНА: Марта, дзівіся: тут ня горш! Так весела!

Гучыць мажорная музыка. ТАНЯ, МАЦЬВЕЙ, ПІЛІП з дурасьлівым імпэтам бегаюць, скачуць, рагочуць. Да іх ахвотна далучаюцца АЛЁНА і МАРТА. ЦІМОХ адчужана ходзіць па сцэне. ЮРКА непрыязна, нават злосна назірае за імі. Раптам яго твар дабрэе ад загадкавай усьмешкі, і ён, сьпешна перакуліўшы ў рот кілішак гарэлкі, таксама кідаецца ў ігрышча. З азартам падбягае да МАРТЫ, і яны пачынаюць энэргічна танчыць. У нейкі момант, якраз насупраць дзьвярэй, яны спатыкаюцца, падаюць, і МАРТА, не ўтрымаўшыся, вылятае вонкі. Грыміць гром. Усё сьціхае.

ТАНЯ: (*крычыць*) Марта-а! (*Падбягае да ЮРКІ і люта малоціць яго кулакамі*) Сволач! Каб ты акалеў!

ПІЛІП: Але ж і штукар ты, хлопец!

АЛЁНА: Юрачка, як жа гэта ты?

ЮРКА: Не вінаваты я! Усё адбылося выпадкова!

АЛЁНА: (*жахліва*) А дзе Надзея? (*Ёй ніхто не адказвае*)

МАЦЬВЕЙ: Брэшаш, паганец! Ты задумаў зжыць са сьвету ўсіх нас! Не атрымаецца! Мы разьбярэмся з табою! Думаю, гэта мы павінны зрабіць зараз.

ПІЛІП: Так, Юрка, крэдыт даверу вычарпаны.

ТАНЯ: Я наогул зьдзіўляюся, як вы яго выносіце?

МАЦЬВЕЙ: (*як бы жартам*) Яшчэ не выносім, але хутка будзем.

ЮРКА: Толькі паспрабуйце!

МАЦЬВЕЙ: Ты шкоднік!

ПІЛІП: Лішні!

ТАНЯ: І нікому не патрэбны!

АЛЁНА: Гэта ня нам вырашаць. Судзіць толькі Бог!

МАЦЬВЕЙ: Мы ня судзім — мы абараняемся.

МАЦЬВЕЙ, ПІЛІП, ТАНЯ рашуча накіроўваюцца да ЮРКІ. Ён абводзіць позіркам усіх на сцэне і ў зале, разумее сваю адзіноту і адступае ў бок дзьвярэй.

ЮРКА: (*пагардліва*) Рэшткі быдлячага статку! Ніводнае годнае душы! Прабач, Божа, што ня здолеў данесьці да Цябе зярнятка лепшай будучыні!

ЮРКА пакідае вежу. Раскаціста вуркоча гром.

АЛЁНА: (*плача*) Я ня вытрымаю гэтага. Мы павінны жыцьцё прадаўжаць, а не абрываць.

ПІЛІП: Між іншым, чалавек навучыўся зьнішчаць раней, чымся ствараць. І гэтая звычка з намі.

ЦІМОХ: Яна нам падабаецца.

АЛЁНА: Мы звыродзьдзе. Забойцы!

МАЦЬВЕЙ: Ты ж нікога не забіла.

АЛЁНА: На маім сумленьні... (*Задумваецца і палохаецца.*)

ТАНЯ: Чатыры чалавекі?!

АЛЁНА: Мільёны.

МАЦЬВЕЙ: Ты што?

ТАНЯ: Здурнела! Вось яна, лесьвіца!

ЦІМОХ: Прасьвятлела.

АЛЁНА: Я нічога не зрабіла, каб прадухіліць іх заўчасную сьмерць.

МАЦЬВЕЙ: А хіба ты ўсіх ведаеш?

АЛЁНА: Мы ўсе з аднае калыскі.

ПІЛІП: Але не з адным розумам. Таму кожны сцьвярджаецца, як можа.

АЛЁНА: Але не за кошт іншых... Дарэчы, дзе ж усё-такі Надзея?

ТАНЯ: (*паказвае на дзьверы*) Таксама там.

АЛЁНА: Юрка?

МАЦЬВЕЙ: Не, яна сама. Пайшла за каханым.

ЦІМОХ: Увесь час хтосьці рвецца ў думкі. Слоў не разабраць — адзін трэск і боль у галаве.

МАЦЬВЕЙ: Зусім ты, Цімох, занядужаў.

АЛЁНА: Гэта ён пасьля лесьвіцы...

ПІЛІП: Хто ведае: можа, наадварот, ачуньвае?

ТАНЯ: Якая розьніца? Аднолькава дрэнна!

АЛЁНА: (*жаласьліва*) Ага, марнее на вачох.

ТАНЯ: А мяне вам не шкада?

МАЦЬВЕЙ: Ад чаго ўжо кепска табе?

ТАНЯ: Ад таго, што стала падвываць вам.

МАЦЬВЕЙ: Але нічога не атрымліваецца? Бедненькая, таленту малавата! Так-так! Твой галасок, даражэнькая, сапраўды, слых рэжа. Ня тыя ўмовы.

ТАНЯ: За мяне ўжо ўзяўся, уладар сьметнікаў?

МАЦЬВЕЙ: Камусьці ж трэба за табою прыглядаць.

ТАНЯ: Навошта?

МАЦЬВЕЙ: Такой пекнай дзяўчыне нельга заставацца адной. Бачу: ты насур'ёз нейкая асаблівая. Вунь як шалеў ад цябе твой апошні палюбоўнік! Мабыць, таму і заслужыў свой геройскі канец!

ТАНЯ: Што ты, сьмярдзючка, ведаеш пра мяне дый наогул пра жанчын?

АЛЁНА: Нас быццам нячысьцік носіць!

ПІЛІП: Ганьба! Досыць!

ТАНЯ: Не, даслухайце! Сапраўды, у Захара быў выдатны канец. Мала каму такі даецца. Яго адносіны да мяне — незвычайныя ў маім жыцьці. Дзякуй яму! Калі ён мовіў пра каханьне, мне стала страшна. Чаго? Таго што кахаць мне нельга. Усе, каго я кахала альбо хто мне падабаўся, нейкім чынам зьнікалі, прападалі, гінулі. На жаль, ня стаў выключэньнем і Захар.

АЛЁНА: Няўжо доля такая жорсткая — каханьнем зьнішчаць людзей?.. Ой-ёй-ёй!

МАЦЬВЕЙ: Упершыню чую такое! Ты, Танюха, першаклясная прафэсіяналка! Станок! Які нельга псаваць рознымі там пачуцьцямі ды замілаваньнямі!

ТАНЯ: Жывёліна!

ПІЛІП: Мацьвей, раю спыніцца, каб не распачаць чарговую бяду. Ты стаў ядавітым.

МАЦЬВЕЙ: А мне надакучыла слухаць яе хлусьню! Калі яна курва і дрэнь — дык хай з гэтай шыльдай і дэфілюе! А то — каханьне, пакуты, сорам!.. Так і да сьвятой дабярэцца! Нас тут мала, і мы яе ведаем як аблупленую. Хопіць брахаць!

ТАНЯ: Я даўно адчула, што ты падлюга.

МАЦЬВЕЙ: А мне няма чаго перад табой хвастом круціць! Я хачу яшчэ жыць і не жадаю табе спадабацца... (*Сьмяецца.*)

Усе зьнямелі, акрамя ЦІМОХА, які нібы адлучыўся ад агульнага дзейства. ПІЛІП, АЛЁНА, ТАНЯ пачынаюць перакідвацца запытальна-трывожнымі позіркамі — і ТАНЯ ад гэтага ўсё больш нэрвуецца.

ТАНЯ: Ды вы што? Канчаткова здурнелі? Я вас не-на-ві-джу! Падабаецца? Задаволены? І мне лёгка! Гэта ж трэба: гаворыш людзям гадасьці, а яны аж вішчаць ад шчасьця!

ЦІМОХ: На нашым сьвеце ісьціна — у процілеглых значэньнях. (*Падыходзіць да кніжнай шафы, бярэ сваю кніжку, разгортвае, чытае і ў задуменьні ставіць яе на месца.*)

МАЦЬВЕЙ: Не скупая ты, Таня, шчодрая. Малайчынка!

ТАНЯ: Як вы мне абрыдлі! (*Налівае сабе віна.*)

ПІЛІП: Ужо ня доўга чакаць.

МАЦЬВЕЙ: Чаго?

ПІЛІП: Канца.

МАЦЬВЕЙ: Годзе пужаць!

ПІЛІП: Шмат прыкметаў.

МАЦЬВЕЙ: І цябе панесла: за звычайнымі чалавечымі стасункамі, што існавалі стагодзьдзямі, раптам знайшоў нейкія знакі?

ПІЛІП: (*удумліва*) Чаму ж мы іх ня бачылі?.. Стагодзьдзямі!

АЛЁНА: Нязгодьныя мы...

ПІЛІП: Таму што глядзелі толькі на сябе. Менавіта з-за гэтага ніхто і не заўважыў страшэннага прызначэньня вежаў. Ад іх трэба было бегчы як мага далей.

АЛЁНА: Чула мая душа, не хацела сюды...

МАЦЬВЕЙ: Чаму вы гэтак усхваляваліся?

ПІЛІП: Грэх паўсюдна, а тут ён проста шалее.

МАЦЬВЕЙ: Піліп, не цягні. Гавары.

ПІЛІП: Вежы — гэта сама пакутныя вузлы вялізнай зьнішчальнай сеткі, якую накінулі на Зямлю; гэта месцы асаблівых сутыкненьняў... Касьмічныя аб'екты дарогі не саступаюць.

ТАНЯ: Ха-ха-ха! (*Зьедліва*) Віншую, абраныя! А чаму ж так сьціпла: сетка. Сьмялей: краты! А мы ўсе — добраахвотнікі! Мазахісты! Во ідовішча! Адзін аднаго, па-садысцку, балюча, зьдзекліва, каб аргазм з усіх шчылінаў сьвістаў! У воргіях, у радасьці трэба канчаць... жыцьцё!..

МАЦЬВЕЙ: Заткніся, сучка! У цябе адно ў галаве. Піліп не прарок. Усё можа быць зусім па-іншаму. Такія выдатныя ўмовы ствараюцца не для сьмерці, а для жыцьця.

ПІЛІП: Чыйго?..

Нечакана ПІЛІП войкнуў, схапіўся за сэрца і павольна ўпаў. Усе кінуліся да яго, замітусіліся.

АЛЁНА: Таня, лекі!

МАЦЬВЕЙ: Ён у непрытомнасьці.
ЦІМОХ: Дыхае?
АЛЁНА: Пульсу няма.
ТАНЯ: Памёр?

Усе сьцішыліся, засумавалі.

МАЦЬВЕЙ: А чаму не было грому?
ТАНЯ: Сапраўды.
АЛЁНА: Дык ён жа яшчэ тут.
МАЦЬВЕЙ: Гэта ж усяго толькі цела.
ЦІМОХ: Душа яго пакуль з намі.
МАЦЬВЕЙ: А калі яна выйдзе?
ЦІМОХ: Калі захоча.
АЛЁНА: Яго трэба пахаваць.
ТАНЯ: Дзе?
МАЦЬВЕЙ: Я думаю, што ў вежы будзе няправільна.
ЦІМОХ: Яго неабходна вынесьці.
ТАНЯ: (*у непаразуменьні*) Узяць і вось так выкінуць за дзьверы?
МАЦЬВЕЙ: А што рабіць, халера ясная? Ён хутка пачне сьмярдзець.
ТАНЯ: Як быццам толькі ён.
МАЦЬВЕЙ: Гэта ты пра сябе?
АЛЁНА: Ды хопіць вам! Знайшлі час.
МАЦЬВЕЙ: Давайце хоць памолімся за нябожчыка.

Запальваюць зьнічкі і ладзяць штосьці накшталт хаўтураў. Усе разам бяруць цела ПІЛІПА, падносяць яго да дзьвярэй і асьцярожна высоўваюць вонкі. Але грымотаў няма. Усе зьдзіўленыя.

МАЦЬВЕЙ: Ня можа быць!
ТАНЯ: Загадкава.

ЦІМОХ: Ён у вежы!

АЛЁНА: Дзьверы прымаюць толькі жывых.

ЦІМОХ: Далей — цяжэй.

МАЦЬВЕЙ: Прыемнага мала.

У паветры зазіхацеў надпіс «НЯМА РУХУ».

МАЦЬВЕЙ: (*злосна ўверх*) Досыць распараджацца! Надакучыла! Самі разьбярэмся!

ТАНЯ: Ужо са зданямі пачынаем ваяваць.

МАЦЬВЕЙ: Я не гуляю ў хованкі і паважаю бачных герояў.

АЛЁНА: (*глядзіць на вокны, дзьверы*) А тут невідзімак нямашака. Зірніце: колькі зацікаўленых і спагадлівых твараў. Яны хочуць нам дапамагчы і клічуць да сябе. А ля дзьвярэй Піліп стаіць! Мы яго выправілі, а ён вярнуўся і нікольки на нас не сярдуе. Усьміхаецца і таксама махае рукою.

МАЦЬВЕЙ, ТАНЯ, ЦІМОХ нікога не заўважаюць.

ТАНЯ: Алёна, акрамя нас тут нікога няма.

МАЦЬВЕЙ: Вось і яна ня вытрымала, нарэшце здалася.

АЛЁНА: Вас вежа зусім даканала, і вы асьлеплі. Цімошка, ты сама відушчы, паглядзі ўважлівей: колькі людзей!

ЦІМОХ: (*незадаволена*) Я іх ня бачу.

АЛЁНА: Значыць, гэта тычыцца толькі мяне... Піліп кажа, што яго аднаго за дзьвярамі не прымаюць. Трэба, каб хтонебудзь правёў. Я пайду. Так будзе лепей.

ТАНЯ: Алёна, спыніся!

АЛЁНА зьнікае ў чорным праёме дзьвярэй. Двойчы аглушальна ляскае пярун. Нейкі час пануе маўчаньне.

МАЦЬВЕЙ: Ці зразумелі вы хоць штосьці? Чаго нічога не зьмяняецца? Столькі жыцьцяў аддадзена — і ўсё па-ранейшаму!

ТАНЯ: Ад пераменаў галава трашчыць, а ён: па-ранейшаму! Няўжо нябачна? А-а, ты, мабыць, чакаеш чагосьці іншага, для сябе?

МАЦЬВЕЙ: Безумоўна, а зрухаў у гэтым напрамку няма.

ТАНЯ: (*наўмысна загадкава*) А ты глядзі ўважлівей.

МАЦЬВЕЙ: Куды?

ТАНЯ: На мяне. Зьведаеш жанчыну — авалодаеш сьветам. (*Выконвае эратычны танец.*)

МАЦЬВЕЙ: Пайшла прэч, зараза! Ведаю я твае хітрыкі.

ТАНЯ: Страшна? А ты думаў: быць уладаром проста? Для гэтага трэба мець асаблівы дух і моц. Ты — слабак. Таму ні на што і не разьлічвай.

МАЦЬВЕЙ: Экспэрт знайшоўся! Вось зараз вазьму за шкірку — ды ў дзірку.

ТАНЯ: А за мяне Цімох заступіцца. Праўда, Цімошка?

ЦІМОХ: Канешне.

МАЦЬВЕЙ: Які зь яго абаронца? Ён жа ненармальны: дагэтуль ня цяміць, дзе знаходзіцца.

ТАНЯ: Затое ён справядлівы.

МАЦЬВЕЙ: Таму і павінен быў заўважыць, што ты за пташка.

ТАНЯ: Я нікога не падманваю. Уся як на далоні. А ты прахвост і шэльма.

МАЦЬВЕЙ: Ужо даўно ня мае значэньня, хто ёсьць хто. Цяпер усё вырашае толькі час.

ЦІМОХ: Мацьвей, ты вельмі сьпяшаесься.

МАЦЬВЕЙ: Я вас падганяю, а то вы тут затрымаліся.

ТАНЯ: Для чаго? На што ты спадзяесься?

МАЦЬВЕЙ: На тое, што адкрыецца нейкі сэнс.

ТАНЯ: І толькі для цябе аднаго?

МАЦЬВЕЙ: Я ў гэтым пераконваюся ўсё больш.

ТАНЯ: А мы замінаем?

МАЦЬВЕЙ: Якія здагадлівыя! Так, вы лішнія! Няўжо не зразумела? Бяз вас я ўжо ўсё ведаў бы.

ТАНЯ: А калі ты памыляесься?

МАЦЬВЕЙ: Ні ў якім разе!

ЦІМОХ: А можа, наадварот: мы падкажам табе праўду?

МАЦЬВЕЙ: Прастытутка і вар'ят? Выдатна! Да чаго ж здрабнела жыцьцё, што яго веліч і мудрасьць бярэцца тлумачыць вось такая нікчэмнасьць!

ТАНЯ: Як я хачу, каб гэта былі твае апошнія словы!

МАЦЬВЕЙ: Для цябе так можа і стацца, калі ты зараз жа выйдзеш вон.

ТАНЯ: Цімошка, чалавека паглынае празьмерная ганарыстасьць. Мы павінны яго выратаваць.

ЦІМОХ: (*падтрымліваючы новую гульню*) Яго заганы можа выправіць толькі гурт, а нас усяго двое — і ён можа прапасьці. Шкада.

ТАНЯ: Чаго ж? Гэта добра, што ў такую цяжкую хвіліну ён не адзін, а з намі. Мы яму дапаможам: накіруем за дзьверы, а там яго стрэне сям'я.

ЦІМОХ: Узапраўды. Мацьвей, мы клапоцімся пра цябе, жадаем, каб ты адчуваў сябе добра, таму прапануем далучыцца да большасьці.

ТАНЯ: Нам будзе вельмі сумна.

МАЦЬВЕЙ: (*зьдзіўлена і спалохана*) Ня можа быць! Нелюдзі! Жудасьць!

ТАНЯ і ЦІМОХ наступаюць на МАЦЬВЕЯ і цясняць яго да дзьвярэй. Спачатку ён працівіцца, але пад іх напорам нікне і пачынае паволь-

на рухацца спінаю да выхаду. На парозе перакульваецца і вывальваецца зь вежы. Удар грому.

Усталёўваецца цішыня. ТАНЯ і ЦІМОХ кідаюць позіркі ўгору, адно на аднаго, адчуваюць няёмкасьць. Празь нейкі момант над сцэнай утвараецца сказ «УСІМ НЕ ХАПАЕ».

ТАНЯ: Каму — усім? Мы толькі ўдваёх.

ЦІМОХ: Можа, нас гэта не датычыць?

ТАНЯ: Не сьмяшы. А каго тады?

ЦІМОХ: Тых, што не трапілі ў вежу.

ТАНЯ: Дык яны ж загінулі?!

ЦІМОХ: А думкамі засталіся тут.

ТАНЯ: Неверагодна!.. Іх мільёны. Якія ж мы дурні!.. А чаго ім не стае?

ЦІМОХ: Мабыць, таго, што мы робім.

ТАНЯ: (*трывожна*) А што мы робім?

ЦІМОХ: Зьнішчаем.

ТАНЯ: (*істэрычна*) Не! Я хачу жыць! Не падыходзь да мяне! Я баюся!

ЦІМОХ: Таня, не хвалюйся. Вялікай бяды ня будзе.

ТАНЯ: Цімошка, давай сябраваць. Ты добры, шчыры, я ня злая — мы паладзім.

ЦІМОХ: Я не пярэчу, але боль не адпускае галаву.

ТАНЯ: Чым табе дапамагчы?

ЦІМОХ: Ня ведаю. Гэта нешта незразумелае...

ЦІМОХ стомлена заплюшчвае вочы і, узяўшыся рукамі за галаву, засяроджваецца на чымсьці ўнутраным. Праз хвіліну яго твар нечакана становіцца бадзёрым, натхнёным, рашучым. ТАНЮ гэта насьцярожвае.

ТАНЯ: Што такое?

ЦІМОХ: Нарэшце боль зьнік і прыйшла яснасьць.

ТАНЯ: Слава Богу!

ЦІМОХ: У вежы шмат чалавечых фантомаў. Мы павінны вытурыць іх адсюль.

ТАНЯ: Якім чынам?

ЦІМОХ: Вельмі напужаць іх.

ТАНЯ: Чым?

ЦІМОХ: Што жудасьней за ўсё?

ТАНЯ: (*панічна*) Забойства... Не, Цімох, не!

ЦІМОХ: Мільёны душаў чакаюць выратаваньня.

ТАНЯ: А нашыя душы?

ЦІМОХ: Нам будзе дараваньне.

ТАНЯ: Ня веру!

ЦІМОХ бярэ нож, разглядвае яго і накіроўваецца да ТАНІ. Тая крычыць і ўцякае. Абодва ўзьбягаюць па лесьвіцы і праз нейкі час вяртаюцца. ТАНЯ разгублена азіраецца па баках і імгненна кідаецца за дзьверы. Раздаецца гром.

ЦІМОХ расчараваны. Уверсе літары складваюць «МАЛА СТРАХУ». Хлопец ад зьдзіўленьня замірае, апасьля ў задуменьні ходзіць па сцэне, усё кранае, праглядвае кнігі. У паводзінах адчуваецца барацьба матываў.

У рэшце рэшт ён забівае сябе. Грому няма. Цішыня. Над сцэнаю павісае слова «ШКАДА».

Зьяўляецца, нарастае і праз хвіліну-другую сьціхае басавіты гул, які суправаджаецца чалавечым шматгалосьсем. Этэр запаўняецца доўгімі грымотамі.

чэрвень-сьнежань 2002 году,
г. Віцебск

# НА ЛЕСЬВІЦЫ ДУХУ

**герархічная праекцыя ў асобах**

Вогненным духалётам імчыць чалавецтва ў Касьмічнай Бязьмежнасьці. З Боскага Ўлоньня яно рынулася ў сьвет, маючы наказ вярнуцца назад у Запаветны Прытулак мудрым і дасканалым. Адвечная інэрцыя і прага клічуць у невядомую далячынь за тайнай, зьнітоўваючы думкі, словы і чыннасьць у трывалыя вузлы сьвядомасьці й памяці. Ніхто ня можа спасьцігнуць Боскую Задуму і заўчасна зьведаць наканаванае. Рух, творчае гарэньне мацуюць чалавека на гэтым шляху і ўзбагачаюць працэс спазнаньня.

Дзеяньні адбываюцца ў мітычным замку. Час, на нашае звычайнае ўяўленьне, ня йснуе; мінуўшчына, сучаснасьць і прышласьць зьліваюцца ў агульную шматмерную плынь, якая нясе герояў цераз усе ўвасабленьні да новых выпрабаваньняў і ўзвышэньня духу. Рух свядомасьці да Праўды, памнажэньне справядлівасьці на Зямлі — асноўныя іхныя памкненьні; дзеля гэтага яны змагаюцца, пакутуюць і церпяць страты, не шкадуючы сябе. Вера ў Бога, Любоў, Радзіма, Свабода — галоўныя шляхі ачышчэньня і прасьвятленьня душы, якія кожнаму з іх суджана прайсьці па-свойму.

Драматургічная форма выбраная, каб паўней, бяз аўтарскага ваджэньня, выразіць істыя галасы касьмічных індывідуальнасьцяў.

Кожнага героя суправаджае характэрны сьвятлацень, які грае адметнай шматколернасьцю ў моманты асаблівага ўнутранага напружаньня; ён можа быць вялікім і малым.

Музычны фон зьяўляецца амаль пастаянным, мэлёдыі ліюцца на розны лад у залежнасьці ад выявы.

Касьцюмы дзейных асобаў незвычайныя, уражлівыя, належаць да розных эпохаў.

Нашае падабенства з Сусьветам вялізнае. Мы інтуітыўна ўспрымаем магутную неабсяжнасьць зорных сістэмаў. За прывіднай цішынёю радкоў чытач адчувае гарманічныя гукі велічнай сімфоніі Жыцьця.

АСОБЫ:

МІКУЛА — Вялікі Князь.

ГАРЫСЛАВА — Вялікая Княгіня.

УЛАДАМІР — бацька князя, заснавальнік дынастыі.

РАГНЕДА — маці князя, пакінула гэты сьвет, яе вобраз прыходзіць да герояў, дапамагае, дае парады, засьцярожвае ад нягодаў.

ГЕНРЫХ — бацька княгіні, дэманструе іншыя варыянты быцьця.

ЛЮДВІКА — маці княгіні.

АГНІЯ — князёўна, яе многія не разумеюць, лічаць дзівачкай, ёй суджана нарадзіць дзіцяня будучыні.

АЛЬГЕРД — старэйшы княжыч.

ІЗЯСЛАЎ — малодшы княжыч.

НАРЫМОНТ — брат князя.

КАРАЛІНА — сястра княгіні.

ВІНЦЭНТ — фаварыт Караліны.

ЯРЫВЕД — галава суседняй княжацкай дынастыі і іншага пласту касьмічнага быцьця, прыхільнік усеаб’емнага духоўнага будаўніцтва і шырокага супрацоўніцтва зь Бязьмежным Сусьветам.

АЛЕСЬ — вандроўнік, каханы князёўны.

БЭНЭДЫКТ, КІРЫЛА, РАСТАН — уплывовыя суседзі.
ДАНЕЛЬ — касьмічны вястун.
АПАЛЁН — рэжысэр прыдворнага тэатру.
Госьці, суседзі, акторы.

## ВЫЯВА ПЕРШАЯ

У замку баль. Сьветла, велічна, шыкоўна. Граюць музыкі. Зьяжджаюцца госьці. Яны танчаць, частуюцца, вядуць гутарку.

МІКУЛА: (*трымае посах зь сямю вузламі — знакам Вярхоўнае ўлады*) Шаноўнае спадарства! Няўмольны час зноў паклікаў нас да Вялікае Рады. Непахісная Вечнасьць нанізала на сябе яшчэ адно жыцьцёвае кола і ўзьвяла новыя прыступкі для далейшага руху. Мы можам ганарыцца, што ўдала прайшлі ўсе церні, вытрывалі і адтаго заслужылі новы выпыт, які нам дорыць Космас. Узмужнеў наш дух, больш пранікнёна і палымяна стукаюць сэрцы, яшчэ далей і вышэй імчаць сьветлыя думкі. Вядома ж, не бяз стратаў. Сёньня мы велічна ўзгадваем і шануем тых, хто ахвяраваў сябе й нанава сышоў наніз, каб навучаць і ўздымаць братоў у разнастайных пластах выяўленьня. Пажадайма ім імклівасьці ды перамогаў. Балюча казаць, але нашчадкі павінныя ведаць, што для некаторых барацьба скончылася паразай, душы іхныя пахіснуліся, і яны не здабылі нічога станоўчага для агульнае справы. Міру ім ды лепшага лёсу.

Прыемна бачыць вашыя памкнёныя твары і адчуваць усіхнюю гатовасьць да новых бітваў. Я віншую прысутных з пачаткам Новае Эры і зычу высокіх узьлётаў духу. Гонар і звага вам, сталыя змагары за свабоду! Моцы і гарту вам, маладыя ваяры! Мы з надзеяй і захапленьнем глядзіма на вас,

дабраслаўляючы на вялікія зьдзяйсьненьні. Крочце з радасьцю да заваёваў нязьведаных вышыняў і менш за ўсё чакайце платы.

А зараз па традыцыі правядзема сумесны акт псыхічнае энэргіі, каб напоўніць прастору флюідамі магчымасьцяў ды запаліць імпульсы новага жыцьця. Натхненьня ўсім і добрага пачуваньня.

Усе бяруцца за рукі, коламі абступаюць Чару Грааля, якая знаходзіцца ў цэнтры на ўзвышэньні, і на адзін лад моцна выгукваюць «АЎМ». У рэзанансе паветра скаланаецца маланкамі з громам і густа насычаецца азонам. Ярка ўспыхвае, потым прытухае і пачынае спакойна гарэць полымя Чары Грааля. Ліецца мэлёдыя сфэраў. Людзі ўздымаюць рукі далонямі ўверх, павольна апускаюць іх, кранаючы свае твары, і складваюць пірамідкамі на грудзях. Момант — і ўсе выглядаюць па-ранейшаму.

ГАРЫСЛАВА: Мудрая грамада! Мы страчаемся супольнасьцю рэдка: на пачатку і пры канцы кожнае Эры — такі наш парадак. Усталяваўся ён даўно і паказаў сваю неабходнасьць. Вольны дух заўсёды шчырае ў гэтай зале і змушае да адкрытасьці, свабоднага палёту думак і меркаваньняў. Як і раней, я запрашаю ўсіх выказацца, паразважаць і акрэсьліць нашыя магчымасьці ў будаўніцтве новага кону. Праблемаў шмат, як і шляхоў іхнага вырашэньня. Раіцца альбо спрачацца можна кулуарна й публічна, як каму пажадана. У любым выпадку вашыя думкі будуць успрынятыя і пакладзеныя ў падмурак узыходнага жыцьця.

УЛАДАМІР: Мне даводзілася часьцей за іншых удзельнічаць у Вялікіх Радах. Нялёгкая гэта справа — пачынаць новы сьвет, узводзіць яго стромую канструкцыю, а затым ажыўляць яе пульсавалай сутнасьцю. Кожны з прысутных ведае імкненьне да дасканаласьці ў творчасьці. Якая рада-

сьць, калі атрымліваецца так, як задумаў, ці яшчэ лепш! Але здараюцца й непамыслоты, калі разьмякаеш і запускаеш ня тую думку: тады ў працэс пранікае шкодны сумнеў — і атрута нявер'я пачынае разьядаць твор. Колькі намаганьняў трэба прыкласьці, каб выправіць крытычны стан і знайсьці імклівае касьмічнае рэчышча. Няма горшага моманту для аўтара, як творчая параза ў выніку няўдалага экспэрымэнту. У Сусьвеце такое назіраецца гэтак жа часта, як і пераможны вокліч. Нічога не паробіш: мы рухаемся да ідэалу, а лепшае куецца шляхам спробаў і памылак. Варта адзначыць, што ў нашых уладаньнях больш дадатных прыкладаў, чымся адмоўных. Гэта паказвае правільнасьць абранага кірунку і высокія здольнасьці чальцоў нашага агулу.

КАРАЛІНА (*да свайго атачэньня*): Зноў гэты балбатлівы здыхлік закрактаў. Хвалюецца за агульную справу, стары крывадушнік! Зараз будзе рэзанёрстваваць. Лепш бы распавёў пра сваё бяздарнае ўладзьдзе, ад якога мы ўсе ня можам ніяк ачомацца.

УЛАДАМІР: Мушу засяродзіць вашую ўвагу на асаблівасьцях, нам уласьцівых. У свой час Вялікія Майстры Вечнасьці даручылі нам завіхацца ля Чары Грааля і абавязкам паклалі памнажэньне жыцьця ў шматмернасьці ягонага размаху. Вялікае войска адважных і мужных рашуча рынулася ў Бязьмежнасьць. Мне выпала радасная доля ўзначаліць гэты паход.

Зараз цяжка падлічыць, колькі народаў і расаў было ўвасоблена намі на плянэце, колькі энэргетычных сістэмаў выпрабавана і якіх цяжкасьцяў, у тым ліку ахвярных з нашага боку, гэта каштавала, каб дамагчыся галоўнага — захаваць самую ідэю жыцьця і яе выбітнага носьбіта homo sapiens. Цяпер ужо тое ня тайна і яе спасьцігаюць нашыя дзеці ад калыскі: усё было зроблена дзякуючы таму, што мы

распаўсюдзілі сярод ствярэньняў сьвядомасьць накшталт нашай. Гэта значна паскорыла эвалюцыйны працэс у нашым касьмічным закуточку, выслабаніла многіх істотаў ад лютасьці й гвалту, якія звычайна ўласьцівыя з-за адсутнасьці розуму і выяўляюцца дзе-нідзе ў іншых сьветах. Мэтазгоднасьць такога кроку пацьвердзілі далейшыя станоўчыя зрухі чалавечага духу. Дык уславім жа Боскае Прадбачаньне і геройства нашых братоў! Імчыся ў далячынь і высь, нашая радасьць, ды памнажай агульныя высакародныя заваёвы!

Сярод гасьцёў пранеслася хваля адабрэньня, запляскалі ў далоні, нехта выгукнуў «VIVAT, УЛАДАМІР!».

Паважна выплывае Людвіка. Нейкі момант яна назірае за дзействам; калі ўзбуджэньне заціхае, грацыёзна ідзе ў цэнтр. Натоўп расступаецца.

ЛЮДВІКА: Ляцела птушыная чародка над стэпам і заўважыла, як у траве сноўдаюць мышы. Ёй падалося, што шэрыя таксама кіруюць у вырай. «Доўга ім прыйдзецца дабірацца: у іх жа няма крылаў!» — заенчылі птушкі і вырашылі дапамагчы. Яны скінулі на зямлю пер'е, хто колькі мог, каб мышы зрабілі крылы. А тыя, ня ўцяміўшы, што да чаго, з птушынага апярэньня змайстравалі ўтульныя гнёзды ў сваіх норах.

КАРАЛІНА: (*кулуарна*) Пасьцюдзянела трохі, а то многія распарыліся, заёрзалі. Правільна, маці, пачастуй іх праўдай.

ЛЮДВІКА: І штойта сёлета здарылася з птушкамі? Раней яны спускаліся долу, спрытненька лавілі шэрых і жэралі іх перад далёкай дарогай. А тут такія клопаты і шчодрасьць! З чаго б гэта? Можа, насыціліся альбо захварэлі?

МІКУЛА: Мы рады вітаць цябе, матухна. Твае парады заўсёды спрыяюць справе, але сёньня ты мовіш неяк загадкава.

ЛЮДВІКА: Гэта толькі немаўлятам і чэсным мае словы падаюцца загадкай. На астатніх шапкі гараць вельмі прыкметна.

УЛАДАМІР: Людвіка, я пастаянна адчуваю тваё крытычнае стаўленьне да ўсяго, што раблю. Шчыра, мне гэта ўжо надакучыла. Калі б я зьвяртаў увагу на такія кпіны, дык нічога б не адолеў і нашыя агульныя дасягненьні былі б не такія значныя. Канешне, ня ўсё йшло гладка, але ўпэўнены: ніхто ня можа абвінаваціць мяне ў нядобрапрыстойнасьці і здрадзе нашым ідэалам. Ці ня так, братэрства?

Па зале прабег шум падтрымкі і згоды. Хтосьці крыкнуў: «Мы верым табе, Уладамір!»

ЛЮДВІКА: А чаго яшчэ чакаць ад іх? Гэта ж твая стайня, Уладамір. Яна зьбіралася ўва ўсім Сусьвеце па падабенству і духоўным прыкметам. Вы зьнітаваныя навечна аднымі памкненьнямі і дзеяньнямі.

УЛАДАМІР: Так і трэба, ад гэтага ўся моц любога хаўрусу. Адзінства думак і жаданьняў уздымае ў прасторы магутны энэргетычны прыліў і шпарчэй нясе нас да мэты.

ЛЮДВІКА: Безумоўна, асабліва высакародныя сэрцы. А вы — прыклад іншага кшталту. Уладамір, ты хоць пра мэту памятаеш? У вас наяве толькі адныя сродкі, а дзеля чаго яны — мабыць, ніхто цяпер і ня ўспомніць.

УЛАДАМІР: У кожнага сваё прызначэньне. І Тайна гэтая Там (*паказвае ўгору*), а яшчэ вось тут (кладзе далонь на грудзі). Хай ня кожнаму дадзена гэта ўсьведамляць, але ж служым мы Ёй з сумленьнем.

ЛЮДВІКА: Вось-вось, калі ў каго яно засталося. Паслухаеш вас — і сумна робіцца: усё ў вас правільна і прыстойна,

а розныя здарэньні ды недарэчнасьці страчаюцца толькі ў суседніх сузор'ях. Дзе вашая цнатлівасьць? Як лёгка і хутка вас захапіла ганарыстасьць і самаўпэўненасьць! Няўжо не стае памяці? Зірніце назад: колькі значных падзеяў, асобаў, душаў яна не зачапіла! Які найцікавы жыцьцёвы матэрыял мы пакінулі без дагляду і як ён пранізьліва крычыць: «Памятайце!» Мы тут мовім прыгожыя словы аб творчасьці, а ў стаўленьні да свайго галоўнага твора — чалавека! — ад пачатку Зямлі ня можам вызначыць канкрэтную пазіцыю ды адважыцца на спыненьне такога доўгага і, трэба прызнаць, няўдалага экспэрымэнту. (*Сярод гасьцёў нараджаецца незадавальненьне.*) Як даўно вы былі сярод людзей?

Абурэньне зьліваецца зь пярэпалахам.

ГОСЬЦІ: — Мы там кожнае імгненьне!
— Чалавек — наш гонар!
— Што яна вярзе?
— Мы абражаныя!
— Спыніце яе пыхлівасьць!

ЛЮДВІКА: Ганьба! Большасьць з вас яшчэ ня можа спасьцігнуць, што я маю на ўвазе. Я пытаюся не пра тую прысутнасьць, якой вы часта забаўляецеся пасьля ўвасабленьня ў чалавечай скуры — тут вы майстры: удосталь, па патрэбе і бязь меры п'яце ўсе зямныя жарсьці, быццам вам усё дазволена і да вас не прыліпае кармічная расплата. Я кажу пра ***духоўную*** лучнасьць зь людзьмі. А яе ў вас няма. Разумееце: ня-ма! (*Паварочваецца да ўваабражанага чалавечага сьвету і ўзыходзіць нібыта на авансцэну*) Вы даўно іх пакінулі. Стварылі, нацешыліся і зьверглі ў куламесу матэрыі, якую самі ж і прыгатавалі. Яны пакутуюць ад адзіноты

і ўспрымаюць толькі звыклае, тое, што хоць крыху зьмяншае іхны боль. Вы сказілі агульныя падыходы — і ад гэтага далёка зайшлі. Цацкі вашых тэалягічных і касмаганічных тэорыяў ужо даўно ім не дапамагаюць. Хвароба залівае ўсю зямную сфэру. Пасля дачыненьняў зь людзьмі трэба доўга мыць рукі. Ім няўцям, што яны — выракчоныя. А вы, (*зьедліва*) дабрадзеі, кінулі для іх сваё пер'е — сьведам'е, нібы для далейшых зьдзекаў з гаротных. Аплакваць іх трэба, а вас — караць. (*Выходзіць.*)

Напружаньне не сьціхае. Як рэакцыя на настрой герояў, узьлятае і падае агонь Чары. Раз-пораз зіхацяць бліскавіцы.

ГОСЬЦІ: — Сапраўды, раней людзі былі злыднямі без усьведамленьня, а цяпер сьвядома.

— А хто іх такімі зрабіў?

— Раньш існавалі ў строгай адпаведнасьці з нашай праграмай, а цяпер могуць карэктаваць яе бяз нас і, як паказвае практыка, ня ў самы лепшы бок.

— Пашкадуйце іх: яны ж сьляпыя кацяняты.

— Мы і так далёка зайшлі са сваім гуманізмам.

— Для дабра няма абмежаваньняў.

— Іх зноў трэба зьнішчыць і стварыць нешта іншае.

— У каторы раз, вар'яты?

Нечакана ў сьветлавой праекцыі вымалёўваецца Агнія. Шматлікія гукавыя і візуальныя праявы натоўпу нікнуць, быццам адыходзяць удалячынь. Жывое асяродзьдзе застаецца толькі вакол Агніі. Гучыць адмысловы музычны рытм, які ў рознай аранжоўцы суправаджае яе кожнае далейшае зьяўленьне альбо папярэджвае аб яе прысутнасьці, неабавязкова фізычнай.

АГНІЯ: Тут бура, і хвалі пачуцьцяў адна на адну, так можна і захлынуцца. Пайду адсюль туды, дзе больш утульней душы (*зьнікае*).

Пакрысе паўстае ранейшы гукавы і візуальны малюнак залы. Гоман, спрэчкі, доказы.

ЯРЫВЕД: Мудры сход! Прашу твае ўвагі. Па-суседзку я даўно назіраю за вамі. Балюча глядзець, як супярэчнасьці разьдзіраюць вас. Можа, у гэтым і ёсьць карысьць, і вы зробіце правільныя высновы. У дапамогу мушу выказаць колькі думак, якія прыйдуцца ня ўсім даспадобы. На золку нашае Югі, калі вы абралі свой касьмічны куточак жыцьця і ўсе гарэлі натхненьнем, я вам параіў не сьпяшацца і не распачынаць шырокую справу, бо ўжо меў нейкі досьвед. Вашыя ўмовы выўленьня былі нездавальняючыя: пласт быцьця атрымаўся матэрыяльна вельмі цяжкім, і ўдасканальвацца на ім было амаль немагчыма. Але вы не паслухаліся і далі імпульс рознабаковай жыцьцядзейнасьці на Зямлі, маўляў, сваёй творчасьцю і энэргіяй мы ўздымем яе на вышыню.

Сапраўды, напачатку вы працавалі творча, імпэтна. Здаровыя энэргетычныя ручаі несьліся ад вас у агульную раку Космасу. Вы і вашыя тварэньні былі адзінай духовай сфэрай. Я захапляўся вашымі подзьвігамі і на нейкім этапе нават лічыў, што памыліўся ў прагнозах. Але час паказаў, што ня ўсё да вашае сілы і зерне на каменьнях не расьце. Посьпехаў стала менш, усё часьцей пайшлі няўдачы. Радасьць пераўтварэньняў затухала. Запаволіўся жыцьцядайны працэс, і мы заўважылі, што вы адстаяце ад астатніх у разьвіцьці. Некаторыя захісталіся, пайшла разгалосіца. На Зямлі занараджаліся істоты, якія спынілі аддачу патрэ-

бнай колькасьці гаючай энэргіі. Каб выправіць становішча, вы распачалі экспэрымэнты, непасьлядоўнасьць і супярэчнасьць якіх зьдзіўляе. Былі пэрыяды, калі вы стваралі толькі для ўласнага спажываньня і ня сама лепшай якасьці; Сусьветная супольнасьць атрымлівала ад вас усё менш і менш. Адтаго мэтафара Людвікі аб паяданьні мышэй мае сэнс.

БЭНЭДЫКТ: Досыць падарожнічаць па нашай памяці. Яна ў нас трывалая, ганарлівая і ня церпіць набегаў збоку. І аб галоўным ёй ведама: абраная некалі намі стратэгічная лінія правільная (*чуваць галасы падтрымкі*).

МІКУЛА: Спадары, ня будзьма залішне хвалявацца і перашкаджаць Ярыведу выказваць сваё меркаваньне. Ён прадстаўляе Касьмічнае Братэрства, і нам, упэўнены, цікава ведаць, як там нас успрымаюць.

ЯРЫВЕД: Там занепакоеныя ад вашэцяў. Цяжкая хвароба гвалтуе Зямлю. Відочна, што вы церпіце няўдачу і няздольныя самастойна дапамагчы людзям. Мы ведаем, што некаторыя з вас пакінулі іх, і толькі сама рашучыя яшчэ гарацъ імкненьнем змагацца. Нейкая палёгка, але толькі ў варыянце часу, адбылася, калі вы ім далі розум. Астатнія парамэтры засталіся ранейшымі. Усе новыя спробы, як правіла, праходзяць цяжка і завяршаюцца няўдала. Хіба можна назваць перамогай тое, калі кожны Вялікі Цыкл плянэты заканчваецца бязьлітаснай катастрофай? Ці падлічваў хто, колькі нэгатыву выкідваецца ў Космас у выніку гэтага? Вадой і агнём зьнішчаецца ўсё спрэс: флёра, фаўна, дасягненьні розуму за выключэньнем тых істотаў, якія, на вашую задуму, павінны даць пачатак новай, больш дасканалай расе. Увогуле, чаканага эфэкту ніколі не назіраецца і атрымліваецца адно і тое ж: людзі няздольныя ўдасканальвацца. А які псыхалагічны штамп спарадзіла і ўтрывaліла іхнае нутро ў выніку: жорсткасьць і боль — неператожныя!.. Дык

дазвольце спытаць: зь якіх рэсурсаў вы, ваяры Сьвятла, будзеце папаўняць свае шэрагі? На што вы разьлічваеце? На дапамогу?

РАСТАН: Я ўзрушаны: мяне абражваюць у маёй жа хаце — недаравальнае нахабства!

КІРЫЛА: А мне здаецца, што Ярывед мовіць слушна. Цікава, а якое выйсьце ён прапануе?

ЯРЫВЕД: Вы выпрабавалі шмат варыянтаў, і ні адзін ня спраўдзіўся. Галоўная бяда ад таго, што кармічны прэс сьціскае вас і вашую рэчаіснасьць усё больш. Каб не памнажаць напасьці — знайдзіце моцы і спыніцеся: прызнайце хібы, адмоўцеся ад досьледнай працы, цалкам зачыніце свой сьвет, перайдзіце ў іншы стан і ўкленчыце перад Богам.

Усе ўзрушыліся. У зале разгубленасьць, трывога, абурэньне, гнеў.

ГОСЬЦІ: — Гэта немагчыма!

— Цікавая прапанова.

— Ганьба!

— Ня слухаць прыблудаў!

— Прэч дарадчыкаў!

— Мы самі разьбярэмся.

— Самагубства ня будзе!

МІКУЛА: Спадарства! Усё варта дэталёва абмеркаваць. Парада надзвычай цікавая, з такой мы яшчэ не сутыкаліся. Я лічу, што наш паважаны сусед ня будзе так мовіць без сур'ёзнай прычыны. Ярывед, кожны прысутны шануе сваю справу і адказвае за ўсё, што робіць, а твае словы кранулі за жывое. Адкажы, няўжо нашая праблема такая значная для Сусьвету і ці адбываецца нешта падобнае ў іншых месцах?

ЯРЫВЕД: У дастатковай колькасьці, і пытаньне кожны раз узважваецца на ўзроўні Касьмічнае Супольнасьці.

МІКУЛА: А выйсьце вы прапануеце заўсёды аднолькавае?

ЯРЫВЕД: Неабавязкова. Шматаблічны Сусьвет мае мноства варыянтаў пачатку і канца жыцьця. Ваш выпадак патрабуе самаахвярнасьці, каб залячыць тую рану, што зеўрае ў агульным выяўленьні пасьля вашых няўдалых экспэрымэнтаў.

БЭНЭДЫКТ: Мяне зьдзіўляе катэгарычнасьць і аднабаковасьць тваіх высноваў, Ярывед. Нашая гвардыя атрымала загад Усявышняга будаваць жыцьцё ў адпаведнасьці з памерам і сутнасьцю свайго таленту. Мы разгарнулі ўсе свае магчымасьці, выпрабоўваем кожную дэталь і асаблівасьць, адвяргаем непатрэбнае і бяром для ўдасканаленьня сама лепшыя ўзоры творчасьці. Як тут ужо казалі, надараюцца шурпатасьці й недарэчнасьці, але галоўнае — ня страчана нашае гарэньне і памкненьне зрабіць сваю справу лепш.

РАСТАН: Ярывед, мы ведаем касьмічныя законы ня горш за цябе і за свае дзеяньні будзем адказваць перад Богам самастойна, без тваёй дапамогі. Нязгаснае Вогнішча Космасу — наш арыентыр.

КІРЫЛА: Так, Ярывед, ты памыляесься. Хіба можна зьнішчыць такі вялізны і значны твор, як нашая рэчаіснасьць? Уявіце яе неабсяжнасьць! А якога захапленьня заслугоўвае гэты цуд — чалавек! Іншыя зайздросьцяць нам за такое сьмелае вынаходніцтва. Ды ні адзін аўтар ня пойдзе на яго ліквідацыю. Ты лічыш, што мы зусім зьдзічэлі ў духу і няздольныя дапамагчы Зямлі? Так, у нас былі адхіленьні ад галоўнай сьцяжыны. Трэба на хвіліну спыніцца, усё прааналізаваць і выправіць памылкі. Рэзэрвы і магчымасьці для гэтага ў нас ёсьць. Мяне не пераканаюць, што ад нашае згубы будзе шмат карысьці ўсяму Сусьвету.

РАСТАН: Наогул мяне ўзрушвае кожнае пабочнае ўмяшаньне ў нашыя справы. Творчасьць — выключна індывідуальная якасьць: тая думка, што нарадзілася ў маёй галаве, ужо ня можа зьявіцца ў чыёйсьці іншай, бо яна ў абрамленьні маёй непаўторнай энэргетыкі. Шаноўныя касьмічныя пасланцы! Не перашкаджайце нам! Мы не дурней за вас.

ЯРЫВЕД: Ніхто не прымушае вас і не гвалтуе вашую волю. Мая задача — папярэдзіць вас. Свой выбар вы павінныя зрабіць самастойна. Я разьлічваю на ўзважаны падыход.

КАРАЛІНА: Ярывед, чаго ты ходзіш усё агародамі, а не вуліцай? Скажы гэтым няўклюдам прама: вы бяздарныя, у вас няма здольнасьцяў, вашае месца сярод рамесьнікаў. Можа, такія словы ім больш падыходзяць? Калі назіраеш вось за такімі цьвердалобымі ганарліўцамі (*паказвае на Бэнэдыкта, Кірылу, Растана*), робіцца сорамна за ўвесь род. У цябе, Уладамір, дастойныя нашчадкі. Гэта дзякуючы табе мы так доўга блукаем у поцемках. Твае ідэі звузілі разумовыя магчымасьці дынастыі і абмежавалі працэс пазнаньня. Тваё празьмернае фанфаронства запаволіла наш рух і працягвае нэгатыўна адбівацца на агульных справах.

УЛАДАМІР: Я заўсёды прыхільна стаўлюся да розных меркаваньняў і лічу, што пярэчаньні толькі садзейнічаюць прагрэсу. Так было неаднойчы. І на гэты раз шляхам крытычнага аналізу мы вызначым правільны кірунак. Толькі ня трэба сварыцца і зьневажаць адно аднаго. А Караліну, дый усіх астатніх таксама, прашу засвоіць, што наш жыцьцёвы пласт — унікальная зьява ў Сусьвеце. Упэўнены, падобнага больш нідзе няма. Дзеля гэтага і ўся нашая самаадданая праца. Менавіта арыгінальнасьцю тварэньня мы робім свой унёсак у Сусьветнае дойлідзтва і пашыраем ягоныя мажлівасьці. Кожны з нас мае права ганарыцца вынікамі такога будаўніцтва.

КАРАЛІНА: Людажэрны падыход. (*Зьдзекліва*) Па-твойму, забойцу павінна аж расьпіраць ад усьведамленьня гуманізму свайго ўчынку, бо ён не адбірае жыцьці, а проста-такі дорыць ахвярам імгненныя магчымасьці для чарговага ўвасабленьня і, вядома ж, хуткаснага ўдасканаленьня?

БЭНЭДЫКТ: Караліна, ты сёньня надзвычай устурбаваная.

КАРАЛІНА: Мяне непакоіць ваш вар'яцкі мажор і ўпартасьць, з якой вы не жадаеце ўспрымаць парады і хоць нешта зьмяняць. Да працягу тваёй думкі, Уладамір: наш сьвет унікальны толькі пярэстымі спосабамі зьнішчэньня гадаванцаў. Мы кінулі іх у надзвычай грубую матэрыю, як у сырое і смуроднае падпольле, куды амаль не пранікае сьвятло. Усе жыхары павінныя дакладна ведаць, якая высокая шчыльнасьць цемры на Зямлі. Такія ўмовы не даюць жывым аніякай надзеі на лепшае. Вось адтаго яны самі шалеюць і ўсіх наўкола атручваюць. Але вам мала: вы пэрыядычна трушчыце іх направа і налева, абвінавачваючы ў здрадзе і прымушаючы біць паклоны з малітоўным утрапеньнем.

РАСТАН: А ты быццам бы не садзейнічаеш гэтым пераўтварэньням?

КАРАЛІНА: Чалавек некалі ствараўся, у тым ліку і мною, з мэтай зьмясьціць у сабе прагрэсавальны касьмічны сэнс. Колькі было ажыцьцёўлена праектаў! І ўсё дарэмна. Аднойчы я зразумела, што мы памыліліся, што задуманая фізычная форма ўвасабленьня атрымалася непрыстасаванай да цяжкіх матэрыяльных умоваў Зямлі. Пасьля гэтага я адмовілася ад народзінаў жыцьця. З тае пары шчыра імкнуся пераканаць усіх пайсьці за мной, але вы ігнаруеце. Як бы там ні было, я і надалей буду гэтак рабіць — і дамагуся свайго. Няхай гэта будзе адступніцтвам, толькі я не жадаю ўдзельнічаць у падобных зьдзеках з існаваньня, якія вы называеце творчасьцю. Раю прыслухацца да таго, што кажа Ярывед.

ГАРЫСЛАВА: Сястра, твая рашучасьць заслугоўвае павагі, але супярэчыць нашым правілам: кожны павінен тварыць, насычаць прастору духовасьцю і клапаціцца аб сваіх істотах. Калі гэтага не адбываецца, то энэргія застойваецца, губляе і шлакуецца ў шчыльныя касьмічныя напластаваньні. Гэты цяжар можа нашкодзіць усім і загубіць твой чароўны дар.

КАРАЛІНА: Можа, яно так і было б, калі б я адмовілася ад праўднага кірунку, а я паставіла крыж на вашых ганебных досьледах. Ад уласных энэргетычных запрудаў я навучылася ачышчацца і адчуваю сябе файна. Я бачу прыгажосьць абранага мною шляху (*яе аднадумцы гучна выражаюць радасьць і прыўзьняты настрой*).

ГАРЫСЛАВА: Табе бракуе прадбачлівасьці з-за празьмернае наравістасьці. Што ты пакладзеш да агульнага Касьмічнага Вогнішча ў канцы Югі, калі ўсе будуць з выпеставанымі тварэньнямі?

КАРАЛІНА: Самую сябе як ня здрадзіўшую правечнаму парадку і Першаснаму Дабраславеньню. А вы да Велічнага Алтару панесяце сваіх вылюдкаў, га?

Зала зноў загаманіла на ўсе лады. Паласнула маланка, і грымнула.

БЭНЭДЫКТ: Вельмі бедаваць ня трэба. Калі тут і ёсьць праблема, дык яна мае не глябальны, а ўсяго тольма рэгіянальна-прыватны характар. Кожны з нас уладарыць у канкрэтным разрэзе і, у адпаведнасьці са сваімі здольнасьцямі, вядзе будаўніцтва. У аднаго выходзіць лепш, у другога — горш, тут аддаюць, там забіраюць, у тых расы праменяць сьвятло, у гэтых — капошацца ў цемры. Шматзначны і займальны сьвет!

МІКУЛА: У рознасьці плянаў быцьця і незьлічонасьці індывідаў адчуваецца галоўны поступ Космасу, бо калі б усё было аднолькавым, то адпала б патрэба ствараць яго ў такой неабсяжнасьці. Дастаткова было б патраціць сілы на нешта адно вялікае, магутнае і значнае, чымся на мноства дробязяў. У шматстайнасьці схаваны моцны энэргетычны патэнцыял Сусьвету.

КІРЫЛА: Чаго ня скажаш пра духоўнасьць. Яна ў нас адна на ўсіх і, як сьведчыць наш гаротны досьвед, у кволым стане. Гэта як агонь — можа быць і агромністым, і маленькім, а па сутнасці заўжды аднолькавы. Некаторыя ўпіваюцца дэмагогіяй, каб прыкрыць адсутнасьць на сваіх тэрыторыях хоць кроплі такога агню — духоўнасьці. Людвіка мае рацыю, толькі, як кажа Бэнэдыкт, абагульняць ня трэба. Нам неабходна вынішчыць асяродкі, дзе дух заняпаў, і такім чынам ачысьціць усё ваколье.

БЭНЭДЫКТ: (*падазрона*) І дзе ж знаходзяцца гэтыя асяродкі?

КІРЫЛА: Іх адрасы кожнаму падкажа сумленьне. У маіх уладаннях такіх няма.

БЭНЭДЫКТ: А што паведамяць астатнія Браты чалавецтва?

ГОСЬЦІ: — Бруду хапае.

— Дастаткова і праталінаў.

— Якое будаўніцтва бязь сьмецьця?

— У некаторых яго зашмат.

— Мы яшчэ ня ўсё выпрабавалі.

— І гатовыя да новых вычынаў.

— А магчымасцяў усё менее.

— Няпраўда!

БЭНЭДЫКТ: Мне падабаецца, як пульсуюць нашыя сэрцы і гарыць творчы аптымізм. Безумоўна, у кожнага ёсьць і павінныя быць праблемы — такі парадак. (*З іроніяй*) Толь-

кі адзін Кірыла спасьцігнуў Вышэйшы Сэнс і зрабіў, як тут кажуць, неверагоднае — на сваіх падуладных тэрыторыях ужо ўзьвёў Сьвятыню Духу.

КІРЫЛА: Ты дарэмна яхіднічаеш, Бэнэдыкт. Найвышэйшай Дасканаласьці пакуль нікому ня дадзена, але імкнуцца да яе мы павінныя. Я ня буду раскрываць свае творчыя сакрэты, але мушу зазначыць, што мая канцэпцыя разьвіцьця адрозьніваецца ад ужо вядомых і на практыцы дала неблагія варункі. Як ужо адзначалася, усё падпарадкоўваецца закону індывідуальнасьці, і мой народ імкнецца максімальна яму адпавядаць. Увогуле атрымліваецца так, што на Зямлі ён, бадай, адзін здолеў захаваць першапачатковы духоўны імпульс і адтаго мае ўсе падставы, каб узваліць на сябе пачэсную місію ратаваньня ўсяго чалавецтва.

БЭНЭДЫКТ: Сьмяхоцьце дый толькі. Мабыць, трэба зусім зглуздзіць, каб сьцьвярджаць, што на агульным дрэве замест банальнай галінкі можна вырасціць сонечны прамень. А можа, ты даказаў, што зь яйка вужакі магчыма вывесці птушку? Ха-ха-ха! Якое семя, такое й племя. І якія ж прыкметы звышдухоўнасьці тваёй чэлядзі? У іх па пяць рук і ног? Кубічная галава? Некалькі сэрцаў? Больш вантробаў? (*Нібы здагадліва*) А-а, яны дыхаюць іншым паветрам, ходзяць па іншай зямлі і плёскаюцца ў іншай вадзе...

КІРЫЛА: Што яшчэ пачуеш ад гэтага нясьцерпнага халерыка? Табе, Бэнэдыкт, не зразумець пераможны поступ маёй нацыі. (*Да ўсіх*) У яе адно сэрца, але яно трапеча любоўю, дабрынёй, самаахвярнасьцю і вернасьцю высокім ідэалам. Яе магутны інтэлект стварае шэдэўры сусьветнае культуры і ўзоры чалавечых узаемаадносінаў, чаго няма ў іншых народаў. Яна не імчыць безупынна, як іншыя, за шкодным тэхнічным прагрэсам і адтаго ня вэдзгае сябе, а будуе храмы, моліцца Богу і ўзносіцца душою да нябёсаў. Я ўзгада-

ваў у майго люду вялізны ўнутраны патэнцыял, дзякуючы якому ён павядзе за сабой усіх насельнікаў плянэты да лепшае будучыні. Гэты працэс пачаўся, і зьбіраньне народаў у адну вялізную супольнасьць ужо адбываецца.

БЭНЭДЫКТ: Якая ў цябе смачная цукерачка: пакладзеш у рот і змружыш вочкі ад асалоды... навечна, кадук яе бяры! Бо з атрутай яна, і аб гэтым вядома многім. Прысутныя ведаюць, як ты «шчыраеш» са сваімі выхаванцамі на Зямлі і які смурод ад гэтага паўзе па ўсёй плянэце. Няма ў цябе сумленьня, Кірыла, калі ты падман узводзіш у ранг дабрачыннасьці.

ГОСЦІ: — Паклёп!

— Зайздросьнік!

— Зласьлівец!

— Не чапай нашую сьвятыню!

КІРЫЛА: Браты! Нам не ўпершыню чуць такія абвінавачваньні. Яны (*паказвае на Бэнэдыкта і яго паплечнікаў*) даўно мараць зжыць са сьвету нашых гадаванцаў і на кожным кроку чыняць перашкоды. Варожае вока ня дрэмле. Гэта нас толькі больш загартоўвае. Істаўка не пакідае нас і вядзе до новых заваёваў.

БЭНЭДЫКТ: Спадарства, мы назіраем звыклую карціну: хворы не ўсьведамляе свайго стану, які пагражае і яму, і астатнім, альбо ня хоча гэтага рабіць.

ЯРЫВЕД: Сапраўды, творчы вопыт Кірылы можа вызваць усеагульнае здранцьвеньне. (*Да яго*) У сапраўднага таленту, дружа, няма сакрэтаў, гэта толькі шэрасьць прыкрываецца фіранкай таямнічасьці. Спасьцігшыя тваю школу пераканаліся ў яе шкоднасьці ня толькі для чалавецтва, але і для ўсяе Касьмічнае Герархіі. Галоўная бяда ад таго, што твае мэтады ўкараніліся ў псыхічную структуру жывых істотаў і ўжо незалежна ад змены расаў, народнасьцяў, тыпаў суправа-

джаюць іх на працягу тысячагодзьдзяў і заўсёды выяўляюцца пры спрыяльных умовах. Лячыць гэта можна толькі агнём самаахвярнасьці.

КІРЫЛА: Менавіта ад гэтага і моц маёй ідэі. І ніякага гора тут няма. Я распачаў арыгінальны прарыў у Вечнасьць, і толькі зацятыя кансэрватары гэтага не разумеюць. Табе, Ярывед, я параіў бы больш ня ўмешвацца ў чужыя справы. Лепш зацугляй сваіх пасланцоў, якія швэндаюць па Зямлі бяз нашага дазволу і вычвараюць абы-што, парушаючы нашую агульную стратэгічную задуму.

БЭНЭДЫКТ: Каторы раз заўважаю, што пераканана-сьць — анамалія лёгікі, але ў такіх памерах — упершыню. Твая нацыя, Кірыла, пачала з агрэсіі. Нічога дзіўнага: такі грэх нясуць многія. Але калі яны апасьля збавіліся ад гэтай заразы, дык у цябе яна стала перавагай існаваньня. Ты значна перабольшваеш, калі кажаш аб выключных разумовых здольнасьцях сваіх пестуноў. Вялікі інтэлект не стасуецца з насільлем, якое запаланіла тваю імпэрыю. Стваральніцкія мэты толькі ледзь-ледзь кранулі тваіх людзей. Яны па сваёй прыродзе гультаі і недапекі. Каб жыць і задавольваць свой драпежніцкі апэтыт, сталі весьці захопніцкую палітыку, рабаваць суседзяў, смактаць зь іх энэргію. Напачатку выкарыстоўваліся пераважна фізычныя і біялягічныя спосабы заняволеньня, у далейшым яны станавіліся танчэйшымі і дасягнулі, нарэшце, маральнага і псыхічнага ўзроўню. Я падкрэсьліваю, што большасьць здабыткаў грамадзкага, культурнага і навуковага кшталту была дасягнутая за кошт эксплюатацыі людзкіх рэсурсаў калоніяў і выпампаваных зь іх нетраў духоўных сокаў. Грэх ад таго, што твае стварэньні, Кірыла, зьнішчаюць індывідуальнасьць іншых народаў, калечаць іх, пагражаюць і не даюць разьвівацца. Толькі вось не заўважаюць, што такім чынам крыўдзяць і сябе: з-за імпэ-

рскіх амбіцыяў згубілі адэкватнае ўспрыманьне рэчаіснасьці. Ім падаецца, што ўвесь сьвет верціцца вакол іх, што яны лепш і больш ведаюць Праўду, што абраныя Богам, каб кіраваць усёй плянэтай.

КІРЫЛА: Астынь, фарысей! Хіба гэта ня так? Няхай кожны шчыра і праўдзіва адкажа: які народ здольны перасягнуць мой у духоўнасьці і ў Божай ласцы?

Усе госьці ўзбураныя. Адны выгукваюць падтрымку Кірыле, другія — нязгоду і незадавальненьне.

МІКУЛА: Грамада, нам ня гожа усчынаць канфлікт. З нашымі магчымасьцямі агню мы можам запаліць любое полымя. Трэба памятаць, як жорстка ўсё адлюстроўваецца на складаных зямных формах. Давайце працаваць спакойна.

БЭНЭДЫКТ: (*да Кірылы*) Грамадзе ўжо надакучыла твая фанабэрыстасьць. Колькі існуе нашае вымярэньне, столькі ты і твае памагатыя ўсё лезеце на ражон і кідаеце камяні пад агульнае кола. Напладзілі калекаў і злосьнікаў са скажонай сьвядомасьцю, якія час ад часу ўвасабляюцца то ў адной частцы Зямлі, то ў другой і стагодзьдзямі жэраюць выявы сьвятла, гвалтуюць касьмічную эвалюцыю. І дзеля чаго: усё адно жывуць, як сьвіньні, у брудзе й галечы. Вы кідаеце плянэту ў глыбокую прорву.

КІРЫЛА: Мне сьмешна ад такога ўяўнага альтруізму. Замест таго каб вынішчыць сваё бездухоўнае кодла, ты вінаваціш мяне ў сьвятатацтве. Чым абярнуліся для чалавецтва твае творчыя высілкі? Ты са сваімі прыхільнікамі так парупіліся аб свабодзе і незалежнасьці асобы, што пайшлі на страшэнны маральны кульбіт, які ўрэшце шпурнуў вас

у сама груваствія слаі Зямлі, дзе ўладарыць духі цемры. Вам пажадалася зямнога раю, і вы скокнулі ў тэхнатронны вір. Згодны, таго-сяго прыемнага для цела вы дамагліся: мэханізацыя і аўтаматызацыя жыцьця, кіраваньне прыродай, шырыня пачуцьцяў... Але ад гэтага змарнела душа, занепаў дух. Вера была пахаваная пад золатам. Бог для вас пачаў існаваць недасягальна і палохаць сваёй вуьсцішнай тайнай. Бэнэдыкт, вонкава твой народ самавіты, шыкоўны і прыстойны, але ўнутрана ён пусты і трупехлы. Касьмічнаму Зьвязу такія ўзоры творчасьці брыдкія.

БЭНЭДЫКТ: На жаль, цябе пакінула разуменьне, што ў такіх шчыльных фізычных умовах, якія ёсьць на Зямлі, удасканальвацца можна толькі шляхам пераўтварэньня і патанчэньня матэрыі, паляпшэньня і апрыгожваньня існаваньня, а ня голага бязьдзейснага маленьня і жывёльнага бадзяньня па сьвеце. Па-твойму, барбар ляснога гушчару з доўбняй у руцэ і з адной мазговай зьвілінай бліжэй да неба, чым адукаваны арыстакрат ва ўрбанізаваным асяродзьдзі.

КІРЫЛА: Твае арыстакраты — духоўныя дзікуны, а мае барбары — арыстакраты духу. Мы ў духу будуем больш, чым вы рукамі.

БЭНЭДЫКТ: А хлусьня — ваш лепшы дарадца. Дух заўсёды стварае тыя формы быцьця, да якіх імкнецца. Мы сьцьвярджаем паўсюдную прыгажосьць. Ты ж дэманструеш пачварнасьць. Твае выхаванцы — па сваёй прыродзе атэісты: яны ўзвысілі і абагавілі сябе — ніжэйшы прынцып прыроды — і зрабілі рабом Вышэйшы — Бога, такім чынам адмовіўшы Яго. Бяз Бога ў Сусьвеце немагчыма хоць якое-небудзь будаўніцтва. Ты спаведуеш адваротнае, адтаго твае людзі нясуць разбурэньне.

КІРЫЛА: Праўда на нашым баку — усьвядоміць гэта можна толькі духоўнасьцю, якой у вас няма шака. Настаў час

узьняць народы мячом альбо маланкай, толькі б абудзіць крык духу.

БЭНЭДЫКТ: Па-іншаму ты ня можаш. Досьвед тваёй расы вельмі небясьпечны і страшны для Касьмічнай Мэтазгоднасьці і Раўнавагі. Яна стварала і працягвае грувасьціць духоўную нікчэмнасьць і ўяўныя каштоўнасьці, бо Дух — Боская Ральля, а не чалавечая. Мае гадаванцы працуюць у асноўным у тэхнатронным рэчышчы, пераўтвараючы свае духоўныя запыты, тым самым агароджваюць душу ад апусташэньня, мітусяніны, марнасьці, на якія хварэюць твае гаротныя.

КАРАЛІНА: А ты, Растан, чаго маўчыш? Гэтыя злыдні хутка захопяць і падзеляць паміж сабой ня толькі Зямлю, але й думкі аб ёй.

РАСТАН: Я не люблю лаянак: яны псуюць асобу і рвуць аўру. Мой край асаблівы: нетры багатыя, паветра празрыстае, стыхіі моцныя — у наяўнасьці ўсе спрыяльныя ўмовы для рознабаковага развіцьця ня толькі цела, але і душы. Праўда, там пусьціў карані жорсткі мужчынскі культ; ён мяне зусім не задавальняе. Пакрысе буду выкарчоўваць. У мяне ёсьць арыгінальная ідэя, укараненьне якой прынясе вельмі добры плён і маім гадаванцам, і ўсяму княству.

КАРАЛІНА: Вы ўсе корпаецеся ў брыдотах, якімі зьяўляецца чалавек, і называеце гэты працэс духоўнымі шуканьнямі. Вы прафануеце Боскую Задуму. Чаму вы вучыце людзей у сваіх тэорыях і рэлігіях? Страху сьмерці! Пра што можа думаць істота, калі яе розум безупынна сьвідруе гэтае пытаньне? Пра Космас? Пра неаб'емнасьць Сусьвету? Пра імкненьні ў Бязьмежнасьць? Толькі пра сябе! Эгаізм ня ведае пра вечнасьць жыцьця, пра адсутнасьць сьмерці і зьневажае Дух. Рэлігіі запалохалі чалавецтва і пазбавілі яго ўтрапеньня. Яны так многа гавораць аб сьмерці,

што й самі памруць, як усе ахвотнікі гэтага, бо будучы стан заключаны ў нашым сьведам'і. Гора, калі замест пазнаньня разрастаецца адмаўленьне і калі існаваньне падточваецца неразумным паняткам сьмерці.

ГАРЫСЛАВА: Маё жаночае сэрца прадчувае ліхое. Бэнэдыкт і Кірыла ўжо неаднойчы былі прычынай мускульных разборак і ваенных схопак. Спыніцеся! Я заклікаю ўсіх да прымірэньня.

ГЕНРЫХ: Гарачыя баталіі і вогненная няўрымсьлівасьць — нашая стыхія. Толькі ня трэба перабольшваць — тут мая дачка вас правільна перасьцярагае. Мне даспадобы ваш кіпучы настрой і адкрытасьць. Некалі з Уладамірам мы гэтак жа натхнёна і палка браліся за ўсе справы — прыемна, што такі парадак захаваўся. Жахліва будзе, калі шэрасьць і раўнадушша паселяцца ў вашых сэрцах, калі вы станеце падманваць адно аднаго, зайздросьціць, употай радавацца няўдачам суродзіча. На жаль, нашыя супярэчнасьці нарадзілі на Зямлі пачуцьцё крайняга антаганізму. Раўнавага парушана. Цемры стала больш, зло паўстала як незалежная сіла і ўвабралася ў розныя жывыя формы. Яно жэрае нашых стварэньняў і перашкаджае нам выконваць сваю задачу. Пагроза рэальна пазначаная. Вось у якім кірунку мы павінныя змагацца. Дзеля гэтага трэба задзіночыцца і ўсю сваю энэргетычную масу прымяніць для ўзбагачэньня сьвятла на плянэце.

МІКУЛА: Раней ты вучыў, што сьвет і цемра могуць супрацоўнічаць.

ГЕНРЫХ: Сёньняшняя Вялікая Рада мяне пераконвае, што абставіны зьмяніліся. Інэрцыя падначаліла многіх. Зямлі патрэбная чарговая порцыя амброзіі і сьвежыя ідэі. Трэба дэталёва ўсё прааналізаваць і толькі апасьля прыняць канчатковае рашэньне. Галоўнае: мы павінныя рашу-

ча і хутка ўзяцца за пераўтварэньні, узьяднацца ўва ўсёй моцы і шчырасьці думак і гнаць ад сябе ўсялякі сумнеў. Нашая грамада дастаткова мудрая і здатная, каб ня збочыць з абранае сьцяжыны, і здолее ўзбагаціць свой духоўны скарб, рэалізуючы сама неверагодныя і адмысловыя задумы. Памятайце добрую асьветніцкую формулу: «Ты можаш усё!» Будзьма ісьці любымі шляхамі, толькі б уверх. Я бачу нас на вяршыні Сьвету. Больш агню, больш ідэяў! За працу!

Энэргетычная ін'екцыя Генрыха станоўча паўзьдзейнічала на агульны настрой. Разнаколерам загуляў агонь Чары. У мажоры загучалі струнныя акорды. Напружаньне зьнікла. Зьявіліся ўсьмешкі, радасьць, узаемаразуменьне.

АЛЬГЕРД: (*пад галасы адабрэння маладні*) Нясецца ў Касьмічным Бязьмежжы Вогненны Дух. Ён запальвае пажадлівыя сэрцы і дорыць радасьць нескончонага будаўніцтва. Іскрыцца і трапеча натхненьне. Мы ведаем, што такое вогненнае супрацоўніцтва і непакорная стыхія барацьбы. Мы клічам вялікую прыгажосьць Сусьвету і жадаем сьцьвердзіць новыя думкі і зьявы ў Неабсяжнай Прасторы.

ГЕНРЫХ: Твой лірычны настрой, Альгерд, зачароўвае. Нашчадкі, я веру ў сама лепшыя наступствы. Вельмі карысна імчаць думкамі да вышыняў, у Космас. Там знойдуцца энэргетычныя камбінацыі для кожнага пытлівага і памкнёнага розуму; там бясконца нараджаюцца, пераўвасабляюцца і злучаюцца ў дзівосныя флюіды нястомныя промні Вечнасьці, якія толькі таго і чакаюць, каб працяць усіхнюю сьвядомасьць і ўісначыцца ў канкрэтныя і жывыя формы, у нашую сфэру.

Дзеяньне, думка, сон — штуршкі сьведам'я ў Космас, яны амаль аднолькавыя па моцы ўзьдзеяньня на вакольле, адтаго

ня мае асаблівага значэньня, ці зрабіў ты нешта, ці падумаў, ці сасьніў, — галоўнае: ты пусьціў да жыцьця канкрэтны твор, вобраз, зьмест, і ад гэтага касьмічная лябараторыя запрацавала.

АЛЬГЕРД: Нашыя пасылкі ў прастору тычацца духовае творчасьці і нясуць зарад вось гэтых гарачых сэрцаў (*паказвае і абдымае паплечнікаў*). Мы не сумуем і не патанаем у скрусе. Мы ніколі нічога і нікога не шкадуем. Сантымэнты не для нас. Радасьць асьвятляе нашыя натхнёныя твары. У нас ёсьць Вялікая Мэта — стварэньне псыхавобразу Зямлі, і дзеля гэтага мы гатовы на ўсё.

МІКУЛА: Сыне, у такім значэньні існуем усе мы, але трэба паважаць законы Космасу і традыцыі.

АЛЬГЕРД: Эвалюцыйны Магніт Сусьвету вымушае нас не зьвяртаць увагі на такія дробязі, як людзі. Калі некага ён не прыцягнуў — прэч з дарогі. Даруйце, бацькі, але вашая палеміка наконт чалавека — дарэмная нэрвовая напруга. Такая пачуцьцёвая вольнасьць супярэчыць агульнае тэндэнцыі. Мы творцы, а людзі — наш будаўнічы матэрыял, такі ж адзінародны, як і ва ўсім Сусьвеце, хоць і сьведамы — так нават цікавей. Мы заўсёды там, дзе трашчыць старое і буяе сьмеласьцю маладое. Мы — гэта буры, штормы, землятрусы, узьлёты асобы, нацыі, расы. Мы разглядаем рознаварыянтнасьць пабудовы чалавечага пласта, шмат мадэлюем, робім сацыяльна-грамадзкія эскізы і маральна-псыхалягічныя камбінацыі, каб намаляваць вялікую карціну псыхажыцьця плянэты. Тое, што не падыходзіць альбо спрацавала, бяз жалю выкідваем. Так трэба для нашага Будынку Духу, такі наш маршрут да Бога. На адным месцы, з канкрэтным народам і ў абмежаваных гістарычных рамках гэта не атрымліваецца. Трэба большы размах. Таму мы выкарыстоўваем панарамныя і ў часе, і ў прасторы пляцоўкі, наводзім масты

паміж будучым, сучасным і мінулым церазь лёсы людзей, шляхам аналёгіі зьяваў, умоваў, асяродку... Іх гістарычнае падабенства — прыкметы нашага вогненнага руху. Заўважайце гэта! Няхай не смуткуюць тыя, хто княжыць у сваіх расавых, нацыянальных, палітыка-ідэалягічных вотчынах; пасягаць на іх мы не зьбіраемся не ад таго, што гэта антыгуманна, а з-за несумяшчальнасьці і другога спэктру нашых ідэяў: яны зьзяюць у абстракцыі, не кранаючы сьвядомасьці масаў, і рэалізуюцца бязь іх уцяму.

ГОСЬЦІ: — Гэта інтэрвэнцыя!

— Рэвалюцыя!

— Бандытызм!

АЛЬГЕРД: Як пажадана, так і мянуйце, але ў гэтым нашае прызначэньне. Чаму вы лічыце, што духатварыць трэба толькі з удзелам людзей? Мы сьцьвярджаем: гэта можна рабіць бязь іх фону, іншым чынам. Вельмі многа ласкі вы ім даяце. Таму і запавольваецца Зямля ў сваім развіцьці.

МІКУЛА: Сёньняшняе чалавецтва — лепшае, што мы стваралі за ўсю Югу. Нашая пляніда — ісьці зь імі да канца. Такі запавет маладому пакаленьню.

АЛЬГЕРД: Сонца абыякавае да таго, хто пад ім грэецца. Калі б яно ведала аб кожнай казяўцы ці травінцы, сьвятло згасла б ужо даўно. Нізкі паклон за вашыя здабыткі, а ў спадчыну мы бярэма толькі магчымасьць творчасьці. Дзякуй за гэта Богу і вам, бацькі.

ІЗЯСЛАЎ: Сонечны Агонь абдымае зрокам Бязьмежнасьці ўсіх. Той, хто хоць аднойчы адчуў цеплыню яго промняў, успыхвае псыхажыцьцём і ўзбагачае агульнае полымя. Трэба берагчы кожную, нават сама кволую, такую іскрынку, бо і яна ўдзельнічае ў Касьмічным Будаўніцтве.

АЛЬГЕРД: Я люблю цябе, брацейка. Твая цнатлівая ўзьнёсласьць лагодзіць усё нутро. Калі б у нас з табой былі ад-

нолькавыя погляды, мы разам зьвярнулі б нават гару Меру. На жаль, там, дзе я будую, ты разбураеш.

ІЗЯСЛАЎ: Я захапляюся тваёй самаадданасьцю, Альгерд. Сапраўды, у лучнасьці нам ня ручыць. Тое, што я лячу, ты калечыш.

ГАРЫСЛАВА: Сыночкі мае, вам падаецца, што вы процілегласьці. Не, вы — зьява аднаго вялікага ланцугу і народжаныя, каб выканаць кожны сваю ролю. Дзякуй Усявышняму за тое, што вы ўжо ўяўляеце, як і дзе гэта зрабіць, і ўнутрана рыхтуецеся да такога доўгага напружаньня. Але вашае пакаленьне павіннае ведаць: Вышэйшы Прынцып Гармоніі адарыў вас сама галоўным выпрабаваньнем — пранесьці цераз усе віхуры ўвасабленьняў і захаваць у сэрцах братэрскую любоў.

ІЗЯСЛАЎ: Не хвалюйся, маці. Нашыя добрыя пачуцьці нішто не астудзіць. Упэўнены, што тая высокая ступень дасканаласьці, якая дасягнутая ў нашым княстве, будзе гэтаму заўсёды садзейнічаць.

КАРАЛІНА: Вы, даражэнькія, дарма разьлічваеце на нейкую дапамогу. Сёньняшняя гутарка паказвае, што ў нашай хаце — ростыргі і кволыя рэсурсы. Нам усё цяжэй ажыцьцяўляць задачы. Так што больш спадзявайцеся на свае здольнасьці, на дадзенасьць. А Прырода, бачу (*нераўнадушна пазірае на Альгерда*), вас не пакрыўдзіла.

МІКУЛА: Гэта праўда: вам складаней. У так званай старажытнасьці героі былі іншыя, ім не патрэбны быў энтузіязм. Адно — похап! Іхныя вычыны былі кароткімі, і адзін выбух агню мог іх насыціць. Цяпер жа вычыны больш працяглыя і патрабуюць вялікіх энэргетычных затратаў, бо зямная атмасфэра амаль вычарпала сілы. Вы павінныя глыбока ўсьвядоміць, што нам няма адкуль чакаць падмогі. На гэтым полі мы адныя.

ЯРЫВЕД: Калі чалавецтва канчаткова здрадзіць Касьмічнаму Вучэньню, яно ўнурыцца ў поўнае неразуменьне — і тады прыйдзе канец. Такое ў Сусьвеце ўжо здаралася.

ІЗЯСЛАЎ: У нас гэтага ня будзе. Зьняважаны дух ня хутка адраджаецца — патрэбны час. Нельга весьці духоўную бітву, калі не пералічыш усе прадоньні і не падрыхтуеш асяродзьдзе. Сябры, людзі чакаюць нас! Мая малітва будзе ў вычыне, і я пачну яе маўчаньнем (*выходзіць з аднадумцамі*).

АЛЬГЕРД: Дзівак, сёньняшнія сфэры плянэты як ніколі шчыльныя. Колькі нашых братоў, Архатаў, згарала ад немагчымасьці зьмясьціць усе Касьмічныя Агні ў зямной абалонцы? Лепш сьцьвярджаць ідэю магутнасьцю Стыхіяў.

НАРЫМОНТ: Зноў занімаецца чырвань разладу, і рэчышча вычынаў запаўняе кроў. Мы ўсё даводзім да абсурду і абражваем чысьціню высокіх задумаў. Дагэтуль зямляне не навучыліся карыстацца агнём. У іх разуменні ён — толькі зьява матэрыі: зьнішчае, але не стварае; ім няўцям, што ёсьць запальваньне цэнтраў альбо Агонь Духу. Фізычны прынцып агню ўкараніўся так глыбока, што многія нашыя духовыя вогненныя высілкі ўзрываюць сьведам'е людзей і сеюць на Зямлі выбухі ды катастрофы. Годзе! Мы павінныя ўлічваць разбалянсаванасьць чалавечага існаваньня, пазьбягаць гвалту і зьнішчальнай тактыкі. Трэба адчуць пульс людзей і набліжацца да іх магнітам сэрца.

Нехта хіхікнуў, хтосьці цяжка ўздыхнуў; многія дэманстратыўна адвярнуліся і пачалі перамаўляцца ў групках.

КАРАЛІНА: (*добразычліва*) Колькі існуе нашае княства, столькі ты, летуценьнік, песьціш сваю думку пра абсалютнае дабро. Нават немаўля кумекае, што Сьвет трымаецца на па-

лярнасьці. Калі на Зямлі такое бязладзьдзе і пануе пераважна зло, то гэта не выключэньне, а правіла. Плянэта хварэе на гарачку атруты — і вінаватыя ў гэтым яны (*паказвае на ўсіх*). Зь імі карысьці не здабудзеш, толькі запэцкаесься. Адна кропля ня зьменіць плынь. Упрагайся лепш са мной у барацьбу з гэтым брудам — будзе весялей.

НАРЫМОНТ: Я ведаю: той, хто мае розум, калі-нікалі прыйдзе да высновы, што выратаваць усіх можа толькі дабро. Яно бязьмежнае ў сваіх магчымасьцях. Як хто гэта ўспрымае, так той і жыве. Клічу ўсіх да мяне дзеля выратаваньня чалавецтва.

ГАРЫСЛАВА: Упэўненая, што нашае шырокае разуменьне эвалюцыі зьмяшчае ўсіхнія творчыя імпульсы і садзейнічае мэтанакіраванаму руху да Бога. Досыць дэбатаў! Вялікая Рада ня можа абысьціся без традыцыйнага тэатральнага відовішча. Слова рэжысэру.

АПАЛЁН: (*узьнёсла*) Поўняцца музыкай касьмічныя сфэры. Імчаць у прасторы натхнёныя ўдзельнікі Вялікай Гульні, запрашаючы на гіганцкі фэст. Увесь Сусьвет — прадстаўленьне. А чалавек — наш тэатар. У ім мы ладзім свае спэктаклі дый выконваем даручаныя ролі. Няма лепшых сцэнічных падмуркаў, каб ужыць свой талент і мастацкі густ, каб узьляцець да вышыняў Творчасьці. Увага, шаноўныя! Сёньня мы слугуем чарговай прэм'ерай.

Акторы выходзяць з натоўпу і кіруюць у бок, дзе ўтварыўся невялікі амфітэатар, частка якога адгароджаная каляровай тканай заслонай з выявамі ведычных знакаў. Яны духам і пачуцьцямі ствараюць вобраз трагічнага каралеўства. Яго пераклад на фізычную мову выглядае гэтак: СІРОЦТВА

АКТОР-1: Каралева Ліцьвінія, бачу: вам самотна?

КАРАЛЕВА: Як ніколі. Сэрца ня стане маніць і хаваць страшэнную праўду: у ім няма больш мейсца для аднолькавай любові да маіх сыноў. Ад усьведамленьня гэтага мне робіцца дрэнна.

АКТОР-2: І што ж наладавала яго такім цяжарам?

КАРАЛЕВА: Апошнія сямейныя праблемы. Мае дзеці заўсёды былі сьмелымі, рашучымі, вельмі дружнымі. Я з замілаваньнем глядзела на іх і не магла нарадавацца. Мне здавалася, што на ўсёй зямлі няма такой братэрскай лучнасьці і ўзаемападтрымкі, як у маіх сыноў. Ды ня толькі я, усе казалі пра гэта і прарочылі нашаму каралеўству вялікую будучыню. Я цешыла сябе надзеяй, што мой род нарэшце пераадолее дастойніцкую грызьню і на яго абсягах усталюецца паразуменне й сапраўдны мір. У глыбіні душы масьцілася радасьць, што мая прыўкрасная краіна можа даць для ўсяго сьвету прыклад новага чалавекаладу. Выходзіць, я ілюзіяністка. Зараз мае сыны разыходзяцца.

АКТОР-3: Вашая імасьць, вы памыляецеся. Сёньня я страчаў іх пасьля паляваньня. Яны па-ранейшаму ветлівыя, абдымаюць адзін аднаго, жартуюць дый частавацца пайшлі разам.

КАРАЛЕВА: Матчынае сэрца — лепшы баромэтар. Яны нават самі не заўважаюць, як разьлятаюцца ў розныя бакі, хоць вонкава гэта не прыкметна. У духу яны ўжо розныя.

АКТОР-4: А з чаго вы так вырашылі?

КАРАЛЕВА: Розум стаў прыгнятаць іхныя душы. Усё, што можна было зрабіць супольна, яны пажадалі ажыцьцявіць паасобку. Я ня супраць індывідуальнага сталеньня і самастойнасьці, але ведаю, што там, дзе пралягае мяжа, сядзіць нячысьцік. Ён з асалодай ухапіўся за маіх сыноў, і ў ход пайшлі хітрасьць, ліслівасьць, ашуканства... Мне робіцца блага. Няхай далей распавядуць летапісцы.

ЛЕТАПІСЕЦ-1: Браты часьцей загаманілі пра прыватную ўласнасьць, сям'ю, дзяцей. Абодва цікавіліся гэтымі пытаньнямі, бадай, у аднолькавай ступені, а вось у спосабах іх вырашэньня імпэт выяўлялі розны.

ЛЕТАПІСЕЦ-2: Аднаго незалежніцкая ідэя захапіла да ўтрапеньня, вельмі карцела збудаваць уласную гаспадарку. Маючы галаву на плячах, ён пайшоў мудрым шляхам. Узброіўся гістарычнымі ведамі пра свой радавод, прыцягнуў дасьведчаных дарадцаў, прааналізаваў досьвед іншых. Ня ўсё было гладка, не абышлося безь перагібаў, але ўвогуле гэта была станоўчая і натхняльная праца. У выніку была створаная невялікая, але духова магутная краіна. Яе насельнікі пачувалі сябе добра, карысталіся павагай суседзяў.

ЛЕТАПІСЕЦ-3: Другі марудзіў. Не ад ляноты, а ад няўцяму: навошта свая хата, калі ў грамадзе зручней? І іранічна назіраў за дзіваком-братам. Можа, і яму пашанцавала б зь цягам часу, але чорт зблытаў яго з суседам-недарэкам, які ад сваёй недалужнасці не любіў ствараць, слыў гультаём ды абадранцам і быў вельмі ласы на чужыя каўбасы. Дабрыня, памяркоўнасьць і непатрабавальнасьць каралевіча прыйшліся яму да густу, і неўпрыкметку ён паклаў свае лапы на ўсю ягоную маёмасьць. Па-драпежніцку былі зьнішчаныя засабы, спадчына і гонар продкаў. Прыйшоў рэзрух. Хутка яны пачалі звацца братамі, перад тым перапісаўшы гісторыю пад адзін капыл. Безупынная хлусьня заліла ўсе абшары.

КАРАЛЕВА: Апасьля так адбылося, што мае сыны, на радасьць зласьліўцаў, пасварыліся і заварагавалі. Паліліся абвінавачваньні, абразы, нянавіднасьць. Хітры сусед падліваў масла ў вагонь. Я, як магла, імкнулася спыніць вайну і прымірыць сыноў, але наканаванае было іншае: яны пайшлі рознымі шляхамі.

АКТОР-5: Вашая імасьць, вы зводзіце сябе дарэмна: гэта банальная гісторыя, і назіраецца яна амаль на кожным каралеўскім двары.

КАРАЛЕВА: Разумею, але я маю на ўвазе не велікасьвецкі бруд, а свае чалавечыя пачуцьці. Менавіта яны зараз вызначаюць. Гэтыя шалі — сама справядлівыя. Старэйшы сын прыкладае высілкі для таго, каб захаваць ды памножыць славу свайго роду, каб свае землі і народ зрабіць паважанымі ў сьвеце, а малодшы страціў гонар, мужнасьць, памяць і ганьбіць край. Страшна тое, што ён перастаў гэта разумець і паўсюдна мовіць пра нейкі інтэрнацыяналізм. Па-матчынаму мне шкада яго, і я не губляю надзеі, што ачмурэньне зьнікне, ён ачуняе і пойдзе за сваім братам. У сэрцы страшэнная бура. Ён зрабіў усё, каб зьнішчыць любоў да яго.

АКТОР-6: А літасьць?

КАРАЛЕВА: Яе хапае, але ж нелюбоў мацней. Я ведаю, што безь любові і дабраславеньня ён ня вылечыцца і ня ўздыме галавы. Будзе гінуць ад цяжару нягодніцкіх ідэяў, пакуль ня ўспырхне ўсьведамленьне, што выратаваньне ў адраджэньні, у радаводзе. І я да тае пары анічога не зраблю, бо няма шляху. Спадзяюся, бо ведаю: любоў вяртаецца ад розуму.

Апладысмэнты.

ГАРЫСЛАВА: А ты, Апалён, усё мудрагеліш. Хіба можа хто з гэтай буйной дынастыі асірацець?

АПАЛЁН: (*двухсэнсоўна*) Калі мы таго пажадаем. А гэта адбылося — і дынастыя выявіла сіроцтва духу. Лёс разарваў яе ланцуг. Чалавек — адна з багацейшых істотаў Сусьвету, але някемлівы гаспадар дый з дрэннай памяць-

цю. Ён не ўсьведамляе, што кожная ягоная якасьць, нават сама драбнюткая, — гэта вынік доўгага, цяжкага і змагарнага існаваньня мільярдаў і мільярдаў жыцьцяў у шматмернасьці неабсяжнага Космасу, што трэба берагчы і памнажаць у сабе дасягненьні, умацоўваць сваю сутнасьць. На ягоным рахунку мноства духоўных паразаў. Стагодзьдзямі бяз працы ачышчэньня і абнаўленьня душы спажывалася пітво са студні-духу аж пакуль не змарнелі жываносныя слаі і не спарахнелі сувязі з Усясьветнымі Сфэрамі. Людзі, не зважаючы на гэткую вялізную касьмічную страту, працягвалі неяк клеіць жыцьцё асобаў, народаў, дзяржаваў. І аднойчы ў адным магутным каралеўстве на высокім узроўні прарвала... Уявіце, колькі такіх маленькіх ды вялікіх дзірак у душы чалавецтва за ўвесь пэрыяд існаваньня Зямлі!

МІКУЛА: Ты маеш рацыю: чалавек — наш тэатар, а ён пасур'ёзнеў, як і ўвесь сьвет. Хіба ўсмешка ўжо больш не стварае? Ці патрэбна заўсёды плакаць, каб данесьці існасьць? Наогул, наколькі мэтазгодны ён, наш тэатар? Якую ролю выконвае, каго цешыць, каму спрыяе? На маю думку, ён пакутуе ад празьмернай умоўнасьці, фармалізму, бясслоўя. Песьні, музыка, сьвятло, настрой і шмат іншае, што павінна суправаджаць паўсюднае існаваньне жывых істотаў, аздабляць прыгажосьцю ўвесь зямны соцыюм, — усё гэта мы ўціснулі толькі ў адну форму — чалавека, не зважаючы на разнастайнасьць іншых сцэнічных падмуркаў Сусьвету. Калі мы выйдзем за чалавека, на шырокія Касьмічныя Прасторы і ажыцьцявім пастаноўку ў новым тэатры?

АПАЛЁН: Цяжка сказаць. Мабыць, тады, калі раскрыюцца таямніцы чалавечай душы. Усе людзі жывуць у абдымках Майі, вялікіх і малых ілюзіяў. Адзін успрымае і будуе рэчаіснасьць як драму, другі як камэдыю, трэці як трагедыю, чацьверты як фарс — гэты ланцуг бясконцы. Яно так

задумана. Для самаўдасканаленьня — таксама. І, можа, было б ідэальна, калі б не адная асаблівасьць: кожны зь іх існуе паасобку, а Космас — усё-такі грамада, дзе мікрасьветы датыкаюцца, злучаюцца, пераплятаюцца... Нашыя ж гадаванцы — эгаісты, абмежаваныя фізычна-эмацыйна-мэнтальна, адтаго і супярэчнасьці, і варажнеча...

МІКУЛА: Ці варта наогул спрачацца і ствараць усё новыя тэорыі для выказваньня нейкіх там ідэяў? Усяго столькі многа, што чалавек, як адзінка сьветаўспрыманьня, ня здолее ўсё ахапіць. Зручней было б раскаваць розум і надзяліць кожнага прыроднай здольнасьцю пазнаваць і бачыць унутраную сутнасьць рэчаў... Мо тады працэс удасканаленьня пайшоў бы шпарчэй?..

Многія зьдзіўленыя і ў непаразуменьні пераглядаюцца.

УЛАДАМІР: (*незадаволена, але мякка*) Табе, сынок, не да твару сумнеў. Наш сьцяг — рашучасьць. У нас ёсьць плян, і ён ня выкананы. Нашая Чара яшчэ няпоўная ад Касьмічнай Жывіцы, а ў сэрцах па-ранейшаму ўздымаецца вогненны прыліў. Да вычынаў!

Паўсюль актыўны рух, сьвятло, музыка.

## ВЫЯВА ДРУГАЯ

Зьяўляецца Агнія, павольна крочыць, не заўважаючы Людвіку, якая ля Чары моліцца.

АГНІЯ: (*пра сябе*) Расхінулася брама Вечнасьці.

Весела пырснулі промні

І заказыталі мяне ў радасьці:

«Пойдзем з намі! Пойдзем з намі!»

А маё сэрца азірнулася:

Ты яшчэ ідзеш.

Я чакаю цябе, любы.

Што мне Вечнасьць без цябе?

ЛЮДВІКА: Агнія! Дабрыдзень!

АГНІЯ: Бабця! (*Кідаецца ў абдымкі*) Дзень добры!

ЛЮДВІКА: Як я рада табе, унуча! Даўно цябе ня бачыла. (*Прыглядаецца да яе*) Ты нібыта зьбянтэжаная. Здарылася што?

АГНІЯ: На Зямлі заўсёды што-небудзь здараецца. А ты, бабуля, чаго тут? Давай разам вершы складаць ды песьні пець.

ЛЮДВІКА: Родненькая мая, ты яшчэ ў гарачцы пераходу. Відаць, цябе нечакана выправілі дахаты. Табе дрэнна? Адпачні і раскажы пра сябе.

АГНІЯ: Мне ўжо няблага, толькі вось сум не адпускае сэрца. А дзе яны?

ЛЮДВІКА: Хто, сонейка маё?

АГНІЯ: Людзі. Іх было шмат. Яны ўсе злаваліся, крычалі, пагражалі мне...

ЛЮДВІКА: Не хвалюйся, тут толькі мы з табой. Ты дома.

АГНІЯ: (*абводзіць позіркам ваколье*) Сапраўды. Я і не заўважыла. Мяне яшчэ не пакінула жудасьць адзіноты, якая мне напаткалася там (*паказвае навонкі*). Бабуля, як гэта страшна, калі ты адная на Зямлі! Твае чалавечыя пачуцьці, здольнасьці, разуменьне — усё кіпіць, прагне ўзаемінаў, сугучча... і — які жах! — застаецца без адказу. За адно ўвасабленьне можна звар'яцець. А людзі прызвычаіліся: фізычна яны ў грамадзе, а ўсім астатнім паасобку, у адзіноце — і не ўсьведамляюць сваёй стратнасьці.

ЛЮДВІКА: Ведаю, унучка. Яны — няшчасныя стварэньні, і, пэўна, добра, што гэтага не разумеюць. У Космасе ўжо даўно глядзяць на іх са шкадаваньнем. Чыстай душы зь імі вельмі цяжка, лепей наагул ня быць.

АГНІЯ: А чаму так, бабуля? Гэта ж нашыя дзеці.

ЛЮДВІКА: Недагледжаныя і пакрыўджаныя дзеці. Усё было б добра, калі б Уладамір са сваімі прыхільнікамі аднойчы не надзялілі іх вышэйшай якасьцю — розумам — у спадзеўцы на больш інтэнсіўнае разьвіцьцё. Я папярэджвала аб небясьпецы такога хуткасьпелага і неўзважанага рашэньня. Ня можа розум існаваць без скажэньняў у такіх шчыльных матэрыяльных умовах, як на Зямлі, у адным целе, побач з такімі ж свабоднымі душою і пачуцьцямі; грубыя эмацыйныя і фізычныя мутацыі непазьбежныя. Мяне не паслухалі, і ты бачыш, што з таго атрымалася. Зараз усе мяркуюць неяк выправіць гэтае становішча, твораць розныя камбінацыі, але пакуль нічога не атрымліваецца. Бяда адтаго, што людзкі розум пачаў выяўляць усё больш незалежнасьці ад нас, узганарыўся і, як заўсёды ў такіх выпадках, збочыў з Боскага Бальшаку.

АГНІЯ: Мяне гэта вельмі непакоіць. Я ўпэўненая, што іх выратуе каханьне, і кожнае сваё ўвасабленьне вучу іх гэтаму пачуцьцю. Але яны ўпартыя ад эгаізму, лічаць сябе вянцом Тварэньня, роўнаснымі з Богам і не жадаюць нічога ўспрымаць. Я злуюся на іх і ў той жа час люблю. Памятаеш, як пад час Атлянтыды я імкнулася прымірыць іх зь небам, ліквідаваць шкодныя магічныя абрады, а яны пасьмяяліся зь мяне і справакавалі на заўчасны адыход. А пазьней, калі ў манаскай апратцы я несла ім асьветніцкую праўду, дзікуны-крыжакі згвалтавалі мяне.

ЛЮДВІКА: Нацярпелася ты. І ўсё-ткі такой разгубленай, як цяпер, не была ніколі.

АГНІЯ: Бабуля, я, мабыць, недалужная і няздатная, бо ў каторы раз мяне пагналі.

ЛЮДВІКА: Не хвалюйся, ты вельмі здольная.

АГНІЯ: Што ім не спадабалася? Я духам сваім сплятала вершыкі і песенькі ды сэрцам узбагачала радасьць зямную. А яны сталі судзіць мяне, зьневажаць, зьнішчаць маю лучнасьць з Вышынёю і патрабаваць ад улад расправы нада мною. Такіх зьдзекаў яшчэ не было! Я занядужала ўсімі іх хваробамі і ў непрытомнасьці пайшла зь Зямлі.

ЛЮДВІКА: Тое, што зрабілі з табой, даўно стала нормай сярод людзей. Зло так увабралася ў зямное жыцьцё і парушыла здаровы сэнс, што тамака ягоныя носьбіты адчуваюць сябе вельмі спраўна, а праведнікі спазнаюць усё новыя мучэньні.

АГНІЯ: Бабуля, няўжо на Зямлі ўсё такое шэрае, смуроднае і ўжо няма нічога прыгожага й сьветлага?

ЛЮДВІКА: Адчаго ж, ёсьць, але мала і становіцца ўсё меней. Сёньня гэта — кветачнае царства, блакіт нябёсаў, сонечныя промні, асабліва раніцой, дзіцячыя ўсьмешкі — увогуле тое, ад чаго трапеча і ўздымаецца душа.

АГНІЯ: Бабулечка, значыцца, існуюць яшчэ магчымасьці, каб прабіцца да чалавечага сэрца і растапіць яго холад.

ЛЮДВІКА: Безумоўна, галоўнае — патрапіць на месца своечасова, а ты, сонейка маё, бывае, сьпяшаесься, а пасьля ад гэтага пакутуеш.

АГНІЯ: Здараецца такое. А яшчэ я стала прыкмячаць, што пасьля чарговага паходу на Зямлю ўнутрана мяняюся, быццам цяжэю пачуцьцямі і думкамі.

ЛЮДВІКА: Я таксама. Ты ж ведаеш: у нас больш тонкая сутнасьць, чым у людзей, і, якое б ні было апусканьне ў чалавечыя эманацыі, мы ўсё адно вэдзгаем сябе зямным. Трэба чысьціцца.

АГНІЯ: Так, я спачну, глытну каліўца амброзіі для моцы і зноў пайду туды.

ЛЮДВІКА: Не сьпяшайся. Ты была там мноства разоў і ўжо набліжаесься да таго моманту, калі павінна адчуць тое галоўнае, дзеля чаго ўвасабляесься і наогул існуеш. Уважліва слухай сябе.

АГНІЯ: Я распавяду, што адбылося са мной на Зямлі. Аднойчы зусім выпадкова і нечакана на адным зь перакрыжаваньняў лёсу мы пабачыліся. Нашыя позіркі сустрэліся на хвілінку, у імгненьне агеньчык аблашчыў усё маё нутро, і я зразумела: гэта ён. Але мы не падзякавалі Богу за спатканьне, не спыніліся, а бяздумна разышліся. Вочы — гэта наш скачок у Вечнасьць, а ў яго яны былі асаблівыя: глыбокія, блакітныя, і вось туды я кінула свой гарачы пагляд, які, упэўненая, іскрынкай асеў у ягонай душы. Мой суджаны не ўсьведамляе, якую трапяткую часьцінку мяне носіць з сабой. Яна, няўрымсьлівая, стукаецца ў кожны закуточак ягонае сьвядомасьці, каб узбудзіць яе і засьведчыць аб сабе: то прарвецца салодкім сном-успамінам, то народзіць незразумелы сум, то сьцісне сэрца, то пройдзецца нудой па ўсім целе. А аднойчы, калі ўзбуйнее, яна пакліча майго суджанага ў дарогу. У адчаі ён будзе блукаць па нязведаных сьцежках, цягацца па тлумных вуліцах, стукацца ў незнаёмыя дзьверы, спазнае глыбіню і вышыню, пакуты і боль, пакуль зноў на ростанях Сусьвету ня стрэне мяне. Я чакаю гэтага моманту і малюся за яго.

ЛЮДВІКА: Малайчына, у цябе добры настрой. Я вельмі радая. Толькі памятай: нічога выпадковага ў Сусьвеце няма, усё мае сэнс.

Навальніцаю і музыкай поўніцца прастора. Агнём гуляе Чара Грааля.

ЛЮДВІКА: Прабач, мне пара (*выходзіць*).

Агнія заўважае вобраз Рагнеды. Словы гучаць у этэры, а не на вуснах гераіняў.

РАГНЕДА: Акіян бруду разьліваецца па Зямлі. Чысьціня чалавечых душаў танюсенькім ручайком цурчыць у неба — гэта твае перамогі, Агнія. Але побач крывавыя цені прагнуць паскудзтва. Сьцеражыся іх!

АГНІЯ: Сьвятая Рагнеда, заступніца нашая, бабуленька! Твая шчырасьць і дабрыня ня маюць межаў. Усімі сваімі штохвілінными памкненьнямі я цягнуся да цябе. Дай разуменьне тваіх дзіўных словаў.

РАГНЕДА: Пакуль не хадзі да людзей у іхнай форме — гора будзе.

АГНІЯ: Гэта немагчыма: мяне клічуць дух мой і чалавечая смага.

РАГНЕДА: Перачакай гэтае ўцелаішчаньне.

АГНІЯ: Як?

РАГНЕДА: Кветкай разгарніся — і ўзбагаціш прыгажосьць на плянэце.

Рагнеда зьнікае, на яе месцы ўтвараецца абстрактная музычна-праменістая фігура, якая набліжаецца да Агніі, лашчыць і паглынае яе.

Размаўляючы, выходзяць Алесь і Данель.

Дзяўчына для іх нябачная.

ДАНЕЛЬ: Увогуле, Алесь, сюды я не на аладкі.

АЛЕСЬ: Зноў благая навіна, Данель?

ДАНЕЛЬ: Гэта як хто тлумачыць. Мая справа — абвяшчэньне. А яно ня мае ні паху, ні колеру. Як прычыніцца да яго?

Асабістая справа і лёс кожнага. Я заўсёды побач з надзеяй і праўдай. Нясу гэтыя вугалькі па ўсяму Сусьвету і дапамагаю палаць Вялікаму Вогнішчу.

АЛЕСЬ: Узьнёсла і справядліва. Паважаю твой занятак. Ён нечым падобны на мой: тое ж безупыннае касьмічнае падарожжа і такія ж нечаканасьці на бязьмежных сусьветных ландшафтах. Мужнасьці табе!

ДАНЕЛЬ: Бывай!

Разьвітваюцца. Прамяністая фігура, выслабаняючы Агнію,ператвараецца ў вялікую сонечную галу, якая залівае ранішнім сьвятлом наваколье.

Алесь становіцца на калены і пачынае шаптаць пацеры. Агнія заўважае Алеся. Ад нечаканасьці губляецца.

АГНІЯ: Ты чытаеш маю малітву?

АЛЕСЬ: (*зьдзіўлена*) Не, яна мая. Кожную раніцу зь першымі промнямі сонца я пасылаю яе Богу, каб узбуйніць жыцьцядайны прыліў псыхічнае энэргіі.

АГНІЯ: А ў маёй душы яна гучыць заўсёды і вельмі асабова. Ніколі ня думала, што хтосьці загаворыць маімі словамі і так палка, як ты.

АЛЕСЬ: Я таксама сьцярог яе глыбока ў сэрцы і быў упэўнены, што маё ня можа быць яшчэ чыімсьці. Ня памятаю, калі ўва мне нарадзіўся гэты ўзьнёслы матыў, але ён загучаў асабліва моцна пасьля таго, як у адзін з далёкіх момантаў майго жыцьця няўрымсьлівая прага ахінула мяне і пацягнула да касьмічных гасьцінцаў.

АГНІЯ: І што ты напаткаў? Ці згасіў свой гар?

АЛЕСЬ: Мяне выпрабоўвалі агонь і вада, сьвятло і цемра, усе знакамітыя жарсьці Суьсвету — і нідзе не знайшлося патолі. Я не зьняверыўся, бо ўпэўнены, што ў гэтым Бязьмежжы ёсьць той голас, які кліча мяне і не дае заспа-

коіцца. Трэба толькі больш і часьцей слухаць сябе, не зважаць на дробязі.

АГНІЯ: Менавіта так.

АЛЕСЬ: У рэшце рэшт мне дазволілі ўсьперці на свае плечы цяжар вандроўніка, і я стаў крочыць ад зоркі да зоркі ва ўсіх кірунках быцьця, радуючыся такому высокаму прызначэньню.

АГНІЯ: А чым яно цябе вабіць?

АЛЕСЬ: Табе сапраўды гэта цікава?

АГНІЯ: Безумоўна. Тое, што я назапасіла дагэтуль, — кропля ў параўнаньні з тым, чым напаўняецца мая душэўная скарбонка цяпер.

АЛЕСЬ: Кажаш ты дзіўна, мне падабаецца і хочацца распавядаць табе ўсё больш і больш. Дык вось. Ты, мабыць, ведаеш: па нашым Сусьвеце рассыпанае незьлічонае мноства незвычайных кропак. Яны маюць прамыя дачыненьні да Найвялікшага Майстра і разьмеркаваныя не хаатычна, а мэтанакіравана, па строга вызначанай сістэме. За гэтым парадкам схаваная Тайна Ўсіх Тайнаў, якая вядомая толькі **САМОМУ**. Кажуць, што ў сваёй сукупнасьці гэтыя кропкі могуць даць хоць і прыблізнае, але ўяўленьне аб **ІМ**. Я і мае сябры прыглядаем за імі, назіраем за абастоўкай вакол іх, дыягнастуем акаляючае асяродзьдзе. Мне таксама не дазволена аб усім распавядаць. Скажу толькі, што гэтыя кропкі-маякі — інфармацыйна-энэргетычныя вузлы ўсекасьмічнага шматканальнага абмену. У розных галяктыках яны выглядаюць па-свойму і належна ахоўваюцца. Побач зь імі заўсёды тайба.

АГНІЯ: А як у нас?

АЛЕСЬ: На вашай плянэце яны замаскаваныя пад курганы, горныя канструкцыі, могуць быць у пустынях, глыбока пад вадою і зямлёю. Аднойчы я быў тут.

АГНІЯ: (*устрапянулася на імгненьне, трохі расчараваная*) Я думала ты — узьнёслы і мужны вандроўнік-летуценьнік, як кажуць на Зямлі, гэткі рыцар, а ты нясеш у сабе тайну адвечнае барацьбы, Вышэйшы Сэнс, Заданьне, аб зьмесьце якога ад цябе я не пачую ніколі.

АЛЕСЬ: (*у захапленьні*) Так яно і ёсьць. Гэта нас толькі так называюць — вандроўнікі. Мы хутчэй патужнікі, спачынцы. Нам не бадзяцца па Сусьвеце бяз мэты, а суцэльным імкненьнем гарэць на шляху да Праўды і Дабра, духам імчаць да Вышэйшага Сьвятла. Калі пэрспэктыва агульнага пляну ясная, можна прайсьці ўсе перашкоды.

АГНІЯ: (*больш сабе*) Значыць, і на гэты раз агеньчык не давёў яго да мяне. Ён яшчэ блукае.

АЛЕСЬ: Я надакучыў табе?

АГНІЯ: Не, зусім наадварот, я ўважліва слухаю і ўглядаюся ў цябе.

АЛЕСЬ: Вінаватая мая нястрыманасьць. Не разумею, адкуль яна ўзялася? Наогул я не гаманкі. Але з табою мне хочацца гаварыць і гаварыць.

АГНІЯ: Маё імя Агнія.

АЛЕСЬ: Прабач, мы не пазнаёміліся. Во дуравей! Што гэта са мною? Мяне клічуць Алесем.

АГНІЯ: А гэтым разам, Алеська, што цябе прыцягнула да нас?

АЛЕСЬ: Я хацеў бы сказаць: абавязак, бо нашыя маякі на Зямлі пачалі працаваць арытмічна. Але гэта будзе толькі частка праўды. Унутры мяне ўздымаецца невядомая стыхія, якая пачынае гуляць тым саладзей, чым я бліжэй да вас.

АГНІЯ: (*двухсэнсоўна*) Да нашага сьвету ўвогуле альбо да некага канкрэтна?

АЛЕСЬ: Ня ведаю. Акрамя цябе я тут яшчэ нікога не страчаў. І мне вельмі добра. Можа, і зь іншымі таксама будзе? Тады ўсё значна прасьцей, чым мне падаецца.

АГНІЯ: На гэтым лузе тваёй можа быць толькі адна кветка.

АЛЕСЬ: Мне трэба на гэты луг.

АГНІЯ: Дарэчы, я зноў выпраўляюся на Зямлю.

АЛЕСЬ: І ў якасьці каго?

АГНІЯ: Цяпер я наведаю царства флёры.

АЛЕСЬ: А чаму не чалавека?

АГНІЯ: Ён у вялікай злачыннай спакусе, і яго трэба выратоўваць прыгажосьцю зямной прыроды.

АЛЕСЬ: Ты мяне бярэш з сабою?

АГНІЯ: Мы разам ужо даўно. Але агонь павінен шугаць. Жадаю перамогаў! (*Накіроўваецца да выхаду.*)

АЛЕСЬ: Дзякуй. Загадкавая ты.

АГНІЯ: (*паварочваецца*) Калі на Зямлі стрэнеш кветкі — ня рві, сярод іх я буду. (*Выходзіць.*)

Алесь глядзіць ёй усьлед, нейкі момант стаіць у задуменьні і нетаропка пакідае прастору.

Уваходзяць Генрых і Людвіка.

ГЕНРЫХ: Я разумею тваю прынцыповую пазіцыю і таксама змагаюся за парадак і згоду ў нашым княстве, але без адчаю і ў больш памяркоўным стылі.

ЛЮДВІКА: Канешне: ты ж суаўтар Уладаміра.

ГЕНРЫХ: У цябе няма вытрымкі.

ЛЮДВІКА: Мне не хапае рашучасьці і аднадумцаў. Але, я ўпэўненая, яны хутка зьявяцца.

ГЕНРЫХ: Людвіка, дарагая, гэта ня той выпадак, калі трэба расьсякаць вузел. Усё можа паляцець у тартарары разам з намі. Я бачу сур'ёзныя недахопы нашае праграмы, неда-

сканаласьць яе выканаўцаў і сёньняшняга кіраўніка. Варта дэталёва вывучыць сітуацыю і магчымасьці кожнага, а затым праводзіць рэформы, толькі не рэвалюцыйным махам.

ЛЮДВІКА: Усё і так зразумела. Я не задаволена існуючай сістэмай. Мы павінныя спыніць Уладаміра — і як мага хутчэй. Зямля ляціць у багну! Мне горка, што дачка Гарыслава з-за гэтага вельмі перажывае. Нялёгка ёй у такой сямейцы.

ГЕНРЫХ: У яе свая галава на плячах. Яна ў нас самастойная, як матуля.

ЛЮДВІКА: Гэта мяне і цешыць. Характар у яе разважлівы і сьмелы, у крыўду сябе ня дасьць. А Ўладаміра трэба пастаянна пакусваць, каб зусім не звар'яцеў.

ГЕНРЫХ: Мы самі загналі сябе ў пастку. Нам нельга пайсьці на крайнія меры і зьнішчыць плянэту альбо закрыць вымярэньне, бо куды будуць трапляць грэшныя душы людзей: месца ім ня будзе, а другім Княствам яны непатрэбныя, там сваіх хапае. Ніхто не пагодзіцца, каб яны бяздомнымі і злымі блукалі ў Суьсвеце вечна.

ЛЮДВІКА: Я люблю гэтых бедных авечак і шкадую, бо ў іх несамавіты гаспадар.

ГЕНРЫХ: Я аглядаў зямныя пласты, некаторыя зь іх могуць адпавядаць чалавечаму арганізму, калі ажыцьцявіць адпаведную энэргетычную перабудову. Перасяляць туды людзей магчыма.

ЛЮДВІКА: (*зацікаўлена*) І без чарговай катастрофы? Гуманны варыянт. Ты, Генрых, мяне зьдзіўляеш. Малайчына!

ГЕНРЫХ: (*пяшчотна*) Толькі калі ты побач.

У замілаваньні выходзяць. Вынікаюць узбуджаныя Караліна і яе сябры, сярод якіх Вінцэнт.

КАРАЛІНА: Не апраўдвайся, Вінцэнт. Абставіны мы ствараем самі. Мне прыкра ад таго, як ты павёў са мною апошнім разам.

ВІНЦЭНТ: Даражэнькая, я зноў паўтараю: калі б ня людзкая намова, мы з табою яшчэ б доўга мілаваліся на троне.

КАРАЛІНА: А ты хіба чалавек, што зважаеш на плёткі? Твой дух не павінныя ўзрушваць зямныя жарсьці. Мы толькі карыстаемся імі, каб больш удала і трапна ўкараняць сярод людзей свае ідэі.

ВІНЦЭНТ: Але ж калі трапляеш у гэты грэх, то ён так цябе можа запаланіць, што забудзеш пра сваё прызначэньне.

КАРАЛІНА: Табе, Вінцэнт, ня гожа так гаварыць. Альбо гэта твае хітрыкі, альбо ты зусім зьнясілеў ад частых зямных увасабленьняў. Можа, жадаеш адпачыць у іншых пластах?

ВІНЦЭНТ: Не, любая. Я не магу існаваць безь цябе. Нам усім (*паказвае на сяброў*) наканавана быць разам. Нашае вогнішча мы запальвалі і падтрымліваем гуртам. Толькі ты ярчэйшая і мацнейшая сярод нас. Даруй мне мае памылкі.

СЯБРЫ: — Прабач усіх нас, Караліна.

— Мы вінаватыя.

— У наступны раз усё будзе інакш.

— Мы выправімся.

КАРАЛІНА: (*больш мякка*) Вось так заўсёды: перад вандроўкай на Зямлю абяцаюць горы, пасля яе каюцца. Гарачыя і рызыкоўныя вы ў мяне. Яшчэ не надакучыла гарэзьнічаць? Разумею: без вычынаў мы як рыба без вады. Люблю ўсіх вас і сьцерагу. Але скажыце: чым так захапіла Вінцэнта дый вас таксама гэтая сьмяротная дзеўка, што мне, царыцы, прыйшлося ўступіць ёй сваё месца? Розумам? Адукаванасьцю? Ці сваімі жаночымі якасьцямі?

ВІНЦЭНТ: У гэтым бясспрэчнае першынство належыць толькі табе.

КАРАЛІНА: (*захоплена раптоўным успамінам, нібыта сабе і ўдалячынь*) Так, па іх гісторыі я добра прайшлася, толькі яны гэтага чамусьці ня ўлічваюць, у адным з жыцьцяў нават была цудоўнай гетэрай: каралі поўзалі ля маіх ног. (*Вяртаецца да ранейшай размовы*) Дык чым жа?

Кавалеры адчуваюць сябе няёмка і маўчаць.

КАРАЛІНА: (*нібыта здагадліва*) А-а! Сорамна мне аб гэтым ня помніць: мужчына — гэта тая жывёліна, якая вельмі ахвочая да разнатраўя, і ў асноўным маладзенькага ды сьвежанькага. Зусім зганьбілі каханьне. Калі яно і зьнікне з твару Зямлі, дык толькі па віне мужчынаў.

ВІНЦЭНТ: Ты ж ведаеш, Караліна, якія людзі недасканалыя тварэньні. Паміж мужчынамі і жанчынамі ніколі няма гармоніі. Усё сваё кароткае жыцьцё яны імкнуцца прыстасавацца адно да аднаго, але здараецца гэта вельмі рэдка дый на кароткі тэрмін. А так большасьцю блукаюць па жыцьці бязмэтна і ад суму паскудзяць вакол сябе.

КАРАЛІНА: За гэта трэба сказаць дзякуй Уладаміру. Гэта ён некалі, як мяснік, расьсек іх на дзьве няроўныя палавінкі, маўляў, будуць шукаць адно аднаго, каб злучыцца, і шпарчэй пойдзе эвалюцыя. Ага, яны так забегалі ў пошуках па плянэце, што пераблыталіся, абшмулялі сваё цела і душу грубай матэрыяй, забыліся пра ўсё і запаволіліся ў разьвіцьці. А галоўнае: у гэтай няспыннай сумятні зь іх галоў выветрылася думка пра Бога, а безь Яго няма аніякага існаваньня.

ВІНЦЭНТ: Зараз мы назіраем страшэнную зьяву: мільярды чалавек нават не ўсьведамляюць, што ад немагчымасьці знай-

сці сваю палову яны зрабіліся фізычна і псыхічна непаўнацэннымі і далёка адышлі ад ідэалу, ад таго, кім былі. Усё атрымалася наадварот: мужчыны і жанчыны на Зямлі замест таго, каб імчаць насустрач, разьлятаюцца ў розныя бакі і тым самым памнажаюць свае пакуты. Шкада.

КАРАЛІНА: (*жартаўліва*) Няўжо? Многім жа з вас яны падабаюцца: як толькі ўмовы пасьпеюць — вы адразу ж на Зямлю.

ВІНЦЭНТ: Такі наш абавязак.

КАРАЛІНА: (*сур'ёзна*) Разумею. Сама такая. Мы павінныя шырока распусьціць ружу пачуцьцяў і інтыму людзей, распаліць гэтую сфэру так, каб хутчэй выявіць усе чалавечыя здольнасьці і шляхам інтэнсіўнага выкарыстаньня вычарпаць усе іх да кроплі...

ВІНЦЭНТ: (*працягвае ў захапленні*) І тады Зямля згубіць усе магчымасьці прымаць новыя душы і даваць ім жыцьцё. Гэта значыць, мы прадухілім паступленьні гаротных у гэты пякельны вір. Яны будуць увасоблены ў больш дасканалых краёх Сусьвету.

КАРАЛІНА: (*сьмяшліва*) Адчаго ты так радуесься? Грэе прадчуваньне перамогі?

ВІНЦЭНТ: Менавіта. Вельмі б хацелася, каб гэты агонь (*паказвае на Чару*) шугаў толькі ад нашага настрою.

КАРАЛІНА: Максымаліст. Спачатку нам трэба ўзьняць кастрышчы ў сэрцах зямлянаў, а ўжо затым духатварыць тут.

ВІНЦЭНТ: Так. А ў якой сфэры мы будзем працаваць наступным разам?

КАРАЛІНА: (*наўмысля засяроджана і быццам помсьліва*) Мяне захапіла дзіўная ідэя — гэта, мабыць, кармічны імпульс: каб нікому з нас не балела, у чарговым увасабленьні я буду царом, а вы ўсе маімі палюбоўніцамі. Вось толькі трэба знайсьці прывабнае сацыяльнае і маральнае асяродзьдзе.

Ад нечаканасьці ўсе зьдзіўленыя, занепакоена пераглядаюцца, апасьля пачынаюць жартаваць і эмацыйна распальвацца.

СЯБРЫ: — Хутчэй у дарогу!

— Я буду тваёй першай каханкай!

— А я заўсёды лепшай!

— Не чапайце маю дзявочую цнатлівасьць!

— Я нараджу табе насьледніка!

— А са мною будуць гуляць усе вяльможы!

— А я стану казытаць нэрвы здрадамі і дварцовымі сваркамі!

Выходзяць Кірыла і Нарымонт.

НАРЫМОНТ: Ашуканства, Кірыла, стала тваёй хранічнай хваробай. Ты ўсьведамляеш гэта?

КІРЫЛА: Нарымонт, мне вядома другое: ты нанёс майму народу вялікую шкоду.

ВІНЦЭНТ: А гэтых з сабою бяром?

КАРАЛІНА: Не, у іх фізыка іншая, а вось геаграфія з улікам нашай будучай вандроўкі павінна нас зацікавіць. (*Да Кірылы і Нарымонта*) Вітаю нястомных здабытчыкаў, аднаго — славы, а другога — справядлівасьці! Як шчыравалі ў сваіх радовішчах гэтым разам?

НАРЫМОНТ: Навошта ты зацягнуў мяне ў сваю імпэрыю? Я ня ўбачыў там таго, што ты так рэклямаваў.

КІРЫЛА: Значыць, ты сьляпы. Я дарэмна на цябе разьлічваў.

КАРАЛІНА: Зразумела: у чалавечых нетрах вы згубілі надзею і павагу адзін да аднаго — дарагая цана сумесным ілюзіям. Там, дзе трэба зьбіраць аброк, вы плаціце. Абсурд!

Людзі так доўга і шмат бралі ў нас для карыстаньня, што прыйшоў час вучыць іх аддачы. Дзе вашая мудрасьць?

КІРЫЛА: (*з фанабэрыяй*) Караліна, цябе захапіў мужчынскі задор рэзанёра: ніяк ты зьбіраесься ўвасобіцца вучоным? Гэта так на цябе не падобна.

КАРАЛІНА: А скуль табе вядома, хто на што здатны?

ВІНЦЭНТ: Ён, мабыць, узгадвае тваё амурнае амплуа, якое так яскрава раскрылася, калі ты была імпэратрыцай у ягоных уладаньнях.

КАРАЛІНА: Брыдка ўспамінаць. Я ледзь не захлынулася ад тамтэйшага бруду. Такая атмасфэра разлажэньня, якая існуе на тваіх тэрыторыях, Кірыла, мне яшчэ не сустракалася. Там сама лепшыя намеры так пэцкаюць, што тыя выяўляюцца як гразь.

КІРЫЛА: (*з намёкам*) Асабліва калі хто гэтага жадае.

КАРАЛІНА: Закаранелы ганарлівец, табе здаецца, што ты — галоўны прынцып тварэньня, а астатнія — гэта памылка разьвіцьця. Цемрашальства! Адчаго твой народ ні з кім ня ладзіць на плянэце, заўсёды лезе на ражон і ўсім шкодзіць?

КІРЫЛА: Усе ведаюць, што ёсьць праўда, але ніхто ня хоча прызнаваць, што яна са мной. А адтаго, Караліна, што наш дух мацнейшы і ўсеперяможны. Каб гэта зразумець, трэба быць як я. А такое немагчыма, бо Касьмічны Парадак не прадугледжвае копіяў. Ха-ха-ха!

НАРЫМОНТ: Яго нішто ня пройме. Тая злыбяда, якая распаўзлася па ўсёй Зямлі, у яго ўладаньнях сама густой канцэнтрацыі. Яе назоў — тыранія. Гэта калі розум закабаліў душу, глыбока кінуў яе ў турму чалавечага цела, зрабіўшы ахоўнікамі разбэшчаныя жарсьці, а сам звар'яцеў ад бязьмежжа атрыманай улады. У такіх умовах адбываецца замена паняцьцяў на процілеглыя, жыцьцё запаўняюць сурагатныя каштоўнасьці і пакрысе ўсталёўваецца антысьвет.

Хлусьня падаецца праўдай, цемра — сьвятлом, зло — дабром, сатана — Богам. У стасунках узрастаюць агрэсія і захопніцкія апэтыты.

КАРАЛІНА: Я была сьведкай і ахвярай іхнага жыцьцяладу: яны думаюць адно, гавораць другое, а робяць трэцяе.

КІРЫЛА: І гэтыя сьпеліся! Дзіўна: мая тэма яднае ўсіх калекаў. Каб не зьніякавець, вы лепей мяне ўшаноўвайце, а не ўшчувайце. Ха-ха-ха! Трымайся, Кірыла, супраць цябе толькі той, хто рухаецца назад і не ўспрымае эвалюцыю, альбо, проста кажучы, — касьмічнае сьмецьце.

Сябры Караліны нэрвуюцца і гатовыя даць Кірылу кухталёў.

КАРАЛІНА: Ня трэба. Ён зусім хворы.

КІРЫЛА: Я на вас не крыўдую, хоць вы, няўдзячныя, плявузгаеце пра мяне шмат. Мне імпануе вашая шчырасьць і адчыненасьць. Дзякуй. Вось толькі ў госьці я вас болей запрашаць ня буду. А тое, што вы натварылі ў маім доме пад час сваіх вандровак, будзе вынішчанае да кроплі, бо не адпавядае маёй мэце.

НАРЫМОНТ: Значыць, свабоды стане яшчэ менш. Твае, Кірыла, сатрапы зьдзічэюць зусім.

КАРАЛІНА: А людзей канчаткова скуюць хлусьня ды варожасьць і ўжо нельга будзе эфэктыўна запабегчы іх разлажэньню. У выніку раўнавага на Зямлі, якая падтрымліваецца чалавечай свабодай, моцна парушыцца.

КІРЫЛА: Не, памыляецеся: проста зьнікнуць умовы для вашага ўплыву на мой кантынгент — і вы зьбяднееце. А для прагрэсу гэта лепшы напрамак.

НАРЫМОНТ: Напачатку я загарэўся ад прапановы пазнаёміцца з тваім досьведам псыхажыцьця, каб апасьля рас-

паўсюдзіць яго сярод іншых нацыяў. Але рэальнасьць мяне агаломшыла. У цябе Бога адарвалі ад душы і ўвагналі ў зямлю. На шляху веры, як апраўданьне рэнэгацтва, паставілі рэлігію, у якой Бог — гандляр і зухаваты спэц па задавальненьню чалавечых амбіцыяў. А духоўнасьцю сталі называць здольнасьці чытаць ды пісаць і ўспрымаць сьвет трохі цямлівей, чым жывёлы.

КІРЫЛА: Твой збуцьвелы ідэалізм дапякае многіх. Нездарма цябе лічаць дзіваком — канчаткова гэта да мяне дайшло толькі цяпер. Я прыгадваю, як ты ў вобразе прарока мітусіўся па кантынэнце майго візаві Бэнэдыкта. Столькі сакрамэнту напусьціў на ўсіх, так зашыфраваў сэнс у сваіх цэнтурыях, што ніхто зь зямлянаў да канца сьвету так і не дазнаецца, аб чым ты хацеў распавесьці. Каму патрэбныя такія сачыненьні? Якая ад іх карысьць?

НАРЫМОНТ: Боскія катэгорыі існуюць па-за часам і прасторай. Аб іх вяшчаюць толькі раз і ў сама адказны момант. Калі яны дадзеныя, людзі павінныя шпарчэй імчаць у Духу, каб дасягнуць іх разуменьня.

КІРЫЛА: (*ягоны сьвятлацень зьмяншаецца і цямнее*) У сваіх межах я надаю зямному існаваньню неабходны рытм і насычанасьць. І я вызначаю актуальнасьць і важнасьць сітуацыі. У мяне ўсё канкрэтнае, рэальнае і своечасовае. Ніякага дыму і двухсэнсоўнасьцяў. За ўсё адказваю я, адтаго пабочнага ўзьдзеяньня не цярплю. Ты ўзрушыў мой народ, пачаў злаваць яго — ён і вытурыў цябе за межы, скажы дзякуй, што не пасадзіў пажыцьцёва за краты альбо ня зьнішчыў, як некалі Растан; яму непатрэбныя разважаньні аб свабодзе, правах, асьвеце — гэта парушае парадак і стамляе. У яго ёсьць усё, а як і што рабіць — лепей мне вядома. Ты б лацьвей склаў оду ў мой гонар — стаў бы нацыянальным героем.

НАРЫМОНТ: Для такога натхненьня энэргіі ў мяне няма.

КАРАЛІНА: (*Вінцэнту і сябрам абыякава*) Сумна зь імі: благі й дарагі галаве для тугі. Я стамілася ад нескончонага напружаньня і безупынных спрэчак. Вярэдзім сябе — куеўдзім плянэту і памнажаем гора. Калі ўжо ў нас будзе лад ды згода? Пакіньце мяне, я хачу пабыць адна.

Караліна ідзе да Чары, каб у роздуме папоўніць і падбадзёрыць сябе энэргіяй адзіноты. Яе атачэньне пакідае прастору.

КІРЫЛА: Глядзі, вяшчун, не спазьніся. Калі мой плян разьвіцьця ўзмацнее і дух майго народу ўзбагаціцца — адкрыецца тайна аб яго асаблівай місіі. Мая постаць у велічы ўздымецца на недасягальную вышыню. Тады ўсё княства прыйдзе да мяне на паклон.

НАРЫМОНТ: (*зь цікавасьцю пазірае на сьвятлацень Кірылы*) І зайграюць гусьлі ў маркоце.

КІРЫЛА: (*ня чуе Нарымонта, захоплена*) Зямля скаланецца ад урачыстых і ўзьнёслых гукаў, рытмы праведнасьці ахопяць усе душы. Ачоліць новую чыстую грамаду мой богаабраны люд. Так будзе! (*Выходзіць.*)

НАРЫМОНТ: Царыца выяўленага сьвету Майя апранутая ў такую мантыю, што нават мы, творцы рэальных пластоў быцьця, можам папасьці ў палон ілюзіяў і ня ўбачыць Праўду.

У шумнай і вясёлай кампаніі зьяўляецца Альгерд з Бэнэдыктам. Апошні некалькі стрыманы і сур'ёзны.

АЛЬГЕРД: Як ты ад нас ні хаваўся, Бэнэдыкт, мы цябе ўсё адно вылічылі.

БЭНЭДЫКТ: Я не гуляю ў хованкі, Альгерд. На новыя тэрыторыі мяне паклікалі абставіны.

АЛЬГЕРД: У старым сьвеце цябе абняславілі альбо ты спракудзіў?

БЭНЭДЫКТ: Ні тое, ні другое. Людзі губляюць розум: надакучыла звыклае жытло, пацягнула ў бязьмежжа — вось яны і рынуліся за моры-акіяны.

АЛЬГЕРД: Ну і правільна: сумнавата стала на старым кантынэнце, усё знаёма дый месца мала, няма дзе разгуляцца.

БЭНЭДЫКТ: Зьнікае жаданьне ствараць — зьяўляецца прага рабаваць. Гэта аксыёма чалавечае псыхалёгіі. Ты ня горш за мяне ведаеш нашых гадаванцаў: без прыгляду звар'яцеюць. Я змушаны быў імчаць у новы сьвет, каб прадухіліць бяду.

АЛЬГЕРД: Затое нам зрабіў пагана. Мы кінуліся за табой, але паспыталі мізэр стыхіі; толькі на бадзёрасьць яе і хапіла. Можна ўявіць, як там цудоўна было раней! Іншы раз сам вякамі зьбіраеш усе зямныя эманацыі ў адно цэлае, каб сфармаваць які-небудзь катаклізм, а тут бяз нашага ўдзелу ўтварыўся такі агромністы згустак хаатычных энэргіяў!

СЯБРЫ: — Каланісты дурэюць ад золата і крыві!

— Туземцы ад страху на ўцёкі!

— Жах, насільле, лямант поўняць усе абшары!

— Прырода хістаецца ад бедстваў!

АЛЬГЕРД: Зразумей, не скарыстаць гэтага мы проста не маглі. Дзякуючы нам, псыхічныя пырскі не раскідаліся па прасторы абы-як, а зьліліся ў адзіны адмысловы ручаёк. Яго мы накіруем у патрэбнае рэчышча.

БЭНЭДЫКТ: Вас гэта радуе, а мяне засмучае і непакоіць. Лёс наканаваў мне будаўніцтва расы будучыні. Яна будзе лепшай за ўсе, што былі дагэтуль. Каб усталяваць новае, трэба ачысьціцца ад старога — ахвяры тут непазьбежныя.

Але гэта ня гора ў касьмічным уяўленьні, а заканамерны ход разьвіцьця — як не зьмясьціць гэтую праўду ў сьвядомасьці маіх людзей? Там і клетачкі ня знойдзеш для такога разумовага зруху.

НАРЫМОНТ: Там хапае месца, вось толькі яно заваленае ўсялякім брудам і злачынствамі. Трэба чысьціць жываносныя каналы, а вам усё некалі, сьпяшаецеся. Думаеце, што мэтад балючага пакараньня больш рацыянальны пры ўзьвядзеньні чалавека? Памыляецеся. Гэта антыкасьмічна. Трэба настроіцца на цярплівы й разважлівы рытм, асьветай і дабром уздымаць сваіх дзяцей.

АЛЬГЕРД: Дзядзька, ідэалізм — здатны сродак, але на Зямлі ім нават пячору не агораеш.

БЭНЭДЫКТ: Я ведаю аб магчымасьцях Сусьвету, нашых умовах і на гарачку не хварэю. Мяне хвалююць пытаньні расшырэньня і захаваньня жыцьця. Зразумей, Нарымонт: мне вельмі рана імчаць у эмпірэі са сваімі гадаванцамі. Яны яшчэ немаўляты ў духу. Мой плян прадугледжвае іх паступовае ўдасканаленьне. Сакрэты я раскрываць ня буду, скажу толькі, што свабода асобы і яе росквіт — галоўнае ў маёй задуме.

НАРЫМОНТ: Сьмела і без фанабэрыі — ужо добра. Прабач, мне нязручна рабіць табе заўвагі, бо я з табой заўсёды супрацоўнічаю з задавальненьнем і найбольш вынікова. Але я не выношу такія творчыя прыёмы нашага княства, як хлусьня і гвалт, якое б апраўданьне ім ні давалі. Усе лічаць мяне дзіваком пасьля таго, як мой бацька Уладамір выказаў прынцыповую нязгоду са мной. Аднойчы я сказаў, што мы пацерпім паразу, калі, даўшы людзям розум, не надзелім іх яснчутнасьцю, ня зробім працэс іх мысьляваньня адкрытым і відавочным: можна будзе ведаць, хто аб чым думае. Ніхто мяне не паслухаў — і што мы цяпер маем?

БЭНЭДЫКТ: Магчыма, тады чалавечы шлях на неба быў бы намнога карацейшым.

НАРЫМОНТ: Безумоўна. Менш стала б нэгатыву, сканала б агрэсія. На пачатку Югі ажыцьцявіць гэта было зручней, цяпер жа можа прывесьці да зьнішчэньня чалавецтва і ўсяго жывога на Зямлі.

АЛЬГЕРД: (*з задорам*) Во, якраз тое і трэба! Дзядзька, кіруй да нас і навучы сваёй мэтодыцы. Хопіць важдацца з гэтымі малпамі, іх трэба добра агрэць. Які важкі псыхазбор будзе — нават цяжка ўявіць!

НАРЫМОНТ: Хопіць блюзьнерыць. Більёны манадаў чакаюць нашае дапамогі. Наш абавязак — супольна знайсьці абсалютны і дзейсны спосаб, каб не дапусьціць іх згубы і вывесьці зь цемры.

БЭНЭДЫКТ: На жаль, лучнасьці ў нас для гэтага не хапае. Кожны творыць па-свойму і часам на шкоду іншым.

АЛЬГЕРД: Цікаўныя вы! Вашыя надзеі даўно парасьлі мохам. Паглядзіце на сваю чэлядзь — нахабней стварэньняў я не страчаў. Вы ўжо даўно ў іх палоне. Яны зьневажаюць і карыстаюць вас і на зьмест, і на форму, сьмярдзяць ад поскудзі і брыдотаў, а вы ўсё зносіце, як бацькі ад няўдзячных дзяцей. Зямля ня вытрывала такога грэху і схілілася ў скрусе. Ці выпрастае яна свой хрыбет? Толькі тады, калі цяжар зваліцца зь яе плячэй. Я буду гэтаму садзейнічаць. Вашыя пачвары павінныя атрымліваць па заслугах, і ніякага ім дараваньня. Ад кармічных законаў яшчэ ніхто ня ўцёк. Хопіць зьдзекавацца з касьмічных сэнсаў і засьмечваць Прастору! Яны не жадаюць вучыцца! Я не зьбіраюся, і вам ня раю, браць на сябе іхныя грахі. Досыць! Кожны абавязаны плаціць па рахунках.

НАРЫМОНТ: Тваёй заўзятасьці можна пазайздросьціць. І як жа ты будзеш дзеіць?

АЛЬГЕРД: (*зь весялосьцю, да сяброў*) Па прынцыпе: ствара́й хутчэй, не чакай, бо энэргія адыйдзе ў іншыя формы. У нас спосабаў дастаткова, у асаблівасьці нематэрыяльных. Мы можам раскідаць чалавечы інтэлект і энэргію па ўсёй Зямлі як трапяткія і жвавыя флюіды, каб індывідуалізаваць іх сілаю нашых стыхіяў, і апасьля згуртаваць у вялікую псыхічную масу падобна акіянічнай. Гэта будзе значны дадатак да псыхавобразу плянэты.

НАРЫМОНТ: Асьцярожней, моладзь, такі агонь не ўздымае, а кідае ніцма. Сьцеражы вас Бог! (*Да Бэнэдыкта*) Ты сьветла думаеш і ўзяўся за высакародную справу. Вынішчэньне ў чалавеку раба пачуцьцяў, душы і розуму — неверагодная мэта, ва ўмовах Зямлі амаль недасягальная, але імкнуцца да яе неабходна. Табе трэба дапамога.

БЭНЭДЫКТ: Па гэта я хачу зьвярнуцца да ўсіх Братоў.

НАРЫМОНТ: Можаш разьлічваць на мяне. Толькі не замардуй у мітусьні сваю тайну. Перамогі табе! (*Выходзіць.*)

АЛЬГЕРД: Сябры! Велічны Грааль узгарвае нашыя сэрцы і чакае ад нас вычынаў! У дарогу!

Падыходзяць да Чары, каб перад сыходжаньнем на Зямлю выканаць абрад. Агонь выбухам скокнуў угору. Нечакана для ўсіх зьяўляецца Караліна.

КАРАЛІНА: Не сьпяшайся, Альгерд. Сяўба толькі разгарнулася, а ты ўжо ляціш па ўраджай.

АЛЬГЕРД: Караліна! Вось з кім ходзіць удача! Нядзіўна, што так зашугаў агонь.

КАРАЛІНА: Агонь узрадаваўся нашай агульнай самаадданасьці і падрыхтаванасьці.

АЛЬГЕРД: Да чаго?

КАРАЛІНА: Да супольнага паходу на Зямлю па шчасьце.

АЛЬГЕРД: (*зьбянтэжана*) Цудоўна. Хіба такое магчыма?

КАРАЛІНА: Без сумневу. Закіпела б толькі нашая воля.

АЛЬГЕРД: Шчыра кажучы, у мяне і думак такіх ніколі не было. Дый працуем мы ў розных плянах.

БЭНЭДЫКТ: Мне здаецца, што лёс ужо даўно водзіць вас адно вакол другога і паступова звужае гэтае кола. Напрыклад, пазіцыі вашыя адносна чалавека вельмі блізкія.

КАРАЛІНА: Вось-вось, усе носьбіты агню скажуць тое ж. Толькі табе гэта няўцям.

АЛЬГЕРД: А навошта мне гэта? Мой творчы ланцуг не павінны абцяжарваць дадатковыя зьвёны. Калі патрэбна, я сам магу падзяліцца на неабходную колькасьць увасабленьняў. Мае сябры гэта добра ведаюць.

КАРАЛІНА: Ён невыносны.

БЭНЭДЫКТ: Ты, Альгерд, занадта захапіўся справай і забыўся, што ёсьць такія касьмічныя струмені, якія прызначаныя толькі для нас, творцаў. Яны тонка індывідуалізаваны, узбуджаюць асабовыя якасьці, і ня ўлічваць іх — значыць, зьдзекавацца з эвалюцыі.

КАРАЛІНА: І ганьбіць усё княства.

АЛЬГЕРД: Не перабольшвайце. Мне ўсё вядома. Сваёй службай я ганаруся і адданы ёй цалкам. Майце на ўвазе, што я паважаю мэтад сублімацыі, дзякуючы якому тая энэргія, пра якую вы кажаце, перапрацоўваецца ўва мне дзеля Вышэйшае Карысьці. Не перашкаджайце!

КАРАЛІНА: Дзікі ты, Альгерд. Шкада, што я не дамовілася з табой. Атрымаўся б вельмі добры плён. Ці ня так, Бэнэдыкт? Твой новы кантынэнт мог бы прытуліць нашыя гарачыя душы.

БЭНЭДЫКТ: Упэўнены: вы гэта ажыцьцявіце іншым разам і на больш дасканалай глебе. Жадаю посьпехаў. (*Пакідае прастору.*)

КАРАЛІНА: Скнара ён. Баіцца, што мы развалім ягоную канструкцыю. Усіх падмінае духоўная галеча і мітусяніна. Дзе ж ён, наш паратунак? (*Ідзе вонкі.*)

АЛЬГЕРД: Пачакай, цётка!

КАРАЛІНА: Успомніў, нахабнік. Што яшчэ?

АЛЬГЕРД: Я запрашаю цябе аздобіць сваёй мудрасьцю наш рытуал вычыну.

КАРАЛІНА: Хоць гэта зробім разам.

Усе падыходзяць да Чары.

Альгерд бярэ напоўненую амброзіяй чатырохгранную судзіну, якая ўнутры пакрытая срэбрам, звонку — чырвонай медзьдзю, і перадае яе Караліне. Браты становяцца вакол Караліны кожны на адно калена. Яна ўзьнімае судзіну ў вышыню. Наваколье запаўняюць адпаведныя спэцэфэкты. Караліна вылівае вадкасьць на чатыры бакі, тым самым сьцьвярджаючы падрыхтаванасьць герояў да служэньня дабру без абмежаваньня.

Натхнёныя, яны борздка выходзяць. Караліна нясьпешна ідзе ў іншы бок.

У прасторы ўладараць гукавыя і сьветлавыя зьявы кшталту навальнічных, надзвычай прыемныя і шматколерныя.

Са зьяўленьнем Мікулы, Гарыславы і Уладаміра яны паступова зьнікаюць.

УЛАДАМІР: Мяне непакоіць дэзарганізаванасьць княства. Няма ранейшага настрою і адзінства. І гэта ў той момант, калі ўсё так напружана на Зямлі.

МІКУЛА: Бацька, ты дарма хвалюесься, так было неаднойчы. Звычайная сітуацыя напярэдадні зьменаў.

ГАРЫСЛАВА: Нашай сям'і ўласьцівая прагрэсіўная чыннасьць і асаблівая касьмічная сьмеласьць. Хіба дрэнна, што ўсё гэта так бурна праяўляецца?

УЛАДАМІР: Паскорыць цячэньне Боскага пляну немагчыма. Да пераменаў яшчэ далёка, а этэр ужо ліхаманіць. Чаму? Мяне насьцярожвае залішняя ўвішнасьць і дэман-

страцыйная самастойнасьць нашых творцаў. Ня выклікала б гэта хаос.

МІКУЛА: Безумоўна, супярэчнасьці ў нас ёсьць, але яны, на маю думку, не фатальныя, а творчыя. Тым больш я прытрымліваюся закону праўды і кожнаму веру.

ГАРЫСЛАВА: Наш агонь не хвалюецца і паказвае на мір. Дый у маё сэрца ліха не тышчыцца. Мо па-за нашым прывілеем каму вельмі рупіць?

МІКУЛА: А можа, ня ўсе тайны мне даручаны, га, бацька?

УЛАДАМІР: Неабходную ступень пасьвячэньня ты маеш. Але і нам ня ўсе скрыжылі адчыненыя. Нічога не паробіш. Таму ў крытычныя хвіліны трэба больш разьлічваць на сваю творчую інтуіцыю і духоўныя імпульсы.

МІКУЛА: А не занадта мы спажываем гэтых сваіх унутраных магчымасьцяў? Некаторыя ўжо стаміліся і амаль вычарпалі сябе. Ашчадней было б ісьці поруч з касьмічным гуртам.

УЛАДАМІР: (*нэрвова*) А мы быццам асабняком рухаемся! Зразумей, сыне: калі майстар творыць, прыходзіць у рух уся сусьветная лябараторыя і па духоўных каналах дасылае яму неабходны матэрыял. Іншая справа, калі няма аддачы. Тады дапамога паступова канае.

МІКУЛА: Менавіта гэта я і маю на ўвазе.

УЛАДАМІР: Табе, як Вялікаму Князю, не да твару разважаньні ў стылі Ярыведа. Ён толькі выконвае волю Касьмічнай Супольнасьці. Сам жа ні на што ня здатны: па ягонай плянэце наогул адны мурашкі поўзаюць. Нам нельга вагацца. Упэўненасьць і цьвёрдасьць — і мы дасягнем сваёй мэты. Неабходна толькі ўнесьці некаторыя карэктывы ў нашую тактыку.

МІКУЛА: Асноўныя намаганьні мы засяродзім на падрыхтоўцы новага чалавека. Яго празьмерная самастойнасьць можа прывесьці да агрэсіўнага рэнэгацтва.

ГАРЫСЛАВА: Паўстанцаў ужо дастаткова. Асабліва сярод тых увасабленцаў, якія пасьля чарговага маршу па Зямлі не жадаюць болейісьці туды, просяць не пасылаць іх, а некаторыя нават падманваюць і хітруюць. Я вырашыла прывязаць іх да Зямлі ўспамінамі. У выніку людзі злучыліся адно з адным і з матэрыяй так моцна, што толькі праца духу можа выслабаніць іх і адправіць на касьмічны прасьцяг.

УЛАДАМІР: Мне цяжка гэта казаць, але ўсе павінны прызнаць змрочнасьць чалавечай душы і неабходнасьць прымяняць больш суровыя мэтады ўзьдзеяньня.

МІКУЛА: Ганебна тое, што мы выкарыстоўваем той арсенал, ад якога настойліва вучым чалавецтва збаўляцца.

УЛАДАМІР: Ня будзьма падманваць саміх сябе. Мы добра ведаем, што на гэтым этапе чалавецтва ў сваёй асноўнай масе няздольнае ўдасканальвацца, дый, па праўдзе кажучы, гэтага і ня трэба. Галоўнае: мы павінны выпеставаць расу абраных і падрыхтаваць іх для вялікіх Боскіх задач. Вышэйшая пляніда астатніх мільярдаў і мільярдаў жывых далёка наперадзе, у новых эрах, а пакуль яны прызначаны для таго, каб ствараць неабходнае энэргетычнае асяродзьдзе і спрыяльныя ўмовы для разьвіцьця эліты.

ГАРЫСЛАВА: Гэта не вызваляе нас ад клопатаў аб лёсе гэтых істотаў. Мы ўсімі спосабамі садзейнічаем іхнаму ўзыходжаньню.

УЛАДАМІР: Безумоўна, але сёньняшняя задача — сабраць на ўсёй плянэце тых, хто высьпеў для новага кола і па псыхічных якасьцях гатовы для пераходу, прычым нам трэба ўсё закончыць да чарговай Вялікай Энэргетычнай Хвалі. Усе іншыя, каго незаслужана кранулі пакуты, апасьля атрымаюць кармічную палёгку і будуць узнагароджаны лепшай доляй. Якое месца на Зямлі ты вызначаеш для ажыцьцяўленьня нашага праекта?

МІКУЛА: Мажліва, ва ўладаньнях Кірылы?

УЛАДАМІР: Ён увесь час імкнецца вынайсьці нешта, але пакуль так і не зрабіў гэтага, а сваімі трупехлымі памкненьнямі ўжо забрудзіў многіх. Не падыходзіць.

МІКУЛА: Бэнэдыкт распачаў будаўніцтва на новых землях. Дагэтуль у яго былі нават посьпехі.

УЛАДАМІР: Гэты варыянт больш прымальны. Мы зь ім дамовімся. Іншыя кандыдатуры разглядаць ня будзем.

МІКУЛА: Існуюць цяжкасьці з асобнымі нацыямі і народнасьцямі, а таксама групамі людзей, якія плятуцца ў хвасьце эвалюцыі і стрымліваюць агульны рух.

ГАРЫСЛАВА: Нашыя браты шмат моцы паклалі на іх прасьвятленьне, але вынікі пакуль несуцяшальныя.

УЛАДАМІР: Я раю спыніць усялякае апякунства іх і скіраваць усе сілы на здольных індывідаў. А з гэтымі балотнымі зданямі мы разбяромся потым, калі яны толькі канчаткова не перагрызуцца і застануцца жыць.

ГАРЫСЛАВА: Я не магу пагадзіцца з такім падыходам. Мы даем свабоду злу, ад якога самі ж і пацерпім.

УЛАДАМІР: Ня зробім гэтага — увогуле паставім жыцьцё на Зямлі пад пагрозу зьнішчэньня. Уявіце, як гэта адгукнецца ў нашым княстве.

Уваходзіць Генрых.

ГЕНРЫХ: Дабрыдзень у хату!

УСЕ: Добры дзень, вітаю, здароў!

ГАРЫСЛАВА: Па ўсяму бачна: ты, бацька, толькі што зь Зямлі?

ГЕНРЫХ: Ага, трохі паблукаў па старых сьцежках, асьвяжыў пачуцьці, наведаў тыя-сія краі.

УЛАДАМІР: Ці было памысна твайму духу, Генрых?

ГЕНРЫХ: Я задаволены. Зямля па-ранейшаму жыватворная, сакавітая, прыгожая. Але засмучоная і нярадасная.

ГАРЫСЛАВА: Нядзіва, столькі гора на плячах.

ГЕНРЫХ: Мяне ўстурбавалі чорныя плямы на яе целе.

МІКУЛА: І якая іх прырода?

ГЕНРЫХ: Мы пагражальна самазадаволеныя. У асалоду спрачаемся, генэруем ідэі, а калі ўзгадваем пра небясьпеку, дык разглядаем яе як вонкавую, а не сутнасную агрэсію. Тое, што бяда сьпее ўнутры чалавека і плянэты, мы амаль ня ўлічваем.

УЛАДАМІР: Ты, Генрых, памыляесься. Аб гэтым мы хвалюемся нават зашмат.

ГЕНРЫХ: Тая грахоўная эманацыя, якая выпаўзла з чалавечае галавы і шырока матэрыялізавалася, патрабуе звышпільнасьці. Гэтае зло стала самастойным, набыло рэальнае аблічча і працяла ўсе нетры плянэты. Я спускаўся туды, назіраў ягоныя ўладаньні. Жудасьць там нарастае па меры паглыбленьня. Адмоўная сіла гэтых пластоў так павялічылася, што людзі зрабіліся ня толькі іх заложнікамі, але і ахвярамі. Яны ўжо не ўсьведамляюць, як іх энэргія шалёным струменем перацякае ў сатаністцкія рэчышчы.

МІКУЛА: Мы аваложваем чалавечыя душы, а яны гарбеюць на патрэбу д'яблу?

ГЕНРЫХ: Менавіта так. Сама жахлівае тое, што на Зямлі пакрысе менее нашых увасабленцаў. Сатана пачаў засяляць плянэту сваімі вылюдкамі ў чалавечай скуры. Там ужо даўно няма ідэальнага асяродзьдзя. Мы ведаем, што кожны мае сваю псыхафізычную і астральна-мэнтальную сістэму разьвіцьця і павінен знаходзіцца ў адпаведных духоўных каардынатах. А на Зямлі ўвасабляюцца і жывуць побач прадстаўнікі ўсялякіх вымярэньняў — дурань і разумны, выкрадальнік і абкрадзе-

ны, злачынец і ахвяра, добры і дрэнны. Вельмі цяжка існаваць у такой блытаніне. Матэрыяльныя ўмовы мацуюць гэты хаос і ліквідуюць любы настрой на ізаляцыйнасьць.

ГАРЫСЛАВА: Гэта наш сур'ёзны недахоп. Калі не даглядаць, творчыя палеткі заўсёды зарастаюць быльлём.

УЛАДАМІР: Трэба абараняць і ратаваць умовы ўвасабленьня жыцьця.

ГЕНРЫХ: Мне зь цяжкасьцю ўдалося схаваць пад тоўшчай ільду нашую першапачатковую Зямлю і творчыя сакрэты. Шкада, што сама чыстыя і богападобныя мясьціны плянэты пакуль застаюцца агаленымі і лёгка даступнымі для д'ябальскай хеўры.

УЛАДАМІР: Страты тут непазьбежныя. Мы ўжо распачалі ахоўную працу.

ГЕНРЫХ: Я ведаю. Бітва зь цемрай будзе нялёгкай. Але мы пераможам. Уладамір, наконт гэтага ў мяне ёсьць некаторыя меркаваньні.

Агонь Чары шырока ўзмахвае сваім іскрыстым крылом і заціхае. Прастору раптоўна паглынаюць маўчаньне і прыцемак.

Уваходзіць Данель. Усе захваляваліся.

ДАНЕЛЬ: Цішыня залівае Сусьвет. Смутак забірае сэрцы. Нямеюць у роспачы душы.

ГАРЫСЛАВА: Што здарылася? Кажы хутчэй!

ДАНЕЛЬ: Растан пацярпеў паразу і ня можа вярнуцца да сваіх пэнатаў.

Трывожна ўпаў агонь Чары, смутак папоўз у душы.

УЛАДАМІР: Як гэта адбылося?

ДАНЕЛЬ: Усім вядома задача Растана. Ён захацеў ажывіць край, дзе сьмела гарцавала сатаніская кодла з намерам замацавацца ў ім трывала і надоўга. Растан крыху спазьніўся, бо яно ўжо пасьпела пасеяць сярод людзей цемру. Ён сьмела распачаў барацьбу, узброіў сваіх прыхільнікаў ідэямі ды перакананьнямі і расьсяліў іх на шырокай тэрыторыі, але праціўнік гуляў не па правілах. Ён увагнаў у душы сьмяротных страх і лютасьць, стаў бязьлітасна зьнішчаць праведнікаў і усіх няверных. Рахманасьць Растана да дабра не прывяла. Каб выратаваць людзей, ён вырашыў зрабіць манэўр і пайшоў на перамовы з д'яблам. Той яго перахітрыў і навязаў свае правілы. Зь цягам часу Растан зьмяніўся, нават сябры сталі дзівіцца ягоным поглядам. Усё гэта такім цяжарам лягло на ягоны дух, што ён страціў здольнасьць вяртацца да нас і ўсьведамляць такія мэтамарфозы. А ягоная зямля яшчэ больш стала чарнець ад духоўнай нястачы і болю.

ГАРЫСЛАВА: Я яго папярэджвала, што там, дзе зьневажаюць жанчынаў і лічаць сьвятой крывавую расправу, будзе вельмі цяжка прапаведаваць словам.

МІКУЛА: З дабром на Зямлі мы выглядаем як безабаронныя жабракі зь дзіравай торбай у той час, як зло, разнамастае і дзейснае, паўстае заможным уладаром.

ГЕНРЫХ: Добры вобраз, але ня болей. Усё гэта — толькі некаторыя са шматлікіх умоваў гартаваньня духу. Растан спазнаў іх як спакусьлівыя і пахіснуўся. Яму зараз цяжка. Мы павінныя дапамагчы нашаму брату вярнуцца дадому.

ДАНЕЛЬ: Адна бяда ня ходзіць, за сабою другую водзіць.

ГАРЫСЛАВА: У цябе ня ўсе весткі?

ДАНЕЛЬ: Ізяслава на Зямлі забілі.

Жах уварваўся ў прастору.

Героі, атачэньне, музыка, сьвятло — усё загаласіла, заенчыла і пацякло горам.

МІКУЛА: Хто зрабіў гэта?

ДАНЕЛЬ: Адзін паклікаў яго, другі слухаў і зайздросьціў яму, трэці ўзьвёў паклёп, чацьверты данёс, пяты падаў сякеру, шосты стаў катам, сёмы маўчаў, а ўсе астатнія ў нявер'і рагаталі. Табе каторага?

МІКУЛА: Мяне самога, бо ў гэтым ланцугу і я таксама. У сваёй ніжэйшай якасьці мы — страшэнныя шкоднікі. Калі Бог творыць касьмічную буру і напаўняе прастору азонам, то мы нараджаем гнеў і заліваем сфэру смуродам удушша.

УЛАДАМІР: Нават акіян сьлёзаў не павінен забіраць нашую мудрасьць. Усё ліхое сканае.

ГАРЫСЛАВА: Ня час грымець словамі. Мікула, нас чакае сын.

Гарыслава і Мікула пакідаюць прастору.

ГЕНРЫХ: Горкая доля ў цябе, Данель. За сваю незвычайную дасьведчанасьць і ўвішнасьць ты яшчэ ніколі не атрымаў падзякі.

ДАНЕЛЬ: Кожны ўзнагароджаны ўжо раб. А мяне вабіць свабода, абсалютны росквіт якой у праўдзе.

УЛАДАМІР: Ты заўсёды адзін. Хто цябе вядзе?

ДАНЕЛЬ: Бог.

ГЕНРЫХ: Мы таксама служым Яму.

ДАНЕЛЬ: Вы ідзяце да Яго шляхам рабства, а я — пуцявінай свабоды. (*Выходзіць.*)

УЛАДАМІР: Ці не занадта катэгарычным робіцца сьвет? Майму тэмпэрамэнту больш адпавядае стылістыка адценьняў і ўмеранага прагматызму.

ГЕНРЫХ: Зь якіх гэта часоў? Ты жартуеш, Уладамір! Хіба можа хто цягацца з табой ува неўтаймаванай жорсткасьці? Колькі разоў ты зачынаў і зьнішчаў жыцьцё на Зямлі?

УЛАДАМІР: На Зямлі я стварыў жыцьцё аднойчы і ўсю Югу чышчу яго ад бруду дзеля высокае касьмічнае мэты. Майстар габлюе свой твор і зусім не зважае на расы, нацыі, індывіды, якія непатрэбнымі трэскамі разьлятаюцца ў розныя бакі. Колькі асабістай моцы ён траціць на гэта? Чаго гэта яму каштуе? Хто падлічыў?

ГЕНРЫХ: Не сярдуй. Я цябе разумею і заўсёды дапамагаю. (*З усьмешкай*) Ведаю: прыйдзе час і ты зноў дасі недалужнаму чалавецтву важкую аплявуху, каб далёка не ўцякала ад істага.

УЛАДАМІР: Гумару тут мала. Людзьмі яшчэ валодае глум, адтаго я баюся, каб пасьля такой чарговай ін'екцыі яны не зьляцелі зь лесьвіцы духу ў марах аб ніжэйшай ступені.

ГЕНРЫХ: Па шчырасьці, ты рана адышоў ад штурвалу.

УЛАДАМІР: Напрамак судна зьмяніўся?

ГЕНРЫХ: Не, хістаецца залішне. Каб не перакуліцца.

УЛАДАМІР: Я таксама заўважыў непасьлядоўнасьць і нерашучасьць з боку майго старэйшага сына. Ён усё часьцей ставіць пад сумнеў абраны намі курс, імкнецца да наватарства. Але нейкай суцэльнай канцэпцыі ў яго яшчэ няма. Спадзяемся, што й ня будзе. Пакуль мае ідэі трымаюць наш агульны плян, нічога катастрафічнага ў княстве не адбудзецца.

ГЕНРЫХ: Гэта я і хацеў пачуць ад цябе. Твой аптымізм — усім нам падмога.

Выходзяць. Хутка забягае Апалён. Ён у натхненьні і гарыць нейкай ідэяй.

АПАЛЁН: Ужо Сусьвет імчаў ушыркі,
Хаос ад сполаху марнеў,
Сьвятло гульнёй вясёлых блікаў
На хвалях Вечнасьці плыло.
І я у безьлічы іскрынкаў
На моцы вогнішча трымцеў,
Усхвалявана, нецярпліва
Адлёту радасьці чакаў.
Вятрыска Космасу натхнёна
Мяне панёс удалячынь.
Ня здолеў я зірнуць за покрыў,
Які хаваў Правечны Лік.
Бязьмежны Шлях мой дух бадзёрыў,
Узносіў думкі, акрыляў.
У зіхаценьні зорных цудаў
Хаваўся тайны сьмелы сэнс.
Яго спасьцігнуць немагчыма
Адразу, цалкам і нагбом.
Пакрысе, кроплямі, сьлязою
Дае ён чыстае пітво.
У тым парадку, што бясконца
Буяе, сьпее і гарыць,
Знайшоўся мне прытулак сьціплы -
Майстэрня, родная душы.
Я захапіўся працай цела,
Спазнаў натхненьне, пошук, боль,
Жытлом заняў усё пад небам,
Заслаў зямлю сваім цяплом.
Былі узьлёты і падзеньні,
Але стагнаў ад крыўды сьвет.
Шчасьлівай долі не здабыў я,
А толькі вырасьціў журбу.

Тугою сэрца зацягнула,
У думках злое пацякло...
І раптам дзіўна і прыгожа
Той Вобраз з мроіва прыйшоў.
Я зразумеў усю уяўнасьць
Зямнога ўдолу і сваю...
Апратку прэч, у сэрца веру -
На кліч у Сьветлы Зорны Дом!

ЯРЫВЕД: (*зьяўляецца пад час дэкламаваньня, нечакана для Апалёна пляскае ў далоні*) Брава, Апалён! Цудоўна, майстар! Чарговы творчы экспэрымэнт?

АПАЛЁН: Практыкуюся са словам, каб лягчэй бараніць чалавека ад бяды. Раптам, паэзія дапаможа яму хутчэй усьвядоміць сваё прызначэньне?

ЯРЫВЕД: (*адчувае ў гэтым іншы матыў*) Ты шукаеш мастацкія сродкі, каб пакуты здаваліся яму прыгожымі, а не агіднымі? Умацоўваеш ілюзію і тым самым драматызуеш усю пастаноўку жыцьця на Зямлі? Цікава: гора становіцца прыемным і яшчэ больш засьціць істае!

АПАЛЁН: Ярывед, глядзі на рэчы прасьцей. Чалавек — мой тэатар, маё жыцьцё. Гэта пакуль сама лепшы сцэнічны падмурак для ўсіх актораў нашага княства. Ён павінен і будзе існаваць любой цаной! Для гэтага мы даём яму ўсё новыя і новыя энэргетычныя субсідыі. Адна з іх — слова.

ЯРЫВЕД: Слова — непамерны цяжар для людзей. Упершыню зьляцеўшы з вуснаў чалавека, яно адзначыла момант яшчэ большага падзеньня розуму. Пустая гамонка часта сьведчыць пра легкадумства і глумнасьць.

АПАЛЁН: Думка, слова, учынкі — вядомыя духалёты для людзей. Яны імі карыстаюцца, як умеюць.

ЯРЫВЕД: А мо як іх навучылі? Зямная лёгіка атруціла ўсе словы: рашэньне вынікае зь іх абмену, а ня з сэнсу.

Некаторыя словы па віне чалавека і блытанасьці яго натуры страцілі сваё першапачатковае значэньне, набылі штучныя якасьці, запэцкаліся, адтаго ўжо ня маюць свайго ранейшага ўзьдзеяньня й сілы, а часам нясуць адваротны зарад і пагражальныя для жыцьця.

АПАЛЁН: Страчаюцца і такія зьдзекі з прыроды рэчаў. Тут адбываецца падмена паняцьцяў і значэньняў альбо сьвядомае скажэньне праўды, падман. Слова — страла граманосная, адзін з галоўных спосабаў тварэньня і зьнішчэньня. Вось прыклад: цэлы народ на доўгія вякі заблудзіўся, згубіў сябе і сваю гісторыю пасьля таго, як аднойчы акупанты назвалі яго беларусам замест ліцьвіна.

ЯРЫВЕД: Так, здараецца, для характарыстыкі эпохі наагул не знаходзяць патрэбнага слова, якое хаваецца ў трапнай і кароткай формуле.

АПАЛЁН: І ад гэтага пагаршаюць сваё становішча, як мы.

ЯРЫВЕД: Менавіта, у вас такім чынам скрывіўся сэнс галоўнага даручэньня.

АПАЛЁН: (*задумліва ідзе за кулісы*) Вось адтаго я і экспэрымэнтую, каб знайсьці гэтае слова — ключ ад нашага тэатру.

ЯРЫВЕД: Каб адчыніць ці зачыніць яго?

Апалён, мабыць, ня чуе. Ярывед накіроўваецца за ім.

Звычайнае асьвятленьне. Частку прасторы запаўняе галаграфічнае адлюстраваньне зямнога ляндшафту. З мроіва, падобна самнамбуле, паступова выступае постаць Алеся. Ён трызьніць.

АЛЕСЬ: Як холадна і няўтульна душы. Вакол адны драпежнікі. Кіпцюрамі драпаюць сэрца. І цемра невыносная! Тут яе лічаць за сьвятло. Толькі адзін праменьчык дрыжыць. Адкуль ён? А-а! Ад цябе, кветачка мая. Прыгажуня жаданая! Колькі мяне кідала па ўсясьветных абшарах,

дзе я толькі ні быў, а вось тут, на гэтай жудаснай плянэце, стрэў цябе. Як ты тут апынулася? Якім касьмічным ветрам цябе сюды закінула? Ты загінеш тут. Цябе зьядуць альбо затопчуць гэтыя пачвары. Хадзема са мной.

Хоча сарваць кветку. Зьяўляецца вобраз Рагнеды.

РАГНЕДА: Алесь, ня рві жыцьцё. Не зьнішчай пялёсткаў Сусьветнага Каханьня, водару Нязгаснае Прыгажосьці, зараніцы Чыстае Духоўнасьці.

АЛЕСЬ: Як жа мне яе бараніць?

РАГНЕДА: Зазірні ў сваё сэрца. (*Зьнікае.*)

Яркія гукавыя і сьветлавыя эфэкты сьведчаць аб нараджэньні Вялікай і Моцнай Радасьці Духу.

АЛЕСЬ: Вось яна, Галоўная Тайна Быцьця — я Кахаю. Кветачка мая, прэлюдыя скончылася — у мяне болей няма сакрэтаў, я іду ў жыцьцё, сёньня пачынаецца нашае сумеснае падарожжа ў Вечнасьць.

Карціна раствараецца ў буяньні вакольнага мажору.

Праз хвіліну ўсталёўваецца цішыня. Агонь Чары трывожыцца, кідаецца іскрамі ўва ўсе бакі. Уваходзяць Мікула, Гарыслава, Агнія, Людвіка. Ізяслава ўносяць на драгах.

ІЗЯСЛАЎ: (*у гарачцы*) Прабач іх, Божа, яны самі ня ведаюць, што робяць.

ГАРЫСЛАВА: Не чапайце яго. Ён яшчэ ў непрытомнасьці.

МІКУЛА: Яму патрэбная энэргетычная падтрымка.

ЛЮДВІКА: Агнія, ты чысьцейшая сярод нас, падлячы брата.

АГНІЯ: (*схіляецца над Ізяславам, маніпулюе рукамі, поіць з кубку амброзіяй*) Родненькі мой, прачынайся, мацней духам, гані зь цела немач. Я ж казала табе: не хадзі бяззбройна да зьвяроў, не распавядай пра праўду там, дзе разумеюць толькі рык.

ІЗЯСЛАЎ: (*уздымае галаву*) Я дома?

ГАРЫСЛАВА: Так, так, сынок. Як ты сябе адчуваеш?

ІЗЯСЛАЎ: Някепска. А што на Зямлі?

МІКУЛА: Як заўсёды, доўжыцца бітва.

ЛЮДВІКА: Па праўдзе: там катуюць твае ідэі, а іх прыхільнікаў зьнішчаюць.

ГАРЫСЛАВА: Раненька ты пачаў уздымаць зябліва; яшчэ сонейка ня зьзяе, а ты ўжо за плугам.

АГНІЯ: Не хвалюйся, брацік, тваё зерне ўжо калыша глебу жыцьцядайнай сілай і дорыць памкненьні прагным.

ІЗЯСЛАЎ: Значыць, сяўба была недарма. А дзе мае сябры?

АГНІЯ: Адны яшчэ там, другія побач з табой.

ІЗЯСЛАЎ: Мы пайшлі на Зямлю грамадою, каб выцягнуць яе з багны. Плян быў вялікі. Вызначылі ролі, далі слова быць разам... І што атрымалася? У тым цемрашальстве, якое зацягнула плянэту, згубіў сябе не адзін брат. Амаль усе забыліся аб місіі. Я застаўся адзін. Гэта цяжка. Некаторыя з нашых разам з натоўпам нават гналі мяне на эшафот.

ГАРЫСЛАВА: Матэрыя карае нецярплівых. Ніколі не сьпяшайцеся, дзеткі. Перад паходам на Зямлю чысты дух павінен доўга рыхтавацца. Для творчасьці ў Сусьвеце ўсім хопіць мейсца й часу.

МІКУЛА: (*узбуджана*) Чалавек — няўдзячнае быдла. Трэба часьцей хадзіць па ім бізуном. Кожная раса атрымлівае вестку ад нас толькі адзін раз. Калі яна не ўспрынятая —

гора народам. Такі закон! Яго парушальнікі караюцца, а за зьдзекі з Мэсіі вінаватыя губляюць розум!

ІЗЯСЛАЎ: Ня трэба, яны — ахвяры.

ЛЮДВІКА: Мікула, ты не падобны да сябе. Дзіўна! Тваёй ваяўнічасьці надоўга хопіць? Не па адрасу яна. Слухай сына: ён не хістаецца ў кірунку да мэты, а рухаецца па сумленьні. Людзі — сапраўды вязьні вашай творчасьці і эгаізму. Яны ўжо даўно заблыталіся ў панятках дабра і зла, а ў некаторых выпадках наогул зьнішчылі неабходную лінію падзелу паміж імі. А ўсё пачалося з настаўнікаў (такіх, як Уладамір), якія бесьперашкодна хадзілі па плянэце і на вачох у людзей нахабна забаўляліся з жыцьцём. Даўшы розум сваім пестунам, яны толькі потым усьвядомілі, чым гэта абярнулася. Дападкія людзі дапетрылі, што ім нагляд замінае, і сталі гнаць стваральнікаў зь Зямлі. А тыя нічога больш разумнага, як бессаромна пакінуць плянэту, не знайшлі. З тае пары нас імчыць туды толькі натхненьне.

МІКУЛА: Творчыя манэўры непрадказальныя. Часам нават сам аўтар зьдзіўляецца сваёй спрытнасьці і ня ў стане стрымаць гульню імклівай думкі.

ЛЮДВІКА: Мікула, ты варты нашчадак дэмагогіі свайго бацькі. Але, бачу, табе ня ўсё вядома.

ГАРЫСЛАВА: Матуля, я прашу вас спыніцца. Ізяславу патрэбны спакойны энэргетычны рэжым.

ЛЮДВІКА: Слоў толькі на адзін удых. Дарэчы, яму таксама карысна паслухаць. Не пашкодзіць. Дык вось, калі разгаралася нашая Юга, вучэньне Вялікага Настаўніка, якое сьцьвярджалася і грымела на ўсіх перакрыжаваньнях, зганьбілі тым, што пасьлядоўнік Уладамір ня змог яго годна несьці. Мы ўпалі на прыступку ніжэй, і Чара Праўды стала гарэць іншым агнём. Нам патрэбны новы Герой, каб

забраць ідэю з рук нягоднага пасьлядоўніка. Тады зазьзяе Сапраўднае Сьвятло.

ІЗЯСЛАЎ: Атрымліваецца, што мы дзеім у памылковай сістэме каардынатаў, у якой не прадугледжанае месца для галоўнай ідэі. Яна знаходзіцца па-за нашай чыннасьцю, вышэй нас і на недасягальным узроўні.

АГНІЯ: Мы сьпяваем узьнёслую песьню фальшывым голасам і не разумеем гэтага.

ГАРЫСЛАВА: І працавалі мы больш на падзеньне духу, чымся на яго ўзвышэньне.

МІКУЛА: (*сярдзіта*) Як толькі выявілася прычына, усе нарэшце сталі відушчымі, нібыта вынікі даўно не былі навідавоку. Калі я турбаваўся заганным станам нашых справаў і неаднаразова распачынаў абмяркоўваць гэтую тэму, на мяне пазіралі як на дзівака. Кожны марыць аб лепшым, а слова жывога не пачуеш ні ад каго. Калі мы ўжо вытравім эпігонства і эгаізм? І гэта сярод нас — а як тады між людзей?

ЛЮДВІКА: Усё адно новага Героя пакуль ня бачна. (*Да Ізяслава*) Мацуйся, унучак, і гартуй свой дух. (*Выходзіць.*)

ГАРЫСЛАВА: Амаль усе нашыя высілкі тычацца Зямлі, а за сабою прыглядзець няма калі. Асабіста я адчуваю ўнутраную нераўнавагу і энэргетычную разбалянсаванасьць. Які зь мяне творца? Нам усім трэба прывесьці сябе да гармоніі. Тады замест руцінных абавязацельстваў зьявяцца творчае натхненьне і асалода працы. Толькі такім чынам мы зможам сінтэзаваць усе магчымасьці княства, каб выявіць у сіле духу героя-выратавальніка. Ці ня так, дарагія мае?

МІКУЛА: Узгодненасьць памкненьняў — значная сіла. Але дасягнуць яе будзе цяжка, бо ў сваіх супярэчнасьцях мы зайшлі вельмі далёка.

ІЗЯСЛАЎ: Безумоўна, кожны з нас хоць колькі-небудзь, але псуецца на Зямлі, трэба абавязкова чысьціць сваю сьвядо-

масьць і ў процілегласьць цемры тварыць лепшыя кармічныя ўчынкі. Агнія, што з табой?

АГНІЯ: (*паглыбляецца ў сябе*) Я адчуваю, як у сонечным спляценьні мацнее агонь. Так можна гарэць толькі ўдваіх. Гэта ён далучыўся да мяне. (*Ідзе за мяжу ўспрыманьня.*)

ГАРЫСЛАВА: Сынок, залішнія эмоцыі цябе разбураюць. Табе тэрмінова неабходныя практыкаваньні адзіноты і ёгі. Пойдзем.

ІЗЯСЛАЎ: Я апрану агонь, спалю рызьзё ўсіх напластаваньняў і зноў буду чыстым.

Усе выходзяць.

Пасьля некалькіх імгненьняў бадзёрай гука-сьветлавой рытмікі вакольлем авалодвае спакой.

Ля Чары сядзіць Нарымонт і нешта піша.

Зьяўляецца Алесь.

НАРЫМОНТ: Не пытайся, што я раблю. Заканчваю трактат аб новым філязофскім вучэньні, якое павіннае ўскалыхнуць зямную думку. Ты сьвецісься радасьцю, зорны падзейнік. Чым ты ўсьцешыў душу гэтым разам?

АЛЕСЬ: Там трапеча бясцэнны дар, які мне пашчасьціла атрымаць на вашай плянэце. Імя яму — Каханьне.

НАРЫМОНТ: Неверагодна! Ты знайшоў на Зямлі тое, чаго там не павінна быць!

АЛЕСЬ: Ты цынік. Каханьне існуе незалежна ад нас і праціпае сваімі токамі ўвесь Космас. І ніхто ня ведае, калі і дзе яно стрэнецца. Як цудоўна!

НАРЫМОНТ: Адтаго што ты ня з нашага княства. Каханьне — непасьцігаемае таемства, невядомая Боская Велічыня. Жыць зь ім на Зямлі — мука, жудасныя ў сваёй непазбежнасьці пакуты. На нашай плянэце адсутнічае дасканаласьць,

а значыць, істага аб'екту для каханьня няма. Кахаць у такіх умовах — хутчэй пакараньне, чымсь узнагарода. Гэтае пачуцьцё роўна самакатаваньню, бо горка любіць недасканалае. Яго можна назваць мазахізмам, калецтвам і нават вар'яцтвам. Адзнака каханьня на Зямлі — агромністы дар, цяжкае, пакутлівае выпрабаваньне на шляху прасьвятленьня і спазнаньня прыроды. Каханьне пакуль ня можа зьмяніць гэты сьвет, яго недастаткова для гэтага, але тое, што яно ёсьць сярод людзей, — лепшая надзея для вогненнага ўзыходжаньня. Дзякуй Богу за такую ласку!

АЛЕСЬ: (*весела*) Дастаткова, прамоўца! Красамоўе табе яшчэ спатрэбіцца для палемікаў на Зямлі. Не спазьніся!

НАРЫМОНТ: Разумею, бывай! (*Зьнікае за мяжу ўспрымання.*)

Алесь у добрым настроі ходзіць па зале.
Усё насычанае радасьцю, шчасьцем.
Зьяўляецца Агнія.

АЛЕСЬ: Агнія, у якім бы абліччы ты ні была, я пазнаю цябе і знайду ў сама далёкім закуточку Сусьвету, ты са мной заўсёды. Адчаго раней я не адчуваў цябе ў сваёй душы?

АГНІЯ: Алеська, адтаго што ты туды не глядзеў, не наведваў свой дом, быў у дарозе.

АЛЕСЬ: Я вельмі доўга ішоў, бо не ўяўляў, што гэты шлях вядзе да цябе. Наогул, дрэнна для характару, калі штосьці невядомае: душа пакутуе, сэрца рвецца, думкі зьлеюць. А калі каханьне абмінае — гора так і ліпне. Гэта я толькі зараз зразумеў. Быццам у другі сьвет перайшоў. Можа, гэта зман?

АГНІЯ: Не, ты насамрэч прасьвятлеў і стаў бліжэй да сапраўднага. Я зьведала гэта раней за цябе, і мне знаёма, як

моцна Майя трымае ў сваіх абдымках, пакуль каханьне не пачне іх расчапляць.

АЛЕСЬ: Ты прыйшла ў маё сьведам'е — і зьніклі ўсе перашкоды, трывогі. Мне адкрылася, як ты дапамагала мне і ратавала ад бяды ў касьмічным гушчары. Дзякуй табе, дарагая. Я дыхаю жыватворным фіміямам каханьня.

АГНІЯ: Гэта твае цэнтры нарэшце адчыняе наўменальнае пачуцьцё — адно са шматлікіх і доўгачаканых, якія ёсьць у Божай скарбонцы.

АЛЕСЬ: Ты так цікава ўсё тлумачыш.

АГНІЯ: Алеська, ты яшчэ нэафіт і дзіцё, пакуль цябе трэба бараніць, адтаго я сумысна гэта раблю, каб твая ўзьнёсласьць апранулася ў трывалыя Боскія паняцьці і паімчала нас у зорную вышыню. Я столькі вяла цябе па Сусьвету і чакала, што зараз баюся згубіць.

АЛЕСЬ: Ніякія растаньні нам ня страшныя. Мы зьнітаваныя духам і палымнеем у адзінстве. Я адчуваю неверагодную моц.

АГНІЯ: Не сьпяшайся, любы. Я вазьму твае вобразы, аблашчу іх душою і сэрцам, напоўню чысьцінёю і дабрынёю і вярну табе, каб перад выхадам у жыцьцё яны загартаваліся тваёй мужнасьцю і ведамі.

АЛЕСЬ: Будзьма тварыць у новым і асаблівым вымярэньні, дзе акрамя нас з табою нікога няма.

АГНІЯ: Алеська, а можа, гэта грэх?

АЛЕСЬ: Што?

АГНІЯ: Тое, што ў сваім каханьні мы забыліся пра Бога? Мы вучым людзей: больш за ўсё трэба любіць не адно аднаго, а Яго.

АЛЕСЬ: Каханка мая, Бог — гэта Любоў у шматлікіх выяўленьнях. Гэты агонь уздымае душы ўсё вышэй і вышэй да поўнага зьліцьця зь Ім. Ён у творчасьці — адначасова му-

жчына і жанчына, таму тыя стварэньні, якія ў любоўным гарэньні адшукалі адно аднаго ў Космасе і злучыліся ў вялікае цэлае, найбольш адпавядаюць Сьвятой Задуме і ўзбагачаюць Яе. Я абляцеў амаль увесь Сусьвет і ня так многа страчаў такіх выпадкаў. У Космасе асаблівае сьвята, калі ў Эдэм вяртаецца чарговая ідэальная пара закаханых.

АГНІЯ: Аб гэтым і я ведаю, але сярод такога бруду мне раптам падалося, што нашае шчасьце таксама нячыстае і грахоўнае.

АЛЕСЬ: Не хвалюйся, усё будзе выдатна. Каханьнем ствараюцца сама лепшыя жыцьцёвыя сістэмы ўва ўсіх галяктыках.

АГНІЯ: І нашая будзе гарманічнай і дасканалай.

АЛЕСЬ: Абавязкова, мілая. (*Цалуюцца.*)

Этэр патанае ў вялікай радасьці сьвятла, музыкі, агню.

## ВЫЯВА ТРЭЦЯЯ

У замку агульны сход. Музыка, танцы, шматгалосая гамонка. Урачыстасьці меней, чым мінулым разам.

МІКУЛА: Самаадданая грамада! Я рады вітаць усіх напрыканцы чарговага Круга нашай Югі. Мы шмат і шчыра працавалі, упэўнена трымаючы курс на ўзвышэньне і прасьвятленьне Духу. З задавальненьнем адзначаю, што Братэрства ня здрадзіла справе сваіх продкаў і значна ўзбагаціла ідэю ўсекасьмічнага будаўніцтва новым зьместам. Нашыя вогненныя здабыткі маглі б быць больш уражлівымі,

калі б стваральнай духоўнай плыні аб'ектыўна не перашкаджалі брудныя разбуральныя плыні матэрыі. Перад тым як прыступіць да абагуленьня і аналізу назапашанага вопыту, традыцыйна прашу ўзгодненым сумесным выкідам насыціць прастору сьвежай ды гаючай энэргіяй.

У зале адбываецца рытуал, як у пачатку першае выявы.

ГАРЫСЛАВА: Неверагодна цяжкім бачыцца мне наш шлях. Хоць і зручна пачуваецца ад вялікага энэргетычнага напружаньня і гожай памкнёнасьці, але вынікі ў нас атрымліваюцца ня сама лепшыя. Шмат сілаў забірае бітва з нячысьцікамі, вельмі мала стваральніцкіх крокаў. Мы робімся больш ваяўнічымі і няўрымсьлівымі. Некаторыя нават сталі захлынацца ад агрэсіі, нібыта яна, а не чыстае паветра дабрачыннасьці, — адзіны і сама надзейны будаўнічы матэрыял.

УЛАДАМІР: Усё гэта ад празьмернага індывідуалізму. У мяне такое ўражаньне, што мы дбаем пра асабістае больш, чым пра агульнае, і спакваля адракаемся ад супрацоўніцтва.

ЛЮДВІКА: Высновы справядлівыя, а вось падыходы бессаромныя. Адасобленасьць сярод нас — абарона ад тваёй ідэйнай тыраніі, Уладамір. Годзе хоць на Вялікай Радзе дыктаваць свой стыль. Няхай рэй вядуць свабодныя прынцыпы. Я думаю, у шчырасьці і адкрытасьці недахопу ня будзе. Сёньня мы павінныя канчаткова вызначыцца ў стратэгіі.

УЛАДАМІР: А хіба раней было па-іншаму? Ты не захварэла, Людвіка? Чаму я ўзурпатар?

ЛЮДВІКА: Уладамір! Гурт трымаецца ідэяй, якая вырошчвае правадыра, а не правадыром, які плодзіць ідэю. Так як табе бліжэй апошняе, ты абсалютызуеш сваю ролю. Мы жада-

ем кіравацца Ідэяй і Свабодай, адтаго кажам пра гэта ўголас. Многім надакучыла хітраваць і вышукваць такія варыянты быцьця, дзе можна было б хавацца ад твайго нагляду ды апекі і задавольваць свой творчы азард. Пасьпеў час адчыніць патаемныя скарбонкі магчымасьцяў і прыбраць свой талент для асалоды духа як пажадана. Тады й радасьць закіпіць, разьвее агульны сум, і ў свабоднай творчасьці нас нарэшце пацягне адно да аднаго, да супольнасьці. А там, глядзіш, і народзім сьвята.

КАРАЛІНА: Няўжо гэта ў нас будзе? Так абрыдлі бясконцыя нягоды і пакуты. Адчаго нельга тварыць у мажорнай танальнасьці?

ГОСЦІ: — І Зямлю засадзіць кветкамі шчасьця.

— Вусны людзей расчапіць усьмешкамі.

— Паветра насыціць водарам дабрыні і спагады.

— Зьнішчыць холад, цемру, непагадзь.

— Сонцам і цеплынёй аблашчыць душы.

— Дык грымнем агулам і пашлем на плянэту адпаведны энэргетычны выбух!

— А там не сканаюць ад гэткай нечаканай шчодрасьці?

УЛАДАМІР: Атрымліваецца, глум палоніць ня толькі людзей. Раней мы, Настаўнікі, так не разважалі. Сама вялікае сьвята — калі дух у барацьбе, у змаганьні, у безупынным, штохвілінным гарэньні; ён ніколі не адпачывае, не стамляецца і не лянуецца.

НАРЫМОНТ: І сее на Зямлі большасьцю звады і нянавісьць.

УЛАДАМІР: (*быццам ня чуе*) Няйначай, зямная эпідэмія кранула нас: там рамантычны лібералізм ужо даўно шкодзіць. Касьмічныя законы не дазваляюць цярпець такое, адтаго я заўсёды буду змагацца з разбэшчанасьцю і ганебнай вольнасьцю нашых нораваў, каб прадухіліць новы хаос.

ЛЮДВІКА: У нашым княстве ён пануе даўно, толькі ты ўпарта не жадаеш зьвязаць яго са сваім імем, прызнаць паразу і ісьці на спачын. (*У натоўпе хіхікнулі.*)

МІКУЛА: Палеміка пачынае нагадваць зьдзеклівую сварку. Ня будзьма парушаць гармонію ўзаемаадносінаў. Памятайма, што сапраўдная сусьветная творчасьць выяўляецца толькі ў палярнасьці і дваяроднасьці агню.

НАРЫМОНТ: Нашая чыннасьць аднабокая і нэгатыўная, значыць, яна зусім ня творчасьць.

ГАРЫСЛАВА: (*зірнула на Нарымонта і працягвае думку Мікулы*) ...што кожная праява мае свайго аўтара, а ў нас талентаў вунь колькі.

ЛЮДВІКА: Столькі і прычынаў канкрэтна паказаць пальцам, каб па заслугах адзначыць перад праўдай кожнага ўдзельніка гэтага шалёнага маратону. (*Між гасьцёў прабег шумок незадаволенасьці.*)

ГЕНРЫХ: Нават у чалавека ня ўсё так проста, што ўжо казаць пра нас? Каго вінаваціць, што няўдала завяршаюцца шматлікія спробы прасьвятліць людзей? Так, у 19 стагодзьдзі была дасланая хваля глыбокага вывучэньня матэрыі. І як усё перавярнулася? Яны праскакалі па паверхні і плюхнуліся ў грубы матэрыялізм. На сыходзе веку ім далі магчымасьць трохі адпачыць і зрабіць пераацэнку каштоўнасьцяў — распладзіліся застойныя зьявы. У 20 стагодзьдзі прыадчынілі заслонкі больш шырокага пазнаньня Сусьвету — яны ўпрагліся ў небывалую агрэсію і распачалі сусьветныя войны. Затым мы сталі літаральна бамбіць плянэту інфармацыяй аб Касьмічнай Бязьмежнасьці з мэтай паклікаць чалавецтва да зораў і супрацоўніцтва — яны па-стравусінаму яшчэ шчыльней прыціснулі галовы да зямлі, панавыдумлялі розных машынаў і камputараў, якія проста сталі зьнішчаць іхныя памкненьні, здольнасьці і працавітасьць.

ЛЮДВІКА: Такое было б дзіўным у княстве дурняў, а нашае братэрства кемлівае і цяміць адразу. Чалавек — наш узорны вучань. Для хутчэйшага ўдасканаленьня ён атрымаў ад нас розум, які стаў сама зручнай формай сьцьвярджэньня зла. Значыць, зло — прагрэс. Так, Уладамір? Гэта — соль тваёй ідэі? Жах, ад якога зараз заходзіцца Зямля, — твой плян? Не хавай гэтай праўды. Скажы аб ёй усім памагатым, каб яны болей не перашкаджалі табе сваімі тэорыямі аб дабры.

КАРАЛІНА: Сьмешна, але ўсе іх тэорыі — варыянт сьветаладу па прынцыпу Пталемея: усё круціцца вакол Зямлі. Дзе ён, дарэчы? (*Госьці заварушыліся, нехта нязвыкла зарухаўся, замітусіўся — і рогат накрыў натоўп*) Ніводнае думкі агульнакасьмічнага ўжытку!

НАРЫМОНТ: Некалі мы не маскаваліся сярод людзей, адкрыта несьлі сваё вучэньне і выпраўлялі іхныя памылкі. А цяпер адсутнічае ідэя Боскага Адзінства, наўкола безьліч недасканалых рэлігіяў. Чым далей ад Бога, тым іх больш, як тэорыяў апраўданьня адступніцтва.

ІЗЯСЛАЎ: Тысячагодзьдзямі жылі на Зямлі нашыя сьвятыні й вучэньне, калі іх надзейна захоўвалі ў духоўных храмах, сьцераглі ад барбараў і гвалту. З вуснаў у вусны, з душы ў душу яны перадаваліся герафантамі. А пасьля, калі дапусьцілі да скарбніцы натоўп, — што адбылося? Чарната папаўзла па плянэце, цемра затапіла прасторы ўсяго за некалькі стагодзьдзяў.

ГЕНРЫХ: Сумна, бо гісторыя чалавецтва — гэта ўнікальны і падрабязны летапіс самазьнішчэньня. Яно дайшло да такой стадыі, што ўзварушвае і разьвівае ў асноўным нэгатыўны пласт сваёй сутнасьці, астатняе прабіваецца на сьвет зь вялікай цяжкасьцю альбо наогул гіне.

ІЗЯСЛАЎ: Людзі глыбока засвоілі, што, каб збавіцца ад граху, патрэбна ўкленчыць перад небам, хаця ўжо даў-

но настаў час не прасіць, а жадаць Богу новых дасягненьняў і вышыняў.

АЛЬГЕРД: Чаго вы так хвалюецеся за іх, няхай мізарнеюць і далей, калі на большае не хапае розуму. Гэта ж адзін са спосабаў інтэнсіўнага развіцьця: хутчэй да фінішу — і ў новае вымярэньне! Ха-ха!

УЛАДАМІР: Я вучу чалавека, што маўчаньне — ягонае выратаваньне, а балбатня — згуба, адзін з варыянтаў зьнікненьня; галоўнае — ні слова пра Боскае, істотнае, сакраментальнае. Гэта я паўтараю ўсім вам і заклікаю гнаць прэч ад сябе ўсялякі сумнеў і нявер'е, якія могуць нарадзіцца пад час вось такіх спрэчак. Ведайце, што галоўнае нашае заданьне чалавецтву — злучыць матэрыяльны сьвет з духоўным.

ЛЮДВІКА: Уладамір, ты адчуваеш, што пачынаецца шторм? Ня трэба паводзіць сябе так, нібыта ты валодаеш патаемным ключом. Скажы шчыра: яго ў цябе няма.

Уладамір маўчыць.

МІКУЛА: Бацька, нам усё вядома.

Агонь Чары Грааля імгненна ўпаў, у прасторы запанавала нязвыклая цішыня.

УЛАДАМІР: Тайна Боская ў кожным з нас. Пасьцігаем мы гэта паступова, па меры свайго росту. Нельга ўзьляцець раней прызначанага часу. У адказны момант я вымушаны быў перахапіць Агонь, бо Героя побач не апынулася. Я ўсьведамляю, што ранавата бяруся за справу, але, калі б не зрабіў гэтага, княства не існавала б зусім. Я спадзяваўся,

што хутка зьявіцца Годны і забярэ ў мяне Велічную Паходню. Але ён не прыйшоў. Трагедыя ўзрастае ад таго, што і зараз яго няма сярод нас.

Трывожнае шматгалосьсе загуляла ў прасторы.

ГЕНРЫХ: Гэтае чыстае прызнаньне толькі дапаможа нам. Цяпер мы разумеем, як моцна зьнітаваныя адзін з адным і як сугучна трэба дзеіць, каб пераадолець крызіс. Мужнасьцю і найвялікім напружаньнем духу будуецца нашая сфэра. Цяжкасьцяў шмат, але галоўнае — мы захавалі жыцьцё і не здрадзілі Творчаму Прынцыпу, які абдымае ўвесь Сусьвет. Прэч смутак і скруху! Кожны з нас валодае вялікім патэнцыялам агню, які ў лучнасьці можа зацьвердзіць новую ступень развіцьця.

УЛАДАМІР: Папярэджваю: рэзкіх тактычных рухаў рабіць ня варта, каб не парушыць агульную раўнавагу. Мэтазгодна захоўваць характэрны для нашага княства стыль паводзінаў.

АЛЬГЕРД: Цудоўна! Катаклізмы, катастрофы, зьнішчэньні застаюцца!

ЛЮДВІКА: Няшчасныя творцы! Бедныя людзі!

Вырастае агонь Чары і зьяўляецца вобраз Рагнеды.
Усе ўважліва слухаюць яе.

РАГНЕДА: Любыя мае! Клічу на падмогу вашую мудрасьць і веру. З Касьмічнага Цэнтру пачала рухацца Вялікая Энэргетычная Хваля, якая нясе магутныя зьмены духу і новую інтэлектуальную эру.

МІКУЛА: Дзякуй, маці. Што нам рабіць?

РАГНЕДА: Знайдзіце ў сабе моцы з годнасьцю прыняць яе. Ратуйце новую Расу.

ГАРЫСЛАВА: Якім чынам?

РАГНЕДА: Ахвяраю.

Вобраз зьнікае. Меншае агонь. Узмацняецца агульнае ажыўленьне.

ЯРЫВЕД: Асаблівай радасьцю поўніцца сэрца ў прадчуваньні сусьветных пераменаў. У рэзанансе ходзіць увесь сьвет. Мы на парозе Велічнай і Сьветлай Будучыні. Хутка да вас завітае дэсант пасланцоў зь іншых, больш дасканалых сістэмаў. Яны ведаюць пра вашую бяду і прынясуць з сабою сьвежы, жыватворны дух.

КІРЫЛА: Нам ня трэба чужынцаў. Яны ўсё адно нас не зразумеюць. Са сваім болем мы справімся самастойна.

БЭНЭДЫКТ: Гонар не дазваляе нам карыстацца ў такой сітуацыі дадатковымі сродкамі. Хопіць асабістых духоўных рэсурсаў.

ГАРЫСЛАВА: Наогул, пасля папярэджаньня сьвятой Рагнеды нам нязручна і неэтычна прымаць шчадроты ад іншых. Наадварот, зараз мы павінныя аддаваць, пры тым сама дарагое і значнае.

КАРАЛІНА: І хто ж будзе ўзважваць?

ГЕНРЫХ: Галоўнае — што альбо каго?

МІКУЛА: Гэта вырашыць гурт сваёй агульнай энэргетычнай пасылкай у Сусьвет. А крытэрам традыцыйна будзе Чара Грааля. Дзякуючы вогненнай сувязі, якая існуе паміж ёй і касьмічнымі адрасатамі, мы атрымаем сапраўдную адзнаку сваёй духоўнай гекатомбе.

Усе глядзяць на Чару, агонь слаба гуляе. У далейшым яны сочаць за ім, каб вызначаць вагу сваіх прапаноў.

КІРЫЛА: Я маю велізарныя малаабжытыя і ўрадлівыя землі. Мой народ шчыры, памяркоўны, духоўна багаты, адтаго правільна зразумее, калі я аддам іх для насельнікаў расы будучыні.

ВІНЦЭНТ: Ёсьць больш заможныя ўладаньні, грамадзяне якіх прымуць любых мігрантаў без папярэдніх умоваў.

Агонь выпусьціў некалькі іскрынак.

БЭНЭДЫКТ: Нядаўна я распачаў асвойваць новыя тэрыторыі, перасяленцы праходзяць эвалюцыйны адбор па ўсіх касьмічных правілах; бываюць недарэчнасьці, але гэта звычайныя хваробы росту, ад якіх грамадзтва хутка вылечваецца.

УЛАДАМІР: Сапраўды, Бэнэдыкт мае добры плён, і я раіў бы прыняць ягоны праект. Тыя нацыі, якія ён расьціў дагэтуль, адрозьніваюцца высокімі якасьцямі. Яму суджана ісьці зь імі да самых вышыняў. Нягледзячы на гэта, ён пайшоў яшчэ на адзін выспраб і ўзваліў на сябе дадатковую ношу. Яго рашучасьць і мужнасьць заслугоўваюць лепшае адзнакі.

НАРЫМОНТ: У яго высакароднае сэрца.

БЭНЭДЫКТ: Братэрства! Вы ўсе самааддана і рупліва завіхаецеся на сваіх сялібах, ведаеце сапраўдны кошт кожнага намеру, адтаго адчуеце маю шчырасьць. Я адчыняю свае прафесійныя сакрэты і клічу ўсіх да сябе на кантынент для ўзьвядзеньня лепшае расы.

КІРЫЛА: Гэта калі мы здолеем пераступіць цераз сябе і забыцца на той разлад, якім так багацее нашае княства. А да цябе прэтэнзіі немалыя. Я супраць тваёй мэханікі.

Агонь ірвануў угору і хутка апаў.

НАРЫМОНТ: Кожны ў адзіноце ідзе да Бога, у натоўпе — да д'ябла.

АЛЬГЕРД: Хопіць зьдзеквацца зь сябе з-за гэтых зямных пачвараў! Ды зьнішчыце вы іх, і гайда да мяне ў акіян стыхіяў!

Па агні прайшлася хваля паветра, і ён стаў кволым.

ГЕНРЫХ: Ёсьць цікавы жыцьцёвы пласт, які можна скарыстаць на супольныя мэты. Я прапаную ўсім паступіцца ўласнымі прынцыпамі ў аднолькавай ступені і накіраваць туды трохі сваёй мэнтальнай энэргіі. Гэта створыць спрыяльныя ўмовы для абраных перасяленцаў.

ЛЮДВІКА: Прашу ўважліва прааналізаваць ідэю. На мой погляд, яна ў канчатковым варыянце зьменшыць катастрафічнасьць нашага становішча.

Многія зьдзіўленыя пазіцыяй Людвікі, адтаго нават галосна сталі выказваць падтрымку Генрыху. Але агонь ня выявіў асаблівай актыўнасьці, адзін зь яго языкоў сьмела хістануўся і зьнік, нарадзіўшы пасму едкага дыму. Ад нечаканасьці грамада ахнула.

ЯРЫВЕД: Калі вас задавольвае прапанова Генрыха, то Космас выказвае нязгоду зь ёй. Гэта яшчэ раз сьведчыць пра тое, што вы не на праведным шляху. Я зноў зьвяртаюся да вас з парадай у імя Адвечнага Прынцыпу зачыніць сваё вымярэньне.

Навокал пачало цямнець, густа пацякла жудасьць.

ІЗЯСЛАЎ: Набліжаецца вялікае гора. Трэба зьменшыць яго ўдар. Космас не прымае нашых прапановаў, бо яны не

зьмяняюць сутнасьці ўсяе сістэмы. Мы імкнемся захаваць і ратаваць не чалавека, а сябе. Ганьба! Я раблю ахвяру ў сваім духу і крочу на шматпакутную Зямлю назаўсёды.

Гэтыя словы выклікаюць усеагульны жах, бо такога ахвяраваньня яшчэ не было. Агонь магутным і буйным парывам шугануў уверх. Прастора пакрысе набыла ранейшы сьветлы выгляд.

ІЗЯСЛАЎ: Я буду жыць там ня 33 гады, а вякі, а мо й тысячагодзьдзі. Я пачну прасьвятляць людзей, гаварыць ім праўду, адкрыю ўсё, што ведаю сам, прыкладу, колькі магчыма, сілаў, каб наогул зьнішчыць тайну і боль у душы, розуме, сэрцы чалавека, а таксама ўсялякія схованкі, сакрэтныя паняткі і крыўду на ўсіх абшарах гэтай няшчаснай плянэты.

Ідзе наперад. Ягоны сьветлацень зьзяе ўсімі колерамі вясёлкі, паступова павялічваецца і займае ўсю пэрспэктыву.

Усіх абдымае радасьць. Нябёснае сьветлавое і музычнае буяньне толькі паляпшае агульны сьвяточны настрой.

Вылучаецца Агнія зь дзіцём.

Усе героі пацiху адыходзяць воддаль, акрамя дзіцяці Агніі, якое застаецца ў промнях сьвятла наперадзе. Яго аблямоўвае зьзяючая рознакаляровая сфэра — аўра. Гучыць Гімн Богу. Наступае Новая Эра, і яе першы Ўладар, духоўна чысты, свабодны і празрысты, велічна паўстае перад жыцьцядайнай Вечнасьцю.

г. Віцебск,

красавік 2001 году.

# Змест

ГОЛСКАСЬЦЬ
рэсткая праекцыя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

СЬВЯТЫНЯ
культавая праекцыя . . . . . . . . . . . . . . . . . .113

КАХАНЬНЕ
псыхічная праекцыя . . . . . . . . . . . . . . . . . .185

ВЕЖА
апошняя гульня лёсаў
канодная праекцыя . . . . . . . . . . . . . . . . . . .275

НА ЛЕСЬВІЦЫ ДУХУ
герархічная праекцыя ў асобах . . . . . . . . .333

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Калядны** Мікола

**Касьмічныя праекцыі**

**Раманы, п'есы**

Адказны за выпуск *Зміцер Вішнёў*
Дызайн вокладкі *Павел Дарохін*
Вёрстка *Таццяна Тамілава*
Карэктура *Ліда Наліўка, Алена Брава*

Падпісана да друку 20.10.2020. Фармат 84×108/32.
Папера Classic. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 22,26. Ул.-выд. арк. 12,74.
Наклад 99 асоб. Замова 2776.

16+

Прыватнае выдавецкае ўнітарнае прадпрыемства «Галіяфы».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/48 ад 03.10.2013.
Вул. Куйбышава, 22, каб. 6, пам. 6, 220029, Мінск, Беларусь.
E-mail: vish@bk.ru
www.halijafy.by

Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Палікрафт».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/14 ад 21.11.2013.
Вул. Кнорына, 50, 220103, Мінск, Беларусь.



ВЫДАВЕЦТВА
ГАЛІЯФЫ

ISBN 978-985-7209-59-0
9 789857 209590

Мікола Калядны

# Касьмічныя праекцыі